Леанід Пракопчык

# „Дрэмле памятка дзён...”



*Леанід Пракопчык*

# „Дрэмле памятка дзён...”

**КРАЯЗНАЎЧЫЯ НАРЫСЫ**

МІНСК
ПОЛЫМЯ
1991

ББК 26.891
П 69
УДК 908 (476)

Рэцэнзент
кандыдат гістарычных навук, член СП СССР
**Г. А. Каханоўскі**

П $\frac{1805080000 - 048}{М306 (03) - 91}$ 9 — 91

ISBN 5-345-00381-5

© Л. Ц. Пракопчык, 1991

## ПРАДМОВА

Веды пра той ці іншы край, гісторыю яго народа складваюцца з розных вытокаў. Не апошнія сярод іх – навуковыя даследаванні, гістарычныя, археалагічныя, літаратуразнаўчыя адкрыцці. Што датычыцца мінулага Беларусі, асабліва яе сярэднявечча, калі на працягу пяці стагоддзяў беларускія землі з'яўляліся асновай тэрыторыі вялізнай і магутнай дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага, то тут у большасці людзей амаль поўная і, безумоўна, недаравальная недасведчанасць. Як гэта ні дзіўна, але са школьных падручнікаў і нават з фундаментальных акадэмічных выданняў той цікавейшы перыяд – фарміравалася беларуская нацыя, звяршаліся значныя падзеі ў палітыцы і культуры народа – амаль выключаны. У розных дапаможніках, даведніках да мінімума скарочаны звесткі, матэрыялы пра меўшыя эпахальнае, пераломнае значэнне ў гісторыі краю нацыянальна-вызваленчыя паўстанні з удзелам беларускай шляхты, беларускіх сялян пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, Кастуся Каліноўскага. (На жаль, да апошняга часу так і няма на роднай зямлі ніводнага помніка Кастусю Каліноўскаму.)

Аўтар сабраных у гэтай кнізе нарысаў (частка з іх ужо публікавалася ў перыядычным друку) ставіць сціплую мэту: звярнуць увагу чытача хоць бы на некаторыя падзеі, факты, імёны з мінулага свайго краю, закінуць зерне цікавасці, павагі да далёкай даўніны, той багатай, але, шкада, і па сённяшні дзень ледзь прыадчыненай скарбніцы. Аповяд ідзе пра унікальныя мясціны, помнікі архітэктуры, культуры, канкрэтныя гістарычныя асобы.

...Грозна і велічна паўстае Княжацкая вежа Крэўскага замка. Менавіта тут у змрочнай каменнай каморы, якая захавалася і па сённяшні дзень, у канцы XIУ стагоддзя быў задушаны славуты князь Кейстут і адсюль жа пры незвычайных і ўсё яшчэ загадкавых абставінах змог уцячы асуджаны на пагібель сын Кейстута Вітаўт. На самым ускрайку Браслаў-

скага раёна ў вёсцы Відзы Лаўчынскія ўцалела сядзіба канца ХУІІІ стагоддзя, якая належала герою паўстання 1794 года сябру і паплечніку Тадэвуша Касцюшкі генералу касінераў Тамашу Ваўжэцкаму. У Любчы і Гальшанах, што на Гродзеншчыне, зберагліся гарадзішчы-замчышчы Х–ХУ стагоддзяў, касцёл і кляштар пачатку ХУІІІ стагоддзя. Усё гэта сведкі даўніх часоў, гістарычныя вобразы, своеасаблівыя ілюстрацыі да далёкага мінулага роднай зямлі. А колькі ў краі іншых не менш цікавых мясцін, дзе нарадзіліся, жылі, працавалі знакамітыя людзі – паэты, мастакі, кампазітары? Як не прыкра, пра колішнія фальваркі нярэдка нагадваюць прысады ці рэшткі падмуркаў. Родавыя сядзібы недаравальна знішчаны.

Хто павінен у тым, што руйнуецца наша Бацькаўшчына, агонь памяці тлее? Не час шукаць вінаватых, час не дапусціць вынішчэння сваёй Спадчыны, сваіх каранёў...

Аўтар мае аптымістычную надзею: знойдуцца, дый ёсць ужо людзі, якія будуць ведаць сваё мінулае, шанаваць памяць сваіх продкаў, не дапусцяць, каб згасла яна ў сэрцах многіх пакаленняў нашчадкаў.

# Крэўскія таямніцы

*Прысвячаю Юргелю Казіміру*

Калі сабраць малюнкі і гравюры, на якіх адлюстраваны беларускія замкі часоў сярэднявечча – Навагрудскі, Лідскі, Крэўскі, а таксама пабудаваныя пазней – Мірскі і Гальшанскі, акрамя таго, адабраць фотаздымкі тых жа замкаў ужо пачатку XX стагоддзя, то ўбачым сумную заканамернасць: чым выява пазнейшая, тым муры больш разбураныя, вежы – ніжэйшыя. І разбураюцца, гінуць яны ўжо ні ад асад альбо ваеннай навалы– бярэ сваё час, які павінны пераадолець ахова, рэстаўрацыя, адраджэнне помнікаў гісторыі і культуры. Ці не перакanaўчы таму прыклад – лёс недалёкага ад нас астраўнога (абкружанага возерам) Трокскага замка ў Літве, сцены і чырвонацагляныя гатычныя вежы якога, наадварот, апошнім часам не панізіліся, а дараслі да сваіх першапачатковых памераў, і ён ператварыўся ў высакародны помнік нацыянальнай гісторыі і дойлідства, стаў цэнтрам турысцкага паломніцтва...

Заснавальнікам многіх замкаў-крэпасцей, што ўвайшлі ў сістэму магутных умацаванняў – Трокі, Меднікі, Ліда, Крэва, Навагрудак – быў вялікі князь Гедымін. Мудры валадар, ён амаль пазбегнуў міжусобнай барацьбы і ўсе свае намаганні скіроўваў на пашырэнне і ўмацаванне дзяржавы. Пры ім да Вялікага княства Літоўскага далучыліся Менск, Віцебск, Турава-Пінская, Берасцейская землі. Гедымін пачаў запрашаць да сябе замежных рамеснікаў, будаўнікоў, заключыў з Рыгай гандлёвае пагадненне. На ўсходзе ён паспяхова змагаўся з уплывам маскоўскага князя Івана Каліты на Пскоў і Ноўгарад. Але галоўную пагрозу існаванню свайго народа, ведаючы трагічны лёс прусаў, бачыў у няспынным націску, агрэсіі рыцараў Тэўтонскага ордэна. Відаць, ні адзін вялікі князь ні да Гедыміна, ні пасля яго не распачаў і не давёў да канца будаўніцтва такой колькасці крэпасцей на шляхах крыжакоў, што пастаянна нападалі на беларуска-літоўскае Панямонне. Менавіта пры Гедыміне амаль адначасова ўзводзіліся каменныя замкі-крэпасці ў Вільні, якую ў 1323 годзе князь зрабіў сталіцай свайго княства, і вельмі падобныя паміж сабой так званыя замкі-

кастэлі ў Медніках, Лідзе і Крэве. Выкарыстаўшы зваду паміж ордэнам крыжаносцаў і Лівоніяй, ён пайшоў на палітычнае і эканамічнае збліжэнне з Рыгай.

Прыблізна ў 1328–1330 гадах Гедымін пачаў узводзіць у Крэве – цэнтры ўдзельнага княства (займала землі ў басейне Заходняй Бярэзіны) замак-кастэль, накшталт ужо існаваўшага, закладзенага ім жа ў 1323 годзе Лідскага. Заканчваў будаўніцтва крэпасці яго сын Альгерд, які атрымаў Крэўскае княства яшчэ пры жыцці бацькі. Між іншым, Крэва (узнікла недзе ў XI–XII стагоддзях) і належала амаль усё XIУ стагоддзе вялікакняжацкаму роду Гедымінавічаў, было іх дамэнам і пасля Альгерда перайшло да яго сына – вялікага князя Ягайлы. Стаўшы каралём Польшчы, апошні аддаў княства малодшаму брату Аляксандру–Вігунду, якога ў 1391 годзе тут жа, у Крэўскім замку, задушылі змоўшчыкі.

Падобныя ўмацаванні ўжо з XII стагоддзя былі вядомы ў Германіі, Даніі, на поўдні Скандынавіі. Будавалі іх рыцары, прытым як мага хутчэй, з мэтай стварэння гаспадарча-стратэгічных пунктаў у буйных паселішчах, на скрыжаваннях важных дарог, дзе маглі б пры небяспецы адсядзецца, папоўніць правіянт. З такіх крэпасцей, паўстаўшых на межах з літоўскімі і беларускімі землямі, яны і рабілі свае рабаўнічыя набегі. Крыжацкія абарончыя збудаванні станавіліся надзейнай апорай, сховішчам падчас захопніцкіх паходаў шматтысячных атрадаў рыцараў. Так што і Гедымін намагаўся мець у сябе, каб з поспехам абараняцца і ў сваю чаргу наносіць ворагу ўдары, узбраенне і замкі, якія б адпавядалі тактыцы тагачасных войнаў.

Крэўскі замак-кастэль якраз і вылучаюць, калі можна так сказаць, тыповыя рысы, асабістасці падобных умацаванняў. Па-першае, пабудаваны ў нізіннай раўніне, якую паміж высокіх пагоркаў размыла рака Крывянка, на штучным прамавугольным поплаве. Як і Лідскі, у плане ён нагадвае няправільную трапецыю. Даўжыня (найбольшая) сцен – 108 метраў. Вышыня – 10–12, таўшчыня – амаль 3 метры. Мелася ўсяго дзве вежы, адна насупраць другой па дыяганалі. Найбольшая – Княжацкая (вежа Кейстута) – галоўная і вельмі цікавая пабудова ва ўсім замку. Яна выходзіла за перыметр замкавых муроў, даючы тым самым магчымасць абараняць, абстрэльваць заходнюю і паўночную сцены, у ёй мелася ўязная брама. Вежа, амаль квадратная – 18,5х17 метраў, была шматпавярховай. Ніжнія паўтара паверха займаў каменны, паглыблены ў падмурак склеп. Непасрэдна над гэтым самым змрочным і надзейна ўмацаваным памяшканнем, што служыла турмой, размяшчаліся (ужо на другім паверсе) княжацкія пакоі. Тут самыя шырокія, уверсе скругленыя вокны, атынкаваныя



Вежа Кейстута

сцены распісаны фрэскамі – яшчэ ў мінулым стагоддзі аконныя ліштвы захоўвалі сляды фрэскавага жывапісу. Карысная плошча кожнага паверха, што не цяжка падлічыць, больш як 200 квадратных метраў. Першы, як ужо гаварылася, нагадваў глухі каменны мех і прызначаўся для вязняў, другі – лічыўся жылым, княжацкім, там знаходзіліся самыя па тым часе шыкоўныя пакоі – з камінамі, на сценах і падлозе ляжалі скуры мядзведзяў, ласёў. У самым большым пакоі (трапезная і прыёмная разам) стаяў вялікі дубовы стол, масіўныя лавы – тут князь прымаў паслоў, тут гасцявалі. Па суседству размяшчаліся спальні, скарбніца і іншыя памяшканні. На трэцім паверсе жылі шматлікая чэлядзь і начальнік замкавай варты, месціўся гарнізон з адабраных, найбольш надзейных вояў. Той

жа трэці і, відаць, чацвёрты паверхі выконвалі таксама і абарончую ролю – тут знаходзіўся яшчэ адзін рад байніц, а на самым версе – пляцоўка, куды ў тоўшчы сцяны вяла каменная лесвіца.

...Новая дарога з Мінска на Вільнюс напрамку Ракаў–Валожын–Ашмяны праходзіць у кіламетры ад Крэва, ад замка. Але саміх муроў ужо амаль і не відаць, адзіна вылучаецца рог Княжацкай вежы са старым, накшталт капелюша, буслінымгняздом. А вось зблізку руіны ўсё яшчэ ўражваюць. Па-першае, самі памеры дзядзінца – вялікая пляцоўка з таямнічымі, шчыльна затканымі дзёрнам узгоркамі пасярэдзіне. Шматпудовыя шэра-зялёныя грубачасаныя валуны над фундаментам, пляскатыя цагліны (амаль удвая большыя за сучасныя), быццам луска, сям-там прыкрываюць каменнае нутро шасцісотгадовых сцен. Рэшткі муроў месцамі яшчэ дасягаюць 7–8 метраў, Княжацкай вежы – 20 метраў. Крэўскі замак, як і Лідскі, Медніцкі, не выпадкова быў пабудаваны ў даліне рэчкі: ваду ў тыя часы таксама выкарыстоўвалі ў якасці абарончых рубяжоў. На старых малюнках відаць – яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя да ўсходняй сцяны замка падыходзіў стаў. Як сведчаць археолагі, амаль усё ўмацаванне абкружаў штучны роў, які таксама запаўняўся вадой. Лічаць, што і ў замкавым двары мелася сажалка.

Вакол Крэўскай кастэлі не суджана было разбудавацца гораду і, відаць, галоўная прычына ў тым, што непадалёку расла тады новая сталіца – Вільня і знаходзіўся яшчэ адзін вялікакняжацкі, дзяржаўны цэнтр – Трокі з двума замкамі. Дарэчы, ніякіх рэшткаў іншых каменных пабудоў, таго, калі ўзводзілася крэпасць – у XIУ або ХУ–ХУІ стагоддзях у Крэве не знойдзена. Можна лічыць, што вакол яе толькі і існаваў невялікі пасад з драўляных хат.

Але сам Крэўскі замак, асабліва ў першае паўстагоддзе свайго існавання, паспеў стаць сведкам многіх гістарычных падзей, прытым і трагічных. А разбураць яго пачалі яшчэ ў 1503–1506 гадах перакопскія татары, што не раз рабілі ў тыя часы набегі на Беларусь і Літву. З тае пары Крэва амаль страціла значэнне рэзідэнцыі вялікіх князёў, ды і пасля Грунвальдскай бітвы (1410 год), якая закончылася поўным разгромам крыжакоў, ролю крэпасці замак таксама ўжо не выконваў. Таму з ХУІ стагоддзя ён амаль не выкарыстоўваўся па прызначэнні і стаў разбурацца. Згодна апісанням, у ХУІІІ стагоддзі на вялікай вежы ўжо былі праламаны дах, перакрыцці паміж паверхамі, абвалілася частка ўсходняй сцяны. Але больш за ўсё муры пацярпелі падчас першай сусветнай вайны, калі праз Крэва тры гады праходзіла лінія фронту. У 1926 годзе замак часткова рэстаўрыравалі, аднак і па сённяшні дзень так нічога

і не зроблена па кансервацыі гістарычных руін, рэдкага на нашых землях абарончага збудавання XIУ стагоддзя. І як не прывесці прыклад з суседняй Літвы, дзе такі самы замак-кастэль у Медніках (за два кіламетры ад граніцы з Беларускай ССР) даўно стаіць закансерваваны, а часткова і рэстаўрыраваны – вуглавая вежа – і на яго прыбранай, дагледжанай тэрыторыі знаходзіцца драўляны будынак, падобны на стары фальваркавы дом, дзе з характэрным для літоўцаў густам зроблена і пастаянна дзейнічае невялікая гістарычна-археалагічная экспазіцыя з мінулага замка.

...Я не аднойчы трапляў у Крэва, але найбольш уразіў, запомніўся адзін восеньскі, у канцы лістапада, прыход у мястэчка па старой брукаванай дарозе. Было ўжо цёмна, гадзін дзесяць вечара (ішоў да знаёмага настаўніка, ведаў, што ў яго і пераначую), ярка свяціў амаль поўны месяц, ад чаго бялела, а дзе і серабрылася падмерзлая зямля. Навокал стаялі голыя пагоркі, якія паніжаліся ў даліну Крывянкі, да замка, і нагадвалі нейкі дзікі, старажытны пейзаж. Уздоўж дарогі і на падступаючых палях дзе-ндзе сустракаліся вялікія, у месячным святле сівыя валуны – быццам акамянелыя прывіды. Слупы, хоць і звычайныя тэлефонныя, у гэтай начной пустыні здаваліся чорнымі крыжамі, яны нібы рухаліся, спускаліся да замка...

Вось і невялікая местачковая плошча – магазін, аўтобусны прыпынак, але вакол – ні душы. Чуваць, як праз нечыя агароды бяжыць, журчыць па каменьчыках Крывянка, тая, што шэсць стагоддзяў назад служыла тут абарончым рубяжом. Над ёй паўставаў шэра-сівы, нібы ў векавым попеле, вугал Княжацкай вежы. Не адвесці вачэй ад гэтага велічнага, грознага муру, ад якога ў абодва бакі адыходзяць таксама шэра-сівыя (здалёк бачацца чорнымі) шчарбатыя каменныя сцены. Над галавой у рэдкіх зорачках неба, навокал поўная цішыня, дробязі пейзажу сучаснай вёскі неяк сціраюцца, а вылучаецца з асяроддзя менавіта замак. Але не, не ўсё тут у мінулым, не ўсё змяртвела: на самым версе вежы, з нябачнай паміж каменняў і цэглы шчыліны расце, цягнецца ўгору маладзенькая беластволая бярозка. І расце дрэўца якраз на той сцяне, што гранітнымі валунамі, шчыльна прыгнанымі і злепленымі патаемнай вапнай, сыходзіць пад насып апаўшых камянёў і цэглы, каб стаць адной са сцен „каморы" – турмы, якой Крэўскі замак, як і славутай, названай па ім дзяржаўнай уніяй, перш за ўсё і вядомы ў гісторыі...

Featured Рознае ўражанне пакідаюць выявы ўмацавання, зробленыя выдатнымі мастакамі – Напалеонам Ордай, Язэпам Драздовічам, Фердынандам Рушчыцам, якраз тымі, хто вельмі неабыякава ставіўся да далёкага мінулага, гістарыч-

ных помнікаў сваёй радзімы. Літаграфія Орды, напрыклад, дасканалае сведчанне таго, як выглядаў Крэўскі замак у сярэдзіне XIX стагоддзя, калі тут бываў мастак і маляваў яго не адзін дзень. Сцены збудавання на малюнку даволі высокія, можа толькі і абсыпаліся на метр-два тыя, дзе знаходзіліся байніцы, а з унутранага боку праходзіла драўляная баявая галерэя з памостам. Амаль на ўсе свае дваццаць пяць метраў падымаецца Княжацкая вежа (толькі ў пярэдняй сцяне яе бачыцца пралом). А веліч гэтых быццам нетутэйшых, цыклапічных муроў яшчэ больш падкрэслівае спакойны, вясковы пейзаж: на пярэднім плане – дзве, крытыя саломай хацінкі, паміж імі студня з жураўлём і неглыбокі стаў пад самай сцяной замка.

У Драздовіча руіны замка больш рамантычна-казачныя, яго малюнак хутчэй падыйшоў бы да ілюстрацыі нейкай гістарычнай аповесці ці паэмы.

І зусім іншае, нечаканае ўражанне пакідае вялікае – метры два на тры, напісанае маслам палатно Фердынанда Рушчыца (зараз захоўваецца ў бібліятэцы Акадэміі навук Літвы) пад лаканічнай назвай „Крэва". На ім фактычна адзіны аб'ект – Княжацкая вежа. Гэта чырвона-буры перакошаны куб на фоне цёмна-сіняга начнога неба. Амаль трэцяя частка карціны – снегавы схіл. Накладзеныя буйнымі мазкамі фарбы яркія, грозныя. А ўвесь эмацыянальны сэнс, які добра адчуваецца, – нейкае трывожнае, патаемнае чаканне, і галоўная дэталь, што перадае яго, – ланцуг ідучых ад крывава-чырвонай сцяны ўніз, на гледача, чалавечых слядоў...

Вось тая рэальная начная сустрэча з Крэўскім замкам, а пазней з яго дзівосным вобразам на карціне Рушчыца і вызначылі жаданне даведацца аб знамянальных, нібы ўжо і добра вядомых падзеях, што адбываліся тут, з „першых вуснаў" – з летапісаў. І вось у „Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай" – галоўнай крыніцы звестак аб тым перыядзе гісторыі Вялікага княства Літоўскага – прачытаў усяго два словы: „Ольгердаву Крева" (дарэчы, першае ўпамінанне пра мясціну). Гаворка ідзе аб тым, што размяркоўваючы спадчыну паміж сынамі, Гедымін аддаў Крэўскае княства старэйшаму з іх, будучаму вялікаму князю Альгерду. Але ж варта прыгадаць, што галоўная Княжацкая вежа вотчыннага замка, акрамя таго, носіць яшчэ імя роднага брата Альгерда – Кейстута, уладара заходняй часткі княства – Жэмайціі, Трокаў, Гародні. У Крэве Кейстут ніколі не жыў, хіба толькі гасцяваў – браты правілі дзяржавай пасля смерці бацькі палюбоўна. А прычына гэтай назвы ў тым, што Княжацкая вежа стала для Кейстута апошнім яго прытулкам, ужо як вязня, месцам забойства – здрадніцкага, каварнага.

Хоць пасля смерці Альгерда (1377 год), як паведамляе Хроніка Быхаўца, „...князь великий Кейстут, помня договор и любовь брата своего и то, что до самой смерти его они всё делили вместе, признал великим князем в Вильно сына его великого князя Ягайла и приезжал к нему как и раньше советоваться о делах, как приезжал к старшему брату", барацьба за княжацкі прастол нарэшце абвастрылася менавіта паміж Ягайлам і яго дзядзькам, Кейстутам. Радня Ягайлы, галоўным чынам маці і жонка, пераканалі князя, што пакуль жывы Кейстут, які карыстаецца вялікім аўтарытэтам і ў баяр і ў большай часткі народа, яму на княжацкім прастоле спакойна не ўсядзець.

Хутка адносіны паміж пляменнікам і дзядзькам абвастрыліся настолькі, што справа дайшла да бітвы – сустрэліся войскі Кейстута і яго сына Вітаўта, з аднаго боку, і Ягайлы і яго брата Скіргайлы, з другога, яшчэ падмацаваныя прусакамі, недалёка ад Трокаў. Але сутычка не адбылася, прымірыліся. Пасля гэтага, як сведчыць „Заходнерускі летапіс", „...князь Ягайла те присяги переступил и рек так поедьмо до Вильни и там докончаем сваe присяги и за тым войска ничего не пачынали... Як да Вильни приехоли там князь великий Ягайла князя великого дядю своего оковавши до Крева послал и всадил в твержу, а князя великого Витовта оставили были в Вильни и там в Креве великого князя Кейстута вдвили пятое ночи коморники князя Ягайловы..."

Гісторык П. Бранцаў у кнізе „Гісторыя Літоўскай дзяржавы" (Вільня, 1897) называе нават і забойцаў Кейстута: „Чацвёра сутак пакутаваў у Крэўскім падзямеллі любімец літоўскага народа, на пяты дзень па загаду Ягайлы Кейстут быў задушаны шнурам ад яго ўласнага адзення. Гэтае ганебства зрабілі: Прокша, Лісіца, Жыбентой і Кучук – усе „карнікі" Ягайлы". Дарэчы, рэха – своеасаблівы доказ той любові і пашаны, што захоўваліся ў народзе да Кейстута і Вітаўта, дайшло і да нашага часу: найбольш любімыя, распаўсюджаныя мужчынскія імёны ў Літве – Кейстут і Вітаўт.

Афіцыйна было аб'яўлена, што Кейстут скончыў жыццё самагубствам. У суправаджэнні соцень плакальшчыц шыкоўна ўбранае цела князя прывезлі ў Вільню, дзе па старадаўняй язычніцкай звычцы спалілі на свяшчэнным агні ў даліне Свентарога (зараз на гэтым месцы стаіць касцёл св. Станіслава). Тут жа ў полымі згарэлі яго баявы конь, паляўнічыя сабакі, любімы слуга, зброя і капцюры рысі. Але на гэтым забойстве Ягайла не думаў спыняцца – яго мэтай стала выкараненне ўсяго роду Кейстута, ён знішчаў радню нават жонкі князя. Аднак хутчэй за ўсё хацеў збавіцца ад Вітаўта – сына Кейстута, свайго стрыечнага брата і нядаўняга сябра.

У „Заходнерускім летапісе” пра далейшыя падзеі ў Крэве гаворыцца наступнае: „...По смерти князя великого Кейстута пошлет князя великого Витовта князь великий Ягайло в нашество до Крева з жонаю и велит твёрда стеречи...” „Хроніка Літоўская і Жамойцкая” зазначае: „Потом был посланный (Витовт) да Крева и насмерть асуждённый, але оттамтоля ночи едной, за помочью жоны своей штучным способом и промыслом ушел...”

Так здарылася ў Крэве сенсацыйная, нават і ў гістарычным сэнсе падзея, дзякуючы якой Вітаўт – князь, чые дзяржаўныя дзеянні адыгралі значную ролю ў лёсе беларускага і літоўскага народаў – усёй дзяржавы, быў выратаваны ад немінучага забойства. Хто ж, як мог вывесці, вырваць асуджанага палоннага князя з каменнага склепа з адзіным уваходам, які і дзень і ноч няспынна пільнавала варта Ягайлы? У летапісах наогул вельмі рэдка, часам ускосна ўпамінаюцца жанчыны, нават і князёўны, але тут летапісцы парушылі свой звычай – назвалі абедзвюх жанчын, звяршыўшых дзёрзкае, цудоўнае ўратаванне Вітаўта. Гэта яго жонка, смаленская князёўна Ганна, і яе служанка Алена, імя якой таксама стала здабыткам гісторыі. Тут дарэчы спаслацца на летапісы. „Хроніка Літоўская і Жамойцкая”: „... И так, пришедшы часу едного в вечер (княгиня Ганна. – *Л. П.*), меже двома паннами Витолта мужа своего в убиоре паненском з собою вывела, бо гды ж Витолт был без бороды... Потым Витолт до Яна, княжати мазавецкого, кревного своего, а оттамоля до пруских утекл крыжаков...”

„Заходнерускі летапіс”: „... И Витовт послухавши жоны свое парады и нарадился в жончыно платье, и вышел вон з другою жонкаю и спустился з горада и втечёт до Немец...”

Вядомы расійскі гісторык С. Салаўёў, знаўца летапісаў і малавядомых архіўных дакументаў, распавядае так: „Хворы Вітаўт быў таксама з жонкай Ганнай адвезены ў Крэва, дзе яго трымалі пад надзейнай вартай... Нарэшце яна (Ганна. – *Л. П.*) атрымала ад Ягайлы сабе адной дазвол ехаць у Маравію. У ноч перад ад’ездам яна прыйшла развітацца з мужам і затрымалася ў яго, чаго і трэба было чакаць, даўжэй звычайнага. Гэтым часам Вітаўт пераапрануўся ў сукенку адной са служанак жонкі, Алены, якая засталася на яго месцы, а ён выйшаў з жонкай з турмы, спусціўся са сцяны, знайшоў коней... Алена не ўставала з ложка і так добра выконвала ролю хворага князя, што толькі на трэці дзень даведаліся аб яго ўцёку. Яна паплацілася жыццём за сваю ахвяру”.

Сёй-той з гісторыкаў наогул адхіляе магчымасць таго, каб горды, вялікакняжацкай крыві Вітаўт згадзіўся апрануцца ў жаночую сукенку, і быццам гэты факт ні больш ні менш як

байка, якая з лёгкай рукі нейкага несумленнага летапісца качуе з летапіса ў летапіс і выкарыстоўваецца многімі аўтарамі. Але ёсць жа галоўны доказ – той факт, што Вітаўт, асуджаны, зняволены, уцёк з Крэва, дабраўся да прусаў у Марыенбург і потым пайшоў з войскам помсціць Ягайлу. Як жа такое магло здарыцца? Вітаўт – смяротны вораг Ягайлы, і, безумоўна, варта каля яго стаяла надзейная. Тады здрада? Чыя? Тых самых „каморнікаў", што два тыдні назад расправіліся з Кейстутам? Выключана. Ну, а без дапамогі выбрацца з падзямелля-турмы, мінуць варту ў самой вежы, прайсці незаўважаным па двары, праз вароты, якія таксама ахоўваліся, Вітаўт ніяк не мог. Уцёк яго быў добра абдуманы, падрыхтаваны. Так што трэба, відаць, верыць факту „пераапранання".

Але ёсць і яшчэ адзін бок у гэтым пытанні: на чым трымалася ахвяра служанкі? Паслухмяная, пакорлівая рабыня выканала загад, прымус сваёй гаспадыні, ці можа і самога князя? Цяжка дапусціць. Па-першае, Алена разам са сваёй княгіняй і Вітаўтам знаходзілася ў адным стане – зняволеныя палонныя, і не згадзіцца ісці на несумненную смерць у стане ворагаў яе гаспадароў служанцы было вельмі проста – побач каморнікі Ягайлы, варта. Па-другое, наўрад ці бліжэйшая служанка княгіні, жонкі Гедымінавіча, паходзіла з простага саслоўя і лёгка паддалася страху, прымусу. Застаецца пагадзіцца, што Алена звяршыла свой ахвярны подзвіг добраахвотна, можа, як самазабыўна адданая сваім гаспадарам, а можа, з палітычных пазіцый, адчуваючы, якую ролю адыграе выратаванне Вітаўта ў лёсе радзімы. А можа... любоў, каханне? Чаму не магло ўзнікнуць сапраўднае, моцнае пачуццё да маладога (тады Вітаўт меў трыццаць два гады), разумнага, прыгожага князя ў дзяўчыны ці жанчыны, якая амаль штодзень сустракалася з ім, – патаемнае, а можа і падзеленае?

...Адбылося тое восенню 1382 года. Уцёк Вітаўт да крыжакоў, якія з задавальненнем прынялі Гедымінавіча, бо ведалі, наколькі вялікі яго аўтарытэт на Літве, і высока цанілі ваенны талент князя. А неўзабаве пачалася і падрыхтоўка да вайны – паходу на Трокі, Вільню – на непакорлівую Літву, што так жадалі захапіць, падначаліць сабе тэўтонцы, каб пашырыць межы Ордэна за Нёман.

Вітаўт хутка сабраў войска з уцёкшых ад Ягайлы ў Прусію прыхільнікаў Кейстута, а таксама з верных яму вояў. І, магчыма, разам з тэўтонскімі рыцарамі адолеў бы Ягайлу, але кроўную помсту, крыўду нарэшце перамаглі розум князя, палітычнае прадбачанне, а ў выніку – інтарэсы радзімы. Бо крыжакі незадарма ўступілі ў саюз з прэтэндэнтам на вялікакняжацкі прастол – у адплату яны патрабавалі Жэмайцію і іншыя землі. Не, не мог Вітаўт такой цаной заплаціць за пера-

могу над Ягайлам, сысціся канчаткова з галоўнымі ворагамі Вялікага княства Літоўскага, з якімі ўсё жыццё змагаўся і дзед – Гедымін, і бацька – князь Кейстут. Паступова Вітаўт і Ягайла памірыліся, дзякуючы чаму ў рэшце рэшт і звяршыўся Грунвальд – назаўжды сталіся разбітыя тэўтонцы. Літва з Беларуссю пазбавіліся ад лёсу прусаў, ятвягаў і іншых балцкіх плямёнаў, перамолатых крыжацкімі навалами...

Крэва злучаецца для нас і яшчэ з адной эпахальнай гістарычнай падзеяй – Крэўскай уніяй, першым дзяржаўным і шлюбным саюзам Вялікага княства Літоўскага з Польшчай, імёнамі Ягайлы і польскай каралевы Ядвігі.

Прымірэнне паміж Вітаўтам і Ягайлам адбылося, мацней зрабілася Літва, але набегі крыжакоў не спыніліся, доўжылі тэўтонцы сваю агрэсіўную палітыку і супраць Польшчы, захоплівалі яе паўночныя землі. Акрамя таго, не драмалі татары (цяпер часцей перакопскія), на ўсходзе збірала, падпарадкоўвала сабе княствы, землі Масква. У гэтых умовах сярод палітычных дзеячаў Польшчы і Вялікага княства стала выспяваць ідэя дзяржаўнага саюза, каб разам абараняць свае інтарэсы і перш за ўсё спыніць крыжакоў, якія вось ужо два вякі, атрымліваючы дапамогу ад заходніх дзяржаў, Рыма, рабавалі літоўскія, беларускія, польскія тэрыторыі.

Цяжка сказаць, чаму не ў Вільню, у вялікакняжацкі замак, а менавіта ў Крэва – вотчыну Ягайлы з'ехаліся ў сярэдзіне жніўня 1284 года польскія паны і літоўска-беларускія прыхільнікі пагаднення і заключылі (несумненна, усё ў той жа Княжацкай, Кейстутавай, вежы) першую паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польшчаю унію.

Поўны тэкст гэтага вельмі значнага ў гісторыі абедзвюх дзяржаў, ды і наогул Еўропы дакумента, на жаль, невядомы. Хаця па пазнейшых перагаворах, якія на працягу яшчэ двух гадоў вяліся ў Вільні, Ваўкавыску, Любляне, ды і па выніках заключанага саюза можна ў галоўных рысах уявіць, аб чым прадстаўнікі абодвух бакоў дамаўляліся ў Крэве. Разам з маладой прыгажуняй-каралеўнай (Ядвізі павінна было споўніцца – чакалі! – яшчэ толькі пятнаццаць гадоў) Ягайла (меў каля трыццаці пяці гадоў) атрымліваў і карону Польшчы, чым адначасова ўмацоўваў свае пазіцыі і ў Вялікім княстве Літоўскім, дзе пакуль што як забойца Кейстута, як чалавек слабага характару, які вельмі любіў уцехі, жыццё без клопатаў, ён не карыстаўся сімпатыяй ні ў большай часткі баяр, ні ў народа. У сваю чаргу новаспечаны кароль абяцаў разам з усёй раднёй, вяльможамі і жыхарствам прыняць каталіцтва, аб'яднаць свае ўладанні з польскімі, дапамагчы Польшчы вярнуць захопленыя крыжакамі землі, весці сумесную барацьбу са знешнімі ворагамі. Акрамя таго, Ягайла мусіў прывезці ў Польшчу ўсе



„Ягайла". *Малюнак са старажытнага летапісу*

скарбы дзеда і бацькі, а таксама выплаціць быломy нарачонаму Ядвігі аўстрыйскаму герцагу Вільгельму дзвесце тысяч чырвонцаў адступнога.

Уніяй з Польшай асабліва быў задаволены Вітаўт, бо калі Ягайла станавіўся каралём Польшчы, то ён – вялікім князем

Вялікага княства Літоўскага, якое, згодна з пагадненнем, пакідала за сабой пэўную незалежнасць: на розныя дзяржаўныя пасады назначалася толькі беларуская і літоўская шляхта, заставаліся свае войскі, фінансы.

Перагаворы ў Крэве і іншых месцах праходзілі без удзелу Ядвігі, яна проста была важнай казырнай картай у руках польскіх магнатаў і ксяндзоў, якія вяршылі вялікую палітыку. Лёс каралевы Ядвігі па-свойму трагічны. Польскі кароль Казімір не меў дзяцей і перадаў прастол свайму пляменніку – венгерскаму каралю Людовіку. Усе дванаццаць гадоў праўлення апошні жыў у Венгрыі, польскімі справамі займаўся мала, так што яго панаванне вылучалася амаль бесперапыннымі смутамі, і наогул аўтарытэт Людовіка ў палякаў быў вельмі нізкі.

Кароль меў трох дачок, і польскі прастол вызначыў спачатку мужу старэйшай – маркграфу брандэнбургскаму Сігізмунду. Але апошні не задавальняў польскую шляхту, і яна нечакана прысягнула другой дачцы Людовіка – малалетняй Ядвізі. Праўда, гэта дальнабачная палітыка, мэта якой, у будучым, і недалёкім, самім выбраць для Польшчы караля, па сваіх інтарэсах. У рэшце рэшт, хоць і меліся спробы выдаць малодшую дачку за князя крыві Пястаў, самым жаданым для панаваўшых вяльможаў стаў валадар вялікай, моцнай дзяржавы на ўсходзе – князь Літвы Ягайла.

Нягледзячы на тое, што ў шасцігадовым узросце Ядвігу заручылі з аўстрыйскім эрцгерцагам Вільгельмам, разам з якім яна выхоўвалася пры венгерскім двары і якога з юнацкіх гадоў кахала, лёс маладой каралеўны вырашаны. Яе перавозяць у Кракаў, хутка карануюць і ўжо як польскую каралеву ні пад якім выглядам не адпускаюць у любую ёй Венгрыю. Між іншым, у тыя часы венгерскі двор, цесна звязаны з аўстрыйскім і нямецкім, быў больш адукаваны, больш свецкі, чым кракаўскі. Вільгельм дабраўся да Кракава і, нягледзячы на перашкоды, сустрэўся ў манастыры з Ядвігай, якая нават не хацела і чуць аб „варвары норавам і ўродам целам" літоўскім князі. Яны паспешна абвянчаліся. Але паны не дапусцілі маладых да шлюбнага ложка і фактычна выгналі Вільгельма з Кракава. Ядвіга вельмі перажывала гвалтоўны разрыў з жаніхом, яе ледзь уратавалі ад самагубства.

Далей падзеі разгортваліся хутка і ў адным напрамку. Кракаўскі біскуп Пятро Выш пераканаў Ядвігу, што калі яна возьме шлюб з Ягайлам, а галоўная ўмова – той павінен ахрысціць свой дзікі народ, – то зробіць апостальскі подзвіг, выратуе тысячы душ ад вечнага пекла. Каралеўне няспынна тлумачылі, хоць яна і не надта ўсё гэта разумела, аб палітычных выгадах аб'яднання, аб умацаванні дзяржавы, якая стане

найвялікшай у Еўропе. Нарэшце Ядвіга дала згоду пры ўмове, што яе давераны чалавек сустрэнецца з Ягайлам, каб праверыць нораў літоўскага князя і яго знешні выгляд – дайшлі чуткі, што літоўскі князь увесь у шчаціне і мае хвост. Паслу Ядвігі Завішу-Алясніцкаму акрамя размоў з князем на розныя тэмы было даручана схадзіць з ім у лазню...

Ягайлу, які ўжо набліжаўся да Кракава, папярэдзілі аб гэтым, таму ён сустрэў Завішу вельмі ветліва, шчодра адарыў яго. Вярнуўшыся ў Кракаў, пасол так абрысаваў Ядвізе яе жаніха: „...выгляд князя вельмі прыемны, ён прыгожы і стройны, росту сярэдняга, даўгатвары, на ўсім целе няма ў яго ніякага недахопу, у абыходжанні паважны, трымаецца ўладаром". Каралеўна дала згоду на шлюб. Ягайла трыумфальна ўехаў у Кракаў і быў прадстаўлены Ядвізе, якой уручыў каштоўныя падарункі. А неўзабаве разам з братамі Вітаўтам, Скіргайлам і Кіргайлам яго тут жа ў Кракаве ахрысцілі ў католіка і надалі імя Уладзіслава (да гэтага ён меў праваслаўнае імя – Якаў). У сярэдзіне лютага 1286 года адбылося вяселле, а ў пачатку красавіка Ягайлу каранавалі польскай каронай. У Вільні пачалі пераводзіць жыхароў у каталіцкую веру: для хрышчэння людзей заганялі ў раку Вілію. Акрамя таго, на чым адразу ж настаялі ксяндзы, быў патушаны свяшчэнны агонь галоўнага храма Пяркунаса ў даліне Свентарога, высечаны дубы і перабіты свяшчэнныя вужакі, жыўшыя пры храме.

Ядвізе лёс наканаваў нядоўгі век – дваццаць сем гадоў. Існуе меркаванне, быццам бы яна вельмі пакрыўдзілася адмовай Вітаўта прывезці ёй у Кракаў дары – вялікі князь аб'явіў, што не лічыць сябе васалам і не абавязаны рабіць падарункі польскай каралеве, што і паскорыла яе канчыну. (Дарэчы, памерла і яе адзіная дачка.) Польскія гісторыкі характарызуюць жыццё каралевы як подзвіг, як самаахвяру...

Ядвіга прыязджала ў Вільню, у Крэва наўрад ці наведвалася, але яе імя назаўжды звязана як з першым пагадненнем паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польшчай, так і з назвай гэтага саюза – Крэўская унія.

Нечаканым насельнікам Крэва (і хутчэй за ўсё Княжацкай вежы) у 1563 годзе стаў рускі князь, нядаўні бліжэйшы паплечнік Івана Грознага – Андрэй Міхайлавіч Курбскі. Пазней кароль Жыгімонт падорыць яму за добрую службу некалькі маёнткаў і нават горад Луцк, а спачатку, збегшы з Юр'ева Лівонскага, дзе ён быў ваяводам, апальны князь разам з многімі слугамі пасяліўся ў Крэве. Курбскі вядомы не толькі як здольны воін, як палітычны дзеяч, але і як выдатны пісьменнік ХУІ стагоддзя, аўтар знакамітых „Четырех писем к Грозному", „Истории князя Московского о делах, яже слышахом у достоверных мужей и яже видехом очима нашима" і

іншых твораў. Хутчэй за ўсё лісты да Грознага пісаліся Курбскім у Крэве.

...Безумоўна, руіны Крэўскага замка-кастэлі неабходна закансерваваць, што нарэшце, ёсць спадзея, і адбудзецца. Але чаму б справу не доўжыць. Ёсць жа і прыклад – амаль завершана рэстаўрацыя Лідскага замка. Але апошні аднаўляецца перш за ўсё як абарончая крэпасць-кастэль, а вось славутую Княжацкую вежу ў Крэве, ад якой між іншым яшчэ засталася добрая трэць, можна адбудаваць і размясціць на яе паверхах-залах цікавыя гістарычныя экспазіцыі. І чаму б не пафантазіраваць: вось я трымаю ў руках праспект „Замак у Крэве", у якім прапануецца наведаць у тутэйшым музеі „Залу Крэўскай уніі", „Кабінет князя Курбскага", „Камору-турму Кейстута", пазнаёміцца з многімі сабранымі ў Беларусі, Літве, Польшчы выявамі (арыгіналамі, копіямі, фотарэпрадукцыямі) гістарычных асоб, каго лёс прыводзіў у Крэва. Гэта немалая галерэя: Гедымін, Альгерд, Ягайла, Вітаўт, Скіргайла, Вайдыла, Андрэй Курбскі, каралева Ядвіга, жонка Вітаўта – Ганна Станіславаўна і, вядома ж, яе служанка Алена – выратавальніца вялікага князя Вітаўта, славутая крэўская вязніца...

# Легенды старога Лоска

Не шмат можна пабачыць на Беларусі вёсак, дзе б галоўная вуліца, як у Лоску, цягнулася па самым грэбені высокага, з крутымі схіламі ўзгорка. Таму і няма тут роўных двароў – усе то на адхонах, то на равах. Разам з сядзібамі, з садамі ды агародамі, што прытуліліся да схілаў, старая лоская вуліца і сама паступова сыходзіць, спадае да замчышча.

Замчышча ў Лоску – таксама высокі ўзгорак, на дзіва правільнай авальнай формы, які ў свой час падсыпалі і ўмацавалі, бо яму суджана было стаць пляцоўкай пад цэлы горадкрэпасць. Гэтаму помніку старажытнасці не менш як шэсцьсот гадоў: у пісьмовых крыніцах XIУ стагоддзя Лоск згадваецца ўжо як вядомае, добра ўмацаванае паселішча. А недзе ў другой палове XУ стагоддзя на памянёным узвышшы замест землянога вала і драўляных тыноў узняліся высокія зубчастыя муры. Мяркуюць, што замак пабудаваў князь Януш Карыбутовіч. Яго жонка Ганна, застаўшыся ўдавою, правіла тут і падпісвалася на дзелавых паперах ужо не інакш як княгіня Лоская.

Пасля Карыбутовічаў гісторыя мясцовасці працягвае ісці па ўзыходзячай лініі, узбагачаючыся як цікавымі падзеямі, так і знанымі імёнамі. З 1494 года Лоск стаў уласнасцю магнатаў Кішкаў. Спачатку замкам валодаў Пётр Кішка – полацкі ваявода, потым яго брат, Ян Кішка – кашталян віленскі, вядомы ў межах Літвы і Беларусі як заўзяты прыхільнік рэфармацыі. Тут, за сценамі надзейнага замка і ў баку ад вялікіх гарадоў, апошні ў 1570 годзе заснаваў адну з першых у Беларусі друкарняў.

З 1574 года ў летапіс Лоска ўпісваецца імя Сымона Буднага – выдатнага філосафа-асветніка, публіцыста і пісьменніка, аднаго з самых адукаваных людзей свайго часу. Вучыўся ён у Кракаўскім універсітэце, некаторы час жыў у Вільні – настаўнічаў у пратэстанцкай школе, потым займаў пасаду пратэстанцкага прапаведніка ў Клецку. У 1562 годзе выдаў сваю першую кнігу на беларускай мове – „Катэхізіс", якая хутка набыла папулярнасць. Твор быў надрукаваны ў Нясвіжскай друкарні,

заснаванай самім жа Будным і яго паплечнікамі Лаўрэнціем Крышкоўскім і Мацеем Кавячынскім.

Прыблізна з 1570 года асветнік жыў у Нясвіжы пад апекай магната Мікалая Радзівіла (Сіроткі). З пераходам апошняга ў каталіцызм Буднаму давялося адмовіцца ад друкарні і пакінуць Нясвіж: як аўтар добра вядомай прадмовы да „Катэхізіса" гуманіст асабліва не падабаўся каталіцкім царкоўнікам.

Спачатку Будны пераехаў у Хоўхлава, недалёка ад Маладзечна, потым, як мяркуюць, у Заслаўе і ўсюды наладжваў выдавецкую справу. У 1574 годзе ён аказаўся ў Лоску. Надзеі знайсці спакойнае месца для працы нарэшце збыліся. Лоск Будны не пакідаў амаль на працягу дваццаці гадоў. Тут пабачылі свет лепшыя яго творы. Асабліва плённым быў першы год. Адна за адной выйшлі пяць кніг пісьменніка: „Супраць хрышчэння дзяцей", „Пра дзве сутнасці Хрыста", „Наконт аргументаў пра дзве сутнасці Хрыста", „Кароткі доказ, што Хрыстос не з'яўляецца такім жа богам, як айцец" і „Пісьмо Дж. Фоксу". Кожнае выданне было накіравана супраць састарэлых догмаў хрысціянскай царквы...

Ад калісьці непрыступных сцен замка, ад мураваных будынкаў і драўляных хацін, што цясніліся за імі, да нашых дзён у Лоску захаваліся толькі засыпаныя зямлёю рэшткі падмуркаў. Але затое не забылася легенда – яна існуе не адно стагоддзе і зберагае нам уяўленне аб славутым у свой час прыгажосцю і магутнасцю Лоскім замку. Згодна з ёй будаваўся замак не з цэглы і не з граніту, а з „дзікіх" камянёў, якімі былі ўсеяны тутэйшыя палі і лясы. Сабралі іх усе да адзінага на тры вярсты вакол паселішча, але гэтага хапіла толькі на падмурак. Тады і выдалі загад: кожны, хто едзе ў Лоск на кані, павінен прывезці і здаць варце ля гарадскіх варот не меней тузіна валуноў ці глыжакоў, а кожны пешы, хоць у торбе, хоць у кішэні, таксама мусіць прынесці.

Калі камянёў назбіраліся горы, іх рассартавалі па велічыні, колеры і пачалі ўзводзіць муры. Найперш паклалі ў зямлю самыя вялікія валуны, усе – чорнага колеру, далей – сіняга адцення, затым – карычневага. І чым вышэй узнімаліся сцены збудавання, тым яны станавіліся больш светлымі, яркімі. Самы верх іх – зубцы і вежы – зрабілі чырвонымі.

І вось толькі ў муры лёг апошні камень пунсовага колеру, як над Лоскам сабраліся хмары і пайшоў дождж. Ён ліў усю ноч, змываючы са сцен замка пясок і гліну. А раніцою жыхары паселішча раптам убачылі, што зубцы і вежы замка, хоць сонца яшчэ і не ўзышло, адліваюць яркім вогненна-чырвоным святлом. З таго часу ў любое надвор'е, калі палохаючы ворагаў, калі здзіўляючы гасцей, з раніцы і да цямна Лоскі замак свяціўся чырвоным зарывам.

На пабудову гмаха, сведчыць далей легенда, пайшлі ўсе камяні з тутэйшай зямлі. Таму ў наваколлі хто хацеў пакласці камень у падмурак хаты, мусіў купляць яго ў замку або ехаць за ім аж пад самую Вільню. Так мучыліся людзі да тае пары, пакуль нарэшце не пачалі трэскацца і рассыпацца старыя муры. А тады той-сёй і заўважыў, што кожны камень, сарваўшыся з замкавай гары, каціўся да таго самага месца, з якога калісьці быў падняты.

...На замчышчы, на колішняй плошчы з краю пры ўездзе, стаяць дзве невялічкія хаткі. Побач – хлявы, паветка, старая скасабочаная пуня. Перад хлявамі і вакол пуні, нібыта зусім не да месца, буйна разрасліся кусты бэзу, шыпшыны, бружмелю. Абягаючы замкавы ўзгорак, сюды, на плошчу, вядзе наезджаная крутая дарога. Калісьці яна пачыналася з паўднёвага падножжа, ад Татарскай гары, дзе цераз роў на ланцугах і канатах спускалі пад'ёмны мост. Зараз дарога на замчышча так крута ідзе ўверх, што на машыне не ўсякі рызыкне па ёй падняцца.

У першай хаце (яна бліжэй да адхону) жыве цётка Ефрасіння, у другой – яе дзевер. Абодва будынкі стаяць на адным двары. Трапляючы на Лоскае замчышча, перш за ўсё апынаешся на гэтым звычайным сельскім падворку.

Цётка Фрося ўжо ведае, чым здзівіць гасцей, і без доўгіх размоў выносіць звычайна кош, а то і два з аскепкамі кафлі, глінянага і шклянога посуду, кавалкамі шлаку, які запёкся ў цікавыя фігуркі. Сувеніраў гаспадыня не шкадуе, і кожны набірае іх, колькі хоча.

– Бярыце, бярыце, – падбадзёрвае яна. – Мы дабро гэта не купляем, само на сотках расце...

Пасля такіх слоў карціць пацікавіцца: а як жа цэгла на градах можа расці? І тады цётка распавядае, што жыве на замчышчы ўжо пяцьдзесят гадоў – пераехала сюды, як выйшла замуж. Кожную восень, выбіраючы бульбу, абавязкова назбірвае некалькі вёдраў тых самых аскепкаў. Адкуль яны бяруцца, і сама не ведае.

Калі даўжэй затрымацца ў цёткі Ефрасінні, разгаварыцца з ёй, то можна пачуць павучальную гісторыю пра шукальнікаў так званай лоскай казны.

...Было гэта даўно, на замчышчы тады яшчэ ніхто не жыў, а тутэйшае поле належала аднаму старому пану. Прыехалі неяк да яго два хлопцы нібыта з Варшавы і сказалі, што ім дакладна вядома, дзе на замкавай плошчы закапаны багаты скарб залатых манет.

Пагалоска пра зніклую бясследна гарадскую казну даўно ішла па наваколлях Лоска. Расказвалі, што калі крыжакі акружылі замак і рыхтаваліся яго ўзяць, мясцовыя жыхары,

сярод якіх было нямала багатых купцоў і рамеснікаў, знеслі ўсе свае грошы, золата ў адно месца, ссыпалі ў скураны мяшок і замуравалі яго недзе ў зямлі.

Доўга пуставаў пасля крыжацкага нашэсця спалены і разбураны Лоск. Нарэшце людзі зноў пачалі збірацца і будавацца на старым замчышчы, на сваіх папялішчах. Але тыя, хто хаваў казну, хто ведаў, дзе яна, не вярнуліся з вайны – усе загінулі.

Не даваў скарб людзям спакою – шукалі яго і тутэйшыя, і прыезджыя. Адны капалі глыбокія ямы пасярэдзіне былога пляца, другія разбівалі старыя падмуркі, трэція ўзрывалі каменне на дарозе, але нічога так і не знаходзілі...

І вось сталі пераконваць варшавякі лоскага гаспадара, што абавязкова знойдуць скарб, нават план паказалі, на якім усё адлюстравана. Паабяцалі пану аддаць роўна трэцюю частку ўсяго адшуканага. Тры дні ён думаў, гадаў і згадзіўся.

Пачалі хлопцы капаць адразу ў двух вуглах, але рыдлёўкамі не доўга карысталіся – пайшоў суцэльны камень, і давялося ўзяцца за ламы і кіркі. Сем дзён працаваў кожны ў сваёй яме, і нарэшце на восьмую ноч у аднаго на дно глыбокай шахты аднекуль збоку раптам пасыпаліся залатыя манеты. Ашалелі варшавякі, убачыўшы золата: яны смяяліся, крычалі, седзячы ў яме, запіхвалі манеты ў кішэні, сыпалі за пазуху. Калі апамяталіся, падзялілі ўсё пароўну (па паўмяшка абодвым выйшла) і, вырашыўшы нічога не плаціць пану, тут жа ноччу пайшлі з Лоска.

Да раніцы блукалі па дарогах і сцежках, далёка абыходзячы кожную вёску, кожны хутар. А як ужо зусім стаміліся, у адным з паселішчаў папрасіліся нанач. Пусціў іх гаспадар у хату, накарміў, напаіў, паслаў за перагародкаю. Здзівіўся, чаму падарожнікі адмовіліся ад падушак і паклалі пад галаву свае цяжкія мяшкі. Нават доўга не мог заснуць. Недзе пад раніцу пачуў, што госці нечым бразгаюць і паціху смяюцца. Зазірнуў за перагародку і ўбачыў: сядзяць хлопцы на падлозе і, як малыя дзеці, чэрпаюць кожны са свайго мяшка каменьчыкі, чарапкі і перакідваюць, перасыпаюць іх са жмені ў жменю.

Не вытрымаў гаспадар, запытаўся:

– Што гэта вы, хлопцы, робіце?

А яны спалохаліся, хуценька пазакрывалі мяшкі, але адзін усё ж адказаў:

– Ці ж ты не бачыш, – золата лічым!

– Золата? – яшчэ больш здзівіўся гаспадар. – Ды гэта ж чарапкі ды каменьчыкі нейкія!

– Каменьчыкі? Відаць, ты яшчэ не прачнуўся, калі чыстае золата за каменьчыкі лічыш. Але няхай будзе так, удзень разбярэшся і будзеш яшчэ ўдзячны лёсу, які паслаў нас да

цябе, – сказаў варшавяк і адлічыў з мяшка некалькі чарапкоў гаспадару.

І пайшлі далей хлопцы шчаслівыя, задаволеныя...

Вясной, калі бульба яшчэ не пасаджана, альбо восенню, як ужо выкапана, цётка Ефрасіння ахвотна пакажа на сваіх сотках тыя ўчасткі, дзе штогод выворваюцца кавалкі чырвонай цэглы, чарапкі посуду, шлак і попел. Раней меліся на замчышчы месцы, якія араць зусім было нельга. Плуг натыкаўся на заплыўшы пяском брук – яго і лом не браў. Але, каб пустка гэтая не гуляла, свёкар цёткі Ефрасінні навазіў сюды зямлі, і тут таксама сталі сажаць бульбу.

За сваёй хатай гаспадыня пакажа і рэшткі замкавых муроў. Праўда, каменняў, кладкі ўжо не відаць – наверсе тоўсты пласт зямлі і дзірвану, але вялікія выступы і цяпер выпіраюць – гэта падмурак.

Недзе тут, дзе падымаліся высокія сцены Лоскага замка і праз вокны-амбразуры адкрываўся від на далёкі гарызонт, на Бярэзіну, што бегла між зялёных лугоў, знаходзіўся пакойкелля Сымона Буднага. У сутарэннях муроў стаяў друкарскі станок. Дакладна вызначыць тое месца, дзе амаль дваццаць гадоў жыў вялікі гуманіст і дзе размяшчалася яго друкарня, цяжка. Пэўна вядома другое: тут, у Лоску, у сваіх творах, прадмовах і перакладзеных артыкулах да кніг пісьменнік адстойваў, абараняў (і гэта ў канцы XУI стагоддзя!) правы чалавека на свабоду сумлення, думкі, волі, гаварыў аб неабходнасці ўсеагульнай, шырокай асветы.

Дарэчы, спіс кніг, выдадзеных Сымонам Будным у Лоску, усё яшчэ ўдакладняецца. Зараз ужо вядома каля 20 твораў самога асветніка і іншых аўтараў, напісаных на рускай, польскай, лацінскай мовах і выпушчаных у мясцовай друкарні. Але ёсць падставы меркаваць, што гэта толькі частка прац выдатнага публіцыста і спіс іх яшчэ будзе прадоўжаны...

У цёмную ноч, калі контуры замкавай гары нібы растваракоцца, цьмяныя жаўтаватыя вочкі святла ў верхніх лоскіх хатках здаюцца далёкімі зоркамі.

А з вышыні, з гары, добра відаць россып агнёў на станцыі Гародзькі, у вялікіх вёсках, што цягнуцца адна за адной уздоўж Валожынскага тракту, і, вядома, унізе, у Лоску, – кожны агеньчык, кожнае асветленае акно.

Аднойчы я застаўся ў цёткі Ефрасінні начаваць. У яе хаце ёсць прасторная чыстая палавіна. Яна не разгароджаная, тут амаль няма мэблі, але ў кожнай з трох сцен па два акны. І гэта зразумела – тут жывуць людзі, якія прывыклі са сваёй сядзібы бачыць на многа вёрст навокал. А гаспадыня зноў распавядала шмат чаго цікавага. Ад часоў далёкага сярэднявечча, калі Лоск яшчэ лічыўся горадам, доўга захоўваўся і своеасаб-

ліві падзел яго жыхароў на людзей рынкавых, з падзамачча, з Татарскай горкі і замкавых. І хоць тыя, хто жыў на замчышчы, даўно ўжо не адрозніваліся ад астатніх сялян ні багаццем, ні знатнасцю, аднак выйсці замуж на замчышча лічылася гонарам.

Цётка Ефрасіння прыйшла сюды з небагатай хаты, што стаяла пасярэдзіне колішняга рынка. Было ёй тады васемнаццаць гадоў, і яна ледзь не бягом бегала з вёдрамі па ваду ўніз да крыніцы.

– Іду, бывала, і ўглядаюся ў гліняныя пражылкі, у жоўты пясок на сцежцы. І вельмі часта здаралася, што тут жа і атрымаю ўзнагароду: то вымыты дажджом медны грошык знайду, то раптам сінім ці жоўтым агеньчыкам засвеціцца на пяску пацерка або нібы спецыяльна хто падкіне пад самыя ногі пачарнелы ключык, падкоўку... А цяпер, – уздыхае цётка Ефрасіння, – як дажыла да сямідзесяці, дык нешта перастала дарыць мне сцежка грошыкі ды пацеркі...

Два вядры з крыніцы заўсёды стаяць на лаве ў цёткі Фросі і цяпер. Трэцяе, што на расходзе, вісіць на круку перад печчу. Каштаваў я тую ваду. Відаць, маецца ў ёй увесь неабходны складаны набор солей, які робіць яе прыемнай на смак. Да таго ж, як кажа гаспадыня, тыдзень–два можа стаяць вада, толькі каб у чыстай пасудзіне, і не будзе ў ёй ні муці, ні асадку.

Праўда, аднойчы нібыта без прычыны замуцілася замкавая крыніца, насілі з яе ваду ледзь не папалам з граззю і глінаю. Увесь гэты час свёкар Ефрасінні, Сцяпан (жывы ён яшчэ быў), хадзіў хмуры, гаварыць ні з кім не хацеў. І толькі калі зноў пачысцела вада, прызнаўся, што сам вінаваты: пакрыўдзіў незнарок Белую панначку, яна ўсё і падстроіла.

Белая панначка! Загадкавая і няўлоўная гераіня мясцовых легенд, прычына многіх колішніх ды і цяперашніх цудаў. Канешне, дзе ж ёй і жыць, як не на такім слынным паданнямі і таямніцамі старым Лоскім замчышчы. Цікава, што сама цётка Ефрасіння гаворыць пра яе, стараючыся ні здзівіць, ні напалохаць слухача, – нібы пра сваю суседку, з характарам і капрызамі якой даводзіцца лічыцца.

А ваду ў крыніцы вось чаму замуціла Белая панначка. Там, дзе пасярэдзіне агароду прыкметная круглая ўпадзіна, калісьці стаяў калодзеж. Не драўляны зруб, як звычайна ў вёсках, а глыбачэзная, выкладзеная часаным абымшэлым каменнем шахта. Камяні тыя павыязджалі, павысоўваліся са сваіх гнёздаў і завалілі калодзеж. Ніхто ўжо не памятаў, калі ім карысталіся. Але як кідалі ў шахту каменьчык, ён знаходзіў шчыліну і, доўга стукаючыся, нарэшце далятаў да вады. Адтуль, са дна, заўсёды цягнула, нібы скразняк, халоднае, сырое паветра.

Стары калодзеж знаходзіўся на самай сярэдзіне двара, і, каб ніхто туды не ўваліўся, Сцяпан надумаў яго засыпаць: накідаў карчоў, рознага ламачча, а зверху – зямлі. Закончыў работу вечарам, а раніцой наступнага дня ў крыніцы была не вада, а адна каламуць. Праз пяць дзён не вытрымаў Сцяпан, устаў рана і сказаў абодвум сынам: „Будзем калодзеж чысціць". Прынёс доўгія лейцы, адным канцом абвязаў сябе, другі аддаў хлопцам і загадаў моцна трымаць, а калі што – цягнуць наверх, а сам рыдлёўкай і ломам пачаў раскопваць закіданую ім старую шахту. Спыніўся толькі тады, калі з прабітай дзіркі са свістам вырвалася паветра. Каб праверыць, кінулі ў шахту каменьчык. Ён даляцеў да вады, адазваўшыся са дна ледзь чутным рэхам. Пасля гэтага ачысцілася крынічная вада.

А Сцяпан доўга ўспамінаў потым, як усё здарылася. У тую ж ноч, як заваліў ён стары калодзеж, убачыў у сне паннaчку. Яна падышла і села ў нагах на край ложка. Ляжыць Сцяпан, гарачым потам абліваецца і чакае, што ж далей будзе. А паннaчка сядзела-сядзела, апусціўшы галаву, дый заплакала, слёзы з вачэй, нібы макавінкі, на прыпол пасыпаліся.

Шкада стала Сцяпану паннaчкі, і ён, асмялелы, спытаўся, чаго такая маладая і прыгожая сумуе і плача, ці не здарылася што? Паннaчка ўзняла на яго заплаканыя вочы і кажа, што было ў яе адно-адзінае акенца, праз якое яна на свет, на сіняе неба глядзела. І вось зачынілі яго, засыпалі ёй вочы пяском, таму і слёз спыніць не можа... Сказала так і знікла, толькі лёгкі ветрык па хаце прайшоў і лісце на вазонах закалыхалася.

Не адразу зразумеў Сцяпан, што яму гаварыла паннaчка. Усе пяць дзён мучыла яго нейкая сумота, пакуль нарэшце не здагадаўся, пра якое акенца яна мовіла...

Змяніліся часы. Цётка Фрося расказвае, што раней, пры тым жа свёкру Сцяпану і ў іх з мужам маладосці, нібыта прывід гэты людзям часцей паказваўся, а цяпер нешта даўно нічога не чутно. Некалі ж многае прыкмячалі за лоскай паннaчкай. Напрыклад, любы мясцовы жыхар мог расказаць, які ў яе конь: шэры, у яблыках і з доўгаю белаю грывай. А бачыўся ён толькі ў першы дзень маладзіка, калі ледзь прыкметна пакажацца ражок месяца. У такія ночы паннaчка любіла пасвіць свайго скакуна на крутых схілах замкавай гары. Але варта было таму, хто іх заўважыць, свіснуць ці кашлянуць, як зьнікалі і конь, і паннaчка, а на іх месцы потым знаходзілі два белыя камяні.

Іншыя нібыта з'яўляліся сведкамі таго, як плавала паннaчка па лоскіх рэчках – Піжме і Пахамянцы. Сустракалі яе часцей за ўсё закаханыя. Стаяць дзе-небудзь пад вольхамі, мілуюцца, і раптам як зацурчыць, зазвоніць вада на камянях!

Азірнуцца на звон – і ўбачаць: выплывае з белага туману паннначка. Не на лодцы – для лодкі мелка, а на праніку, якім бабы палатно пераць. Плыве сабе і залатым грэбенем валасы расчэсвае. Вочы ў яе нібы заплюшчаны, а сама ўсміхаецца некаму, як у сне, і ўсё кланяецца, кланяецца, ды гэтак па-даўнейшаму, у пояс. Калі хочаш панначку лепш разглядзець, замры, не дыхай. А зварухнуўся – і ўсё, знікне, прападзе за кустамі...

Хто і калі бачыў Белую панначку ў апошні раз – невядома. Але цікава, што ва ўсіх легендах і казках яна на дзіва аднаго характару. Хутчэй нясмелая і сумная, чым злосная, хоць і валодае, як і іншыя здані, усялякімі спосабамі свавольства, чараў. Але яе бяскрыўдныя ўчынкі носяць адбітак жыццёвай мудрасці і прыстойнасці. А што любіць у першы дзень маладзіка прагуляцца са сваім белым канём па схілах замкавай гары, паказацца парачцы закаханых або падпільнаваць юнака – дык яна ж і сама прыгожая, маладая, таму гэта ёй даравальна і толькі дамалёўвае, дапаўняе пяшчотны паэтычны вобраз добрай, але нечым пакрыўджанай, няшчаснай дзяўчыны.

Бадай адзіным дапушчэннем таго, што Белая панначка – вобраз хаця і апаэтызаваны, але сапраўдны, з'яўляецца яшчэ адно, прытым самае старажытнае паданне аб верным каханні і трагічнай смерці дзяўчыны, на аснове якога, відаць, і саткаўся ўвесь гэты прыгожы ўзор з легенд.

Жыла ў Лоскім замку прыгажуня з залатой касой. Прыехаў аднойчы туды пагасцяваць юнак, таксама прывабны, станісты. Маладыя пакахалі адзін аднаго. Нішто, здавалася, не магло перашкодзіць іх шчасцю, быў ужо і дзень вяселля назначаны. Як раптам пачалася вайна. Надзеў хлопец свае даспехі, пацалаваў на развітанне нявесту і знік за варотамі з атрадам коннікаў. З таго дня мінула семнаццаць гадоў. Узмужнеў за гэты час юнак, стаў дужым і адважным.

І вось надышоў доўгачаканы дзень, калі гучна заспявалі баявыя трубы, і на сваім верным кані з'явіўся ў двары Лоскага замка праслаўлены воін. Узбег па лесвіцы ў высокую вежу, дзе былі пакоі панначкі, расчыніў дзверы і знерухомеў на парозе: яму насустрач з верацяном у руках паволі ішла незнаёмая пажылая жанчына. Ішла і ласкава ўсміхалася. А ён усе стаяў, нібы ўкапаны: іншай памятаў усе гады сваю каханую.

І тут вывалілася з рук у панначкі верацяно і ўшчэнт разбілася. Ачнуўся воін, але не паспеў зрабіць і крок, як панначка падбегла да расчыненага акна, яшчэ раз азірнулася, махнула яму рукой і кінулася ўніз на брук. Закрычаў воін у адчаі і пабег па доўгай лесвіцы ўніз. Калі ён нахіліўся над распластанай на каменных плітах панначкай, то раптам убачыў, што ляжыць перад ім маладая, прыгожая, такая ж, як ён пакінуў

семнаццаць гадоў назад, дзяўчына, і толькі яе тонкую шыю абвівае не залатая, а белая, нібы снег, каса...

Ці ведаў, ці чуў гэтую старажытную легенду Сымон Будны? Чалавек шырока адукаваны, кніжны, вядома, ён не мог не любіць паэзію паданняў, што захоўваліся ў памяці народнай. Нават можна ўявіць, як пасля дыспуту або сяброўскай гутаркі Будны вёў свайго жаданага госця або сябра па крутой лесвіцы ў самыя верхнія пакоі вартавой вежы, адкуль адкрываўся такі знаёмы від на лапінкі палёў, на сіні лес з кучаравым купалам велікана-дуба, на вулачкі Лоска, дзе цесна збіліся шэрыя хаткі, і паказваў акно, з якога кінулася Белая панначка. Мажліва, для Буднага і яго сучаснікаў панначка, што так трагічна загінула, і не была яшчэ абагульненым, абстрактным вобразам, і Будны, магчыма, называў яе поўным імем – як і воіна, які праславіўся сваёй доблесцю, храбрасцю ў многіх паходах і бітвах...

Шляхі-дарогі... З Крэва і Смаргоні, з Маладзечна і маленькай станцыі Гародзькі. Усе яны сыходзяцца, крыжуюцца ў Лоску. Раўней і шырэй сталі колішнія тракты і гасцінцы, свабодна размінаюцца на іх машыны, але перад самай вёскай пуцявіны, як і раней, пачынаюць пятляць, агінаючы крутабокія лоскія ўзгоркі. Лясы ўжо даўно адступілі ад паселішча, наўкола, на схілах і нізінах – палі з мяккаю, падатліваю, ураджаліваю зямлёю.

Цяпер Лоск ужо не той. На новых сядзібах – новыя, як звон, хаты, за невысокімі платамі – агародчыкі, сады, уздоўж вуліц, раўняючыся на старыя прысады, выстраіліся каштаны, клёны, а вясною віруе пахкай замеццю бэз ды чаромха. Гэта ўжо не з легенды, гэта сённяшні дзень адной са старэйшых беларускіх вёсак, аднаго з лепшых калгасаў Валожынскага раёна.

У мясцовай школе ёсць вялікі музей гісторыі Лоска, дзе па макетах і малюнках можна даведацца, якім юныя краязнаўцы ўяўляюць свой Лоскі замак, убачыць партрэт Сымона Буднага, кавалкі посуду і рознакаляровай кафлі, знойдзеныя на былым замчышчы.

Ну, а легенды аб цудах і таямніцах старых муроў, аб іх гаспадыні – Белай панначцы, звесткі аб друкарні, адкуль выйшлі ў свет як не першыя на беларускай зямлі кнігі, – пра гэта ведаюць у многіх лоскіх хатах.

...Зноў і зноў хочацца пабываць у Лоску!

# Гальшанскія муры

Прыблізна з сярэдзіны мінулага стагоддзя невялікае мястэчка Гальшаны, што на Гродзеншчыне, стала для гісторыкаў і археолагаў, пісьменнікаў і мастакоў своеасаблівай Мекай. Сюды наведваліся гісторык і этнограф Адам Кіркор, паэт Уладзіслаў Сыракомля, пісьменнік Ядвігін Ш., мастакі Напалеон Орда, Фердынанд Рушчыц, Язэп Драздовіч, якія пакінулі серыю выразных замалёвак замка і гарадзішча. Тут і цяпер літаральна кожны суботні і нядзельны дзень можна сустрэць экскурсантаў, турыстаў, прытым часцей з суседняй Літвы або з Польшчы.

Мне першы раз давялося трапіць у Гальшаны ў годзе шасцідзесятым, калі ехаў кружным шляхам праз Валожын і Іўе – іншых дарог тады яшчэ не было – у Ліду. Ужо на пад'ездзе да паселішча з боку Валожына ўбачыў замак: за высокімі рэдка стаячымі на зялёных адхонах клёнамі напалову атынкаваныя муры, чорны, арачны праём – уезд, вуглавая шасцігранная вежа з прастакутнікамі невялікіх вокнаў. На плошчы, дзе спыніўся аўтобус, уразіў сваёй урачыстасцю велічны гмах касцёла. Час дазваляў, і я зайшоў за невысокую, складзеную з валуноў агароджу. Падкошаная трава, навокал чыста. Ля агароджы, з унутранага боку, некалькі дагледжаных магіл (пахаваны ксяндзы) – шэрыя гранітныя пліты, чорныя мармуровыя крыжы.

Здзівіла неяк і сама плошча. У цэнтры яе месціліся гандлёвыя рады, паабапал – старыя, чамусьці з жоўтай цэглы адна- і двухпавярховыя дамы і ніякіх новых забудоў, што, канешне, нязвыкла.

Пазней у кнізе доктара архітэктуры, прафесара У. А. Чантурыя „Помнікі архітэктуры і горадабудаўніцтва Беларусі" прачытаў: „У радавой забудове Гальшан уяўляюць цікавасць каменныя жылыя дамы рамеснікаў і гандляроў. Як правіла, яны аднапавярховыя і пастаўлены тарцовым фасадам да вуліцы. Такая шчыльная група жылых дамоў у добрым стане робіць Гальшаны рэдкім для рэспублікі аб'ектам з вялікім і вельмі паказальным радавым асяроддзем XIX – пачатку XX

стагоддзя. Гэта своеасаблівы музей „пад адкрытым небам", які сабраў у сваёй экспазіцыі тыповыя прыёмы забудовы зямельных участкаў і традыцыйныя тыпы жылля, уласцівыя гандлёвым плошчам у невялікіх пасёлках дарэвалюцыйнай Беларусі..."

З часу свайго першага знаёмства з гэтай цікавай мясцінай мне даводзілася з прамежкамі ў пяць-шэсць гадоў яшчэ некалькі разоў бываць тут, і я абавязкова хадзіў да замка, аглядаў касцёл і будынкі манастыра, што прымыкалі да яго. Помнікі гінулі. Касцёл даўно ўжо служыў складам, і дзеці са спецшколы-інтэрната, размешчанай побач, у манастырскіх келлях, прабіраліся туды, разбівалі, ламалі літаральна ўсё, што паддавалася, у тым ліку арган, вітражы, замазвалі, „замалёўвалі" алтарныя фрэскі, пашкодзілі нават мармуровыя скульптуры на магіле Паўла Сапегі і яго трох жонак (зараз гэты надмагільны помнік захоўваецца ў Музеі старабеларускай культуры Акадэміі навук БССР).

Не менш трагічны лёс напаткаў і Гальшанскі замак. У маё першае наведванне ў яго ўсходнім крыле, ва ўцалелай жылой частцы, яшчэ размяшчалася вучылішча пчаляроў. Але калі ў адной палавіне жылі навучэнцы і знаходзіліся вучэбныя класы, то ў другой... Вежы, сцены выхаванцы проста разбіралі, прычым учыняўся той вандалізм па распараджэнні дырэктара вучылішча. Гэта нават заахвочвалася (будавалі новы клуб): таго, хто здабыў 80 цаглінак, адпускалі дамоў, на канікулы.

Пазней, калі вучылішча выбралася, не менш старанна замкавыя муры разбуралі з дазволу кіраўніцтва тутэйшай



Гальшанскі замак сёння

гаспадаркі. Прама ў двары пабудавалі адзін кароўнік, а побач узводзілі другі – са знакамітай „пальчаткі” XУII стагоддзя. І зараз ферма саўгаса „Гальшанскі” размяшчаецца тут, у чым, несумненна, яе унікальнасць. А пасярод двара разлілася і моцна трымаецца лужына, што няспынна папаўняецца брыдкай жыжай. Можна сабе ўявіць, як хтосьці з экскурсантаў або гасцей, уражаны бескультур'ем, дрымучай цемнатой мясцовага начальства, усё ж дабіваецца, каб яго выслухалі, і спрабуе растлумачыць, давесці: маўляў, гінуць унікальныя помнікі сярэднявечча, гістарычнае асяроддзе вядомых Гальшан, адкуль родам каралева Соф'я Гальшанская – жонка вялікага князя Ягайлы, заснавальніца роду Ягелонаў, і княгіня Юлія – мудрая, мужная жанчына, жонка Вітаўта Вялікага.

Аднак вернемся да гісторыі. Пра першых князёў Гальшанскіх, аб узнікненні самога паселішча Хроніка Быхаўца расказвае наступнае: „А чацвёрты брат вялікага князя Нарымунта Гольшыс (Гольша) перайшоў раку Вілію і знайшоў гару прыгожую паміж гарамі над ракой Вільна, за мілю да ўпадзення яе ў раку Вілію супраць Раканцішак і стварыў горад, і назваў яго сваім імем Гальшаны, і прабыў там нямнога. І адтуль ездзіў на паляванне ў пушчу за дзесяць міль ад таго свайго горада...”

Аднак гэта легенда, а першы ж пісьмовы ўпамін пра Гальшаны – узаконены гісторыкамі метрычны запіс пра іх нараджэнне – прыпадае на канец XIII стагоддзя, 1280 год. Гальшаны – адно са старэйшых на тэрыторыі Беларусі пасяленняў, што пацвярджаюць і знаходкі археолагаў.

Прыгожая гара, якая адразу палюбілася Гольшысу, не была дзікай. Заснавальнік роду князёў Гальшанскіх выбраў пад свой першы замак, як нярэдка здаралася, ужо абжытае, хутчэй за ўсё ўмацаванае гарадзішча. (Археолаг Я. Г. Звяруга вёў тут раскопкі і знайшоў у культурным слоі кераміку ранняга жалезнага стагоддзя і часоў Кіеўскай Русі.) Яно знаходзілася ў двух кіламетрах на поўнач ад сучасных Гальшан ля старажытнай дарогі на Крэва і займала, сапраўды, прыгожую, амаль правільнай акруглай формы гару, што пераважала над адкрытай мясцовасцю, над далінай ракі Карабель. Да нашага часу (гара ўжо паўштучная) захаваўся земляны насып, які робіць па крутых схілах пятлю, а да ўязных варот падымаецца вузкая, падсыпаная камянямі дарога. І зараз яшчэ на вяршыні гары, паўскрай выраўненага невялікага дзяцінца маецца пакрыты векавым дзёрнам ахоўны земляны вал, дзе калісьці стаяў высокі, з дубовых бярвенняў тын. І хоць Гальшанскія вялі свой род ад вялікіх князёў, былі знатнымі і багатымі, іх вядомы на ўсё Вялікае княства Літоўскае радавы замак заставаўся драўляным. Аб гэтым зноў засведчылі раскопкі: на гары не выяўлена ні каменных падмуркаў сцен, ні наогул

значнай колькасці будаўнічага каменю або цэглы. Ды і ўласна першыя мураваныя прыватніцкія замкі-цытадэлі на беларускіх і літоўскіх землях пачалі з'яўляцца толькі ў ХУІ стагоддзі.

Тут, на пустуючым ужо амаль чатыры стагоддзі старажытным узгорку, дзе кожную вясну ажываюць запаведныя травы, у дубовых церамах магутных князёў Гальшанскіх не раз вяршыўся лёс Вялікага княства Літоўскага. Сюды да насцеж расчыненых варот падымаліся са світамі рыцараў паслы-сваты ад самога Ягайлы, ад Вітаўта. І не дзе-небудзь, а менавіта ў старым Гальшанскім замку ў 1440 годзе „вялікія паны" выбралі на вялікакняжацкі прастол трынаццацігадовага каралевіча, будучага караля польскага Казіміра ІУ Ягелончыка, аб чым у Хроніцы Быхаўца гаворыцца: „...І з'ехаліся там (у Гальшанах), паслалі спешна да пана віленскага старосты жэмайційскага Кейзгайла і да Мікалая Неміровіча, і да земскага маршалка Радзівілкі. І ўсё ж паны з'ехаліся ў Гальшаны да князя Юрыя і прынялі аднагалосна рашэнне ўзяць сабе кіраўніком у Вялікае княства каралевіча Казіміра, сына Ягайлы, айчыма літоўскай зямлі (дарэчы, па маці Гальшанскага. – *Л. П.).* І накіравалі паслоў у Польшчу да каралевіча ў Судамір, і адправілі яму пасольства з паноў Кейзгайлы, Міхаіла і Яна..."

Пачынаючы з ХІУ стагоддзя князі Гальшанскія і ў палітыцы і ў кіраванні Вялікім княствам Літоўскім часта адыгрывалі вядучыя ролі. Так, напрыклад, ужо сын Альгімунта – першага гістарычна дакладнага прадстаўніка роду, па імені якога наступныя пакаленні князёў Гальшанскіх звалі сябе Альгімунтавічамі Гальшанскімі, – Іван Гальшанскі з'яўляўся намеснікам Вітаўта ў Кіеве і ў 1401 годзе падпісаў першую ў гісторыі Вялікага княства Віленска-Радомскую унію. Яго сын Сымон, празваны Лютым, быў намеснікам у Вялікім Ноўгарадзе, яшчэ адзін сын, Міхаіл, меў пасаду намесніка зноў-такі ў Кіеве. Апошні таксама служыў ваяводай у Льва Свідрыгайлы, сына Альгерда, што прэтэндаваў на вялікакняжацкі прастол і два гады займаў яго, а ў палітыцы змагаўся за незалежнасць Літвы ад Польшчы. У 1433 годзе Міхаіл цалкам разбіў войска князя Жыгімонта Кейстутавіча і палякаў пад Маладзечнам.

Па жаночай лініі Гальшанскія падняліся да гранічнай вышыні: сястра Сымона, княгіня Юлія, даводзілася трэцяй жонкай Вітаўту, а Соф'я, дачка князя Андрэя Іванавіча, – чацвёртай жонкай Ягайлу (да гэтага шлюбу ён быў бяздзетны), якому нарадзіла двух сыноў: Уладзіслава, што потым стаў венгерскім каралём, і Казіміра, будучага вялікага князя літоўскага і караля польскага. Такім чынам, Соф'я – заснавальніца дынастыі Ягелонаў, вялікіх князёў Вялікага княства Літоўскага, каралёў Польшчы, Венгрыі, Чэхіі.

У 1525 годзе пляменніца апошняга па мужчынскай лініі князя Гальшанскага, віленскага епіскапа Паўла – Алена Юр'еўна Гальшанская стала жонкай Паўла Сапегі, прадстаўніка вядомага магнацкага роду, да якога Гальшаны і перайшлі ў першай палове ХУІ стагоддзя. Праз семдзесят гадоў ашмянскі староста, якога таксама звалі Паўлам Сапегам, перанёс сваю рэзідэнцыю з абжытай Чырвонай гары (так называлася старое замчышча) на сучаснае месца ў даліну ракі Лусты (Жыганкі). Мажліва, пасля чарговага набегу або асады колішні замак быў разбураны ці з прычыны, што ў тыя гістарычныя ўмовы замкі ўжо страчвалі функцыі абарончых збудаванняў, староста вырашыў узвесці ў адкрытай даліне больш раскошную і зручную для жылля новую рэзідэнцыю, каб не туліцца на пятачку старажытнага замчышча. І ўсё ж у канцы ХУІ – пачатку ХУІІ стагоддзя тут вырас не парадны свецкі палац, якія будаваліся ў той час, а замкава-палацавы комплекс – прыватнаўласніцкі замак.

У плане гэта замкнуты (з адзінымі варотамі-тунелем у пярэдняй сцяне) квадрат. Па ўсіх чатырох вуглах – вежы. Мастацкую выразнасць пабудове прыдавалі масіўныя сцены, шасцігранныя вежы і высокі дах. Даўжыня знешніх замкавых сцен дасягала ста метраў, вышыня – дзесяць-дванаццаць метраў. З фасаду будынак нагадваў сабой трохпавярховы палац. Дзве ўцалелыя да нашага часу вежы таксама трохпавярховыя, з вузкімі прарэзамі-амбразурамі (іх роль магла быць і чыста дэкаратыўнай) і вокнамі звычайнага жылога памяшкання. Меліся вежы і ў цэнтры паўночнай і паўднёвай сцен. Ва ўсіх знаходзіліся жылыя і гаспадарчыя памяшканні. Аднак аснова абароны ўжо перамясцілася на земляныя ўмацаванні – магутныя валы і вадзяныя равы, што абкружалі збудаванне. Планава-кампазіцыйнай схемай Гальшанскі замак некалькі падобны на Мірскі і галандскія Бесенштэйн і Клейдаец, што пад Антверпенам. Трэба сказаць, што ў Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай, нярэдка ў вялікіх магнацкіх палацах адчуваўся прыкметны ўплыў галандска-фламандскай архітэктуры – вынік пастаянных, ажыўленых сувязей Польшчы з краінамі Заходняй Еўропы.

Гальшанскія муры, не разлічаныя на працяглую асаду, служылі заслонай для прыбудаваных знутры жылых памяшканняў. Праўда, у ХУІІ стагоддзі гэтае каменнае гняздо князёў з'яўлялася сховішчам не столькі ад варожага войска, колькі ад сваіх суседзяў магнатаў, якія нярэдка вялі сапраўдныя міжусобныя войны, ці ад бунтаваўшых прыгонных і мястэчковай беднаты. Таму Сапегі старанна зачынялі двайныя – знешнія і ўнутраныя – вароты (гнёзды для завалы і сёння бачны ў тунелі), акрамя таго, утрымлівалі гарнізон – дзесяткі верных

слуг з дробнай шляхты і добрую сотню стражнікаў. У параўнаўча невялікім палацы і цяпер уражваюць размерамі сутарэнні, якія двума-трыма ярусамі ідуць углыб. У іх захоўваліся назапашаныя на месяцы правіянт, зброя, боепрыпасы. Тут жа жыла ніжэйшая княжацкая чэлядзь, знаходзіліся казарма, турма і нават падземная канюшня. Парадныя пакоі і палацы выглядалі куды больш прыгожа, чым у ранейшай пабудове, дзе голыя каменныя сцены часта толькі і зацягваліся скурамі.

Яшчэ да нядаўняга часу ў замку захоўвалася каробка жылога памяшкання: гэта былі свецкія пакоі багатага магната, дзе мала што нагадвала пра строгі аскетызм абарончых збудаванняў.

Гісторык і археолаг Міхась Ткачоў гадоў дваццаць назад правёў археалагічнае даследаванне замка. У кнізе „Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XУIII стагоддзя" (Мн., 1978) вучоны піша: „У паўночным куце замка на першым паверсе знаходзілася раскошная парадная зала, крыжавыя скляпенні якой абапіраліся на чатыры стройныя калоны. Уздоўж сцен віселі партрэты прадстаўнікоў роду Сапегаў, жывапісныя палотны і зброя. Вокны, што выходзілі на замкавы двор, мелі вітражы з тоўстага шкла. Каменныя пліткі падлогі гарманіравалі з дарагой мэбляй: крэсламі, мармуровымі столікамі, бронзай падсвечнікаў. Сучаснікі лічылі Гальшанскі замак самым выдатным і прыгожым замкам Беларусі і Літвы".

Упершыню палац Сапегаў у Гальшанах значна пацярпеў, дарэчы, як і многія замкі на тэрыторыі Беларусі, падчас Паўночнай вайны. У 1880 годзе апошні гаспадар яго, Гарбанёў, узарваў уцалелыя вежы і цэглу пусціў на пабудову карчмы. І, як ужо гаварылася, працягвалася разбурэнне ў нашыя дні. Так фактычна загінуў помнік айчыннай гісторыі і архітэктуры, адна з прыгожых пабудоў сярэднявечча.

...Павел Сапега, напэўна, намерваўся ператварыць старыя Гальшаны ў рэзідэнцыю, дастойную свайго знатнага і багатага роду. Таму амаль адначасова з новым замкам у 1618 годзе ў цэнтры мястэчка ўзвёў і касцёл.

Будынак гэты – нібы карабель, што сплыў з высокіх узгоркаў вакол паселішча і замёр на базарнай плошчы ў абкружэнні сціплых домікаў. Высокія, чырвоныя сцены касцёла маюць два ярусы вокнаў: ніжнія – вялікія, верхнія – глядзяць амаль з-пад даху, з паўкруглых ніш-вачніц. Само збудаванне прамавугольнае, шырокае, раздзеленае на тры нефы. Вежаў няма, але затое высока падняты фігурны франтон – галоўнае ўпрыгожанне, якое заканчвае разны ажурны крыж. Сцены аздоблены выступамі-пілястрамі, нішамі, на вокнах фігурныя завяршэнні, вуглы падпіраюць ступеньчатыя контр-



Надмагілле Паўла Сапегі і яго трох жонак

форсы. Велічная пабудова ў стылі позняга барока ўражвае размерамі, прыгажосцю. Сваімі манументальнымі лаканічнымі формамі яна звязана з аголенымі, акруглымі вяршынямі ўзгоркаў, падступаючых да Гальшан.

Унутры касцёла нічога лішняга: вялікая зала як бы падпарадкавана адной мэце – выклікаць адчуванне велічы, грандыёзнасці храма! Алтар захаваў роспіс ХУІІІ стагоддзя, хоць і цьмяных пастэльных таноў. Паўкруглая паглыбленая апсіда шчодра аздоблена пучкамі блакітных мармуровых калон, белымі карнізамі і статуямі святых. На самой жа справе няма ў алтары ні калон, ні скульптур, а ўвесь эфект дасягнуты мастацкімі сродкамі – перспектыўным малюнкам на плоскай, як палатно, сцяне. Безумоўна, такое выканаць мог толькі майстар высокага класа.

У правым нефе пахаваны астанкі Сапегаў. Тут да нядаўняга часу і знаходзілася ўжо памянёная скульптурная надмагільная пліта. Цэментны пастамент прыкрывалі чатыры шэраблакітныя мармуровыя скульптуры ў поўны рост чалавека, створаныя ў пачатку ХУІІІ стагоддзя італьянскім майстрам. Злева – рыцар у даспехах – сам заснавальнік, фундатар

касцёла Павел Сапега. Побач у раскошных сукенках з пышнымі рукавамі, карункавымі манжэтамі і жабо (і ўсё гэта – мармур!), заціснуўшы ў руках невялічкія малітвеннікі-кантычкі, ляжаць тры жонкі князя. Згодна з паданнем, першую і другую ён пахаваў сам, а ўжо яго, старога вяльможу, праводзіла ў апошні шлях трэцяя. Яна намнога перажыла мужа і завяшчала пасля смерці памясціць свой саркафаг у магілу па суседству з Сапегам і паставіць адзіную сямейную надмагільную пліту.

З паўднёвага боку, ад ракі, да касцёла прымыкае невялікі малапрыкметны будынак манастыра, узведзенага таксама ў пачатку ХУІІ стагоддзя, але, відаць, крыху пазней касцёла. У гісторыі гэтага мініяцюрнага кляштара, нібыта схаванага пад гмахам храма, адлюстравалася барацьба на Беларусі каталіцкага духавенства з рэфармацыяй. Новыя ідэі зрабілі ўплыў і на гальшанскіх католікаў, якія ў другой палове ХУІ стагоддзя пайшлі за кальвінісцкім прапаведнікам. Але кароль Жыгімонт II Аўгуст, што некаторы час захоўваў нейтралітэт паміж рэфарматарамі і каталіцкай царквой, у рэшцэ рэшт паддаўся націску апошняй, і не толькі ўвёў для пратэстантаў шэраг абмежаванняў, але ў 1564 годзе згадзіўся на допуск у межы Вялікага княства Літоўскага езуітаў. Ганенні на пратэстантаў яшчэ больш узраслі пры наступным каралі – Жыгімонце III Вазе, выхаванцы езуітаў. Большасць беларускіх магнатаў, арыентуючыся на пазіцыю іх Вялікасці, пачалі адмаўляцца ад рэфарматарскай „ерасі" і выганяць кальвіністаў. Так зрабіў Храптовіч, вярнуўшы Вішнева ў лона каталіцкай царквы, так зрабілі і гальшанскія Сапегі. Каб паскорыць справу, яны запрасілі ў Гальшаны верных ахоўнікаў каталіцызму – манахаў ордэна францысканцаў. (Назва паходзіць ад імя яго заснавальніка – Францыска Асізскага. Арганізаваўся ордэн яшчэ ў 1209 годзе. Адразу яго прадстаўнікі прапаведавалі аскетызм, жылі за кошт жабрацтва, вялі місіянерскую дзейнасць, у прыватнасці на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. Пачынаючы з ХІУ стагоддзя ўзводзілі першыя ў Беларусі і Літве касцёлы, пазней уключыліся ў барацьбу з рэфармацыяй.)

Захаваўся цікавы гістарычны дакумент – запіс размераў гадавога забеспячэння, прызначанага Львом Сапегам сямі запрошаным у Гальшаны манахам-францысканцам. Князь абавязаўся штогод выплачваць ім са сваёй казны шэсць тысяч залатых, акрамя таго, выдаваць на год шэсцьсот кавалкаў воску і дваццаць гарцаў віна. Так што дзякуючы асеўшым тут манахам-францысканцам мясцовыя культавыя ўстановы ўвайшлі ў гісторыю пад афіцыйнай назвай – Гальшанскі комплекс францысканскага касцёла і манастыра.

Хоць ордэн францысканцаў на тэрыторыі Беларусі перастаў



Касцёл францысканцаў у Гальшанах

існаваць у сярэдзіне XIX стагоддзя, але ў Гальшанах манашкі працягвалі жыць да трыццатых гадоў нашага стагоддзя, карыстаючыся невялікімі ўчасткамі зямлі.

Не так даўно школа-інтэрнат выехала з манастыра, і разам з касцёлам ён перададзены Дзяржаўнаму мастацкаму музею БССР. Зараз вядуцца рамонтна-рэстаўрацыйныя работы. У манастырскіх памяшканнях мяркуецца размясціць мастацкае вучылішча, а ў касцёле адкрыць філіял музея.

Яшчэ з часоў князёў Гальшанскіх мястэчка, што стаяла на перакрыжаванні дарог, якія вялі на Ліду і Навагрудак, Валожын і Мінск, Ашмяны і Вільню, славілася сваімі кірмашамі. І наладжваліся яны каля касцёла. Вялікі торг збіраўся вельмі рана і бурліў, гудзеў да вечара. Сюды пыганялі жывёлу, прывозілі лён, пяньку, сукно. У такія дні багаты завоз быў і на ўсіх сямі местачковых млынах, што працавалі на вадзе з мясцовых крыніц. Да позняй ночы гандлявалі піўныя, шынкі, дзе ракой лілося піва, якое гатавалася ў невялікіх півапарнях.

У Гальшанах тады мелася два-тры дзесяткі саматужных майстэрань: рымарная, кузні, хлебапякарні, воўначасальні. Яны амаль цалкам задавальнялі тагачасныя невысокія патрабаванні насельніцтва – перш за ўсё жыхароў навакольных вёсак – у таварах і паслугах. Акрамя таго, як гаварылі, „да самай Вільні" былі вядомыя звязаныя гальшанскімі майстрыхамі рукавіцы, пальчаткі, а яшчэ больш „фасоністыя" кофты.

Былую рыначную плошчу і цяпер вызначаюць старыя гандлёвыя рады з невялікімі, пад адным дахам, крамамі. Гэтая тыповая для мястэчак пабудова XIX стагоддзя (часткова рэканструявана) з'яўляецца помнікам старой грамадзянскай архітэктуры.

Несумненна, веліч і прыгожасць Гальшанам надавалі менавіта колішнія муры. А аб тым, як выглядала радавая забудова, можна пераканацца па фотаздымку 1910 года, што захоўваецца ў Ашмянскім краязнаўчым музеі імя Ф. Багушэвіча. На ім адлюстравана брудная вуліца, у перспектыве якой ніводнага дрэўца, і ўпрытык сцяна да сцяны стаяць шэрыя домікі (паміж імі не больш як па два-тры метры праходы ў глыбіні дворыкаў). Затое амаль у кожным будынку крама або піўны шынок, аб чым аб'яўляюць шыльды з аршыннымі літарамі.

Як гэта нярэдка здаралася ў беларускіх мястэчках з драўлянай забудовай, у 1925 годзе пажар знішчыў амаль усе цэнтральныя вуліцы Гальшан. У трыццатыя гады паселішча аднавілася: былі ўзведзены будынак для гміны, гандлёвыя рады, школа і дзесяткі два ўласных цагляных дамоў. Апошняя вайна амаль не кранула мясціну, і перадваенныя пабудовы з цэглы жоўта-лімоннага колеру (гліну здабывалі непадалёк, пад Трабамі) па-ранейшаму вызначаюць выгляд усяго мураванага цэнтра.

Сучасная жылая забудова доўгіх гальшанскіх вуліц тыповая: за стандартнымі платамі, раздзеленыя садамі, агародамі свабодна стаяць драўляныя дамы-катэджы – вялікія, моцныя, з зашклёнымі верандамі. Перад вуліцай – абавязкова кветнікі. Уздоўж вуліц высаджаны дрэвы-прысады. Акрамя таго, у паселішчы захавалася першапачатковая гістарычная

забудова, у прыватнасці на дзвюх вуліцах, якія перпендыкулярна перасякаюцца і складаюць часткі шляхоў на Ашмяны – Валожын і Баруны – Юрацішкі. У адваротным напрамку вуліцы пачынаюцца як бы ля падножжа ўзгоркаў, што абкружаюць Гальшаны, і сыходзяцца на былой гандлёвай плошчы. На другі бок яе – прырэчныя вуліцы. Яны ідуць яшчэ ніжэй – у даліну ракі Гальшанкі і абрываюцца на зялёным лузе. Там знаходзіцца мост і стары вадзяны млын. Няма пакуль у пасёлку стандартных шматпавярховак, а цягнуцца ўздоўж вуліц фактычна вясковыя, зялёныя, акуратныя сядзібы.

У маляўнічасці колішняму мястэчку, якое захавала своеасаблівы выгляд, не адмовіш. А ў дадатак яшчэ архітэктурныя помнікі, багатая гісторыя некалі ўдзельнага Гальшанскага княства. Так што калі нават і не аднаўляць замак, а толькі закансерваваць уцалелыя дзве вежы і рэшткі сцен ды вынесці з двара ферму, ужо можна акружаную зялёнымі ўзгоркамі, ручаём і сажалкай тэрыторыю замчышча ператварыць у цікавы архітэктурна-гістарычны аб'ект. А як скончыцца рэстаўрацыя францысканскага касцёла і манастыра, то Гальшаны маглі б стаць архітэктурна-гістарычным запаведнікам. Тады б да асноўных помнікаў – трох манументальных сярэдневяковых збудаванняў: замка, касцёла, манастыра – варта было б далучыць яшчэ адзін – царкву другой паловы XIX стагоддзя, так званую „мураўёўку". Дый гандлёвым радам неабходна надаць першапачатковы выгляд, вадзяному млыну з колам таксама. Вось тады можна і паказваць гасцям, экскурсантам старажытную мясціну, што мае дачыненне да многіх важнейшых гістарычных падзей нашага сярэднявечча.

# Любчанская даўніна

Пад Шчорсамі і Любчай даволі шырокі Нёман, ужо набраўшы сілу, становіцца прыкметнай мяжой паміж старажытнай, даўно абжытай Навагрудчынай і малазаселенымі ляснымі, а некалі і балотнымі нізінамі Налібоцкай пушчы. Але рака тут раздзяляе не толькі дзве прыродныя зоны, яна з'яўляецца і этнаграфічным рубяжом. Гаворка жыхароў лясных вёсак і хутароў да гэтага часу адрозніваецца ад гаворкі „занямонцаўлюбчанцаў", тут у дварах ставяць вялікія квадратныя дамы, а ў густанаселеных Лаўрышаве, Гесічах, Купіску, Дзеляцічах уздоўж вуліц цесна туляцца адна да другой вузкія, выцягнутыя ў двары хаткі. Праўда, цяпер тая мяжа ўсё больш размываецца – насельніцтва па абодвух берагах Нёмана змешваецца. Але ў старых вёсках сярод людзей сярэдняга і пажылога ўзросту адрозненні прыкметныя. Напрыклад, жыхар навагрудскага берага, любчанец, скажа пра пушчанскія лясы: „Мне гэта пушча, гэта глуш што турма". Карэнны ж пушчанец, вярнуўшыся з-за Нёмана, зазначыць: „У свой лес, як у цёплы дом, трапіў". А яшчэ можа пасмяяцца дабрадушна, вядома, утрыруючы над тым, як гавораць любчанцы: „Гарол сеў на гарышча, а Гарасім яго ганучай".

Старажытная назва Любча, як і падобная на яе Любань, Любач, Любіж, Любічы, Любейкі, вядома ўжо з Х–ХУ стагоддзяў і паходзіць ад славянскай асновы *люб, любая,* што азначае *любімае, аблюбаванае месца.* Сапраўды, паселішча пачыналася на высокім беразе Нёмана, у маляўнічым кутку, што, напэўна, здаўна быў выбраны для гулянак, шлюбных рытуалаў.

Як бліжэйшае ад Навагрудка, сталіцы Вялікага княства Літоўскага, паселішча на Нёмане прыстань і гандлёвы цэнтр Любча (Любч, Любач), знаная з сярэдзіны XIII стагоддзя. Тады вялікі князь Міндоўг падарыў яе кіеўскаму баярыну Андрэю Васільевічу Кіяну, які ўцёк у Літву ад татарскай навалы. Пры Гедыміне яна стала вялікакняжацкім даменам. А ў 1499 годзе вялікі князь Аляксандр перадаў „двор Любч" свайму сакратару Фёдару Храптовічу. У 1528 годзе ўжо не „двор", а напэўна, мястэчка купляе магнат, ваявода віленскі, потым канцлер

літоўскі Альбрэхт Гаштольд. З другой паловы ХУІ стагоддзя гісторыя Любчы, як і Іўя, Лоска, звязана з імем вядомага магната-кальвініста, прыхільніка антытрынітарыяў (рэфармацкая рэлігійная секта, якая не прымала большую частку царкоўных дагматаў, схаластычную філасофію хрысціянскіх тэолагаў і прызнавала толькі аўтарытэт Біблії), заступніка Сымона Буднага – Яна Кішкі. Ён запрашае сюды арыян – прадстаўнікоў таксама рэфармацкай рэлігійнай секты, адкрывае арыянскую школу, засноўвае друкарню. Друкарня дзейнічала ў першай палове ХУІІ стагоддзя і ўвайшла ў гісторыю беларускага кнігадруку як вельмі інтэнсіўна (па тых часах) працуючае прадпрыемства. Многія выданні Любчанскай друкарні прызначаліся для пратэстанцкіх абшчын і арыянскіх школ, але тут было выпушчана і шмат свецкіх кніг, зборнікаў паэзіі, антычнай літаратуры, прац па гісторыі – цяпер вядома ўжо каля 50 твораў. Дайшлі да нас і імёны друкароў. Пачынаў справу ў Любчы (у 1612 годзе) Пётр Блатус Кміта, выдавец і паэт першай паловы ХУІІ стагоддзя. У 1632 годзе друкарню ўзначаліў яго сын – Ян Блатус. Яго замяніў Ян Ланге.

У Вільні, у бібліятэцы Акадэміі навук Літвы, захоўваюцца дзве кнігі, што выйшлі ў Любчы. На іх тытульных лістах паселішча названа Любечай. Фотакопіі вокладкі і першых старонак „Катэхізіса", выдадзенага ў Любчанскай друкарні, ёсць у краязнаўчым музеі мясцовай школы.

Ян Кішка клапаціўся і пра эканамічнае развіццё Любчы. У 1590 годзе ён дабіўся ў караля Жыгімонта ІІІ Вазы магдэбургскага права, якое прыраўноўвала мястэчка да горада і гарантавала яму некаторую самастойнасць у кіраванні і гандлі. Потым, ужо ў сярэдзіне ХУІІ стагоддзя, Уладзіслаў ІУ пацвердзіў ранейшыя прывілеі, а таксама дазволіў рэгулярна весці там гандаль і наладжваць кірмашы.

У ХУІ–ХУІІ стагоддзях, маючы дадзеныя каралямі правы, Любча становіцца гандлёвым цэнтрам акругі і першым у вярхоўях Нёмана портам, фактычна варотамі ўсяго, да прускіх зямель, судаходства. Вядома, што тутэйшыя купцы валодалі цэлай флатыліяй лодак, здавалі іх у арэнду. Адсюль на парусных стругах і лодках, на баржах (звычайна цягнулі валакам) тавары – у асноўным зерне, якое звозілася ў Любчу з багатых маёнткаў Навагрудчыны, – расходзіліся па ўсяму Прынёманскаму краю. Частку збожжа скуплялі і сплаўлялі па Нёману прыезжыя гандляры (з Гродна, Коўна). У тыя часы нават невялікія рэчкі, па якіх ледзь праходзілі лодкі, выкарыстоўваліся як шляхі зносін і перавозкі тавараў. Ну, а Нёман здаўна быў галоўнай артэрыяй, што звязвала паўночна-заходнія землі Беларусі паміж сабой, з вялікімі гарадамі за яе межамі, а таксама з Балтыйскім морам.

Гандлявалі ў Любчы не толькі збожжам. З правага берага,з пушчы, сюды на кірмашы прывозілі мёд, пушніну – куніц, баброў, выдраў, мядзвежыя і ласіныя скуры. Прадавалася тут і жывёла – каровы, авечкі, ды нямала і рыбы.

З канца ХУІІ стагоддзя Любча разам з часткай прыбярэжнай пушчы і мястэчкам Налібокі перайшла да Радзівілаў. Але войны, а потым і эпідэмія страшнай хваробы прынеслі ёй вялікія страты, ад якіх яна не змагла аправіцца, так і не перарасла ў вялікі горад. У ХУІІІ стагоддзі мястэчка з паднোўленым цагляным замкам на высокім беразе Нёмана стала ўласнасцю графаў Вітгенштэйнаў, а потым – багатага землеўладальніка Фальцфейна. (Між іншым, ён стварыў у 1874 годзе на Херсоншчыне вядомы стэпавы запаведнік „Асканія-Нова".)

У сярэдзіне XIX стагоддзя Любчанскаму порту суджана было зноў ажывіцца. Цяпер па Бярэзіне – правым прытоку Нёмана, па Жоўта-Нёманскім канале, пракладзеным праз пушчу, сюды сплавам пайшоў лес, а таксама прадукцыя Клецішчынска-Налібоцкіх прадпрыемстваў – жалезаліцейнага завода і шклагуты. Любча з'явілася ў асноўным пераваласным пунктам: лес тут не апрацоўвалі, а толькі сартавалі, звязвалі ў вялікія плыты і гналі ўніз па цячэнні ў Гродна, Коўна і нават у Клайпеду. На баржах перавозілі чыгун у выглядзе стандартных па некалькі пудоў чурак-адлівак (адна з іх, згодна з паданнем, раздавіла нават воз і цяпер ляжыць пад Кляцішчамі на ўзбочыне дарогі), а таксама гатовую прадукцыю: плугі, абады для колаў, рознае ліццё. Само мястэчка, куды з'язджаліся сяляне з багатага земляробчага краю, славілася ў той час кірмашамі. У 1910 годзе на Любчанскім торгу пабываў беларускі пісьменнік, сябар Янкі Купалы Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі) і ў сваіх „Лістах з дарогі" – дарожным дзённіку пакінуў змястоўныя звесткі публіцыста. Вось адно з яго назіранняў:

„...На рынку шмат рагатай жывёлы і коней. Жывёла вельмі пекная, найбольш галяндэрскага і швіцкага, хаця і не зусім чыстага заводу... Добра, што Любча мае хоць тую славу, што гадуе добрую скаціну і коней".

Дапытлівы краязнаўца і этнограф дае таксама падрабязнае апісанне адзення прыехаўшых на кірмаш і з гэтай нагоды прыгожа апранутых сялян. Характэрна, што ў пачатку нашага стагоддзя „чыстым", святочным адзеннем тут усё яшчэ былі нацыянальныя касцюмы.

„...Паміж усіх сялян адразу кідаюцца ў вочы шчарсунцы ў нацыянальных сваіх апратках: у мужчын белыя доўгія балахоны, падпяразаныя шырокім тканым або ласіным поясам, і саламяныя шырокія капялюшы сваёй работы. Кабеты ў самадзялковых спадніцах, белыя з вышыўкамі кашулі, гарсеты

паверх, на галаве крамная хустачка, да рагоў якой папрычапляны сваёй работы кутасікі, хустачка гэта ўкруг твару прыстае гладка, але на вярхочку самой галавы падкладаюць паперу, дык выглядае начыпурыўшыся; на шыі паначапляны пацеркі".

Пра Любчанскія кірмашы ведалі за дзесяткі кіламетраў у акрузе. На той час гэта была важная падзея для мястэчка. Торгі наладжваліся, як правіла, на цэнтральнай плошчы, ля царквы. Зразумела, у той дзень працавалі ўсе шынкі, крамы, што знаходзіліся паблізу плошчы.

Любчанская царква, пабудаваная ў сярэдзіне XIX стагоддзя, захавалася. Яна невялікая, з ярка-сінімі купаламі-макаўкамі ў залатых зорках, высокімі крыжамі, абвешанымі ланцужкамі. А, відаць, там, дзе калісьці размяшчаліся гандлёвыя рады, дзе ў разброд ставілі вазы і ў спецыяльна адведзеным месцы гандлявалі жывёлай, дзе збіраўся народ, цяпер разбіты сквер. З аднаго боку плошчы знаходзіцца зараз новы двухпавярховы магазін – гастраном і універмаг, непадалёку – кніжная лаўка. Насупраць – яшчэ некалькі невялікіх магазінаў.

У цэнтры Любчы, як і на ўскраіне, няма шматпавярховых будынкаў, таму і захавалася яе колішняе аблічча. Ад плошчы ідуць ціхія зялёныя вуліцы з драўлянымі дамамі-сядзібамі, з садамі і агародамі. Вуліцы строга прамыя, паралельныя, а тыя, што перасякаюцца, утвараюць правільныя прамавугольнікі кварталаў. Дарэчы, напрамак іх у многім быў вызначаны і, як цяпер гаворыцца, прывязаны да Нёмана яшчэ ў ХУІІ стагоддзі. На малюнку-плане Любчы канца ХУІІ стагоддзя, выкананым мастаком Т. Макоўскім, цэнтральная плошча сваімі формай (прамавугольнік) і памерам адпавядае сучаснай. Дзве старыя вуліцы з боку Навагрудка ад варот-вежаў вялі да Нёмана. Перасякаючы іх, праз усё паселішча ад паўночна-ўсходніх варот да замка, што стаяў на паўднёва-ўсходняй ускраіне, праходзіла галоўная вуліца мястэчка. Цяпер, каб трапіць на гістарычны цэнтр Любчы, трэба ад аўтобуснай станцыі па адной з вузкіх вуліц падняцца на ўзгорак, да замка.

Першая пабудова, бачная тут на фоне цёмных ліп, гэта чатырохпавярховая гранёная вежа, атынкаваная і пабеленая, што стаіць па другі бок глыбокага рова. Яна ўяўляе сабой масіўны куб, які на вышыні другога паверха пераходзіць у васьмівугольную прызму. Зараз перад варотамі насыпаны земляны пераход, а калісьці ў замак можна было трапіць толькі праз пад'ёмны мост. Ажыўляе той змрочны будынак, прызначаны для абароны, шырокі ўязны праём, абкружаны ляпным бардзюрам і дзвюма паўкалонамі. Археолагі ўстанавілі, што вежу закрывала некалі моцная дубовая брама, у



Любча. Брамная вежа

падмурках-сутарэннях месціліся скарбніца і турма. Справа ад уваходу знаходзілася варта – кардыгарда, а на сцяне, павернутай у бок двара, – гадзіннік з боем. Праходзячы праз уязную вежу (дзесяціметровы тунель), і зараз нібы апынаешся ў сівым сярэднявеччы. Над галавой крутыя каменныя скляпенні, па баках – нішы для ліхтароў, байніцы, пад нагамі зліліся ў маставую вялікія булыжнікі.

Вежа, як кажуць спецыялісты, мела чатыры ярусы бою. На кожным паверсе байніцы: на першым – восем, на другім – дванаццаць, і ўжо пад самым дахам – шатровым, васьмігранным – па дзве ў кожнай грані круглыя мушкетныя. Так што галоўная надворная вежа была для ворага непрыступнай.

Мяркуючы па кладцы, гэта гатычна-рэнесанснае збудаванне ўзведзена не раней чым у канцы другой паловы XVI стагоддзя і, напэўна, доўга заставалася адзіным муром у драўляным

замку, пра што сведчыць не толькі прасла, якое прыкладзена да яго, але і другая вонкавая кутняя (паўднёва-ўсходняя) вежа. Апошняя адрозніваецца ад уязной не толькі памерамі — яна квадратная, 8,3х8,3 метра, але і муроўкай (у стылі рэнесансу). Мае тры ярусы бою — тры паверхі. Як і ўязная, стаіць на падмурку вышынёй каля чатырох метраў.

На гербе Любчы, атрыманым мястэчкам у 1644 годзе, адлюстраваны дзве вежы, ад якіх па перыметры квадратнага двара ішлі драўляныя сцены. А згодна з інвентаром замка 1661 года, тут былі пабудаваны яшчэ дзве невялікія вежы і паміж імі палац. Бляшаныя дахі іх упрыгожвалі флюгеры з гербам Радзівілаў. Замак абкружаў злучаны з Нёманам роў (трыццаць метраў шырынёй і да дзесяці глыбінёй), які запаўняўся вадой. Акрамя таго, перашкодай, абаронай служыў сам Нёман і яго высокі, ды яшчэ надсыпаны, умацаваны бераг.

Любчанскі замак, пабудаваны ў асноўным ужо ў ХУІІ стагоддзі, уяўляў сабой тыповы сядзібны комплекс, у чым і меў падабенства з суседнімі Гальшанскім і Мірскім. У 1655 годзе яго аблажылі казакі атамана Івана Залатарэнкі, і ўпершыню замак моцна пацярпеў — былі разбураны радзівілаўскі палац, абвадныя сцены і дзве вежы. У пачатку XIX стагоддзя на палацавым падмурку ўзвялі арыгінальны белакаменны, упрыгожаны гатычнымі вежамі панскі дом (вядомы яго здымак пачатку XX стагоддзя), дзе жылі апошнія гаспадары маёнтка Фальцфейны.



Так выглядае адноўлены Любчанскі замак

У першую сусветную вайну колішні палац над Нёманам зноў разбурылі. Але праз колькі гадоў цэнтральны фліґель аднавілі, праўда, ужо без рамантычных вежаў і зубчастых сцен.

У канцы саракавых гадоў усе пабудовы на замчышчы адышлі школе, якая размяшчалася тут гадоў трыццаць. Залы і пакоі перагарадзілі для класаў, а драўляныя будынкі і ўязную вежу прыстасавалі пад падсобныя памяшканні. Сярод настаўнікаў знайшоўся энтузіяст, апантаны краязнавец – выкладчык гісторыі Мікалай Андрэевіч Вінар, ураджэнец Любчы. Дзякуючы яго старанням верхнія паверхі надваротнай вежы былі адрамантаваны і адведзены пад школьны гістарычна-краязнаўчы музей. Тут, безумоўна, самым каштоўным экспанатам стала сама надваротная вежа.

У Беларусі не шмат знойдзецца памяшканняў – помнікаў XУI стагоддзя, выкарыстаных пад выставачныя пакоі. На Любчанскім замчышчы, перш чым трапіць у музей, трэба з другога паверха суседняй прыбудовы па галерэі (яна некалі завяршала сцяну, якая прымыкала да вежы) прайсці ў вежу і падняцца па крутых вінтавых лесвіцах на яе другі і трэці паверхі. Вузкія пераходы, нізкія праёмы-дзверы, дзе-нідзе голыя муры – векавая цёмна-чырвоная цэгла – усё гэта адразу неяк асабліва ўздзейнічае, настройвае на пэўны лад.

Амаль усе сабраныя ў музеі экспанаты былі знойдзены на замчышчы ў Любчы або ў недалёкіх Шчорсах. Тут маюцца старыя, пазелянелыя ключы і замкі, нязвыклай формы падковы, баявыя сякеры і аблегчаны меч літоўскага воіна, некалькі здабытых Вінарам кніг з пячаткамі-экслібрысамі з вядомай бібліятэкі Храптовічаў. Дарэчы, пасля вызвалення Заходняй Беларусі Мікалай Андрэевіч некалькі разоў сустракаўся з апошнім гаспадаром шчорсаўскага маёнтка Храптовічам-Буцянёвым і, так сказаць, з першай крыніцы атрымаў, запісаў цікавыя падрабязнасці пра выданні, што былі ў бібліятэцы, пра лёс збораў.

Ёсць у музеі і каштоўная калекцыя старых, пачатку XX стагоддзя, фотаздымкаў, дзе адлюстраваны тагачасная Любча, яе замак, а таксама палац у Шчорсах. Экспануецца і яшчэ адна рэч – знойдзены пры пасадцы на замчышчы дрэў бронзавы флюгер з выбітым на ім гербам Любчы.

Школьны музей працягвае існаваць і нават папаўняецца новымі экспанатамі. Але многае ён і страціў, калі пераехаў з замкавай вежы ў сучасны клас з вялікімі вокнамі і плафонамі дзённага святла. Акрамя таго, пакуль вежа выкарыстоўвалася пад музей, яна падтрымлівалася, заставалася абжытай. Цяпер жа там запусценне, і унікальны помнік архітэктуры і гісторыі гіне, разбураецца...

Калі на Любчанскім замчышчы (яго плошча каля гектара) узводзіліся фартыфікацыйныя вежы, сцены, капаліся і заліваліся вадой равы, наўрад ці саджалі тут дрэвы і кусты. Хутчэй наадварот, як і быў паблізу гай або лес, што мог схаваць ад наступаючага ворага, то яго высякалі, каб расшырыць агляд. Відавочна, на Беларусі нават прыватнаўласніцкія замкі-сядзібы пачалі ўпрыгожвацца паркамі не раней як з канца XУIII стагоддзя. Таму і Любчанскі замак, намаляваны вядомым жывапісцам І.Пешкам менавіта ў канцы XУIII стагоддзя, стаіць на зусім голым, пустым нёманскім беразе. А існуючы і па сённяшні дзень на замчышчы парк, напэўна, закладзены толькі ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Ён пачынаецца з колішняга школьнага двара, дзе вакол кветнікаў захаваліся колцы дэкаратыўных кустоў: бэзу, жоўтай акацыі, снежнай ягады. Дрэвы тут у асноўным цвёрдых парод – дубы, ясені, клёны, а таксама ліпы, якія купамі высаджаны вакол абарончых равоў, прамымі алеямі ідуць па беразе Нёмана, апаясваюць пладовы сад.

...Абыходжу даўно знаёмы замкавы двор. Уязная ад надворнай вежы дарога па дыяганалі перасякае пляц, вядзе да жылога памяшкання – непрыкметнага двухпавярховага будынка, што стаіць на месцы колішніх палацаў. Ад дарогі разыходзяцца алеі, сцяжынкі. У запусценні паўднёва-ўсходні вугал парка-двара, дзе знаходзіцца другая, паўразбураная вежа замка. Вакол густыя зараснікі бузіны, алешыны. Цэнтр двара больш-менш дагледжаны: тут разбіты клумбы, захавалася некалькі старых дрэў, у тым ліку лістоўніцы, што, як асобныя калоны, даўно ўліліся ў кампазіцыю замчышча.

Ёсць тут яшчэ адзін сціплы куточак. З паўночнага вонкавага боку школьнага будынка над кручай рачнога берага праходзіць малапрыкметная, зарослая сцяжынка. Адсюль, з высока паднятай пляцоўкі, раптам раскрываецца гарызонт, і становіцца бачна ярка-зялёная прастора занёманскіх лугоў, а за ім – сіняя далячынь Налібоцкай пушчы. Унізе, пад абрывам, – няспынныя хвалі Нёмана, на якіх то абазначыцца паласой магутны струмень, то раптам прабяжыць кола хуткага віру. Стоячы тут, на старажытным замчышчы, дзе за спіной уздымаюцца грозныя сярэдневяковыя вежы, міжволі задаеш сабе пытанне: з якімі ж думкамі з гэтага даўно абжытага ўзгорка глядзелі на Нёман, на бязмежныя прасторы пушчы яго колішнія насельнікі, гаспадары ў XУI, XУII, XУIII стагоддзях? Што яны бачылі ў занёманскіх далях? Няўжо толькі змрочныя небяспечныя нетры, дзе акрамя злоснага звера мог хавацца, рыхтавацца да набегу вораг ці раптам разгарэцца няспынны пажар?.. Не пакідае спадзея, што ім, як і мне, думалася і пра добрае, светлае...

# Пахаваны шэдэўр

Пра Гайцюнішскі дом-крэпасць, які ўцалеў і знаходзіцца ў добрым стане, што для помнікаў архітэктуры на Беларусі рэдкая з'ява, не раз чытаў, бачыў яго на фотаздымках, малюнках, але толькі параўнаўча нядаўна трапіў у самыя Гайцюнішкі – аддалены куток на поўначы Воранаўскага раёна Гродзеншчыны, пры самай граніцы з Літвой.

Так здарылася, што з Беняконяў, невялічкага мястэчка, дабіраўся ў Гайцюнішкі пешшу па старым малавядомым тракце, прытым ужо надвячоркам. Абапал дарогі стаяў лес – змрочны, глухі ельнік, і пяць кіламетраў па невядомых мясцінах расцягнуліся для мяне на значна большую адлегласць. Ішоў з надзеяй, што пераначую, як не раз даводзілася, у каго-небудзь з мясцовых жыхароў, а раніцай разгледжу і дом-крэпасць, і Гайцюнішскую пахавальную капліцу.

І вось між дрэў па правую руку паказалася святло, елкі расступіліся, уздоўж дарогі ўжо стаяў штыкетнік. Ад расчыненых варот па парку вяла асвечаная ліхтарамі алея, у канцы якой віднеўся белы, з шырокім ганкам-парталам, з круглай вежай на вуглу замак. Я пазнаў яго. Аднак першае ўражанне – ці то нейкі прывід, ці можа пакінутая тут, у лесапарку, дэкарацыя, папяровы муляж да гістарычнага фільма. Настолькі нечакана з'явілася і незвычайна выглядала гэтае мініяцюрнае збудаванне. Замак двухпавярховы, невялічкі, але невыпадкова яго называюць домам-крэпасцю: па вуглах – круглыя вежы з байніцамі, што вельмі нагадваюць шахматную фігуру ладдзю, на фасадзе – вежа з брамным уваходам, рэдкія вокны забраны кратамі, высокі дах, завостраныя шлемы-дахі на вежах. Відовішча дзіўнае, а яшчэ ноччу, на чорным фоне неба і дрэў.

Аднак усё тут натуральнае – каменне, старажытны мур, які кваліфікуецца як прыватнаўласніцкі замак і, аказваецца, мае агульныя рысы з вядомымі помнікамі беларускай сярэднявяковай архітэктуры – замкамі ў Нясвіжы і Міры. Але ж калі ў памянёныя гарады пастаянна едуць экскурсанты, турысты, каб палюбавацца велічнымі гмахамі, вучоныя ўдасканальваюць іх



Моц і веліч – Гайцюнішскі дом-крэпасць

гісторыю, вядзецца рэстаўрацыя пабудоў, выдаюцца буклеты і паштоўкі з іх выявамі, то Гайцюнішскі замак, таксама выдатны, каштоўны помнік сярэднявечча, пакуль што застаецца дасціпным, вядомым толькі невялікаму колу даследчыкаў.

Між іншым, цікавая, незвычайная біяграфія гэтага шэдэўра дойлідства вывучана даволі дасканала. Падобныя палацава-замкавыя ансамблі пачалі ўзводзіцца беларускімі магнатамі ў ХУ–ХУІІ стагоддзях. Мода, прыклады браліся галоўным чынам на захадзе і работы вяліся таксама іншаземнымі майстрамі, фартыфікатарамі, якія часцей за ўсё разам з купцамі траплялі ў Коўна, Вільню, Гродна. Відаць, так апынуўся ў межах Вялікага княства Літоўскага і фламандзец, архітэктар Пётр Нонхарт і менавіта ён недзе ў канцы ХУІ – пачатку ХУІІ стагоддзя стаў шэфам усіх абарончых умацаванняў у Вялікім княстве. Ну, а маёнтак Гайцюнішкі, што знаходзіўся параўнаўча недалёка ад Вільні, каралеўскі фартыфікатар мог і купіць, а мог і атрымаць, як падарунак, за нейкія заслугі. Вось тут, можа, калі выйшаў ужо ў адстаўку, Нонхарт і збудаваў з дапамогай земляка і паплечніка інжынера Ван Дадэна асабістую рэзідэнцыю – дом-крэпасць.

У часы шматлікіх войнаў, феадальных міжусобіц узвядзенне замежнымі феадаламі ўласных замкаў было звычайнай

з'явай. Да пачатку XVIII стагоддзя падобных дамоў-крэпасцей на Беларусі налічвалася некалькі дзесяткаў. Напрыклад, прыватнаўласніцкія замкі існавалі ў Любчы, Геранёнах, Радашковічах, Мышы, Радуні, Іказні, Заслаўі, Мядзелі, Высокім, Караліне і ў іншых месцах, але часцей на заходніх ад Мінска землях. І яшчэ адна агульная акалічнасць у лёсе гэтых збудаванняў: большая частка іх панесла першы і самы значны ўрон у гады Паўночнай вайны (1700–1721). Так што да нашых дзён зберагліся адзінкавыя абарончыя збудаванні, і то некаторыя напаўразбураныя ці ў выглядзе руін, а ад іншых засталіся толькі насыпы ды равы, колішнія земляныя ўмацаванні.

Асаблівасць, каштоўнасць Гайцюнішскай крэпасці, як помніка дойлідства, перш за ўсё і заключаецца ў тым, што яна захавалася амаль нязменнай з тых далёкіх часоў. Дарэчы, дом у Гайцюнішках можна зараз лічыць найстарэйшым жылым памяшканнем у Беларусі – узводзіўся ён у 1611–1612 гадах. У самым пачатку XVII стагоддзя!

Пётр Нонхарт пабудаваў свой дом-крэпасць, каб абараняцца не толькі ад варожага войска, але і ад атрадаў суседа ці нават банды разбойнікаў, якія ў любы дзень маглі напасці, аблажыць сядзібу. Інжынер-фартыфікатар добра прадугледзеў у сваім праекце абарончыя моманты, неабходныя ўмацаванні. Ва ўсім аблічча Гайцюнішскага замка, у яго хаця і жылых памяшканнях – сведчанні яўнага прыстасавання да абароны. Ці даводзілася яго гаспадарам вытрымліваць сапраўдныя аблогі, невядома. Адно адзначана: у Паўночную вайну дом пацярпеў, але быў адноўлены.

Кампактнасць, утульнасць пабудове надаюць перш за ўсё аднолькавыя цыліндрычныя вежы ва ўсіх чатырох вуглах (дом прамавугольны ў плане). На першым і другім паверхах у сценах іх прарэзаны глыбокія, з закругленнямі ў версе нішы-байніцы. Фасад замка ўпрыгожвае трохпавярховая вежа-рызаліт, з адзіным на ўсё збудаванне ўваходам. Дарэчы, і таўшчыня сцен, што бачыш адразу, як уваходзіш, значная – паўтара метра. Невялікія вокны-байніцы маюцца таксама і на фасаднай вежы. Так што ў наяўнасці ўсе прыкметы сапраўднай крэпасці.

Першы паверх як бы падсобны. Ён нізкі, з магутнымі скляпеністымі перакрыццямі. У невялікіх памяшканнях яго размяшчаліся кухня, кладоўкі, жыла прыслуга. Тут жа знаходзілася казарма невялікага гарнізона. Панскія пакоі месціліся на другім, больш высокім паверсе, і на трэцім, у вежы-рызаліце. Нават з танцавальнай залы і спалень ёсць праходы ў кутнія вежы да байніц і патайных лесвіц. Таксама і вакол дома, дзе зараз двор і парк, тэрыторыя была спланавана і забудавана як фартыфікацыйны аб'ект. Крэпасць акружалі роў,

каналы з вадой, земляны вал. Цяпер земляныя ўмацаванні ўжо ледзь можна адзначыць.

Сам замак невялікі – 15х34 метры, але падпарадкаваны адзінай логіцы формаў, аб'ёмаў і, на здзіўленне, здаецца завершаным. Архітэктурны дэкор амаль адсутнічае. Сярод падобных прыватнаўласніцкіх збудаванняў ён вылучаецца сваёй суразмернасцю, эканамічнасцю. Большасць жа магнатаў, узводзячы палацы, дэманстравалі размах і шык, часта губляючы меру, густ. Дарэчы, мініяцюрны Гайцюнішскі дом-крэпасць мае аналагі – „радню" толькі ў далёкай Фландрыі, адкуль быў родам яго заснавальнік.

Пётр Нонхарт памёр у 1633 годзе. Пахаваны ён непадалёк ад замка ў сямейнай капліцы, якая таксама з'яўляецца помнікам архітэктуры. Яшчэ ў пяцідзесятых гадах яна была цэлай, зараз засталіся толькі каркасы муроў. Колішняя пабудова вылучалася манументальнасцю – тоўстыя сцены, магутныя контрфорсы. Адначасова кампактная, сціплая і нечым нагадвала сам дом-крэпасць.

Пасля Нонхарта замак перайшоў да навагрудскага ваяводы Юрыя Храптовіча, ад яго – да мастака Шрэтара, які ўпрыгожыў сцены пакояў роспісам. Пазней Гайцюнішкамі валодалі Рымшы, Сакены. Апошні пан жыў тут да 1940 года. Сядзіба была дагледжана, вызначаўся прыгажосцю парк (да нашых дзён засталіся ліпавыя алеі). Пасля вайны першым „пасяленцам" у замку стала школа механізатараў. Тады, як і звычайна пры падобных „гаспадарах", пачаўся заняпад фальварка ды і самога дома. Менавіта пры „трактарыстах" (так тут кажуць) нішчылі, разбуралі знакамітую нонхартаўскую капліцу: старажытная пабудова вялікая, цэгла – ХУІІ стагоддзя! – моцная.

І як не робіш пэўную скідку на той пасляваенны час, але ўсё роўна здзіўляешся. Былі ж тады настаўнікі, інтэлігенцыя, прадстаўнікі ўлады, больш-менш граматныя, адукаваныя людзі ў суседнім мястэчку Беняконі, і як яны дапускалі знішчэнне помніка, ды якога – пахавальнай капліцы ХУІІ стагоддзя, парка, кветнікаў, нарэшце ўсёй прыгажосці старадаўняга фальварка, помніка архітэктуры, культуры! Чым жа яны тлумачылі, апраўдвалі гэты вандалізм?!

Дзікунская даніна часу, і колькі падобных прыкладаў вядома, калі, кажучы словамі Анатоля Франса, – „боги жаждали"...

Але Гайцюнішскаму замку пашанцавала – ад поўнай гібелі яго выратавала, як ні дзіўна, псіхіятрычная бальніца. Так, у пачатку 60-ых гадоў сюды, у глухі куток, пераехала Гродзенская абласная псіхіятрычная бальніца. З гэтага часу будынак рэгулярна рамантавалі, ён заўжды быў нацеплены,

прыбраны. Падтрымлівалі дах, што для старадаўніх пабудоў вельмі важна, і, акрамя таго, унутры ніякага разбурэння сцен не рабілі. Дый нарэшце сама медыцынская адміністрацыя заказала рэстаўрацыйным майстэрням праект сапраўднага, па навуцы адраджэння славутага дома-крэпасці.

Безумоўна, пакоі старога будынка, колішняй крэпасці, мякка кажучы, не вельмі падыходзяць пад бальнічныя палаты. Таму плануецца (ужо адно памяшканне ёсць) узвесці паблізу, у парку, новыя лячэбныя карпусы, перавесці туды хворых, а ў адрэстаўраваным замку пакінуць толькі адміністрацыю, гаспадарчыя службы. Ну, а ў будучым мяркуецца перадаць частку дома пад музей старажытнасцей, інтэрнат для мастакоў, турысцкую гасцініцу. Тады, маем спадзею, схаваны ў лясной глушы, малавядомы шэдэўр айчыннага дойлідства, помнік архітэктуры пачатку XYII стагоддзя стане нарэшце шырокавядомым аб'ектам, асяродкам культурнага жыцця рэспублікі.

# Шчорсаўскі скарб

Гадоў сто таму назад на паштовай станцыі ў Навагрудку не ў навіну было пачуць, як нехта, прыехаўшы з Вільні ці з Варшавы, а тое і зусім іншаземец, наймаў ямшчыка ў прынёманскі маёнтак Шчорсы – вотчыну графаў Храптовічаў. Далёкі госць звычайна аказваўся вучоным панам і дабіраўся туды не на званы абед або паляванне, а папрацаваць у найбагацейшай, сабранай Храптовічамі бібліятэцы.

Пра тое, што Шчорсаўская бібліятэка яшчэ і ў пачатку XX стагоддзя заставалася дастаткова вядомай, цанілася ў культурным свеце Еўропы, сведчыць спецыяльна распрацаванае і выдадзенае ў 1902 годзе правіла карыстання ёю: „Збор Шчорсаўскай бібліятэкі разлічаны для навуковых заняткаў, як рускіх, так і замежных вучоных. Заняткі праводзяцца на месцы ў памяшканні, асабліва для яго прызначаным, зусім не ў самой бібліятэцы. Адначасова адной асобе выдаецца на рукі не больш як дзесяць тамоў друкаваных кніг і чатырох тамоў рукапісаў. Высылка кніг і рукапісаў за межы Шчорсаў робіцца толькі па хадайніцтву вучоных устаноў і рускіх, і замежных".

Вядома, аднавіць больш-менш поўны спіс чытачоў бібліятэкі за стагоддзе (да 1913 года) адкрытага да яе доступу, калі архіў Храптовічаў амаль увесь загінуў, няпроста. Але, напрыклад, агульнавядомы факт, які стаў здабыткам гісторыі, што тут займаліся маладыя Адам Міцкевіч, яго настаўнік, прафесар-гісторык Іаахім Лялевель, віленскі астраном Марцін Пачобут-Адляніцкі, паэты Антон Эдвард Адынец і Уладзіслаў Сыракомля, гісторыкі Мікалай Маліноўскі, Ігнат Даніловіч, Іосіф Ярашэвіч. У 1844 годзе ўладальнік яе Адам Храптовіч даў магчымасць працаваць у Шчорсах бібліятэкарам бліжэйшаму сябру Адама Міцкевіча апальнаму паэту Яну Чачоту. Дарэчы, менавіта тады фалькларыст Чачот завяршае пераклад і выдае на польскай мове два зборнікі беларускіх народных песень – „Песні з-пад Дзвіны" і „Песні з-пад Нёмана". У 1784 годзе, вяртаючыся з Нясвіжа ў Гродна, Шчорсы наведаў апошні польскі кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Заядлы бібліяфіл, ён, несумненна, знаёміўся з бібліятэкай Храптовічаў.

Па тэматыцы калекцыя кніг, рукапісаў і архіўных дакументаў, сабраная ў Шчорсах, вылучалася асаблівай разнастайнасцю. У ёй меўся амаль поўны збор твораў выдадзеных у Еўропе грэчаскіх і рымскіх класікаў, французскіх і італьянскіх аўтараў, літаратура па прыродазнаўству, філасофіі, рыторыцы, філалогіі, рэлігійная, у тым ліку памфлеты эпохі рэфармацыі каталіцкага і пратэстанцкага напрамку. Наогул гэта быў традыцыйны збор для адукаванага арыстакрата, прыхільніка французскіх асветнікаў ХУІІІ стагоддзя.

А яшчэ заснавальнік бібліятэкі Іаахім Літавор Храптовіч – вядомы грамадскі і палітычны дзеяч, чалавек шырокіх інтарэсаў сабраў у Шчорсах (чым і праславіў сваю бібліятэку) каштоўныя выданні па гісторыі, геаграфіі, эканоміцы Польшчы ХУІ–ХУІІІ стагоддзяў. Акрамя таго, тут захоўваліся дзесяткі арыгінальных рукапісаў і дакументаў, а таксама копіі рэдкіх пісьмовых крыніц, што адлюстроўвалі гісторыю Польшчы. Напрыклад, поўная калекцыя польскіх летапісаў ХУІ–ХУІІІ стагоддзяў, збор сеймавых і сеймікавых актаў, два выданні Статута Вялікага княства Літоўскага, у тым ліку Статут Жыгімонта Аўгуста 1551 года, выдадзены на пергаменце, матэрыялы Кракаўскай, Таргавіцкай і Сандамірскай канферэнцый. Меліся і такія унікальныя кнігі, як Геаграфічна-статыстычнае апісанне парафій каралеўства Польскага (24 тамы) з дадаткам карт кожнага прыходу, складзенае каралеўскім географам Пертэсам у 1791 годзе, і яшчэ адзін поўны і, безумоўна, надзвычай рэдкі збор – усе калі-небудь і дзе-небудзь выпушчаныя да канца ХУІІІ стагоддзя геаграфічныя карты Польшчы. Апошніх налічвалася сто папак.

Былі ў Шчорсаўскай бібліятэцы і арыгіналы ці копіі пісьмаў і дзённікаў вядомых гістарычных дзеячаў. Напрыклад, „Дзённік польскага пасольства ў Расіі 1866 года” або так званы „Дзённік Марыі Мнішак”, запісаны яе спадарожнікам Дзем’яноўскім, перапіска Багдана Хмяльніцкага з польскімі гетманамі, пісьмы Станіслава Панятоўскага, а таксама багаты, цікавы сам па сабе архіў Храптовічаў – аднаго са старэйшых беларускіх родаў. Усяго ж арыгінальныя і скапіраваныя архіўныя крыніцы складалі 150 (!) тамоў – каштоўныя матэрыялы па гісторыі Польшчы, Беларусі, Літвы. Таму і не дзіўна, што ў сярэдзіне XIX стагоддзя тут падоўгу працавалі амаль усе шырока знаныя віленскія і варшаўскія гісторыкі. У асобную, мастацкую частку калекцыі ўваходзіла каля сямі тысяч гравюр. Сярод іх былі работы такіх выдатных майстроў, як Бачарэлі, Лампі, Рустам, Адашкевіч. Калі ў 1880 годзе зрабілі пералік Шчорсаўскай бібліятэкі, у кнігазборы аказалася каля 26 тысяч тамоў.

Праўда, каталог бібліятэкі ні разу не публікаваўся, таму

меркаваць, колькі і ў які час было ў Шчорсах кніг, можна толькі прыблізна. У Кракаве, у Ягелонскім універсітэце захоўваецца рукапісны каталог, але далёка няпоўны: у прадмове гаворыцца, што там апісаны толькі польскія выданні і кнігі пра Польшчу. Усяго іх налічвалася 2374 асобнікі, з якіх 1229 на польскай мове, прытым 417 тамоў – ХУI стагоддзя, 774 – ХУII, 523 – ХУIII і 364 тамы – пачатку XIX стагоддзяў. Месца выдання: Кракаў, Варшава, Вена, Парыж, Венецыя, Брунсберг (Германія). 126 кніг друкаваліся ў Вялікім княстве Літоўскім – у Вільні, Супраслі, Гродне і Полацку. Сярод іх – „Флора Літвы" Э. Жыльберта (1781), „Маніфест Богу, Міру і Айчыне" (1699), „Трон Айчыны або прытулак вечнасці" (1727), біблії, царкоўныя хронікі, багаслоўскія кнігі, творы пра розныя цячэнні рэфармацыі, што вялі барацьбу з каталіцызмам, а таксама „Гісторыя рэфармацыі ў Польшчы" Ст. Любянскага (1685), „Гісторыя кальвінізму, яго пачатак і заняпад" Я. Гачкоўскага (1747), „Выступленні на генеральным евангелічным сінодзе ў Турыне" (1595). У каталогу ўпамінаецца шмат гаспадарчай і эканамічнай літаратуры, у тым ліку віленскае выданне „Палітычнай эканоміі" Адама Сміта (1841). Аднак з гэтага няпоўнага пераліку бачна, што Іаахіма Храптовіча, а потым і яго сына – Адама больш за ўсё цікавіла гісторыя. Таму значную частку збору складалі матэрыялы па гісторыі польскіх каралёў, літоўскіх і польскіх князёў, геральдычныя зборнікі, літаратура па магдэбургскаму праву, дакументы, матэрыялы аб руска-польскіх адносінах, палітычныя выступленні.

...На ўсходняй ускраіне вялікага Шчорсаўскага парка (плошчай у дваццаць гектараў) стаіць касцяк трохствольнага векавога дуба, які называецца дубам Міцкевіча. Згодна з паданнем, жывучы ў гэтай мясціне, паэт любіў хадзіць да дрэва-велікана і нібыта менавіта тут у яго з'явілася задума і былі напісаны радкі паэмы „Гражына".

Першы раз Міцкевіч жыў у Шчорсах і працаваў у бібліятэцы ў пачатку восені 1819 года. У пісьме, дасланым сябрам Юзэфу Яжэўскаму і Ануфрыю Петрашкевічу з Навагрудка 2 верасня, ён адзначаў: „Ежы і Нуфру. Злуйцеся, не злуйцеся, а я праз паўгадзіны еду да Верашчакаў, а ад іх другі раз у Шчорсы, часу мала, пішу абодвум адразу". У другім лісце паэт зноў упамінае пра свае заняткі ў бібліятэцы: „Быў у Тугановічах, а цяпер працую ў Шчорсах". Быццам бы і нядоўга Міцкевіч пражыў у тую восень у Шчорсах, але літаратура, магчыма, летапісы і архіўныя дакументы так зацікавілі, захапілі маладога паэта, што сабраны матэрыял, відаць, пазней дапоўнены, расшыраны заняткамі ў Віленскай універсітэцкай бібліятэцы, натхніў яго на стварэнне абедзвюх „літоўскіх аповесцей" – паэм „Гражына" і „Конрад Валенрод". Па першапачатковай



Дуб Міцкевіча ў Шчорсах

задуме „Гражына" павінна была мець падзагаловак „З літоўскай гісторыі", але пазней Міцкевіч дадаў да паэм свае вядомыя „Гістарычныя заўвагі", у якіх прывёў не толькі вельмі поўныя гістарычныя звесткі, але і апісаў вераванні старажыт-

ных насельнікаў Беларусі, расшыфраваў малавядомыя тэрміны, некаторыя словы.

У прадмове да „Конрада Валенрода" Міцкевіч пісаў: „...Літва ўжо ўся ў мінулым, яе гісторыя ўяўляе таму выдатны матэрыял для паэзіі, бо паэт, які праслаўляе падзеі таго часу, павінен сканцэнтраваць сваю ўвагу на гістарычных фактах, на паглыбленым вывучэнні і мастацкім увасабленні, не кіруючыся ніякімі разлікамі, пачуццямі і густамі чытача...". І хоць твор гэты пісаўся на шэсць гадоў пазней „Гражыны", у 1827 годзе, аднак, на думку даследчыкаў, аўтар яго выкарыстаў яшчэ той багаты матэрыял, які пачарпнуў, працуючы ў Шчорсаўскай бібліятэцы. Толькі ў „Заўвагах" да „Гражыны" ён спасылаецца на добры дзесятак кніг гісторыкаў, храністаў, якія пісалі аб старажытнай Літве. Гэта летапісец-манах Іаан Вінтэртурскі, нямецкі пісьменнік Аўгуст Кацябу, Давід Лука, Трэтнер, вядомы польскі гісторык ХУІ стагоддзя Мацей Стрыйкоўскі, Мартын Бельскі, літовец Хрысціян Данілайціс, немец Беккер. Напэўна, з большай часткай прац згаданых аўтараў Міцкевіч знаёміўся ў Шчорсах. Гаворачы ў тых жа „Заўвагах" аб хроніцы Вінцэнта Майнцкага, паэт упамінае збор Храптовічаў. „Аднак у Шчорсаўскай бібліятэцы сярод твораў гданьскіх студэнтаў ёсць рукапіс нейкага Ташке, памечаны 1735 годам, у якім аўтар цытуе хроніку Вінцэнта..."

Героі паэмы „Гражына" – князь Літавор і яго жонка Гражына, хоць твор і названы гістарычнай аповесцю, прыдуманыя, гэта мастацкія, паэтычныя вобразы. Але вось рэдкае, старажытнае імя Літавор Міцкевіч даў свайму навагрудскаму князю хутчэй за ўсё не выпадкова, а ў памяць пра Храптовічаў. Ва ўсякім разе імя тое было ў паэта на слыху пасля прыезду ў Шчорсы, бо яго насіў заснавальнік бібліятэкі.

На асобе апошняга варта спыніцца. Іаахім Літавор Храптовіч (1729–1812) сярод радавітай беларускай знаці выдзяляўся перш за ўсё еўрапейскай вучонасцю – закончыў Віленскую акадэмію, займаўся ва універсітэтах у Германіі, шырынёй поглядаў, прагрэсіўнай грамадскай і гаспадарчай дзейнасцю. У гісторыю ўвайшоў як вядомы дзяржаўны дзеяч, які завяршыў сваю кар'еру пасадай міністра замежных спраў, а напярэдадні раздзела Рэчы Паспалітай быў прызначаны канцлерам Вялікага княства Літоўскага. Акрамя таго, Іаахім Храптовіч стаў адным са стваральнікаў і кіраўнікоў з дня заснавання і да закрыцця (1773–1794) так званай Эдукацыйнай камісіі. Гэта была першая ў Еўропе ўстанова, якая, скарыстаўшы роспуск ордэна езуітаў, ажыццявіла карэнную рэформу школ і універсітэтаў, вызваліла выкладанне многіх дысцыплін ад сярэдневяковай схаластыкі, ад засілля тэалогіі. Акрамя таго, Іаахім Храптовіч нязменна загадваў дэпартаментам акадэміі і школ, кіраваў

каралеўскай групоўкай магнатаў і шляхты Вялікага княства Літоўскага.

Аб адукацыі, прагрэсіўна-ліберальных поглядах гэтага чалавека гаворыць і ажыццёўленая ім ва ўласных маёнтках – Шчорсах і Вішневе адзіная ў сваім родзе рэформа. У 1790 годзе Храптовіч фактычна адмяніў прыгоннае права. Сялян вызвалілі ад працы на пана і ўсіх падаткаў. Адзінае – за карыстанне зямлёй яны мусілі ўносіць вельмі ўмераную плату, фактычна былі пераведзены на арэнду, сталі хоць і не буйнымі, але дастаткова свабоднымі арэндатарамі зямлі ў магната. Акрамя таго, дзейнічала форма самакіравання. Сваю „дваровую" гаспадарку Храптовіч вёў на еўрапейскі манер – рабіў насыпныя дарогі, добра ўзорваў зямлю, закупіў і разводзіў пародзістую галандскую жывёлу, што таксама служыла прыкладам для сялян. Дарэчы, і пры нашчадках Іаахіма Храптовіча рэформа ў маёнтках заставалася ў сіле.

...У 1770 годзе саракагадовы граф паставіў перад сабой мэту:ператварыць сваю вотчыну ва ўзорны маёнтак і на практыцы ажыццявіць гуманна-асветніцкія ідэі. Перш за ўсё ён пачынае ўзводзіць у Шчорсах багаты – у стылі Людовіка ХУІ – палацавы комплекс з загадзя ўлічанымі ў плане памяшканнямі пад бібліятэку і архіў. Будуе школу, царкву. Над праектам палацавага комплексу працавалі выдатныя архітэктары ХУІІІ стагоддзя, на рахунку якіх многія гмахі ў межах Беларусі і Літвы: Якуб Габрыэль, Джузепе Сака і Карла Спампоні. Галоўны, цэнтральны будынак комплексу – белакаменны, грацыёзны палац з круглай залай у цэнтры, з упрыгожаным чатырма пілястрамі, круглымі вокнамі і параднай лесвіцай фасадам – сумяшчаў элементы позняга барока і класіцызму. Дзе-нідзе толькі невысокай цаглянай агароджай ён звязваўся з адыходзячымі ад яго паўкругам дапаможнымі карпусамі: кухняй, майстэрняй, карэтнай, канюшняй, адміністрацыйнымі памяшканнямі і бібліятэкай. Усе гэтыя пабудовы былі ўпісаны ў пейзажны парк, выдзяляліся фонам і формай дрэў, дэкаратыўных кустоў, дагледжанымі газонамі і люстраной гладдзю сажалак. Падчас першай сусветнай вайны, калі непадалёк па Нёмане праходзіў фронт, палац згарэў. Як ён выглядаў, дае ўяўленне вядомы, напісаны ў 60-ых гадах мінулага стагоддзя малюнак Напалеона Орды „Архітэктурны пейзаж", на якім адлюстраваны яшчэ сажалка, частка парку. Існуюць таксама і больш познія матэрыялы, у тым ліку фатаграфіі.

Заўзяты бібліяфіл Іаахім Храптовіч пачаў збіраць уласную бібліятэку, калі вучыўся за мяжой, шмат падарожнічаў. Ён закупляў выданні ў Германіі, Францыі, Італіі. Акрамя таго, яму перайшла кніжная спадчына графа Міхаіла Раецкага і так званыя „зборнікі Браніцкага" – акты і дакументы сеймаў

другой паловы XVIII стагоддзя, палітычныя памфлеты, вершы, перапіскі вядомых палітычных дзеячаў. Старыя заходнееўрапейскія выданні з бібліятэкі кардынала Іосіфа Імперыяла Храптовіч набыў, жывучы ў Рыме. Калі пасля далучэння Галіцыі да Аўстрыі пачалі закрывацца каталіцкія манастыры і распадацца іх бібліятэкі, агенты графа і там паспелі выкупіць каштоўныя кнігі. Пасля таго як быў сасланы ў Расію заснавальнік Варшаўскай публічнай бібліятэкі біскуп Іосіф Залускі, захавальнік фондаў стаў употай прадаваць кнігі. Праз іншыя рукі некаторыя з іх таксама трапілі ў бібліятэку Храптовіча, што да пабудовы памяшкання ў Шчорсах знаходзілася ў Варшаве.

Збор працягвалі папаўняць у асноўным адукаваныя і перадавых поглядаў нашчадкі Іаахіма Храптовіча. Прынамсі, сын яго Адам Храптовіч (1768–1855). Ён вучыўся ў Францыі, займаў пасаду візіцёра школ Віленскай акругі. Нягледзячы на сваё паходжанне са знатнага магнацкага роду, прымаў удзел у паўстанні 1794 года, якое ўзначальваў Тадэвуш Касцюшка. Аматар славеснасці, ліберал, прыхільнік рэвалюцыйна-вызваленчай барацьбы Адам Храптовіч сімпатызаваў філаманам, Адаму Міцкевічу. Лічыцца, што пры ім, прыблізна да 1820 года, бібліятэка ўсё яшчэ працягвала папаўняцца рэдкімі выданнямі і складала больш як дзесяць тысяч тамоў.

Ад Адама Храптовіча Шчорсы перайшлі ў спадчыну да яго сына Міхаіла – вядомага рускага дыпламата, які быў пасланнікам у Неапалі, Бруселі, Лондане. Міхаіл бяздзетным памёр у Парыжы. Згодна са спецыяльным указам ад 1893 года маёнтак і графскі тытул атрымаў сын сястры Адама – Міхаіл Апалінаравіч Буцянёў (Храптовіч-Буцянёў).

Апошнім гаспадаром Шчорсаўскай бібліятэкі стаў граф Канстанцін Апалінаравіч Храптовіч-Буцянёў. Пры ім у пачатку XX стагоддзя кніжны фонд складаў ужо каля пяцідзесяці тысяч тамоў, у тым ліку сем тысяч рукапісаў і рэдкіх антыкварных выданняў. Перад першай сусветнай вайной Канстанцін Храптовіч-Буцянёў вырашыў частку кніг перадаць Кіеўскаму універсітэту, але з некалькі незвычайнай умовай, што было агаворана ў завяшчанні, – вярнуць іх на радзіму, як толькі тут адкрыецца універсітэт.

У Цэнтральным гістарычным архіве БССР знаходзіцца пісьмо, адрасаванае ў канцылярыю Мінскага губернатара: „Паведамляем, што ў маёнтак Шчорсы графа Храптовіча-Буцянёва для прыняцця падоранай ім Кіеўскаму універсітэту бібліятэкі быў камандзіраваны з Кіеўскага універсітэта памочнік бібліятэкара Н. Л. Эрнст, які закончыў прыём бібліятэкі 14–15 жніўня. Рэдкасць бібліятэкі заключаецца ў тым, што ў ёй многа старадаўніх выданняў XVI стагоддзя на лацінскай і

польскай мовах. Спраўнік Арлоў, лістапад 1913 год". Па адных крыніцах, у Кіеў вывезлі каля сямі тысяч тамоў, па другіх – чатыры з палавінай тысячы. У 1927 годзе кіеўскую частку Шчорсаўскай бібліятэкі – яна лічыцца найбольш каштоўнай – перадалі ў Цэнтральную навуковую бібліятэку Акадэміі навук Украінскай ССР. У Вялікую Айчынную вайну апошняя, у тым ліку і збор Храптовічаў, была эвакуіравана ў Уфу. Па даных намесніка дырэктара бібліятэкі Фёдара Захаравіча Шымчанкі, амаль палова шчорсаўскіх кніг і рукапісаў падчас эвакуацыі загінула. Засталіся і захоўваюцца ў Кіеве каля дзвюх з палавай тысяч тамоў і частка архіва Храптовічаў.

Размешчана шчорсаўская калекцыя ў старым, XVIII стагоддзя, будынку акадэміі, адведзеным пад раздзел рэдкіх выданняў і рукапісаў. Трэба сказаць, што кнігі ў добрым стане – разабраны, пранумараваны і расстаўлены на стэлажах прыблізна ў такім жа парадку, у якім размяшчаліся ў Шчорсах, да іх свабодны доступ. Уражвае знешні выгляд старых манускрыптаў у белых пергаментных вокладках, у цёмных скураных пераплётах, ціснёных золатам, з залацістымі абрэзамі, выдатна афармленымі тытульнымі лістамі. Прыкметна, што многія калісьці нанава перапляталіся добрым майстрам, напэўна, спецыяльна запрошаным у Шчорсы,– пазнаецца адзін стыль, манера работы.

Ёсць кнігі-гіганты, літаральна мятровага памеру, і маленькія, што свабодна змяшчаюцца ў далоні, – малітвеннікі-кантычкі. На кожнай – экслібрыс, які ўключае герб Храптовічаў. У большасці гэта так званая свецкая літаратура – мастацкая, прытым не толькі на польскай, але і на грэчаскай, лацінскай, нямецкай мовах. Маюцца выданні па прыродазнаўству, батаніцы, мінералогіі, гісторыі Рэчы Паспалітай, Літвы, багата ілюстраваныя анатамічныя атласы.

Ёсць меркаванне, нібы частка кніг са Шчорсаўскай бібліятэкі трапіла ў Кракаў. Гравюры, у тым ліку работы Бачарэлі, Лампі, Рустама, сустракаюцца ў калекцыі Музея выяўленчага мастацтва імя Пушкіна ў Маскве, частка архіва знаходзіцца ў Ленінградскай публічнай бібліятэцы імя Салтыкова- Шчадрына. Таксама вядома, што каля трох тысяч тамоў заставалася да 1939 года ў Шчорсах, дзе працягваў жыць у бібліятэчным флігелі ўжо стары граф Канстанцін Апалінаравіч Храптовіч-Буцянёў. Лёс іх аказаўся самым трагічным. Па расказах настаўніка з недалёкай Любчы Н. А. Вінера (ён жа стваральнік Любчанскага школьнага гістарычнага музея), у 1939 ці 1940 годзе адзін з прадстаўнікоў Савецкай улады ў Заходняй Беларусі, прыехаўшы ў Шчорсы нацыяналізаваць маёнтак, загадаў ачысціць яго ад кніг і... спаліць – „панскія", ды яшчэ не на рускай мове! Храптовіч намагаўся растлумачыць, што

гэта самая вялікая каштоўнасць у памесці, і прасіў выклікаць кампетэнтную камісію, якая ацэніць кнігі і вывезе ў якую-небудзь бібліятэку. Але ўпаўнаважаны быў няўмольны і ў двары бібліятэчнага флігеля запалаў касцёр. Мяркуюць, тады загінула каля трох тысяч выданняў.

Так, ад некалі вядомага на ўсю вучоную Еўропу шчорсаўскага збору каштоўных кніг, рукапісаў, архіўных дакументаў захаваліся ўсяго толькі некалькі кніг, якія сталі экспанатамі школьнага музея...

Ад колішняга багатага дварцовага комплексу ў Шчорсах на краі парку ўцалелі бібліятэчны павільён (спачатку ў ім размяшчалася школа, зараз частка памяшканняў жылая) і некалькі гаспадарчых пабудоў. Павільён уяўляе сабой двухпавярховы, з балконам-тэрасай, некалькімі заламі і пакоямі даволі-такі вялікі будынак. Па стылі ён калісьці адпавядаў архітэктуры палаца, супраць якога і знаходзіўся. Але пасля шматлікіх рамонтаў, аднаўленняў гэты унікальны помнік сярэдзіны ХУІІІ стагоддзя якія-небудзь архітэктурныя рысы, калі толькі не лічыць вялікіх выцягнутых вокнаў, страціў.

Праўда, у пачатку 1980 года па ініцыятыве кафедры інтэр'ера і абсталявання Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута мастак-рэстаўратар В. П. Панкратаў (гэта была яго дыпломная работа) распрацаваў праект рэстаўрацыі двух пакояў-залаў флігеля.

Літаральна па крупінках збіраліся звесткі – старыя замалёўкі, пісьмы, расказы відавочцаў пра інтэр'ер старой бібліятэкі (ляпніну, насценныя рысункі і нават колер шпалераў). У выніку мастак прадставіў некалькі дзесяткаў лістоў-праектаў унутранай рэстаўрацыі пакояў. Дыплом ён выдатна абараніў, і праўленне мясцовага калгаса, дарэчы, аднаго з лепшых у Навагрудскім раёне – мільянера, спачатку быццам бы зацікавілася аднаўленнем павільёна,ператварэннем яго ў музей, але работы так і не пачаліся...

Застаецца адкрытым і пытанне пра далейшы лёс уцалелай часткі Шчорсаўскай бібліятэкі. Як завяшчаў яе колішні гаспадар граф Храптовіч-Буцянёў, калекцыю належала перадаць універсітэту, які, ён спадзяваўся, усё ж такі будзе адкрыты на яго радзіме. Са старэйшых навучальных устаноў краю на шчорсаўскі збор цяпер могуць прэтэндаваць Віленскі і Беларускі дзяржаўныя універсітэты. Праўда, ёсць сур'ёзнае ўскладненне: вядома некалькі апублікаваных спасылак на завяшчанне, але само яно пакуль што не знойдзена ці наўмысна схавана.

# Варшаўка

Сучасную асфальтаваную шырокую магістраль, якая строга па прамой перасякае Слуцк, упершыню мне ахарактарызаваў колішні начальнік Слуцкага дарожна-будаўнічага ўпраўлення У. А. Усовіч:

– Старэйшая на тэрыторыі Беларусі шасіраваная, з дакладна спланаваным дарожным палатном, абочынамі і кюветамі, дарога. Поўнасцю шаша была адкрыта ў 1851 годзе, прыблізна за паўстагоддзя да з'яўлення аўтамабіля. Так што будавалася яна з разлікам на конны транспарт. Першапачаткова называлася Маскоўска-Варшаўскай і ўяўляла сабой 999 вёрст найпрамейшай, па ацэнках таго часу, першакласнай дарогі з Масквы да Брэст-Літоўска. Сёння гэта ўжо гістарычная шаша, шаша-помнік.

Апошнія словы некалькі здзівілі мяне: паняцце „помнік" сумяшчалася з дарогай чеяк цяжка. Не збіраюцца ж адну з галоўных магістралей рэспублікі кансерваваць, а тым больш рэстаўрыраваць зноў толькі пад конную цягу. І наогул, як гэта помнікам можа быць шлях?

Але з тае пары, калі мелася магчымасць, я ўжо зусім інакш прыглядаўся да магістралі, і пачаў заўважаць, распазнаваць яе асаблівасці, а потым і збіраць звесткі пра вядомую шашу. Безумоўна, Варшаўка, як і па сённяшні дзень называюць дарогу ў мясцінах, дзе яна праходзіць, перш за ўсё – помнік сотням, тысячам безыменных рабочых, якія фактычна ўручную, з дапамогай адзінай прылады – рыдлёўкі, перакапалі мільёны кубаметраў грунту, насыпаўшы, пабудаваўшы за кароткі тэрмін (чатыры гады) тысячу вёрст дарожнага палатна. Несумненна, гэта помнік і інжынерам-дарожнікам. Сучасная расшыраная і асфальтаваная магістраль Масква–Івацэвічы па сённяшні дзень трымаецца першапачатковага кірунку, здзіўляючы і ўражваючы сваёй праматой. Калі зараз пры павышаных хуткасцях на навейшых трасах спецыяльна плануюцца некаторыя адхіленні прамога напрамку, то ў тыя часы пры павольным руху экіпажаў, калясак, санак (нашы продкі ездзілі на конях прыблізна ў семдзесят разоў цішэй, чым мы

на аўтамашынах) прамая дарога была ідэалам, сімвалам кароткага і зручнага шляху. І канешне, Маскоўска-Варшаўская шаша – помнік пакаленням дарожных майстроў, рабочых, якія абслугоўваюць і рамантуюць яе амаль паўтара стагоддзя. Добраўпарадкаваная, яна аб'ядноўвала яшчэ і цэлыя комплексы прыдарожных пабудоў, розныя ўказальнікі, пасадкі-алеі, што таксама планаваліся, знаходзіліся пад пастаянным назіраннем і доглядам.

Так і зараз, калі праязджаеш па былой Варшаўцы, нават не будучы загадзя інфармаваным, заўважаеш белакаменныя, аднапавярховыя дамы старой архітэктуры, што стаяць пры самай дарозе, – у іх строгая сіметрыя класіцызму, элементы готыкі ва ўпрыгожанні. Гэта і ёсць вядомыя, трывала ўвайшоўшыя ў гісторыю і літаратуру паштовыя станцыі, або станцыйныя дамы (там жылі некалі станцыйныя наглядчыкі ці паштовыя камісары). Будаваліся яны на спецыяльна адведзенай дзесяціне зямлі. Строга па праекце ўзводзіліся станцыйны дом і гаспадарчыя пабудовы, сядзіба абавязкова абсаджвалася клёнамі, ліпамі, ясенямі, а на абведзеным канавай участку можна было разбіць сад, завесці агарод. Да нашых дзён за абочынай дарогі месцамі захаваліся тагачасныя прысады – векавыя, у паўтара-два абхваты бярозы, сосны, а каля дома – магутныя клёны, ліпы.

У „Станцыйным наглядчыку" А. С. Пушкіна чытаем: „Праз пяць мінут – званочак!.. і фельд'егер кідае яму на стол сваю падарожную!"... Менавіта так. Праезджы, вандроўнік, перш за ўсё прад'яўляў на станцыі падарожную – дакумент на замену коней. Тут жа, у гасцінічным пакоі, можна было пераначаваць, адпачыць, атрымаць гарачую ваду і перакусіць. У доме знаходзілася кватэра наглядчыка, канторка, дзе афармлялі падарожныя і захоўвалася пошта. Для надта важных гасцей, асабліва на станцыях першага і другога класаў, меліся асобныя пакоі з паркетнай падлогай, у вокнах – вітражы. А за станцыйным домам, па перыметры квадратнага двара, замыкаючы яго, размяшчаліся гаспадарчыя пабудовы: канюшня, свіран, хлеў, навесы для павозак, а таксама ямскія – памяшканні для фурманаў.

Ад шашы двор адгароджвала магутная цагляная сцяна з двума варотамі – уязнымі і выязнымі (каб не губляць час на разварот цяжкіх экіпажаў, карэт, дыліжансаў). З'езды са шляху на двор выбрукоўваліся каменнем, а пасярэдзіне двара абавязкова стаяў калодзеж.

Праязджаючы па Варшаўцы, адкрываеш яшчэ адну заканамернасць: станцыйныя дамы на ёй ідуць дакладна праз 18–19 вёрст – такім быў вызначаны адзін перагон.

Свой пачатак паштовыя станцыі бяруць ад заезджых

двароў і корчмаў, якімі славіліся беларускія дарогі. Але ў адрозненне ад гэтых прыватных установ, як правіла, брудных, запушчаных, недзе з сярэдзіны мінулага стагоддзя станцыі пачалі будаваць толькі па ўзорных праектах, распрацаваных архітэктарамі і інжынерамі ў сталіцы. У залежнасці ад колькасці наяўных коней, што з'яўлялася характэрным паказчыкам, колькасці і памераў памяшканняў, яны дзяліліся на тры разрады.

Унікальнасць, непаўторнасць Варшаўкі як раз у тым, што на ёй захавалася каля дваццаці старадаўніх, сярэдзіны мінулага стагоддзя, паштовых станцый. Большасць з іх трэцяга разраду – гэта параўнаўча невялікія пабудовы, дзе на канюшнях утрымлівалі па 18–20 коней. Галоўнае, цэнтральнае памяшканне – станцыйны дом, абавязкова выцягнуты паралельна да шашы, сіметрычна спланаваны, даўжыня фасаду каля трыццаці метраў. Скразны праход ва ўсе памяшканні станцыі і ў двор раздзяляў яго на роўныя палавіны. Па баках ад уваходу – па два-тры акны. Франтончыкі, пілястры, навес над дзвярыма, які падтрымлівалі літыя чыгунныя кранштэйны, упрыгожвалі галоўны ўваход. Вокны, стральчатыя або закругленыя ўверсе, мелі ўзорыстыя пераплёты рам. Наогул лічылася, што на адной шашы архітэктурныя афармленні фасадаў дамоў трэба рабіць як мага больш разнастайнымі, каб падарожнікі запаміналі іх.

Будаваліся станцыі з адборнай, моцнай цэглы, што ўкладвалася вельмі шчыльна, „пад расшыўку". Надзейная і таўшчыня сцен – ад васьмідзесяці сантыметраў да аднаго метра. Дах з ліставога, складанага сплаву жалеза. З цэглы рабіліся і ямскія, склеп, кладоўка. Астатнія гаспадарчыя пабудовы ўзводзіліся з дрэва – шырокіх пілаваных плах і пакрываліся гонтам.

Маляўнічую, каларытную карціну жыцця, руху на падобнай дарозе-шашы даўней пакінуў сучаснік і сябра А. С. Пушкіна У. А. Салагуб: „Зірніце хоць на праязджаючых, – колькі іх тут! Усё ваенныя ды чыноўнікі, ды недаросткі, ды немцы. Вось імчаць калёсы – буйная маладосць рускіх дарог, вось перавальваецца брычка, як саратаўскі памешчык пасля абеду, вось горда выступае шырокая карэта, як які-небудзь багаты адкупшчык, вось дармез, вось каляска, а за імі тоўсты купец – дыліжанс, выпіўшы чатырнаццаць шклянак чаю на паштовым двары, падае міласць абарванай жабрачцы..."

Свой колішні выгляд варшаўскія паштовыя двары-станцыі захавалі да нашага часу ў рознай ступені. Некаторыя пабудовы сур'ёзна пацярпелі ў вайны, пашкоджаны часам. Акрамя таго, да нядаўняй пары пры аднаўленні, рамонтах памяшканняў не заўсёды клапаціліся аб тым, каб зберагчы іх

першапачатковасць: наўмысна паніжалі столь, па-новаму планавалі пакоі. І ўсё ж, наведаўшы на Варшаўцы некалькі паштовых станцый, пагутарыўшы з дарожнікамі, з тымі, хто і па сённяшні дзень кватаруе там, не цяжка ўявіць, як выглядалі калісьці двор, дом, гаспадарчыя пабудовы, як праходзіла тут служба, ды і наогул жыццё.

Амаль усе старыя станцыйныя дамы на шашы і цяпер у жылым стане. Па традыцыі, можна сказаць, векавой яны перш за ўсе належаць дарожнікам. У Крычаве, Слуцку, Сіняўцы, Мілавідах у іх размяшчаюцца канторы дарожна-будаўнічых упраўленняў, жывуць майстры, рабочыя, у дварах стаіць тэхніка. І зноў жа па традыцыі, шмат дзе, напрыклад у Гадзіловічах, Багушнеўцы, тут і па сённяшні дзень працуюць паштовыя аддзяленні.

У добрым стане станцыя ў Слаўгарадзе – адрамантавана, у вокнах адноўлены вітражы. Кобрынская, што месціцца літарай „П" і хутчэй нагадвае палац (фасад з шырокім парадным уваходам, у крылах па дзесяць вялікіх вокнаў, па вуглах аркі), была некалі першага класа, зараз перададзена мясцоваму прафесійна-тэхнічнаму вучылішчу пад вучэбныя памяшканні.

Заўсёды прыцягвае ўвагу праезджых і турыстаў колішняя станцыя першага класа ў Нехачаве пад Івацэвічамі. Галоўны будынак рэстаўрыраваны пад даўніну, там цяпер рэстаран на некалькі залаў. У памяшканнях вельмі ўтульна – каміны, драўляныя крэслы, дубовыя сталы, стылізаваныя лямпы, маляўнічыя драпіроўкі на сценах. У флігелях дома – гасцініца, лазня, гаражы. „Гасціны двор" – так называецца гэты кэмпінг.



Няхачава. Колішняя паштовая станцыя

Калі будуць адноўлены з улікам гістарычна-архітэктурнай каштоўнасці астатнія станцыі, а многія з іх маюць у гэтым пільную патрэбу, то ў будынках тых мяркуецца адкрыць кафэ, закусачныя, гасцініцы-кэмпінгі, а дзесьці – музей дарожнага будаўніцтва ці гісторыі Маскоўска-Варшаўскай шашы або паштовай справы. Тады падарожжа па Варшаўцы адначасова стане каштоўнай, пазнавальнай вандроўкай у мінулае. Матэрыялаў для прыдарожнага музея тут дастаткова. У Крычаўскім і Слаўгарадскім краязнаўчым музеях, напрыклад, захоўваюцца першыя тэлеграмы-весткі аб здзяйсненні ў Петраградзе Кастрычніцкай рэвалюцыі, атрыманыя тэлеграфістамі паштовых станцый. А пад Мілавідамі ёсць помнікі паўстанцам 1863–1864 гадоў, і вядома, што адзін з атрадаў базіраваўся на мясцовай станцыі. Шмат чаго цікавага тоіць у сябе гэты гістарычны шлях.

У гады станаўлення Савецкай улады, у перадваенны час некаторыя станцыі сталі культурнымі цэнтрамі – ператварыліся ў клубы, хаты-чытальні. А вось у Вялікую Айчынную ў падсобных памяшканнях станцыі ў Сіняўцы гітлераўцы стварылі канцлагер.

Жыхары прыдарожных вёсак, старажылы, якія працавалі на Варшаўцы, захоўваюць паданні, што перадаюцца з пакалення ў пакаленне, аб будаўніцтве шашы, аб смелых, вынаходлівых ямшчыках і першых тэлеграфістах. І дзе ж, як ні на адным з такіх станцыйных двароў можна было б пабачыць амаль забыты ўжо колішні цяглавы транспарт: ад паштовых карэт і дыліжансаў да розных вазкоў, пралётак, калёсаў...

# Трагедыя Антонія Тызенгаўза

...Натоўп чакаў з паўдня. Ён выйшаў з палаца на захадзе сонца – босы, з кіем у руках, што было прызнаннем поўнага разарэння, і пад смех і свіст адных, пад спачувальнымі поглядамі другіх накіраваўся ў манастыр, да езуітаў...

Так, згодна з паданнем, падхопленым гісторыкамі, восенню 1780 года пакідаў Гродна яшчэ нядаўна магутны гродзенскі староста, любімец караля Антоній Тызенгаўз.

Гэта быў чалавек валявы, разумны і ў той жа час натура складаная, супярэчлівая, таму, напэўна, і існуюць далёка неаднолькавыя характарыстыкі яго дзейнасці – дзяржаўнай, гаспадарчай, а таксама асобы.

Беларускі этнограф і публіцыст XIX стагоддзя Адам Кіркор назваў Тызенгаўза геніяльным чалавекам, які апярэдзіў сваё стагоддзе, зрабіў многа дабра і стаў ахвярай зайздрасці, злосці, і, вядома, бяссілля каралеўскай улады. Вучоны канца XIX стагоддзя Еўстафій Арлоўскі характарызаваў дзеянні апошняга, як некалькі бліскучых старонак у „жыццяпісе" Гродна, што не абумовіліся жыццёвымі патрэбнасцямі краіны, а з'явіліся толькі плёнам фантазіі аднаго багатага, энергічнага і вельмі адукаванага чалавека. Аднак тут жа, супярэчачы сабе, заўважыў: „...у кнігі Тызенгаўз ніколі не зазіраў, гаворачы, што яны існуюць толькі для тых, хто не мае ўласнага розуму і павінен жыць розумам, пазычаным у іншых".

Гісторык Мікалай Кастамараў, калі згадваў пра пабудаваныя гродзенскім старостам фабрыкі і пракладзеныя праз дзікія лясы дарогі, адзначаў, што Тызенгаўз, вырабляючы на сваіх мануфактурах толькі прадметы раскошы, забыўся пра інтарэсы сваіх суседзяў і раздражняў іх сваімі паводзінамі, быў чалавекам буйным, самазадаволеным, любіў выпіць...

А пачыналася яго кар'ера бліскуча. Сын шмельцінскага старосты, новаспечаны граф адну за адной атрымоўвае высокія дзяржаўныя пасады: канюшы літоўскі, праз год – падскарбі надворны літоўскі і гродзенскі староста. На каранацыйным сейме сам кароль уручае яму ордэн Святога Станіслава. Новы манарх прызначае Тызенгаўза арэндатарам каралеўскіх

эканомій (сталовых маёнткаў), а таксама ўпраўляючым усіх каралеўскіх мануфактур. Вядома, гэтаму паспрыяла старое сяброўства: будучы кароль Станіслаў Панятоўскі і юны Тызенгаўз пасля нядоўгага знаходжання ў школе віленскіх езуітаў разам выхоўваліся ў Волчыне пры двары князёў Чартарыйскіх, на чыім сцягу, дарэчы, красавалася слова „рэформа". Малады Антоній, як адзначаў біёграф Тызенгаўза І. Гібянскі, у паводзінах быў нязграбны, ведаў толькі польскую і латынь, але вылучаўся розумам, энергіяй і большай сур'ёзнасцю, чым Панятоўскі.

Атрымаўшы пасады, гродзенскі староста з уласцівым яму стараннем акунуўся ў справы. Ён паабяцаў каралю павялічыць у тры разы даходы ад эканомій, зрабіўшы іх узорнымі гаспадаркамі, адрадзіць старыя мануфактуры, узвесці новыя.

Адмовіўшыся ад прыёмаў у знатных асоб і радні, граф дняваў і начаваў у сваёй Гарадніцы (колішняя новая частка горада, дзе ён распачаў нябачнае дасюль будаўніцтва), сустракаўся толькі з немцамі ды французамі – рамеснікамі, майстравымі, якіх сабраў з усяго свету і плаціў за работу вялікія грошы. Арыстакрат старой крыві, граф так напружана працаваў, што спаў усяго тры-чатыры гадзіны ў суткі.

Многія адкрыта зайздросцілі Тызенгаўзу, а пазней знайшліся і такія, хто ў яго дзейнасці і рэформах убачыў нават намер падарваць існуючы ў Рэчы Паспалітай палітычны і грамадскі лад. Але гродзенскі староста не звяртаў увагі на зайздроснікаў, яму верыў кароль, і гэта – галоўнае. У Тызенгаўза наспелі грандыёзныя планы: праз развіццё мануфактур, праз рэформы і новаўводзіны ў сельскай гаспадарцы – перш за ўсё паляпшэнне апрацоўкі зямлі, меліярацыя, будаўніцтва дарог і закупка пародзістай жывёлы за граніцай, а таксама праз адкрыццё розных школ (каб мець сваіх кваліфікаваных майстроў), арганізацыю акадэміі, тэатраў – вывесці з эканамічнага заняпаду і культурнай адсталасці Рэч Паспалітую і галоўнае, як зазначылі сучаснікі, у канец здзічэлыя Беларусь і Літву.

На ўсё патрабаваліся немалыя сродкі, а казна, пра што падскарбі-казначэй добра ведаў, была паўпустая. Таму ён стаў угаворваць караля для ажыццяўлення новых планаў і рэформ узяць у Галандыі пазыку ў дзевяць мільёнаў залатых пад заклад маёнткаў. Зачараваны ідэямі свайго сябра Станіслаў Аўгуст Панятоўскі згадзіўся. Тызенгаўз акрылены: грошы здабыты, цяпер ён пакажа гэтым ганарлівым Чартарыйскім і Мнішкам, ліслівцу Пане Каханку – Радзівілу, на што здольны, і хто не ў прамовах на сейме і ў свецкіх салонах, а практычна, на справе сябра караля, патрыёт!

І гродзенскі староста пачынае будаваць. Старых вуліц яму




Дом Тызенгаўза на вуліцы Э. Ажэшка
(былая Раскоша) у Гродне

не хапае, таму на свабодным месцы адводзіцца пляцоўка амаль у трэць існуючага горада. Новы раён атрымае потым найменне Гарадніца (ад ракі Гараднічанкі, якая перасякала яго). Адразу тут спланавалі адну – даўжынёй у паўтары вярсты, шырынёй у пятнаццаць метраў – прамую вуліцу з гучнай назовай Раскоша (цяпер носіць імя Э. Ажэшкі). Амаль адначасова ўзводзяцца карчма на ўездзе з боку мястэчка Азёры, за ёй, паабапал вуліцы – дваццаць жылых дамоў для запрошаных майстроў з-за мяжы, і далей, набліжаючыся да старога цэнтра горада, – рэстаран, кафэ, гасцініца, дзве кухні, кузня, адміністрацыйныя будынкі, школы, музычны флігель, а каля штучнай сажалкі, адведзенай ад ракі, – шыкоўны палац. І ўсё гэта ўзнікла не стыхійна, а па загадзя распрацаваных кваліфікаванымі архітэктарамі планах.

За пятнаццаць гадоў Тызенгаўз узвёў у Гарадніцы каля 50 будынкаў рознага прызначэння. Акрамя таго, у межах горада і ў недалёкай вёсцы Ласосня выраслі новыя памяшканні пад семнаццаць мануфактур, жыллё для рабочых, магазіны, склады. Як можна меркаваць па знойдзеных у архівах праектах, усяго ў Гродне планавалася каля васьмідзесяці пяці пабудоў. Пры Тызенгаўзе, аб чым сведчылі сучаснікі, з невялікага, бруднага і соннага гарадка, што толькі і ажываў, калі збіраліся сеймы, Гродна ператварылася ў буйны прамысло-

ва-культурны цэнтр, які ў Вялікім княстве ўступаў па значэнні толькі Вільні.

Як казначэй надворны (загадчык дзяржаўнай і каралеўскай уласнасці) Тызенгаўз стаў поўным гаспадаром вялікіх каралеўскіх латыфундый. Адна гродзенская эканомія (самая значная) мела 150 тысяч дзесяцін зямлі і ў яе ўваходзіла 200 вёсак. А яшчэ каралеўскія сталовыя маёнткі знаходзіліся ў Кобрыне, Брэсце, Шаўляі, Алітусе. Усе прыносілі мільённыя даходы, але ў распараджэнне караля трапляла толькі трыста тысяч злотых, астатняе ж асядала ў бяздонных кішэнях шматлікай адміністрацыі, чыноўнікаў, справіцца з якімі было не вельмі проста. Тызенгаўз не сумняваўся, што знойдзе ўцечкі і, акрамя таго, дадуць вынік рэформы, таму па кантракту ўзяў абавязацельства давесці даходы да мільёна пяцісот тысяч злотых у год.

Ён арганізаваў сваё і, як яму здавалася, надзейнае, з новых служачых кіраўніцтва эканоміямі, памяняў арэндатараў, упраўляючых, паслаў на тры гады ў Англію вывучаць аграномію шляхціца Даўнаровіча, купіў у Германіі пародзістых коней, з Англіі завёз авечак, з Галандыі – кароў. Пачаў праводзіць меліярацыю і будаваць сапраўдныя – абкапаныя канавамі з гравійным і каменным пакрыццём – дарогі. Дарэчы, пры Тызенгаўзе і па яго ініцыятыве быў пракладзены амаль стокіламетровы Днепра-Бугскі канал (дзейнічае і цяпер). Аб азначэнні гэтага воднага шляху гаворыць ужо тое, што называлі яго каралеўскім.

Аднак нядоўга староста вытрымліваў замацаванае кантрактам абавязацельства павялічыць прыбыткі. Новая адміністрацыя эканомій, якой ён даверыўся, сам мала ўнікаючы ў справы, у рахункі, абвыкнуўшы, пачала нажывацца не менш старой. Тыя ж, хто быў звольнены і не мог, як раней, „урываць” ад даходаў, станавіліся ворагамі Тызенгаўза. Акрамя таго, будаўніцтва дарог, меліярацыя, закупкі жывёлы за мяжой абышліся яму дорага...

Забавай арыстакрата можа здацца і ўся мануфактурная вытворчасць, праз якую гродзенскі староста намерваўся вывесці дзяржаву, край з эканамічнага тупіка, бо гэта выраб у асноўным прадметаў раскошы. Семнаццаць „мануфактур яго каралеўскай вялікасці”, паўнамоцным адміністратарам якіх фармальна з'яўляўся Тызенгаўз, шмат чаго выпускалі. Прынамсі, шаўковая – шоўк, аксаміт, камізэлькі, жупаны, шаўковыя „літыя” паясы, накшталт слуцкіх, цана якіх даходзіла да пяцісот злотых за штуку; залатая – залаты і срэбраны дрот, галуны (дарэчы, адну з разнавіднасцей апошніх распрацаваў і прапанаваў для вытворчасці сам кароль, пра што абвяшчалася як мага шырэй); суконная – у асноўным ліўрэі

для двара; палатняная – абрусы, муслін, батыст. Меліся таксама мануфактуры панчошная, карункавая, васковая, капялюшная, па вытворчасці пацерак, а яшчэ гарматная, ружэйная, металургічная і інш.

Майстры, кіраўнікі амаль усіх фабрык былі з чужаземцаў, а рабочыя – каля трох тысяч – у большасці набіраліся з мясцовай моладзі. Хоць юнакоў і дзяўчат крыху і вучылі, праца іх лічылася малапрадукцыйнай, вынікі яе амаль не заахвочваліся, а плату нярэдка забіраў гаспадар або яе аддавалі бацькам узятых на работу падлеткаў.

Тызенгаўз рабіў стаўку на вытворчасць галоўным чынам прадметаў раскошы – шоўку, галуноў, карункаў. Тут дзелавы, рэалістычны падыход да справы: пры натуральнай гаспадарцы, калі амаль усё – ад прадуктаў харчавання да адзення, прадметаў хатняга ўжытку і прылад працы – выраблялася ў сядзібах уласнікаў, не гаворачы ўжо пра сялянскія двары, шляхта і магнаты толькі і куплялі тое, у чым адчувалі недахоп, – каштоўныя рэчы. Праўда, усё гэта здаўна набывалася за мяжой, а да свайго адносіліся з недаверам. Але вось з'явіліся тавары тызенгаўзаўскіх фабрык. Іншы раз яны былі не горшыя за імпартныя, аднак амаль удвая даражэйшыя. І ўсё з прычыны непрадукцыйнай працы прыгонных, высокіх затрат на сыравіну, семдзесят працэнтаў якой завозіліся зноў-такі з-за мяжы, і на аплату іншаземным майстрам. Не вытрымліваючы канкурэнцыі з завознымі, тавары накопліваліся, мёртвым грузам ляжалі на складах.

Прапрацаваўшы па тры-чатыры гады, многія з новых каралеўскіх мануфактур, якія не прыносілі прыбытку, пачалі закрывацца. Катастрафічна падаў даход з эканомій, затрымліваліся плацяжы працэнтаў па галандскай пазыцы. Распаўсюджваліся чуткі аб крадзяжах з казны, пра несумленныя здзелкі з замежнымі купцамі, пра неверагодную жорсткасць у абыходжанні з падначаленымі. Спецыяльная скарбавая камісія, правёўшы расследаванне, адхіліла Тызенгаўза ад кіравання фабрыкамі і эканоміямі. Толькі выступленне караля на пасяджэнні сейма выратавала гродзенскага старосту ад суда. На яго Пастаўскае графства – вотчынныя ўладанні – быў накладзены штраф у чатыры мільёны злотых. Тызенгаўз не змог унесці назначаную суму ў тэрмін, і маёнтак канфіскавалі. Тады самы злосны вораг яго – Ржэвускі, жадаючы канчаткова расправіцца з каралеўскім любімчыкам, прынізіць апошняга, аплаціў дзевяць мільёнаў графскага доўгу і атрымаў ва ўзнагароду ўсе яго, акрамя адной – надворнага саветніка, пасады, а таксама кіраўніцтва каралеўскімі эканоміямі і мануфактурамі. (Дарэчы, амаль усе, за малым выключэннем, прыйшлі пры Ржэвускім у поўны заняпад.)

Перабраўшыся ў Варшаву, Тызенгаўз паслаў у сейм пратэст, назваўшы расправу над ім няправільнымі і насільнымі дзеяннямі ворагаў. Але справа была зроблена і ніхто не заступіўся за яго.

Апошнія гады Антоній Тызенгаўз хварэў меланхоліяй, жыў у поўнай адзіноце. Памёр у Варшаве ў 1785 годзе, на пяцьдзесят другім годзе. Пахаваны ў Жалудку, вотчынным маёнтку.

Гаспадарчая дзейнасць колішняга Гродзенскага старосты асаблівых слядоў не пакінула, хаця наогул з'яўлялася прагрэсіўнай, неабходнай – развіццё прамысловай вытворчасці, рэформы ў сельскай гаспадарцы толькі і маглі расхістаць феадальныя ўстоі, што тармазілі эканамічна-культурнае развіццё краю. Аднак засталіся яго пабудовы ў Гродне, Паставах, прадоўжаны былі і графскія пачынанні ў развіцці асветы, навукі, тэатра.

Вось ужо два стагоддзі ў былой Гарадніцы, на вуліцы Э. Ажэшка (колішняй Раскошы) стаяць дамы Тызенгаўза, кожны з якіх і архітэктурны помнік і адначасова нагляднае сведчанне бурнай дзейнасці гродзенскага старосты. Ад вядомай карчмы „Раскоша" – маляўнічай, з шырокімі „крыламі-рукавамі", што ахапілі прасторны двор (знойдзены праект-малюнак), збераглася толькі частка сцен. Яна перабудавана пад склад. Далей, па абодва бакі вуліцы, блізка адзін да аднаго некалі месціліся дваццаць узведзеных адначасова і па адным праекце невялікіх домікаў, якія прызначаліся для замежных рабочых. Аднапавярховыя, але ўсе з мансардамі, акуратныя, утульныя, з атынкаванымі фасадамі, высокім, крытым чарапіцай дахам.



Пастаўскія дамы Тызенгаўза

У горадзе іх называлі „басняцкімі". Відаць, таму, што нейкі час там кватаравалі нанятыя Тызенгаўзам для падтрымання на мануфактурах парадку басякі – кавалерысты.

Яшчэ параўнаўча нядаўна – у шасцідзесятыя гады, на вуліцы Э. Ажэшка захоўваўся амаль цалкам квартал, хоць і старых, але вабіўшых да сябе незвычайнай архітэктурай дзесяць „басняцкіх" дамоў. Цяпер паспяхова рэстаўрыруецца адзін – як помнік архітэктуры ХУІІІ стагоддзя – жылы дом рамесніка. На месцы астатніх узвышаецца „сілуэтная" дзевяціпавярхоўка, якая, па задуме архітэктара, напэўна, прызначана аказваць належнае ўражанне на тых, хто прыязджае ў Гродна. Стаіць сабе гэты сумны шэдэўр сучаснага домабудавання насупраць вакзала...

Праўда, пяць жылых будынкаў, што ўвайшлі ў гісторыю архітэктуры і энцыклапедычныя даведнікі пад назвай „Пастаўскія дамы Тызенгаўза", захаваліся ў Паставах. Узводзіліся яны тут, як і ў Гарадніцы, архітэктарам„яго каралеўскай міласці" Ю. Мёзерам, і ў некаторай ступені дапамагаюць уявіць, як выглядаў „басняцкі" квартал у Гродне.

Будаваліся жылыя дамы хаця і па тыпавых праектах (дарэчы, упершыню прыменены на Беларусі), але з мэтай стварыць адзіны архітэктурны комплекс, таму адначасова яны мелі і адрозненні. Перш за ўсё вылучаліся варыяцыямі форм высокіх, паднятых амаль яшчэ на адзін паверх франтонаўшчытоў. Наогул, будынкі гэтыя невялікія, сціплыя, з маленькімі двума-чатырма вокнамі на фасадзе, з нѐвялікімі дзвярыма, і хіба што падняты фігурны шчыт і адна „пругкая" барэльефная лінія, пушчаная па яго краях, надаюць ім арыгінальнасць. Але пры ўсёй сціпласці – гэта ўсё ж барока, варыянты якога на тэрыторыі Беларусі наогул вызначаліся стрыманасцю ва ўпрыгожваннях. Цікава, што фасады ў „басняцкіх" дамах цагляныя, а астатнія сцены складзены з драўляных брусоў (апошнія ў той час былі танныя).

Наконт гэтага ў Гродне хадзілі такія чуткі. Нібыта прадпрымальны і хітры Тызенгаўз, якому заўсёды не хапала грошай, спачатку, каб хутчэй заманіць патрэбных яму замежных майстроў, паставіў уздоўж Раскошы адны толькі цагляныя фасады. Немчукоў праімчалі з вецярком па новай вуліцы, паказваючы быццам ужо пабудаваныя для іх дамы, а потым наладзілі ў гонар гасцей добры, з выпіўкай абед. Калі ж яны заўважылі падман, граф не разгубіўся і растлумачыў, што, не ведаючы густаў сваіх сяброў, не адважыўся цалкам завяршыць пабудовы і цяпер прапануе ім зрабіць гэта самім. У прыезджых грошай таксама бракавала – не паспелі зарабіць, вось яны і прыстаўлялі да цагляных фасадаў рубленыя сцены...

Гродзенскія і пастаўскія дамы Тызенгаўза былі ўмяшчальныя, мелі па некалькі пакояў і падсобныя памяшканні і ў гісторыю архітэктуры ўвайшлі як адны з першых узораў тыпавых маламетражных дамоў, дзе эканамічна сумяшчаўся розны будаўнічы матэрыял.

Па вуліцы Э. Ажэшка, па правы бок (як ісці да цэнтра горада) на краі старога парка стаіць яшчэ адна пабудова часоў Тызенгаўза – колішняя медыцынская школа, пазней названая акадэміяй. З гэтым вялізным трохпавярховым будынкам звязаны многія асветніцка-культурныя і грамадскія дзеянні гродзенскага старосты. Нягледзячы на неаднаразовыя аднаўленні, дом і зараз адметны сваім маляўнічым сілуэтам, прыгожымі, розных форм вокнамі і дзвюма шасціграннымі вежамі абапал фасада, дзе знаходзіліся „вялікія” аўдыторыі, высокім, з пераломамі дахам. Ад цэнтральнага памяшкання адыходзілі аднапавярховыя крылы. Складанымі аб'ёмамі, дэталямі ўпрыгожванняў, характэрнымі для барока, вылучаліся амаль усе значныя пабудовы, што ўзводзіліся пры Тызенгаўзе.

Лічыцца, што медыцынскую школу, як і большасць дамоў у Гарадніцы, пачынаў будаваць Ю. Мёзер – ён працаваў тут амаль дзесяць гадоў. Прадоўжыў работы, відаць, Джузепе Сака, які ў 1774 годзе прыехаў у Гродна з Вероны. Італія ў той час лічылася заканадаўцам новых архітэктурных стыляў, славілася дойлідамі, якіх запрашалі ў розныя краіны. Таленавітаму італьянскаму майстру ўжо праз год даручылі ўзвядзенне адразу некалькіх будынкаў у Гродне, палацаў у прыгарадзе, розных памяшканняў у каралеўскіх маёнтках. Сака ўдзельнічаў у будаўніцтве Новага замка ў Гродне, Станіслаўскага сядзібнага дома і Аўгустоўскага палаца каля горада, палаца Тызенгаўза. Пазней стварыў праекты для палацаў у Свяцку (пад Гроднам), Брэсце, Шчорсах, Паставах, Камянцы, Беніцы. Уключыўся ў узвядзенне грамадскіх будынкаў, мануфактур, тэатра ў Гарадніцы. Акрамя таго, ён, напэўна, завяршаў, карэкціраваў і некаторыя праекты Ю. Мёзера. Архітэктар з Вероны хутка ўзначаліў усе работы ў Гродне, праславіўся і быў абсыпаны міласцямі не толькі з боку Тызенгаўза, але і караля: атрымаў дваранства, чын маёра і нарэшце званне галоўнага архітэктара Вялікага княства Літоўскага.

У той жа час, і зноў па запрашэнні Тызенгаўза, у Гродне з'явілася яшчэ адна выдатная асоба – французскі натураліст, хірург і анатам, доктар медыцыны Жак Эмануэль Жылібер. Спачатку ён арганізаваў і ўзначаліў ветэрынарную школу. Потым адкрыў пры ёй хірургічнае аддзяленне, школу акушэрак, дзе заняткі вяла вядомая акушэрка з Францыі. За адзінаццаць гадоў працы ў Гродзенскай акадэміі прафесар паспеў

заснаваць батанічны сад, які хутка стаў вядомы ў Еўропе. У ім налічвалася больш як паўтары тысячы рэдкіх раслін. Сучасны Цэнтральны гарадскі парк з векавымі ясенямі, ліпамі, клёнамі – рэшткі колішняга батанічнага саду. Акрамя таго, Жылібер адкрыў музей прыроды, бібліятэку. У Гродне ён выдаў два тамы „Флоры Літвы". Але пасля краху гродзенскага старосты перастала існаваць акадэмія, бібліятэку перавезлі ў Віленскі універсітэт, туды ж пераехаў Жылібер і заснаваў медыцынскі факультэт.

Пры Тызенгаўзе ў Гродне дзейнічалі школы землямераў, будаўнікоў, якімі кіравалі Мёзер і Сака, кадэцкі корпус. Гэтыя навучальныя ўстановы размяшчаліся ў адным месцы, некаторыя ў флігелях медыцынскай школы. Староста меў намер аб'яднаць іх у адзіную Гродзенскую акадэмію.

У былым батанічным садзе знаходзіўся і стары гродзенскі тэатр (зараз тэатр лялек). Памяшканне аднаўлялася ў XIX стагоддзі. Сёння гэта ўзор архітэктуры грамадскіх збудаванняў таго часу: яго прыгажосць дасягнута дзякуючы розным стылям – неабарока і неарэнесанса. І хоць дакументаў не захавалася, але мяркуюць, што гмах той у цэнтры Гарадніцы, побач з іншымі буйнымі адміністрацыйнымі пабудовамі, закладваўся (а магчыма яго і пачалі ўзводзіць) пры Тызенгаўзе. Вядома, што гродзенскі староста нямала прыклаў намаганняў, каб арганізаваць аркестр. Пры ім жа заснаваны драматычная і балетная трупы, літаратурнае таварыства. Так што меламан і прыхільнік мастацтва проста не мог не ўключыць у свае грандыёзныя планы будаўніцтва сапраўднага тэатра.

Калі быў разбураны палац Тызенгаўза (1915 год), які паўкругам агінаў плошчу, яна аказалася як бы раскрытай да дзвюх асобных яго пабудоў, што захаваліся да нашага часу,– так званага музычнага флігеля, або крывой афіцыны, і дома віцэ-адміністратара. Музычны флігель, узведзены некалі адным з першых на плошчы (зноў сведчанне таго, якую роль адводзіў Тызенгаўз культурна-музычнай асвеце), і цяпер з'яўляецца найпрыгажэйшым будынкам у горадзе. Трохпавярховы, масіўны і сапраўды выгнуты – колькі ж няпростых пытанняў патрабавалася вырашыць архітэктарам пры яго будаўніцтве. Аркі, пілястры, міжпавярховыя паясы, мансарда пад высокім фігурным дахам – усё прыдае крывой афіцыне пластычную выразнасць.

На першым і другім паверхах флігеля знаходзіліся зала для публічных канцэртаў і класы балетнай групы, якой кіраваў французскі балетмайстар Ле Ду. Акрамя маладых выканаўцаў і вучняў, набраных з прыгонных, у апошнюю ўваходзілі вядомыя ў свой час танцоўшчыкі – італьянцы браты Патынеці. Падораная потым каралю гродзенская балетная трупа



Помнік Тызенгаўзу у фарным касцёле

разам са слонімскай стала асновай варшаўскага балета, што атрымаў сусветную вядомасць...

Яшчэ адна цікавая пабудова знаходзіцца ў двары крывой афіцыны – колішняя кантора лясной адміністрацыі. (Дарэчы, адно з гаспадарчых дасягненняў Тызенгаўза – ён усё ж змог навесці парадак у лясах каралеўскай эканоміі.) Будынак квадратны, масіўны, падобны на казачны лясны церам, з глыбока ўрэзанымі ў дах мансардамі, з высокімі трубамі. Цяпер гэта жылы дом, які даўно чакае рэстаўрацыі як помнік архітэктуры. Насупраць яго, адарваны ад астатніх пабудоў, стаіць дом віцэ-адміністратара. (Адміністратар і віцэ-адміністратар былі памочнікамі Тызенгаўза ў кіраванні асобнымі эканоміямі.) Ён – адзін з дзесяці тагачасных будынкаў, што захаваліся ў горадзе, цалкам адрэстаўрыраваны і амаль набыў свой першапачатковы выгляд. Двухпавярховы, прамавугольны, не вызначаецца асаблівай выразнасцю, у архітэктуры праглядваюцца рысы ранняга класіцызму.

Палац адміністратара (цяпер корпус медыцынскага інстытута), які замыкаў плошчу, некалькі разоў перарабляўся і страціў сваё колішняе аблічча. Станіслаўскі сядзібны дом на ўскраіне горада – зараз там аўдыторыі сельскагаспадарчага інстытута – добра захаваўся, хораша глядзіцца пасярод парка барочная пабудова, аднак і ёй, безумоўна, патрэбна аднаўленне...

...Ёсць у Гродне яшчэ адзін напамін пра вядомага старосту. У правым нефе старога езуіцкага касцёла пры калоне ў 1910 годзе графіня Пшэздзецкая, як падпісана „Марыя з Тызенгаўзаў”, паставіла сімвалічны помнік свайму продку. Гэта вялікі, з шэра-зялёнага мармуру пастамент, на якім устаноўлена скульптура жанчыны ў смуткуючай позе, з пальмавай галінкай у руцэ. Зверху – вялікі медальён з барэльефам Антонія Тызенгаўза напамінае вядомы скульптурны партрэт Вальтэра: голы чэрап, твар з тонкімі аскетычнымі губамі, што захоўваюць цень усмешкі – твар чалавека валявога, спакойнага, які ведае сабе цану. Пад медальёнам надпіс: Антоній граф Тызенгаўз, староста Гродзенскі, казначэй Вялікага княства Літоўскага. 1733–1785 г.

...Трагедыя Тызенгаўза нібы працягваецца і ў нашы дні – трагедыя яго спадчыны. Часы разбурэнняў, зносу старажытных пабудоў, у тым ліку і дзесяткаў дамоў гродзенскага старосты, будзем спадзявацца, адышлі. Але даўно наспела другая неабходнасць: усе ўцалелыя помнікі архітэктуры, помнікі прагрэсіўнай дзейнасці незвычайнага чалавека, рэфарматара і патрыёта, якім быў Тызенгаўз, неабходна дастойна ацаніць і вывесці з забыцця.

# Генерал касінераў

Купы старых дрэў – ліп, клёнаў, вязаў, што віднеюцца дзе-небудзь на ўскраіне беларускай вёскі, звычайна паказваюць месца былога фальварка. Саміх дамоў захавалася вельмі нямнога, ды і прысады, алеі часцей выубленыя, запушчаныя. І як „традыцыя", у колішніх парках цяпер знаходзяцца калгасныя фермы, майстэрні (двор памешчыка ў часы калектывізацыі абагульняўся перш за ўсё, станавіўся гаспадарчым цэнтрам калгаса), а ад маляўнічых лужкоў, клумбаў тут ужо не засталося і следу. Ва ўсходняй частцы Беларусі памешчыцкія сядзібы знішчаны яшчэ ў трыццатыя гады, у заходняй – звядзенне панскіх „гнёздаў" пачалося пасля вайны. Зразумела, наколькі безгаспадарчай, варварскай была падобная практыка. Загублена шмат карысных, выдатных пабудоў, дзе змаглі б размясціцца школы, бальніцы, клубы, санаторыі. І, вядома ж, сярод тых маёнткаў мелася нямала бясцэнных помнікаў архітэктуры і садова-паркавага мастацтва, што ствараліся стагоддзямі.

Невялікаму фальварку Відзы Лаўчынскія на Браслаўшчыне пашанцавала: прысядзібны дом, частка вялікага парку з каштанавай алеяй, чыстае возера, якое так і называецца Дворнае, захаваліся. (Дарэчы, непадалёку, на беразе, зацененым старымі прысадамі ўцалеў стары „панскі бровар" – спіртзавод, яму ўжо больш як сто гадоў. Зараз выпускае дрожжы.) Сам будынак збярогся, напэўна, таму, што адразу ж пасля вайны ў ім размясціўся дзіцячы дом, потым – мясцовая васьмігодка (тут яна і цяпер). Гаспадары аказаліся дбайнымі – рэгулярна рамантавалі, падтрымлівалі ў жылым стане памяшканні, ахоўвалі, чысцілі, падсаджвалі – а гэта ж цэлая навука – разбіты на маляўнічым крутым беразе пейзажны, або, як яшчэ называюць, англійскі парк.

Фальваркавы дом, узведзены ў канцы ХУІІІ стагоддзя, драўляны, атынкаваны і пабелены, аднапавярховы, выцягнутай формы, па фасадзе – дзесяць высокіх вокнаў. У цэнтр яго нібы ўрэзана трохвугольным невысокім франтонам мансарда, пад ёй – парадны , аформлены чатырма калонамі (таксама

драўляныя, пабеленыя) порцік, амаль абавязковы ў такога тыпу пабудовах канца XУIII – пачатку XIX стагоддзя. Дах – высокі, калісьці быў вальмавы, з пераломам – гэта павялічвала аб'ём будынка, прыдавала яму ўрачыстасць – і пакрываўся, відаць, гонтай, а пазней чарапіцай. Зараз тут змрочна-шэры шыфер. І ўсё ж „азёрны" фасад, арыентаваны на Дворнае возера, якое раскінулася ўнізе пад крутым спускам, больш прыгожы і ўнушальны, чым парадны. На ўхіле ледзь не цалкам праступае каменна-цагляны цокальны паверх, а пасярэдзіне яго – арачная галерэя з чатырма праёмамі. Ад кветнікаў, што цягнуцца па спуску да возера, наверх на балкон-галерэю вядуць дзве бакавыя лесвіцы, складзеныя з магутных гранітных прыступкаў. Унутраная планіроўка дома строга сіметрычная: ад прамавугольнай залы ў цэнтры направа і налева адыходзяць амфілады невялікіх звязаных калідорамі пакояў. Па прынятых характарыстыках, Відзылаўчынская сядзіба ўяўляе сабой прыклад мясцовай інтэрпрэтацыі стылю класіцызму ў архітэктуры фальваркаў.

Пейзажны парк займае плошчу ў пяць гектараў. Прамых алей тут няма, да возера і старога шляху Відзы – Вільня бягуць звілістыя сцяжынкі. Дрэвы пасаджаны групамі – „букет" старых серабрыстых таполяў змяняецца круглай альтанкай са стогадовых ліп, а побач сцяной стаяць елкі. Трапляюцца прасторныя „сонечныя" лужкі з адным магутным дубам або прыгажуном-клёнам пасярэдзіне. Захаваліся і дрэвы рэдкіх відаў: елка калючая блакітная, клёны вастралісты і прырэчны, дубы скальны і чырвоны і інш.

Падобных у значнай ступені ўцалелых фальваркаў, заснаваных і абжытых яшчэ ў XУIII – пачатку XIX стагоддзя, на тэрыторыі Беларусі амаль не засталося. А між іншым, менавіта ў іх жыла дробная і сярэдняя беларуская шляхта – найбольш адукаваная, дзейсная праслойка грамадства, якая, праўда, да пачатку XIX стагоддзя ці не ўся прыняла каталіцкую веру і польскую культуру. Таму Відзы Лаўчынскія ў многім яшчэ натуральны, а таму і асабліва каштоўны ўзор беларускага шляхецкага фальварка, помнік сядзібна-паркавай архітэктуры. Аднак несумненная вартасць гэтага дома ў тым, што тут большую частку жыцця правёў вядомы грамадскі дзеяч-дэмакрат, адзін з кіраўнікоў паўстання 1794 года, бліжэйшы сябар і паплечнік Тадэвуша Касцюшкі Тамаш Ваўжэцкі.

Род яго старадаўні, знаны яшчэ з XУI стагоддзя. Відзы Лаўчынскія ў канцы XУII стагоддзя набыў Аўгуст Ваўжэцкі. З таго часу прадстаўнікі гэтага роду пастаянна займалі розныя адміністрацыйныя пасады ў Браслаўскім павеце. Аляксандр Ваўжэцкі быў паслом ад павета на Вялікім сейме, і тая ж пасада перайшла да яго малодшага, трэцяга сына Тамаша.

Тамаш нарадзіўся ў 1753 годзе, атрымаў добрую адукацыю: вучыўся ў Вільні, а потым, відаць, і за мяжой, аб чым у немалой ступені сведчыць яго прыхільнасць да поглядаў французскіх асветнікаў, уласны дэмакратызм, ды і самы непасрэдны ўдзел у нацыянальна-вызваленчым паўстанні.

Амаль да саракагадовага ўзросту Тамаш Ваўжэцкі, хоць і з'яўляўся ўжо дэпутатам сейма, нічым асабліва не вылучаўся і толькі сярод бліжэйшых сяброў быў вядомы сваёй праматой, сумленнасцю, патрыятызмам, выказваннямі за выхаванне і падтрымку нацыянальнай годнасці як у шляхты, так і ў мяшчан, сялян. Але вось у 1791 годзе адно за адным прагучалі і адразу прыцягнулі да сябе ўвагу ў палітычных колах яго два выступленні на Вялікім сейме 30 сакавіка, калі Ваўжэцкі абгрунтаваў неабходнасць мець гарантыі палітычных правоў такой значнай часткі насельніцтва Рэчы Паспалітай, як мяшчанства (асноўныя жыхары тагачасных мястэчак і гарадоў), і 14 мая, дзе ён горача падтрымаў вядомую Канстытуцыю 3 мая, адну з першых на Еўрапейскім кантыненце, што расшырала правы мяшчан. Згодна з ёю ў склад сейма ўводзіўся 21 гарадскі ўпаўнаважаны з дарадчым голасам і крыху стрымлівалася феадальная анархія – аб'яўлялася прававая і дзяржаўная апека над прыгоннымі сялянамі. Акрамя таго, Канстытуцыя ліквідавала выбарнасць каралёў, адхіляла „ліберум вета" і, адмяніўшы унію, аб'яўляла аб уз'яднанні Вялікага княства і Польшчы ў адзіную дзяржаву – Рэч Паспалітую. У цэлым яна павінна была садзейнічаць палітычнаму і эканамічнаму ўмацаванню Польшчы, у значнай ступені абмяжоўваць самавольства магнатаў.

Прыняў Канстытуцыю так званы чатырохгадовы сейм 1788–1792 гадоў, які праходзіў падчас распачатай у Францыі буржуазнай рэвалюцыі, што аказала несумненны ўплыў на шляхецка-буржуазных прыхільнікаў польскай Канстытуцыі. Да гэтае пары ўжо на працягу дваццаці гадоў згодна першаму раздзелу Рэчы Паспалітай частка польскіх зямель была адлучана і падпарадкавана Расіі, Прусіі і Аўстрыі. Цяпер жа супраць Канстытуцыі 3 мая і „французскай заразы", якая падрывала феадальныя ўстоі, выступілі рэакцыйныя магнаты ў самой Польшчы і ўтварылі Таргавіцкую канфедэрацыю. „Таргавічане" звярнуліся за дапамогай да Кацярыны II, і ў 1892 годзе ўсю тэрыторыю Рэчы Паспалітай занялі войскі інтэрвентаў – Расіі і Прусіі. У 1793 годзе Гродзенскі сейм зацвердзіў другі раздзел Польшчы, у выніку чаго да Расіі адыходзілі амаль уся Беларусь, Літва, Валынь, да Прусіі – Гданьск, Тарунь, Вялікая Польшча.

Групы барацьбітоў за нацыянальнае адраджэнне Польшчы на чале з генералам Тадэвушам Касцюшкам і галоўным

ідэолагам патрыётаў, грамадскім дзеячам, пісьменнікам Гуга Калантаем, што эмігрыравалі ў 1792 годзе, энергічна рыхтаваліся – пакуль за мяжой – да паўстання супраць дзяржаў, якія ажыццявілі другі раздзел Рэчы Паспалітай, і іх войск, што занялі польскія гарады і землі.

24 красавіка 1794 года Касцюшка вярнуўся на радзіму і, прысягнуўшы на вернасць польскаму народу і паўстанню, пачаў ажыццяўляць план, распрацаваны ў эміграцыі. Згодна з ім, у ваяводствах, землях, паветах патрыёты павінны былі ўскладаць на аднаго са сваіх аднадумцаў галоўную місію – сакрэтную вярбоўку людзей у будучае апалчэнне. Завербаваным даручалася збіраць зброю, прадукты. У Браслаўскім павеце і наваколлі тайнай падрыхтоўчай дзейнасцю кіраваў Тамаш Ваўжэцкі. За свой кошт ён узброіў трыста чалавек шляхты, мяшчан і сялян, якія нярэдка прыходзілі да інсургентаў з адзінай зброяй – косамі. З тае прычыны апалчэнцы, што складалі асноўную баявую сілу паўстання, і атрымалі гэтую вобразную, увайшоўшую ў гісторыю назву – касінеры.

Выступленне на Браслаўшчыне ўзначаліў таксама Ваўжэцкі. Яно не мела поспеху: у маі 1794 года сюды былі падцягнуты рускія войскі, і паўстанцаў выгналі з Браслава, а горад спалілі. Ваўжэцкі перайшоў у Курляндыю ўжо з тысячным атрадам, які, рухаючыся ў глыб правінцыі, хутка вырас да васьмітысячнага войска.

Паўстанне ахоплівала ўсё новыя і новыя паветы. Яго кіраўнікі разумелі, што толькі сацыяльныя, дэмакратычныя рэформы і перш за ўсё як не адмена прыгоннага права, то хоць некаторае паслабленне феадальнага прыгнёту прыцягне на бок інсургентаў асноўную масу сялянства. Таму 7 мая Касцюшка выдае свой вядомы Паланецкі універсал (названы так па месцы яго падпісання – у лагеры пад мястэчкам Паланец паблізу Сандамежа (Сандаміра), што на Віслe). У ім, у прыватнасці, гаварылася:

„...Сапраўднае нацыянальнае паўстанне хоча вярнуць Польшчы свабоду, цэласнасць і незалежнасць, даўшы права вырашаць самой, які яна хоча мець урад...

Абвясцім жа, што просты народ карыстаецца заступніцтвам урада краіны, што ўсякі прыгнечаны чалавек можа звярнуцца да Камісіі ўпраўлення свайго ваяводства, і прыгнятальнік, які праследуе абаронца сваёй краіны, будзе пакараны, як вораг і здраднік Айчыны. Я даручаю таму камісіям упраўлення ваяводстваў і зямель па ўсёй краіне выдаць наступнае распараджэнне да ўсіх памешчыкаў, гаспадароў маёнткаў і служачых, якія замяняюць іх:

1. Аб'явіць простаму народу, што згодна з законам ён знаходзіцца пад заступніцтвам урада краіны.

2. Што просты народ атрымае наступныя льготы ў адбыванні паншчыны: той, хто працаваў 5–6 дзён у тыдзень, павінен працаваць на два дні менш, хто працаваў 2–3 або 4 дні ў тыдзень, павінен працаваць на адзін дзень менш...” Далей папярэджвалася, што ўсё гэта даецца селяніну пасля выплаты ім „пазык і падаткаў”.

Амаль следам, 12 мая, Касцюшка звяртаецца да народа з пракламацыяй такога зместу: „Наша вайна – вайна асаблівага характару, якую трэба зразумець. Яе поспех заснаваны, у першую чаргу, на распаўсюджванні энтузіязму і на ўсеагульным узброеным паўстанні ўсіх, хто жыве на нашай зямлі. Акрамя таго, трэба абудзіць любоў да Айчыны ў тых, якія нават не ведаюць, што маюць Айчыну. Выставіць адразу сто тысяч войск цяжка ў нашых умовах, але сабраць трохтысячную масу лёгка, калі гэтага шчыра захочуць памешчыкі і ксяндзы, якім народ дазваляе сабой кіраваць...”

Вядома, і Паланецкі універсал, і ўсе наступныя звароты галоўнакамандуючага кур’еры дастаўлялі Ваўжэцкаму ў кароткі тэрмін, і ён – вопытны партызан, як называлі яго сучаснікі, а потым і гісторыкі, – паспяхова карыстаўся імі пры вярбоўцы соцень касінераў у сваё паўстанцкае войска. Стаў здабыткам гісторыі пераможны рапарт таленавітага кіраўніка інсургентаў, адпраўлены ім 1 ліпеня з Кайдан:

„Наша войска з боку Курляндыі і да Браслаўскага павета нідзе не дае спакою маскалям. Днём і ноччу нашы добраахвотнікі нападаюць. Сабранае з паветаў Ковенскага, Упіцкага, Вількомірскага і Браслаўскага наша войска ўжо налічвае восем тысяч чалавек. Доўга будуць памятаць нас маскалі! Іх пакладзена каля тысячы, нашы страты невялікія...”

Атрад Ваўжэцкага штурмам узяў Лібаву і менш чым праз месяц ужо ўдзельнічаў у бітве з рускімі пад Брэстам...

Паўстанцы захапілі Кракаў, Варшаву, дзе пакаралі некалькі здраднікаў – таргавічан, у руках патрыётаў знаходзіліся Вільня і Гродна. Больш за тры месяцы – да лістапада ім удавалася адбіваць шматлікія атакі прускіх войск і ўтрымліваць Варшаву.

Аднак далёка не „ўвесь народ, што жыў на нашай зямлі”, выступіў супраць расійскіх і прускіх інтэрвентаў. Перш за ўсё значная частка магнатаў дый шляхты не жадала ажыццяўлення Канстытуцыі і Паланецкага універсалу, і сяляне рэальна не пазбавіліся прыгоннай залежнасці, не атрымалі паслаблення паншчыны. Яшчэ больш чым падпарадкаванне Расіі і Прусіі магнатаў-здраднікаў палохалі антыфеадальныя, дэмакратычныя ідэі, якія спрабавалі ажыццявіць паўстанцы. Не на карысць апошнім было і тое, што асноўную сілу інсургентаў

складалі касінеры. Ці ж маглі яны адолець рэгулярную армію праціўнікаў...

Вернемся нарэшце да Тамаша Ваўжэцкага. Існуе думка, хоць прамых сведчанняў і не многа, што ён не толькі цалкам раздзяляў дэмакратычныя, патрыятычныя ідэі Тадэвуша Касцюшкі і безагаворачна яго падтрымліваў, але іх звязвала сардэчнае сяброўства. Магчыма, яны сустракаліся значна раней, яшчэ ў Варшаве, дзе Касцюшка вучыўся ў кадэцкім корпусе, або ў Францыі. Канешне, нейкія прамыя адносіны паміж імі існавалі, а гэта і прывяло да вялікай узаемнай сімпатыі і дружбы. Пра даўнія тайныя сувязі Ваўжэцкага з кіраўніцтвам паўстання і, напэўна, з самім Касцюшкай, сведчыць неабвержны факт: менавіта ён адзін з першых у далёкай ад цэнтраў паўстання – Кракава і Варшавы – правінцыі стаў арганізоўваць і ўзбройваць атрады касінераў, распачаў выступленне.

За паспяховае вядзенне барацьбы з інтэрвентамі ў Курляндыі і Жмудзі і наогул за баявыя заслугі Тадэвуш Касцюшка прысвоіў Тамашу Ваўжэцкаму званне генерал-маёра нацыянальных узброеных сіл Рэчы Паспалітай, а таксама прызначыў камандуючым узброенымі сіламі Жмудскага княства і бліжэйшых да яго паветаў. Акрамя таго, – і гэта было вышэйшай ганаровай узнагародай – асабіста ад сябе падарыў залаты абразок з надпісам: „Абаронцу Айчыны нашай".

Калі інсургенты пацярпелі паражэнне (10 кастрычніка ў баі з войскамі рускага генерала Ферзана), а сам начальнік паўстання атрымаў цяжкае раненне ў нагу і трапіў у палон, праз два дні Вышэйшы нацыянальны савет прызначыў пераемнікам Касцюшкі генерала Ваўжэцкага. Апошні стаў адводзіць разбітае войска да Варшавы, а следам ішла выкліканая з Валыні армія Суворава. 9 лістапада рускі палкаводзец заняў Варшаву, а 18 лістапада пад Раджыцамі атрадам генерала Дзянісава Ваўжэцкі быў узяты ў палон, але – так сведчаць гісторыкі – адмовіў Сувораву падпісаць капітуляцыю...

Як і многіх кіраўнікоў паўстання, Тамаша Ваўжэцкага адправілі ў Пецярбург і заключылі ў Петрапаўлаўскую крэпасць. На следстве, стоячы перад імператрыцай, генерал касінераў смела, у твар сказаў ёй: „Рускія бясчынствавалі. Дамы шляхты разбураны, жывёла забрана, маёмасць вывезена, жыхары аддадзены на дзікія расправы казакам. Забівалі, палілі, змучаныя людзі аддавалі сваю маёмасць. Польшча разрабавана, знішчана так, што няма гэтаму прыкладу ў мінулых вяках і войнах".

Два гады правёў Ваўжэцкі ў астрозе і ўвесь час сумленна, як салдат, пісаў свае ўспаміны, якія назваў „Выпадкі з паўстання на Літве і ў Жмудзі".

Паваротам у лёсах інсургентаў стаў узыход у 1796 годзе на рускі прастол Паўла I, сына Кацярыны II. Па амністыі, аб'яўленай новым імператарам, многіх паўстанцаў вызвалілі. Ваўжэцкі вярнуўся на радзіму, у Відзы Лаўчынскія. Шэсць гадоў ён бязвыезна жыў у сваім маёнтку, і пра нядаўняга героя было амаль не чуваць. Вядома толькі, што ў 1807 годзе колішні баявы генерал вёў барацьбу з бандытамі-рабаўнікамі ў Браслаўскім павеце, а ў 1814-ым арганізаваў (зноў-такі для захавання парадку) народную міліцыю. Падчас жа французскай навалы, не паверыўшы абяцанкам Банапарта дараваць Польшчы такую жаданую народам свабоду, Тамаш Ваўжэцкі выехаў з Відзаў у Пецярбург.

Пасля разгрому Напалеона на Венскім кангрэсе 1814–1815 гадоў нанава падзялілі польскія землі і стварылі так званае Каралеўства Польскае. Каралём яго прызналі рускага імператара. І зноў на палітычнай арэне з'явілася імя генерала Ваўжэцкага, але цяпер ужо як дзяржаўнага чыноўніка вышэйшых рангаў: у новым польскім урадзе ён займаў пасады сенатара, ваяводы, міністра фінансаў (шмат чым здзіўляе нас гісторыя). За службу атрымаў узнагароды: ордэны Белага арла, Святога Станіслава, Аляксандра Неўскага.

У 1816 годзе ва ўзросце шасцідзесяці трох гадоў Тамаш Ваўжэцкі памёр. Прах яго перавезлі з Варшавы на радзіму і пахавалі на ўскраіне Відзаў, у капліцы, што стаяла на развілцы дарог. На гэтым відзаўскі род Ваўжэцкіх абрываецца, бо Тамаш хоць і быў жанаты, але дзяцей не меў.

У першую сусветную вайну – фронт два гады стаяў тут – мястэчка згарэла. Не стала і той капліцы, але магіла Ваўжэцкага яшчэ заставалася. У пяцідзесятыя гады, калі Відзы сталі райцэнтрам, масіўную чыгунную пліту з магілы „польскага генерала", хаця на ёй і значылася, што тут пахаваны прах героя паўстання 1794 года, сябра і пераемніка Тадэвуша Касцюшкі, знялі (не без ведама раённых улад!) і здалі на металалом.

Усяго некалькі гадоў назад па патрабаванні краязнаўцаў помнік выдатнаму земляку аднавілі. Цяпер вялікая прамавугольная пліта чорнага мармуру аказалася на скрыжаванні вуліц, у двары прадуктовага магазіна, і мае вельмі сціплы надпіс: „Тамаш Ваўжэцкі. 1753–1816".

...Менш чым за сто гадоў Рэч Паспалітую, Польшчу тры разы ахоплівалі нацыянальна-вызваленчыя паўстанні, якія ўплывалі на палітыку і Расіі, і ўсёй Еўропы. Кожны раз яны ўспыхвалі не толькі ў Цэнтральнай Польшчы, але і на Беларусі, у Літве. Хто ж кіраваў імі, хто з'яўляўся асноўнай ідэйнай сілай? Найбольш адукаваная частка грамадства – шляхта, у асноўным дробная, сярэдняя і нярэдка – беларуская. Белару-

самі былі Кастусь Каліноўскі, Тадэвуш Касцюшка, са старадаўняга беларускага шляхецкага роду паходзіў, вядома, і Тамаш Ваўжэцкі.

Многія прадстаўнікі шляхты, што насяляла Беларусь, лічылі сябе палякамі, бо ўспрынялі (часта некалькі пакаленняў назад) каталіцызм, польскую мову, культуру. Аднак „тутэйшыя палякі” добра валодалі і „простай” беларускай мовай, мовай асноўнага насельніцтва. Так што па прыродзе, па крыві такі беларуска-польскі шляхціц – іншая справа, прызнаваў ён гэта ці не – быў, заставаўся беларусам.

# Фальварак Люцінка

Эпісталярная спадчына Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча невялікая: адшуканы і дайшлі да нас, на жаль, лічаныя пісьмы славутага „дудара беларускага", хоць па натуры ён быў чалавекам кампанейскім, дзейным, сябраваў з многімі сучаснікамі. У ліку сямі вядомых лістоў адно кароценькае пасланне (трэба думаць, з багатай перапіскі) да жыўшага тады ў Вільні свайго блізкага сябра, беларускага этнографа, археолага, публіцыста і выдаўца Адама Кіркора:

„Высакародны пане Адаме! У сувязі са справамі з'явілася пільная патрэба бачыцца з Загорскім, а паколькі я хворы, то папрасі яго, каб на святы прыехаў да мяне ў Люцінку...Гэта ж не вельмі далёка – праз Лебедзева, Хажова, Ізабелін да Гарадка, а адтуль дарогай у Люцінку Марцінкевіча...

Любі любячага цябе Навума, 23 сакавіка 1862 года, Люцінка".

...Люцінка Марцінкевіча! Так, адзін з пачынальнікаў, класікаў беларускай літаратуры Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч на поўным праве мог называць свой невялікі фальварак пад Пяршаямі.

Выйшаўшы ў 1840 годзе ў адстаўку, чыноўнік мінскай крымінальнай палаты, калежскі рэгістратар Вікенцій Марцінкевіч неўзабаве набывае разам з адзінаццаццю валокамі зямлі хутар. І ўжо ў Люцінцы, амаль у саракагадовым узросце, ён усур'ёз пачынае займацца літаратурнай творчасцю. Піша не толькі па-польску, як многія беларускія літаратары таго часу, а, па словах Купалы, „паслухаўшы сэрца, бярэ дуду беларускую ў рукі".

Марцінкевіч складае лірычныя вершы, пасвячэнні, лібрэта шматлікіх музычных вадэвіляў і першай беларускай оперы „Сялянка" („Сельская ідылія"), у Мінску і Вільні выдае вершаваныя аповесці, гістарычныя паэмы. І ўсё гэта на працягу сарака чатырох гадоў да апошніх дзён жыцця пісьменнік выношваў, ствараў у Люцінцы.

Некаторыя творы Дуніна-Марцінкевіча так і вядомы з дакладным указаннем месца і часу іх напісання. Напрыклад,

жартоўная п'еса („смяхотная штука ў трох дзеях") „Залёты" суправаджаецца заўвагай: „Напісана ў Люцінцы 8-га снежня 1870 года". Назва гэтая ўвайшла ў выдадзенае ў 1857 годзе ў Вільні „гістарычнае апавяданне ў чатырох абразках" – „Люцінка, альбо Шведы на Літве". Дакладны адрас пастаўлены і на жартоўнай, напісанай на польскай і беларускай мовах паэме „З-над Іслачы, або Лекі на сон": апавяданне Навума Прыгаворкі ў 2 частках, Люцінка, 1868 год. Твор не публікаваўся, рукапіс яго знойдзены пісьменнікам і літаратуразнаўцам Адамам Мальдзісам у 1964 годзе ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве.

У Мінску ў колішняга чыноўніка Дуніна-Марцінкевіча мелася кватэра. Наўрад ці ўласны дом – хутчэй за ўсё ў нейкага здымаў. З гэтым горадам звязаны трынаццаць гадоў працы будучага пісьменніка ў кансісторыі перакладчыкам дакументаў з польскай мовы на рускую, а таксама чыноўнікам крымінальнай палаты. У Мінскай гімназіі і ў вядомым прыватным пансіёне Мантэграндзі вучыліся дзеці Дуніна-Марцінкевіча. Так што „асваенне" Люцінкі пачалося, пэўна, з заездаў сюды з усёй сям'ёй на летнія канікулы.

Люцінка (называлі яшчэ і Малая Люцінка) з'яўлялася тыповым фальваркам небагатага шляхціца. Куток на дзіва маляўнічы, утульны. Сярод пагоркавых палёў, у баку ад людных дарог, за сем вёрст ад бліжэйшага мястэчка Пяршаі, „на пагурку", акаймаваным рачулкай з тым жа напеўным дзявочым імем Люцінка, стаяла небагатая, „пад абымшэлай страхой", але даволі прасторная „хаціна", як неаднаразова будзе называць свой дом пісьменнік. І ці не галоўным упрыгожаннем таго прыкметнага пагорка-сопкі былі ліпы, клёны ў старых прысадах, ніцыя вербы над крыніцай, купы бэзу ў кветніках.

Цудоўныя, задушэўныя радкі гэтай мясціне прысвяціў Ядвігін Ш., які васьмігадовым хлапчуком правёў тут, у „прыватнай школцы" дачок Марцінкевіча (перад паступленнем у Мінскую гімназію) адзін год. У сваіх „Лістах з дарогі" ён зазначае: „З Люцінкі пацягнуўся я пуцявінамі на Пяршаі. Як малюнкі, то на ўзгорку, то пры лясочку панасаджаны дзе-нідзе хаткі, быццам хаваюцца яны ад людзей, каб не стрывожылі той цішы, якая вее ўкруг іх... Вось і Пяршаі: вялікая вёска, касцёл, двор; тут і палацы пяршайскага графа Тышкевіча". Пра „люцінскі" год згадвае наступнае: „На кожны важнейшы, бывала, дзень нябожчык (Дунін-Марцінкевіч. – *Л. П.)* пісаў для нас усіх – дзяцей якую-колечы камедыю, мы яе вучылі, з'язджаліся госці, і ішло прадстаўленне". А ці не так і з'явіліся, створаныя Дунінам-Марцінкевічам для выканання тут, у Люцінцы, першыя варыянты камедыйных паэм, оперы

„Сялянка", „Рэкруцкі набор", вершаваныя аповесці „Вечарніцы", „Купала", „Гапон. Беларуская аповесць з праўдзівага здарэння на мове беларускага народа напісана" і славуты фарс-вадэвіль „Пінская шляхта"?

Лібрэта камічнай оперы „Сялянка" выдавалася асобнай кніжачкай у Вільні ў 1846 годзе. Музыку да яе напісалі сябар Марцінкевіча выдатны польскі кампазітар Станіслаў Манюшка і настаўнік мінскай гімназіі скрыпач Канстанцін Кжыжаноўскі. У 1852 годзе, у пачатку лютага, опера была пастаўлена ў Мінску на аматарскай сцэне. Але першае яе выкананне адбылося сіламі сваёй „хатняй" трупы ў Люцінцы. Як правіла, спектаклі тут выконваліся на дзвюх мовах – польскай і беларускай, і самую яркую, каларытную іх аснову складалі ўзятыя з жывой народнай гаворкі беларускія прымаўкі, папеўкі, бойкія, дасціпныя дыялогі...

Адметна, што люцінскі тэатр з'яўляўся музычным. Прытым у ім іграліся не толькі камедыі-вадэвілі, якія суправаджаліся музыкай і песнямі, танцамі, але і спектаклі накшталт „Сялянкі" або „Рэкруцкага набору". Ажыццявіць пастаноўку музычнага спектакля ў невялікім сельскім фальварку, вядома, было нялёгка: патрабавалася немалая колькасць выканаўцаў, пры гэтым падрыхтаваных, здольных да спеваў, і калі ўжо не аркестр, то хоць бы некалькі музыкантаў, адпаведна – інструменты, дый месца, пляцоўка для выступлення.

Таму драматург Марцінкевіч пісаў лібрэта, тэксты камедый і вадэвіляў, разлічваючы перш за ўсё на сваю „сямейную" трупу, на некаторых суседзяў, на сяброў, што наведваліся з Мінска, і нават, як паведамляе Ядвігін Ш.,на дзяцей – вучняў люцінскай школкі. Канешне ж, і аўтар меў вялікі камедыйны талент, удзельнічаў у спектаклях, а ў „Сельскай ідыліі" цудоўна выконваў ролю Навума Прыгаворкі.

Як кажуць, не абдзяліў бог здольнасцямі і дзяцей Марцінкевіча – дачок Камілу, Мальвіну, Цэзарыну, сына Міраслава. Як музыканты-выканаўцы Каміла (пісала музыку сама) і Міраслаў неаднаразова выступалі ў аматарскіх канцэртах. Пра іх выканаўчае майстэрства ў свой час расказвалі газеты „Виленские губернские ведомости", „Киевские губернские ведомости". Праз віленскага ваеннага губернатара Бібікава Дунін-Марцінкевіч звяртаўся ў 1851 годзе да цэсарэвіча з просьбай накіраваць яго адораных „дзяцей-артыстаў" – 14-гадовую дачку Камілу і 13-гадовага сына Міраслава – у Парыжскую кансерваторыю „...і да поўнага заканчэння вышэйшай музычнай навукі ўтрымліваць там на казённым рахунку". Праўда, Марцінкевічам адмовілі, але вядома, што некаторы час яны займаліся ў Вільні, Варшаве. І, трэба думаць, музычнае суправаджэнне люцінскіх спектакляў было на высокім узроўні.

У доме пастаянна знаходзілася фартэпіяна, меліся, відаць, і іншыя інструменты. А пра тое значэнне, якое ў гэтай сям'і надавалася музыцы, сведчыць такі факт: дочкі Марцінкевіча, выкладаючы ў люцінскай школцы, уключалі навучанне музыцы ў складзеную імі праграму і самі ж вялі заняткі. Традыцыйна „музычнай" сядзіба заставалася і пры ўнучках пісьменніка.

„...На месцы старога згарэўшага дома ў Люцінцы стаіць цяпер новенькі зграбненькі дамочак – зусім на манер местачковага. Зграбненькі ён зверху, чысценькі – усярэдзіне, мэблі пекныя, мяккія – сядзіш, як на пярыне, фартэпіяна аж блішчыць...". Далей Ядвігін Ш. у памянёным ужо творы прыводзіць кароценькае апісанне колішняга фальваркавага дома – „старэнькай, згорбленай, пад амшэлай страхой хаткі". І ўсё ж у ёй хапала месца для пражывання шасці вучням, для бібліятэкі і вучэбных дапаможнікаў, для фартэпіяна. Таму, трэба думаць, тут жа, у нейкай прасторнай, выслабаненай ад мэблі і рэчаў палавіне дома ставіліся і славутыя люцінскія спектаклі.

Пасля падзей 1863 года за падтрымку паўстання амаль усе члены сям'і Дуніна-Марцінкевіча падвергліся ганенням. Сам пісьменнік зведаў дзевяцімесячнае зняволенне ў мінскім турэмным замку, старэйшая дачка Каміла была саслана на Паўночны Урал, другая – Цэзарына знаходзілася пад следствам, жонку Марыю вымусілі заплаціць штраф. Пасля выхаду з турмы Марцінкевічу дазвалялася жыць толькі ў фальварку, пад наглядам паліцыі без права выезду.

Люцінку, сваю „хаціну", лясныя і палявыя пейзажы, якія адкрываліся з пагорка, ціхія куточкі-прытулкі, рэчку, што пятляла па лузе, Марцінкевіч любіў да канца сваіх дзён.

Многія сюжэты яго вадэвіляў, паэм, п'ес маюць рэальную аснову, узяты з жыцця суседзяў, сяброў. Шматлікія прымаўкі, прыказкі, моўныя абароты, якімі так шчодра „дудар беларускі" насычаў свае творы, былі пачуты, пачэрпнуты ім тут, у Люцінцы – ад сялян-фальваркаўцаў, жыхароў недалёкага мястэчка Пяршаі.

Вельмі падрабязнае, відаць, даўно вынашанае, выпеставанае апісанне сядзібы дае Дунін-Марцінкевіч у пралогу да свайго гістарычнага апавядання „Люцінка, альбо Шведы на Літве":

...Калі хмара жыцця далягляд захінае,
Дык хаціна ахвотна бадзягу прымае,
Боль душы супакоіць, утаймуе ў спачынку...
А зімой добра мары снаваць ля камінку.
Дзетак я ўзгадаваў пад страхою хаціны,
Тут цудоўныя часта я ведаў хвіліны.
Дом стаіць на пагорку – лес вокал, алешнік,

Дом за домам, а ў садзе – ігрушы, чарэшні.
З ганка ступіш і бачыш – лес воддаль, яліны...
Дзеліць лес напалам стужка сіняй Люцыны...
Невялічкая рэчка, ды рыбы ў ёй поўна,
А пры рэчцы – крыніца з вадою цудоўнай.
Злева, быццам дыван, луг стракаты квітнее,
А на лузе бярозка там-сям зелянее...

...І сёння мы пазнаём Люцінку Марцінкевіча: невялікі, але ўсё ж прыкметны пагорак, на адхоне яго схаваная ў зарасніку крынічка, з якой яшчэ і ў наш час бяруць тубыльцы ваду, мураваныя прыступкі, што некалі вялі на ганак, у колішнюю хаціну...

Неўзабаве пасля смерці Дуніна-Марцінкевіча люцінскі дом згарэў. Але амаль на тым жа падмурку нашчадкі пісьменніка пабудавалі новы, які прастаяў да 1950 года. Калі праўнучка Марцінкевіча выехала адтуль, пуставаўшы будынак разабралі і перавезлі ў суседнюю вёску пад школу.

Зараз тое месца, дзе знаходзілася колішняя пабудова, зялёны мурожны лужок пасярод саду акрэсліваюць ружоваашэрыя гранітныя камяні падмурка. На вяршыні пагорка ад



Ад колішняга дома Марцінкевічаў засталіся толькі прыступкі...

былога парку засталося некалькі старых ясеняў, клёнаў. А гадоў пяць назад тут стаяла яшчэ і раскідзістая ліпа. Ствол гэтага дрэва-патрыярха (мела за дзвесце гадоў) быў на дзіва моцны, без адзінага дупла. Магутную, у тры абхваты, закаваную ў цвёрдую, здаровую кару калону вянчала пышная крона. Як кажуць тутэйшыя жыхары, Марцінкевічава ліпа (паводле падання, пад ёй пісьменнік стварыў славутую „Пінскую шляхту") з'яўлялася галоўнай прыкметай Люцінкі: відна была за некалькі кіламетраў ад вёскі нібы зялёная шапка-страха, што хавала пад сваімі шатамі ўвесь пагорак... Зараз ліпы ўжо няма – спалілі. Замінала некаму цудоўнае гістарычнае дрэва – кідала цень на вакольныя агародчыкі... Адзінае суцяшэнне: на яе месцы настаўнікі Пяршайскай школы пасадзілі маладзенькую ліпку.

Рэчка Люцінка (прыток Ісалчы), якая цячэ да пушчы, каля паселішча выраўнена,ператворана ў меліярацыйную канаву. Праўда, пад пагоркам цяпер разлілося возера – тут Люцінку перагарадзілі плацінай. У сучаснай вёсцы чатырнаццаць двароў. Прытым туляцца дамы, хлеўчукі і розныя прыбудовы ўздоўж агінаючай схіл вузенькай вулачкі. Як і здавён, на сядзібах, у дварах, пад агароджамі і на межах тут шмат розных кустоў, старых дрэў, амаль ля кожнай хаты – кветнікі.

Цікава, што ў доме, які стаіць на люцінскім сядзібным двары, і зараз жывуць Марцінкевічы. Не, не сваякі пісьменніка, але ўсё ж некаторая сувязь прасочваецца. Як вядома, Вікенцій Іванавіч нарадзіўся пад Бабруйскам у фальварку Панюшкавічы. Тут жылі і продкі яго, прадстаўнікі даволі старога, вядомага з пачатку ХУІІ стагоддзя шляхецкага роду. Марцінкевічы – сучасныя жыхары Люцінкі, таксама наезджыя, з таго ж Бабруйскага павета. Па расказах гаспадара Войцеха Браніслававіча, бацька яго, Браніслаў Францавіч, перабраўся ў Люцінку ў дзевяностых гадах мінулага стагоддзя.

Наўрад ці гэта выпадковае супадзенне. Відавочна, дочкі Дуніна-Марцінкевіча працягвалі падтрымліваць сувязь з раднёй, знаёмымі, што засталіся на Бабруйшчыне, дзякуючы чаму тутэйшы селянін даведаўся аб продажы ў параўнаўча далёкай Люцінцы зямлі і купіў яе.

Але чаму шляхціц-дваранін і селянін з аднолькавым прозвішчам? Вельмі магчыма, што нехта з продкаў Дуніна-Марцінкевіча – бацька, дзядзька – даўшы „адпускную" прыгоннаму, па існаваўшым звычаі перадаў яму і сваё прозвішча, але ўжо без „прыдомка" – Дунін – родавага імя.

У шасцідзесятых гадах адна з праўнучак пісьменніка, якая жыла ў Польшчы, прыязджала ў Люцінку, гасціла ў Браніслава Францавіча. І да гэтай пары ўжо яе дзеці падтрымліваюць сувязь, перапісваюцца з мясцовымі Марцінкевічамі.

Люцінка... сто пяцьдзесят гадоў назад тут пасяліўся Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч – пісьменнік, драматург, тэатральны дзеяч, таленавіты, нястомны працаўнік, дудар беларускі, што менавіта адсюль, з Люцінкі, як цудоўна сказаў Янка Купала,

> ...песню за песняй парадкам
> Пусціў, як жывую крыніцу:
> Пасыпаліся проста, як з неба,
> „Дажынкі", „Гапон", „Вечарніцы".
> Як сторож, стаў смела на варце
> Радзімых, запушчаных гоняў,
> Стаў сеяць па-свойму ўсё тое,
> Што мы далей сеем сягоння...

# „Zрысавана з натуры"

Свае экспедыцыі, што цягнуліся месяцамі, да зімовых халадоў, Орда пачынаў ранняй вясной, як толькі падсыхалі дарогі. Ён загадзя наймаў, а то і купляў каня і сціплую, але абавязкова з закрытым верхам – на выпадак дрэннага надвор'я – брычку. Рэчы браў самыя неабходныя і, вядома, мальберт, паперу, алоўкі, фарбы. Маршруты складаў яшчэ зімой: чытаў у бібліятэках кнігі па гісторыі і геаграфіі краю, вывучаў і перамалёўваў карты, адшукваў гарады і мястэчкі, сёлы, фальваркі, у якіх знаходзіліся руіны старажытных замкаў, палацы магнатаў, старыя касцёлы, цэрквы, і вызначаў іх як месца прыпынку на сваім будучым пераездзе. Не менш цікавілі мастака таксама сціплыя двары, сядзібы, дзе нарадзіліся, жылі знакамітыя людзі – паэты, кампазітары, вучоныя.

Ці вёў Орда дзённік у сваім працяглым – дваццаць гадоў – вандраванні па Беларусі, Літве, Валыні? Так. Ім створаны унікальны дзённік, нават, бадай, энцыклапедыя архітэктурных пейзажаў, у якой не прапушчаны літаральна ні адзін больш-менш вядомы, заслугоўваючы ўвагі помнік дойлідства або гісторыі краю. Вынікам выбранай мастаком творчай місіі стаўся неардынарны ў тысячу лістоў збор арыгінальных архітэктурна-гістарычных малюнкаў і выкананых з іх у канцы XIX стагоддзя восем серый-альбомаў буйнафарматных, каляровых літаграфій.

Як і ва ўсякім падарожжы, адзін дзень не быў падобны на другі, але часта работа Орды – змалёўванне з натуры – пачыналася з таго, што, прыехаўшы ў намечаную сядзібу, ён пакідаў у двары брычку, ішоў да гаспадароў, называўся і прасіў дазволу намаляваць фальварак, дом (часам, гэта быў і сучасны багаты палац або стары родавы замак). Звычайна гаспадары не пярэчылі, наадварот, праяўлялі цікавасць да просьбы вельмі далікатнага чалавека ў чорным дарожным плашчы, шырокім капелюшы. Нярэдка знаёмства заканчвалася запрашэннем на абед, на вячэру, а потым і просьбай пажыць у доме некалькі дзён. Справа ў тым, што вандроўны мастак быў выдатна выхаваным і вельмі адукаваным, многае бачыў, да таго ж з'яўляў-

ся цікавым расказчыкам. Ён лёгка пры необходнасці пераходзіў на французскую мову і гаварыў як сапраўдны парыжанін. Калі ў доме меласся фартэпіяна, то маэстра сам прапаноўваў памузыцыраваць і здзіўляў усіх ігрой сапраўднага сталічнага піяніста-віртуоза: выконваў па памяці Шапэна, Гендэля, Ліста... і свае ўласныя творы – паланезы, мазуркі, вальсы. Потым, калі ў „Тыгодніку ілюстраваным" пачалі публікавацца рэпрадукцыі архітэктурных пейзажаў пад рубрыкай „З папкі Орды", то мастаку не трэба было называць сябе: яго пазнавалі, прыезд лічылі за гонар і прымалі як жаданага госця.

... Нарадзіўся Напалеон Орда ў Варацэвічах, што пад Янавам (Іванавам), у сям'і адукаванага шляхціца. Бацька яго Міхал Орда адзін час захапляўся генералам Банапартам як рэвалюцыянерам, дэмакратам (з тае нагоды і сыну надаў такое імя), працаваў інжынерам-фартыфікатарам, будаваў дарогі і асушальныя каналы на Палессі. І, напэўна, іх небагаты шляхецкі дом, сям'ю ад многіх падобных адрознівала тое, што ў Ордаў любілі кнігі і музыку. Маці Напалеона, сама добрая піяністка, з дзяцінства вучыла яго іграць на фартэпіяна. Бацька выдатна чарціў, маляваў. Прыязджаў, жыў у іх родавым фальварку таксама настаўнік малявання.

Орда скончыў Свіслацкую гімназію, а затым, як і большасць маладых літвінаў таго часу, якія жадалі працягваць вучобу, – Віленскі універсітэт. На гэтым спакойнае жыццё пад апекай бацькоў закончылася, наперадзе юнака чакалі бурныя падзеі, нялёгкія выпрабаванні...

Пра Варацэвічы ў польскім „Слоўніку геаграфічным...", выдадзеным у 1893 годзе ў Варшаве, сказана: „...павет Кобрынскі, у 70 вярстах ад Кобрына. Два маёнткі – 575 дзесяцін і 796 дзесяцін зямлі, 64 дзесяціны царкоўнай зямлі. Дзве царквы, два ветракі. Даўняя ўласнасць Ордаў. Тут у 1807 годзе нарадзіўся Напалеон Орда, вядомы рысавальшчык і выдавец альбомаў. Належалі князям пінскім, каралеве Боне. Упамінаюцца Варацэвічы – населены пункт у 18 кіламетрах на захад ад Іванава, што ў Брэсцкай вобласці, уяўляюць сабой вялікую – некалькі шырокіх і доўгіх вуліц на роўным месцы – тыповую палескую вёску. У цэнтры, на плошчы, стаіць мураваная царква з ліку так званых „мураўёвак", што густа ўзводзіліся на тэрыторыі Беларусі пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гадоў, каб зацвердзіць праваслаўе ў краі, які апалячваўся. Варацэвіцкая Хрыстаўздзвіжанская царква асвечана ў 1872 годзе і цяпер з'яўляецца адзіным у вёсцы будынкам з часоў Напалеона Орды. Праўда, не так даўно знойдзена яшчэ адно вельмі каштоўнае сведчанне сувязей мастака з радзімай. Ужо ў наш час, калі культавыя пабудовы гвалтоўна ператвараліся ў склады, а то і наогул знішчаліся, вара-



Н. Орда. *Фотарэпрадукцыя з аўтапартрэта. 70-ыя гады XIX ст.*

цэвіцкія прыхаджане са сваёй царквы (яе таксама зачынялі) разабралі па дамах на захоўванне іконы і розныя царкоўныя рэчы. Вось тады адзін з мясцовых жыхароў – цяпер царкоўны староста, бо храм у Варацэвічах нядаўна нанава асвечаны і адкрыты – на адваротным баку іконы (пісанае маслам адлюстраванне Хрыста), здымаючы яе з рамы, каб зручней захоўваць, заўважыў напалавіну сцёрты надпіс, але сэнс яго было не цяжка зразумець: ...Праваслаўным сяла Варацэвічы ў дзень асвячэння Варацэвіцкай царквы дораць абраз „гаспадары маёнтка Варацэвічы прозвішча Орда". Ніжэй ішлі словы: „Абноўлена гэта ікона... у 1907 годзе 12 снежня". Сёння каштоўная рэліквія менавіта як падарунак ад Напалеона Орды (у 1872 годзе, калі асвечваўся храм, Орда, ужо вядомы мастак, часта бываў на радзіме) займае ў царкве ганаровае месца...

Фальварак Варацэвічы знаходзіўся ў баку ад сяла, у кіламетрах двух. У наш час на тым месцы, дзе стаяў дом Ордаў, размяшчаўся двор з гаспадарчымі пабудовамі, прысадамі, раскінулася роўнае чыстае поле („руплівыя" меліяратары далёка да гарызонта ссунулі хмызнякі, лес). Адзіная прыкмета: як раз на колішнім двары стаіць малады дуб, пад ім абгароджаная магіла – таму дрэва і ўцалела – аднаго з апошніх гаспадароў хутара, які памёр недзе ў 30-ых гадах XX стагоддзя і завяшчаў пахаваць сябе пад дубам, пасаджаным ім яшчэ ў дзяцінстве.

Мясціна носіць назву Першы Міхалін і мяжуе з Другім Міхалінам. Магчыма, найменні дадзены па імені бацькі Напалеона – Міхала. З краю Другога Міхаліна месціцца хутар – таполевы і ясеневы гай, сад, стары вялікі будынак. Часам яго прымаюць, а ў перыядычным друку нават і фатаграфіі даваліся, за фальваркавы дом Ордаў. Але гэта памылка – сядзіба ўзнікла тут у 20-ых гадах нашага стагоддзя.

Упершыню Орда намаляваў свой родавы фальварак яшчэ ў дзяцінстве, апошні раз – у 1860 годзе (тады ўжо сядзіба Ордам не належыла). На малюнку адлюстраваны драўляны дом на дзве палавіны, парадны двор. Адзінае ўпрыгожанне будынка – ганак-порцік з чатырма драўлянымі калонамі, над ім невялічкая мансарда. За домам бачыцца парк з ліставых і хвойных дрэў. Такая сядзіба небагатага беларускага ці польскага шляхціца была ў многім тыповай на Беларусі і Літве, пра што сведчаць зноў-такі літаграфіі з малюнкаў Орды: „Смольгаў", фальварак Бабруйскага павета Мінскай губерні, дзе нарадзіўся паэт Уладзіслаў Сыракомля, „Убель", сядзіба Ігуменскага павета, радзіма Станіслава Манюшкі, „Завоссе" – Навагрудчына, адкуль родам Адам Міцкевіч. У праўдзівасці малюнкаў, дакладнасці ўсіх дэталей можна не сумнявацца. Гэта было правіла, крэда Орды – пакінуць нашчадкам дакументальна-мастацкія сведчанні. І ўсё ж асабістыя адносіны мастака адчува-



Так выглядаў фальварак Смольгаў — радзіма У. Сыракомлі.
*Фотарэпрадукцыя з малюнка Н. Орды. 70-ыя гады XIX ст.*



„Палац графаў Тышкевічаў у Лагойску." *Фотарэпрадукцыя малюнка Н. Орды. 1870 год*

юцца – спакой, мяккі лірызм... Шматлікія замалёўкі падобных фальваркаў у рэшце рэшт зліваюцца ў яго ў мастацкі, абагульнены вобраз радзімы. Так, гэта не рамантычная веліч сярэднявяковых замкаў, не халодная прыгажосць магнацкіх двароў, а такі блізкі сэрцу мастака шляхецкі фальварак, з традыцыйнымі прысадамі, гаспадарчымі пабудовамі, дваром, на якім бачацца невялікія фігуркі сялян з косамі, граблямі, прыслуга, распрэжаны конь, павозка...

Як вядома, у 1823 годзе Напалеона Орду залічылі ў Віленскі універсітэт на фізіка-матэматычны факультэт, куды, дарэчы, толькі на восем гадоў раней пaступаў першапачаткова і Адам Міцкевіч. Год гэты ўвайшоў у гісторыю навучальнай установы трывожным часам – была ўчынена расправа над тайным студэнцкім таварыствам філаматаў, што ад быццам бяскрыўдных задач асветніцтва і культурнай дасканаласці перайшлі да распрацоўкі праграм палітычнай барацьбы за нацыянальнае і сацыяльнае адраджэнне. Большасць членаў таварыства, у тым ліку Тамаша Зана, Яна Чачота і Адама Міцкевіча, выслалі ў глыбінныя губерні Расіі. Але рэвалюцыйны дух не ўдалося задушыць канчаткова – працягвала існаваць, дзейнічаць тайная суполка „Заране”, звязаная з дзекабрыстамі. Сціплы, старанны студэнт з Піншчыны Напалеон Орда таксама аказаўся ў адным ланцужку са „змоўшчыкамі”. Пасля нядоўгага расследавання яго выключылі з універсітэта і пасадзілі ў турму. Праўда, адбыў ён параўнаўча невялікі тэрмін – год і тры месяцы. Пасля вызвалення вярнуўся дамоў у Варацэвічы, займаўся самаадукацыяй.

Калі пачалося паўстанне 1830 года, Орда ўжо служыў у коннай гвардыі Літоўскага корпуса, што амаль цалкам перайшоў на бок інсургентаў. І тут далёка не пасіўны, адважны гвардзеец, які застаўся верным вызваленчым ідэям, вызначыўся ў бітве пад Кочыем і ўдастоіўся вышэйшага ордэна – Залатога крыжа. Да канца кампаніі паспеў даслужыцца да чына капітана. Падчас ганення на паўстанцаў Ордзе ўдалося пазбегнуць арышту, і ён на нядоўгі тэрмін зноў вярнуўся ў Варацэвічы. Аднак на ім вісела кляймо інсургента, і пры самым нязначным падазрэнні, даносе можна было зноў трапіць у турму або ссылку. Таму, як і дзесяткі, сотні землякоў – удзельнікаў паўстання, Напалеон Орда вырашае эмігрыраваць у Парыж. Але шлях у Францыю аказаўся для яго доўгім і хутчэй нагадваў падарожжа студэнта з мэтай азнаямлення з культурай Еўропы, пашырэння сваіх пазнанняў.

Дваццацічатырохгадовы Орда вандраваў не адзін, з ім у Еўропу адправіўся адзін з сяброў і аднадумцаў, магчыма, таксама інсургент. Маладыя людзі, на ўсякі выпадак не называючы сябе, абмінаючы вялікія гарады, дабраліся да аўстрый-

скай граніцы і перасяклі яе. Аўстрыя, нарэшце Швейцарыя, потым Германія, Італія, поўдзень Францыі, і толькі праз два гады яны трапілі ў Парыж.

Бадай, у тым доўгім пераездзе якраз і праявіліся галоўныя рысы характару, схільнасці Напалеона Орды – будучага мастака, музыканта, адукаванейшага чалавека сваёй эпохі – цяга да падарожжаў, жаданне сваімі вачыма ўбачыць, успрыняць помнікі даўніны, скарбніцы еўрапейскіх музеяў, пазнаёміцца з выдатнымі дзеячамі культуры. А зарад, цікавасць да ўсяго, прынамсі да мастацтва і музыкі, ужо былі дадзены, выхаваны ў маладым шляхціцу-інтэлігенце і дома, і ў Віленскім універсітэце...

Парыж пасля паўстання 1830–1831 гадоў стаў цэнтрам польскай рэвалюцыйнай эміграцыі. Тут знайшлі прытулак сотні палякаў – ад вядомых афіцэраў і знатных вяльмож да падобных Ордзе маладых інсургентаў. У гэтым горадзе тады жылі Адам Міцкевіч, Фрэдэрык Шапэн.

Паколькі кар'ера ваеннага, хоць і меў чын капітана, Орду пакуль не цікавіла, ён вырашыў вучыцца, удасканальвацца. Але аддаць чаму-небудзь перавагу, раздзяліць свае захапленні было, напэўна, вельмі нялёгка, і Напалеон выбраў і музыку, і жывапіс.

Хто пазнаёміў маладога, захопленага жывапісам паляка з вядомым у той час парыжскім пейзажыстам П'ерам Жырарам, невядома. Але яны пасябравалі і Орда пачаў рэгулярна наведваць майстэрню Жырара, што ў многім і вызначыла яго будучы лёс як мастака-рысавальшчыка. Настаўнік Напалеона захапляўся менавіта архітэктурнымі пейзажамі, так званымі авіядукамі, на якіх цэнтрам кампазіцыі абавязкова былі антычныя руіны, масты, старыя замкі сярод узгоркаў, гор.

Адначасова і з не меншай ахвотай Орда браў урокі музыкі і кампазіцыі ў Фрэдэрыка Шапэна. Яны разам музыцыравалі ў салоне Жорж Санд, дзе хутчэй за ўсё Напалеона і пачуў праслаўлены мэтр Ферэнц Ліст і, як сведчаць сучаснікі, высока ацаніў талент маладога музыканта, параіў яму сур'ёзна заняцца кампазіцыяй. Шапэн многія свае рукапісныя творы прысвяціў Ордзе. У сваю чаргу і Орда лепшы паланез адрасаваў Шапэну, якому першаму выконваў свае ўласныя творы – фартэпіянныя п'есы – паланезы, мазуркі, вальсы. Вядома, у іх адчуваўся ўплыў паважанага настаўніка і сябра, асабліва ў паланезах, што вылучаліся меладычнасцю, драматызмам, віртуознасцю стылю. Часам для гасцей абодва музыканты арганізоўвалі своеасаблівую віктарыну: Орда выконваў нядаўна напісаныя творы Шапэна, а той – музычныя мініяцюры Орды, чаргуючы іх са сваімі, і слухачам прапаноўвалася вызначыць аўтара.

Шапэн вельмі добра ставіўся да творчасці свайго таленавітага вучня і па яго настойлівай просьбе Орда ў 1838 годзе ўключыў некалькі сваіх фартэпіянных п'ес у выпушчаны Шапэнам „Альбом твораў польскіх кампазітараў". Праз дзесяць гадоў „Альбом" пабачыў свет у Парыжы, а ў 1882 годзе (за год да смерці) Напалеон Орда ўсё ж выдаў, ужо ў Варшаве, нотныя запісы дванаццаці сваіх паланезаў і некалькі песень на словы Станіслава Вітвіцкага і Адама Плуга.

Орда беражна захоўваў, ведаў на памяць апошнія пісьмы рана пайшоўшага з жыцця блізкага яму чалавека, усяму свету вядомага кампазітара.

„Студзень, 1849 год.

Жыццё маё!

З таго часу, як мы не бачыліся, я зрабіўся вельмі хворы, сёння мне хацелася б пабываць у вас, але я яшчэ не ў стане. Заўтра пайду на італьянцаў.

Знайдзі мне, як бы гэта ні было цяжка, два месцы – зробіш добрую справу.

*Твой стары сябар Ш.".*

За два месяцы да смерці Шапэн пісаў:

„Шапо, ліпень, 1849 год.

Мой мілы, пасняшайся дзеля нашай старой дружбы. (Размова ідзе пра продаж старога гадзінніка. – *Л. П.*) Бог за гэта выпесціць табе выдатнага хлопца літвіна (Орда меў сына Вітольда. – *Л. П.*), а пані Ордзе дасць сто гадоў здароўя. Пакуль засведчы ёй, калі ласка, маю павагу.

Абдымаю цябе слабей, чым раней, але з ранейшай сардэчнасцю.

*Твой Ш.".*

...У далёкім Парыжы лёс звёў Орду таксама і з Адамам Міцкевічам. Паміж імі склаліся сяброўскія адносіны, тым больш, што абодва літвіны вучыліся ў адной „альма-матэр" – Віленскім універсітэце. Міцкевіч часта выступаў з паэтычнымі імправізацыямі перад палякамі-эмігрантамі ў літаратурных салонах і яго чытанні неаднойчы суправаджаў ігрой на фартэпіяна Орда.

Дасягнуўшы высокага майстэрства як піяніст, Орда адначасова карыстаўся вядомасцю і як адзін з лепшых у Парыжы, аб чым паведамлялі даведнікі і энцыклапедыі таго часу, выкладчыкаў музыкі. Напэўна, тыя заняткі сталі потым адной з крыніц яго параўнаўча бязбеднага існавання. Пераканаўчым сведчаннем таго, што кампазітар распрацаваў сваю тэорыю, школу выкладання музыкі, з'явілася выдадзеная ў 1873 годзе ў Варшаве кніга „Граматыка музыкі", у якой ён абагульніў

уласны трыццацігадовы вопыт навучання ігры на фартэпіяна. Доўгія гады „Граматыка" лічылася адным з лепшых дапаможнікаў для выкладчыкаў музыкі і падручнікам для вучняў. Гэту фундаментальную працу – каля трохсот старонак, шмат нотных дадаткаў – аўтар прысвяціў свайму земляку, ураджэнцу Міншчыны, Станіславу Манюшку. Апошні наконт кнігі пісаў:

„З асалодай чытаў работу аб гармоніі, пераказ якой мне здаецца найбольш поўным і разумным. Збянтэжаны дабрынёй Орды, што прысвяціў мне такую дастойную кнігу...".

Усё сваё доўгае жыццё Орда заставаўся выдатным музыкантам-выканаўцам. Пісьменнік Адам Плуг, які ведаў яго ўжо ў сталым узросце, згадваў, што і ў 70 гадоў ён з натхненнем музыцыраваў і заўсёды з ахвотай прымаў удзел у дабрачынных канцэртах.

Пра папулярнасць і аўтарытэт Орды ў музычных і тэатральных колах сведчыць такі факт: у 1843 годзе Таварыства акцыянераў італьянскай оперы ў Парыжы – аднаго з самых вядомых музычных тэатраў Еўропы – прапанавала яму пасаду дырэктара. Орда згадзіўся, бо прапанова сталася вельмі дарэчы: ён нядаўна жаніўся на Ірыне Богле, і мець пастаянны заработак сямейнаму чалавеку было пажадана. Але, на жаль, папрацаваць кіраўніком оперы яму давялося ўсяго адзін сезон – з-за рознагалосся паміж членамі праўлення тэатр праз некалькі месяцаў зачынілі.

Час несправядліва распарадзіўся спадчынай Орды–кампазітара: значная частка яго музычных твораў згубілася, а тыя лічаныя, што захаваліся, – некалькі паланезаў, песні – не выконваюцца. Хоць яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя іх добра прымала патрабавальная парыжская публіка і аматары музыкі. У канцы XIX стагоддзя музыканта і кампазітара Орду ведалі, высока цанілі ў Варшаве.

Як жа развіваўся другі бок таленту гэтага ад прыроды адоранага чалавека – мастацкі, наколькі ён быў плённым? Жывапісцам у прамым значэнні слова Орда не стаў. Але затое пад уплывам свайго настаўніка П'ера Жырара ён дасканала авалодаў тэхнікай, майстэрствам рысавальшчыка, яго таксама захапіў жанр архітэктурных пейзажаў. І тут зноў праявілася асаблівасць яго натуры – дапытлівасць і шырыня інтарэсаў, жаданне падзяліцца ўражаннямі аб убачаным і перш за ўсё перадаваць мінулае і сённяшняе мясцін, дзе пабываў, праз замалёўкі гістарычных і культурных помнікаў.

Орда стаў мастаком-вандроўнікам, мастаком-пілігрымам, яшчэ жывучы ў Парыжы. Са сваёй першай экспедыцыі па Іспаніі, якую зрабіў у 1840 годзе, закончыўшы курс у Жырара, ён прывёз дзесяткі малюнкаў і акварэлей, напісаных на вуліцах

старых гарадоў, замалёўкі руін на фоне аліўкавых гаёў, палацаў, пастаялых двароў. Гэтыя творы, дзе захавалася дакументальная дакладнасць аб'екта і па-майстэрску перадаваўся настрой, пазнаваўся край, атрымалі высокую ацэнку. Адно з выдавецтваў (саліднае) прапанавала мастаку рабіць да турыстычных даведнікаў папкі ілюстраваных дадаткаў. Па дамоўленасці, атрымліваючы ад выдавецтва заданні, Орда аб'ехаў літаральна паў-Еўропы, пры тым яго экспедыцыі працягваліся па году, два. Ён пабываў у Англіі, Шатландыі, Галандыі, Партугаліі, Алжыры, Скандынаўскіх краінах, прывёз адтуль дзесяткі, сотні архітэктурных пейзажаў...

Парыжскае жыццё Напалеона Орды было не бяздзейсным існаваннем эмігранта: ён змог вучыцца, увайсці ў мастацкае інтэлектуальнае асяроддзе сталіцы, знайшоў прымяненне свайму таленту і здольнасцям. Здавалася б, склаўся творчы інтэлігент, які за дзесяць, дваццаць гадоў мог бы ўжо і страціць духоўную сувязь з радзімай, са сваім рэвалюцыйным мінулым. Але не: у душы яго ўвесь гэты доўгі час жыла, магчыма, схаваная ад блізкіх, вялікая мара – вярнуцца дамоў, на бацькаўшчыну. Ён не рабіў спроб тайна прабрацца ў Варшаву, у любую сэрцу Вільню, бо ведаў, што рэвалюцыйнае мінулае рускі цар не даруе палякам, і яго, калі з'явіцца на радзіме, спасцігне лёс землякоў, таварышаў-інсургентаў – ссылка ў Сібір.

Неўзабаве на расійскі прастол прыйшоў новы імператар – Аляксандр II, у гонар чаго ў 1856 годзе была аб'яўлена амністыя і для паўстанцаў 1831 года. Тады Орда вярнуўся ў родны край. У дарагіх сэрцу Варацэвічах ён не быў дваццаць пяць гадоў! Бацькоўскі маёнтак даўно канфіскаваны, прададзены, аднак Ордзе знайшлося месца, і ён некаторы час жыў там і нават спрабаваў адкрыць невялічкі заводзік па вытворчасці сельгасінвентару і сельгасмашын. Задума не атрымалася, толькі дарэмна затраціў грошы. Аднак Орда не падаў духам – галоўным для сябе лічыў тое, што прыехаў на радзіму. Ён змяніў некалькі месцаў, наймаючыся рэпетытарам, але асаблівай стараннасці нідзе не праяўляў – яго ўжо захапіла ідэя стварыць галерэю архітэктурных пейзажаў краю. Вопыт, навык ёсць, але адна справа рабіць замалёўкі французскіх замкаў і галандскіх фермаў, і зусім іншая – помнікаў, адзначаных падзеямі сваёй гісторыі, родных мясцін знакамітых асоб, старых сабораў і замкаў Беларусі. І ён вырашае: ніякіх лішніх затрат на камфортнае жыццё, на адзенне. Усё павінна падпарадкавацца высакароднай мэце. Дарма, што ўжо пяцьдзесят, страчанае нагнаць павінен, перадаць дастойнае мінулае, прыгажосць і культуру роднага краю ў малюнак.

Канкрэтны план стварыць сістэматызаваныя па губернях,

гарадах серыі гістарычна-архітэктурных пейзажаў Ордзе падказаў гісторык і пісьменнік Юзаф Крашэўскі, якога мастак высока цаніў і да каго адносіўся з асаблівай павагай. Патрыятызм, гарачае жаданне служыць радзіме, выхоўваць гонар, нацыянальную годнасць у землякоў складваліся амаль адначасова. Крашэўскі таксама былы выхаванец Свіслацкай гімназіі, студэнт Віленскага універсітэта, удзельнік паўстання 1830–1831 гадоў.

Напалеон Орда больш не пакідаў свой край. Вядома, што яго жонка прыязджала ў Варацэвічы, некаторы час яны жылі ў Пінску, але яна вярнулася разам з сынам у Парыж, не прыжылася француженка на радзіме мужа. Так што Орда, можна сказаць, ахвяраваў і сям'ёй у імя мэты, у імя служэння таленту. Сын яго – Вітольд меў чын капітана французскай арміі, дарэчы, як калісьці бацька, удзельнічаў у франка-прускай вайне 1870–1871 гадоў і ўжо ў сталым узросце пераехаў у Польшчу.

Сам Орда жыў два гады ў Гродне, потым у Пінску, Варацэвічах. Апошняе дзесяцігоддзе пасля экспедыцый прыязджаў з папкамі, поўнымі замалёвак, у Варшаву да сястры Гартэнзіі Скірмунтавай, у якой праводзіў зімнія месяцы. Памёр там у 1883 годзе ва ўзросце 76 гадоў зусім нечакана, у разгар падрыхтоўкі да выдання дзевятага альбома літаграфій са сваіх малюнкаў. Скірмунтава выканала пажаданне брата – яго прах быў перавезены на радзіму ў Янаў і пахаваны ў сямейным склепе.

Праз тры гады пасля смерці Орды дачка Гартэнзіі, Канстанцыя Скірмунтава, перадала ў народны музей у Кракаве ўвесь збор архітэктурных пейзажаў мастака, што захоўваўся ў яе – 977 малюнкаў і акварэлей – вынік саракагадовай (з 1840 па 1880 год) натхнёнай працы, штогадовых падарожжаў.

Аднак гэта не ўся творчая спадчына жывапісца – па натуры чалавек добры, шчодры, ён раздарыў, раздаў нямала сваіх работ сябрам і знаёмым.

Амаль сто гадоў праляжалі творы мастака ў запасніках музея не разабранымі, і толькі ў 70-ых гадах была закончана іх класіфікацыя, а ў 1977 годзе Кракаўскі музей нарэшце выдаў фундаментальную, аб'ёмную (без малога тысяча рэпрадукцый) працу – „Каталог малюнкаў архітэктурных. Малюнкі Напалеона Орды". У яго ўвайшло каля сотні пейзажаў, прывезеных мастаком з вандровак 1840–1844 гадоў па Францыі, Іспаніі, Нідэрландах, Партугаліі. Але асноўную і найбольш каштоўную частку калекцыі складалі, вядома, малюнкі і акварэлі, напісаныя пасля вяртання жывапісца на радзіму (з 1860 года), у тым ліку больш як трыста змаляваныя з архітэктурных і гістарычных помнікаў у межах Беларусі: Гродзенская, Мінская, Віцебская, Магілёўская, Віленская губерні. Значная колькасць ма-




Вокладка аднаго з альбомаў Н. Орды

люнкаў, таксама каля трохсот, прывезена Ордам з падарожжаў па Валынскай, Кіеўскай, Ковенскай губернях.

Але калі б захаваліся толькі арыгінальныя творы Орды ў музеях, прыватных калекцыях, наўрад ці набыў бы мастак тую шырокую вядомасць, якой карыстаўся ў канцы мінулага стагоддзя. Справа ў тым, што, нягледзячы на ўжо сталы ўзрост, пачынаючы з 1873 года Напалеон Орда паспеў стварыць восем серый-альбомаў – усяго 260 лістоў – літаграфій са сваіх архітэктурных пейзажаў. Малюнкі пераводзіў на камень, друкаваў літаграфіі варшаўскі мастак Алаіз Місеровіч і там жа ў Варшаве на працягу дзесяці гадоў яны выдаваліся ў майстэрні Максімільяна Фаянса і ўсе на сродкі самога Орды.

Альбомы выходзілі даволі-такі вялікімі для тае пары тыражамі і мелі поспех. З часам іх можна было атрымаць у любой бібліятэцы Варшавы, Кракава, Вільні, Кіева. Прэстыжным лічылася для польскага інтэлігента-патрыёта мець альбом гістарычных пейзажаў мастака ў асабістай бібліятэцы.

Дайшлі гэтыя выданні і да нашага часу. Яны значных памераў (прыкладна 20x30 сантыметраў), вельмі добра афармленыя: цвёрдыя ціснёныя золатам вокладкі – малінавага, салатавага колеру, літаграфіі – жоўта-карычневага адцення.

Назвы іх розныя. Напрыклад, выдадзены ў 1876 годзе называецца: „Альбом гістарычных пейзажаў нашага краю, зрысаваных з натуры Напалеонам Ордай". На супервокладцы падрабязнае тлумачэнне і адначасова рэклама: „Альбом малюнкаў губерняў Гродзенскай, Мінскай, Віленскай, Ковенскай, Валынскай, Падольскай, Кіеўскай, Віцебскай і Магілёўскай. У трох серыях прадстаўлены месцы гістарычныя з часоў войнаў: турэцкіх, татарскіх, крыжацкіх і казацкіх, а таксама старыя руіны замкаў і выдатныя рэзідэнцыі, што сведчаць аб прыгажосці і цывілізацыі краю. Варшава, літаграфія Максімільяна Фаянса".

Орда суправадзіў кароткімі, але ёмістымі, змястоўнымі подпісамі кожны ліст літаграфіі, што, дарэчы, гаворыць аб яго далёка не дылетанцкім веданні гісторыі. Вось, напрыклад, якімі словамі аздобіў ён літаграфію з малюнка Гродзенскага замка: „Гродна – месца вядомае з 1128 года. На руінах абарончага замка Эрдзвіла – пляменніка Міндоўга, стаяў замак, у якім праходзіў апошні сейм". Падрабязная гістарычная даведка дадзена да літаграфіі „Лідскі замак": „Вельмі старажытнае мястэчка. Руіны замка, пабудаванага вялікім князем літоўскім Гедымінам у 1323 годзе. У гэтым замку бывалі вялікія князі Вітаўт, Ягайла, Аляксандр Ягелончык. Тут пражываў Тахтамыш – хан татарскі. Старостам лідскім быў Наджы-Гірэй – пазнейшы хан крымскі. Замак разбураны ў вайну са шведамі".

Літаграфія „Свіслацкі касцёл" мае паважлівы надпіс: „Касцёл асвечаны ў 1666 годзе. У мястэчку граф Вінцэнт Тышкевіч заклаў на свае сродкі слаўную гімназію для навучання юнацтва".

Акрамя таго, у левым ніжнім вугле кожнага малюнка, адпаведна і кожнай літаграфіі, абавязкова пазначалася: „Зрысавана з натуры" – нязменнае аўтарскае сведчанне арыгінальнасці твора, таго, што мастак працаваў ля адлюстраванага помніка, сядзібы. І зноў здзіўляешся шчыраму, пастаяннаму інтарэсу Орды да мінулага і сучаснасці роднага краю, дый проста вынослівасці. А яму ж было і за шэсцьдзесят, і за семдзесят гадоў, калі штогод рабіў ледзь не тысячакіламетровыя пераезды (а па якіх дарогах!), каб самому ўбачыць „натуру" і зарысаваць помнік, пейзаж вакол яго, дзе-небудзь на Кіеўшчыне, у Магілёве, пад Кракавам, Коўнам...

„Сведчанні аб прыгажосці і цывілізацыі краю" – гэта выказванне наконт сваіх малюнкаў можна лічыць ідэйным крэда мастака-патрыёта Напалеона Орды. У яго творчай спадчыне ўвасоблены своеасаблівы мастацкі вобраз Беларусі больш як сто гадоў назад. У гэтым вечная каштоўнасць твораў мастака, якія па-свойму унікальныя і з'яўляюцца своеасаблівым прак-

тычным дапаможнікам па гісторыі архітэктуры Беларусі, Літвы, Украіны, надзейным, дакладным зыходным матэрыялам для аднаўлення, рэстаўрацыі помнікаў...

У адным з нумароў штотыднёвіка „Клосы" за 1883 год, што выдаваўся ў Варшаве, Адам Плуг у некралогу на смерць Напалеона Орды пісаў: „Гэта быў сімпатычны чалавек, усё жыццё якога было чыстым, як сляза, хоць характар і мог бы зацвярдзець у яго салдацкіх вандраваннях. Гэта быў пісьменнік, мастак і музыкант, але перш за ўсё сумленны патрыёт, які вельмі любіў свой край... Толькі такі чалавек мог выканаць такую справу – выдаць свае вядомыя „Альбомы пейзажаў...".

# Станіслаў Манюшка – наш зямляк

Кожны год у пачатку мая Волму – цэнтральную сядзібу рыбгаса „Валмянскі" наведваюць прадстаўнікі польскага консульства ў Мінску. У склад гэтай традыцыйнай дэлегацыі, як правіла, уваходзяць і беларускія кампазітары, музыканты, пісьменнікі. Калі надвор'е добрае, картэж аўтамашын спыняецца ў пасёлку, які раскінуўся паміж сасновым борам і вадасховішчам, і госці пешшу ўскрайкам лесу накіроўваюцца ў Убель – ад Волмы гэта недалёка, кіламетра паўтара.

Дарога туды вядзе ціхая, ніякага транспарту – сельскі пясчаны прасёлак, дзе толькі і можна сустрэць павозку, што едзе няспешна, ці лясніка з ружжом за плячыма, ці дзяцей, якія хадзілі ў сасняк за смаржкамі. Але раптам наперадзе паўстае агароджаная паляна. У цэнтры яе пасярод клумбы – прамавугольны з шэрай вапны абеліск. На ім па-беларуску і польску напісана: „Тут у фальварку Убель 5 мая 1819 года нарадзіўся кампазітар Станіслаў Манюшка". І не бывае, каб у гэты дзень ля помніка не ляжалі кветкі.

Ад колішняга фальварка Манюшак у Убелі нічога не захавалася. Хіба што на вялікім двары па ўзгорках на месцы былых падмуркаў і печаў можна вызначыць, дзе стаяў дом, а неглыбокая варонка згадвае пра калодзеж. Вакол зараснікі, што пераходзяць у незвычайны лес, дзе вельмі многа ліпняку, ясеняў, таполяў, кустоў бэзу і шыпшыны – несумненна, гэта „нашчадкі" высаджаных гадоў паўтараста назад у фальварковым парку дрэў і кустоў. І толькі старая паўсухая таполя – справа ад абеліска – напэўна, апошняе дрэва ад даўнейшых прысад. За шырокай далінай ракі Волмы бачна вёска Убель. Некалі пры Манюшках вёску ад фальварка аддзяляла рака, і паміж імі быў наведзены мост, па якім праходзіла дарога.

Пра тое, як выглядаў фальварак, дзе нарадзіўся і жыў заснавальнік польскай класічнай оперы, мы ведаем, дзякуючы бясцэннаму малюнку з натуры сучасніка і сябра кампазітара, мастака Напалеона Орды. На палатне жывапісца адлюстраваны аднапавярховы, даволі высокі драўляны дом. На пярэднім фасадзе невялікі, з дзвюма драўлянымі, „точанымі"



„Убель. Тут нарадзіўся С. Манюшка". *З малюнка Н. Орды. 1867 год*

калонамі порцік, над ім – мансарда ў тры акны, з балконам. Дах, крыты гонтай, з пераломам, аб'ёмны, высокі. Звонку сцены ашалёваныя дошкамі, прытым вертыкальна. На фасадзе паабапал парадных дзвярэй па тры прамавугольныя акны. За домам маляўнічы парк. Перад ганкам расце вялікі куст – ні то бэзу, ні то шыпшыны. Справа за плотам стаіць стройная пірамідальная таполя, а далей на краі парку, пад дрэвамі, бачна мураваная квадратная капліца, хутчэй за ўсё пахавальня.

Наогул, убельская сядзіба Манюшкаў (узводзілася ў другой палове ХУІІІ стагоддзя) была падобна на сотні такіх жа фальваркаў сярэдняй беларускай шляхты, якія будаваліся ў ХУІІІ і недзе да сярэдзіны ХІХ стагоддзя.

Памяць пра знакамітага кампазітара захоўваюць экспанаты адзінага пакуль што – у Польшчы яшчэ няма – музея Станіслава Манюшкі, які існуе пры Валмянскай васьмігадовай школе (не так даўно была дзесяцігодкай) ужо больш як дваццаць гадоў. Ідэю адкрыцця яго падаў польскі музыказнавец Фукс. Ён прывёз некалькі копій дакументаў і партытуры да некаторых музычных твораў кампазітара. Тэматыка-экспазіцыйны план музея ў 1968 годзе распрацавалі нашы навукоўцы Г. А. Каханоўскі і В. А. Конан.

Калі працягваць знаёміцца з манюшкаўскімі мясцінамі на Міншчыне, то варта пабываць і ў недалёкіх ад Убеля Сміла-

вічах. Менавіта там у кнігах парафіяльнага касцёла запісана, што 5 мая 1819 года нарадзіўся і быў хрышчоны Станіслаў-Ян-Эдуард-Казімір Манюшка. Першае імя нададзена будучаму кампазітару ў гонар аднаго з продкаў. Ваенны суддзя Вялікага княства Літоўскага Станіслаў Манюшка-дзед набыў у Агінскіх маёнтак і мястэчка Смілавічы Ігуменскага павета ў 1787 годзе. Па дакументах, што захоўваюцца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве БССР, вядома і пра заснавальніка гэтага роду. Ім лічыцца Пётр Манюшка, які валодаў маёнткамі Манюшкі і Сморгаўка і ў 1529 годзе атрымаў прывілеі на дваранства ад караля Жыгімонта. Пазней прасочваецца ўжо некалькі ліній Манюшкаў.

Пасля смерці гаспадара Смілавіч зямлю падзялілі паміж сабой пяць яго сыноў. Бацьку будучага кампазітара Чэславу перайшла сядзіба ў Убелі. Галоўны фальварак усёй вотчыны – Смілавічы – стаў уласнасцю старэйшага брата Чэслава – Дамініка. Апошні заснаваў тут школу, бальніцу, даваў вольныя сялянам. Чэслаў у 1812 годзе паступіў на ваенную службу герцагства Варшаўскага, але ўжо ў 1815 годзе па ўласным жаданні выйшаў у адстаўку і пасяліўся ў Убелі. Ён быў нядрэнным паэтам, маляваў і нават пакінуў некалькі партрэтаў юнага Станіслава. Дарэчы зазначыць, што маці музыканта Альжбета Манюшка добра спявала, іграла на фартэпіяна, яна стала і першай настаўніцай сына.

Чэслаў, напэўна, меў добрыя адносіны з Дамінікам, бо часта са сваёй сям'ёй наведваўся ў Смілавічы. Ад Убеля да бацькоўскага маёнтка ўсяго восем верст – дарога ўздоўж Волмы, на мяжы паміж лугамі з аднаго боку, і полем, лесам – з другога. На юнага Стася моцнае ўражанне рабілі пустыя пакоі старога палаца – павуцёмныя, з таямнічымі гукамі, з партрэтамі суровых вяльмож на сценах, з цяжкай мэбляй. Мяркуюць, што менавіта пад уплывам тых дзіцячых успамінаў была напісана адна з лепшых опер кампазітара „Страшны двор".

Палац Агінскіх-Манюшкаў часткова захаваўся, праўда, да непазнавальнасці перабудаваны. Цяпер гэта адзін з карпусоў Смілавіцкага сельскагаспадарчага тэхнікума. Але галоўная выдатнасць колішняга фальварка зберaглася – стары парк са стагадовымі ліпамі і цаглянай агароджай.

...Рана, у восем гадоў, бацькі аддалі сына ў навуку – паехаў у Варшаву. Але кожны год на канікулы ён прыязджаў дамоў, у Убель. Калі ў 1831 годзе Манюшкі перабраліся на пастаяннае жыхарства ў Мінск (пражылі тут да 1838 года), Станіслаў паступіў у мясцовую гімназію. Спачатку сям'я пасялілася ў доме Клімковіча, на вуглу Валоцкай і Дамініканскай вуліц – сучасныя Інтэрнацыянальная і Энгельса. Той стары бу-



С. Манюшка ў сталыя гады

дынак 1797 года, чатырохпавярховы, цагляны, стаіць і сёння. Некаторы час Манюшкі жылі на Верхнім рынку ў доме Паляковай. Іх гасцінная кватэра вельмі хутка ператварылася ў своеасаблівы мастацкі салон. Музыканты, артысты, мастакі – Валянцін Ваньковіч, Ян Дамель, Каруфа-Корбут сталі тут частымі гасцямі. Захаваўся малюнак-шарж, зроблены гаспадаром, дзе лёгка пазнаць ўдзельнікаў аднаго з вечароў у Манюшкаў. Пастаянна наведваўся сюды і кіраўнік Мінскага аркестра, а таксама выкладчык музыкі ў гімназіі Дамінік Стафановіч, што адыграў значную ролю у развіцці таленту, у лёсе будучага

кампазітара. У 1856 годзе Станіслаў Манюшка, успамінаючы дзяцінства, юнацтва, пісаў этнографу і публіцысту Адаму Кіркору: „Выкладчыкамі фартэпіяннай музыкі былі: у вёсцы (Убель. – *Л. П.*) – мая маці, у Варшаве – слаўны арганіст Фрэер, у Мінску – мой бясцэнны Дамінік Стафановіч”.

Дарэчы, вучнямі Дамініка Стафановіча з'яўляліся кампазітар Фларыян Міладоўскі і дачка пісьменніка Дуніна-Марцінкевіча – піяністка, спявачка Каміла. Мяркуюць яшчэ, што якраз ён стаўся тайным сааўтарам 15-гадовага кампазітара Манюшкі ў яго першай камедыйнай оперы „Канторшчыкі”, якую паставілі аматары спевакі і музыканты ў 1834 годзе ў Мінску.

Не закончыўшы гімназіі, Станіслаў у 1835 годзе пераехаў у Вільню, а ўжо з 1838 года вельмі сур'ёзна заняўся музыкай у Берлінскай музычнай акадэміі. Праз два гады ён завяршыў вучобу і вярнуўся ў Вільню. У гэтым горадзе ажаніўся на Аляксандры Мілер, тут у іх нарадзіліся ўсе тры сыны. Жылі бедна, зарабляў Манюшка прыватнымі ўрокамі, а ў нядзелю іграў на вядомым аргане ў касцёле святога Яна. Увесь вольны час кампазітар цяпер аддаваў творчасці – пісаў аперэты, кантаты, рамансы. Падтрымліваў сувязь са сваімі мінскімі настаўнікамі і сябрамі. У 1843 годзе вандроўная трупа немца Шмідкофа паставіла ў Мінску яго аперэту „Латарэя”, прэм'ера якой з поспехам прайшла. У той жа час там былі выдадзены і першыя музычныя творы Манюшкі – два сшыткі эцюдаў для фартэпіяна.

Жывучы ў недалёкай Вільні, кампазітар часта гасцяваў у Мінску, дзе ў яго завязаліся новыя знаёмствы і перш за ўсё, дружба і плённае творчае супрацоўніцтва з Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам, а таксама з вядомым скрыпачом, педагогам і кампазітарам Канстанцінам Кжыжаноўскім. Акрамя таго, Манюшка ездзіў у гэты горад па справах, звязаных з фальваркам Убель, які перайшоў яму ў спадчыну. І вось у пачатку 50-ых гадоў у садружнасці з Канстанцінам Кжыжаноўскім і Вікенціем Стафановічам (братам Дамініка) Манюшка напісаў на творы Дуніна-Марцінкевіча чатыры камедыцыйныя оперы: „Рэкруцкі набор”, „Спаборніцтва музыкаў”, „Чарадзейная вада” і „Сялянка” („Сельская ідылія”), дзе выкарыстаў матывы з беларускіх народных песень і танцаў. Музыка, нотныя запісы да гэтых твораў, на жаль, не захаваліся, і толькі нядаўна польскі музыказнавец У. Пожняк знайшоў у адной з Віленскіх бібліятэк лібрэта і музыку да оперы „Рэкруцкі набор”.

Трапляючы ў Мінск, Манюшка спыняўся звычайна ў доме Дуніна-Марцінкевіча. Вядомы прывітальны „Верш Навума Прыгаворкі”, напісаны і зачытаны пісьменнікам перад сябрамі ў кастрычніку 1856 года (усе з'ехаліся на дваранскія выбары

або так званыя кантракты). У падзагалоўку твора названы тыя, каму ён прысвячаецца: „На прыезд да места Менска Апалінара Концкага, Уладзіслава Сыракомлі і Станіслава Манюшкі”.

...Засвяцілі тры звёздачкі ў пару нам шчасліву!
Заляцелі тры сакалы дый на нашу ніву!..
А трэці дудар між намі ўзрос, ён нам братка,
Яму Мінская зямелька родненькая матка!..
Трэці дудар як загудзе песенькі радненькі,
Бяды дый гора забудзеш, станеш весяленькі!
А так думкі прыуныўны соладка спявае,
Што за сэрца, баш кляшчамі, дзетачкі, хватае!

*Пераклад Паўлюка Пранузы*

Пра духоўную сувязь з Беларусяй, з народнымі песнямі і музыкай, пра дружбу са сваімі землякамі гавораць і шматлікія творы Манюшкі (гэта ён „трэці дудар” у Дуніна-Марцінкевіча). Амаль усе яны напісаны на вершы землякоў. Так вядома, што яшчэ ў 1844 годзе ён звяртаўся да паэта і фалькларыста Яна Чачота з просьбай выслаць вершаваныя тэксты. Апошні збіраў, запісваў беларускія песні, перакладаў іх на польскую мову, ставячы сваёй мэтай пазнаёміць адукаваную, чытаючую публіку з багаццем беларускіх песень, і ў рэшце рэшт выдаў некалькі зборнікаў, куды ўвайшло каля тысячы нацыянальных музычных твораў. Словы некаторых песень, што даслаў паэт, аказаліся знаёмымі, блізкімі кампазітару – чуў у дзяцінстве, і ён лёгка паклаў іх на музыку. Толькі ў 1848 годзе на вершаваныя запісы Чачота Манюшка напісаў песні: „Дубрава”, „Думка”, „Зязюля”, „Сірата”, „Сонейка”, „Шумі, гай”, „Пералётная птушка”, „Выбар”. Выкарыстоўваў ён для сваіх твораў і вершы Міцкевіча, Сыракомлі. Так склаўся цыкл „Песні прынёманскіх вёсак”, які ўвайшоў потым у зборнік „Хатнія спеўкі”.

Трэба сказаць, што ў Мінску творы Манюшкі, напісаныя на аснове беларускага фальклору, адразу набылі папулярнасць, часта выконваліся музыкантамі і спевакамі-аматарамі. Дый у наш час яго песні пастаянна ўваходзяць у рэпертуар беларускіх оперных артыстаў, у так званы залаты фонд фанатэкі Беларускага радыё.

Сталася знамянальнай падзеяй пастаноўка камічнай оперы „Сялянка” 9 лютага 1852 года ў Мінску – прагучала першая беларуская опера. Лібрэта яе Дунін-Марцінкевіч напісаў у 1842–1844 гадах. (У 1846 годзе двухактавы твор выдаваўся асобнай кніжкай у Вільні ў друкарні Завадскага.) У складанні музыкі яшчэ браў удзел Канстанцін Кжыжаноўскі. Колькі мі-




Помнік С. Манюшку ў Вільні

нула часу паміж напісаннем музыкі і пастаноўкай оперы, сказаць цяжка. Дэкарацыі да спектакля падрыхтаваў мастак Адам Шамеш.

Калі лібрэта „Сялянкі" захавалася і ўваходзіць цяпер ва ўсе выданні твораў Дуніна-Марцінкевіча, то запіс музыкі – партытура Манюшкі і Кжыжаноўскага, на жаль, згублены. Праўда, у 60-ых гадах беларускі літаратуразнавец Адам Мальдзіс знайшоў у адной з варшаўскіх бібліятэк партытуру дзвюх арый з оперы, перапісаў іх, перадаў у Акадэмію навук БССР, але і там запісы недзе прапалі. Застаецца дапоўніць, што спектакль гэты яшчэ два разы ставіўся ў Мінску – у 1853 і 1855 гадах, а таксама ў правінцыі – у Глуску, Бабруйску, Слуцку, Нясвіжы, Віцебску.

У творчасці Манюшкі трэба вылучыць эпахальнае здзяйсненне – у 1847 годзе ён закончыў вядомую оперу „Галька", якая азначала нараджэнне польскай нацыянальнай оперы! Пастаўлены аматарскім калектывам спачатку ў Вільні, потым двойчы – у 1856 і 1858 гадах – у Мінску спектакль толькі праз дзесяць гадоў выпусціў Варшаўскі оперны тэатр. Публіка з захапленнем сустрэла оперу, што сведчыла аб поўным прызнанні кампазітара, яго вялікім трыумфе. Тут жа Манюшку прапанавалі месца галоўнага рэжысёра Вялікага тэатра ў Варшаве. Акрылены поспехам, ён адну за адной піша оперы „Плытагоны", „Графіня" і „Страшны двор". Апошняя стала вяршыняй яго опернай творчасці. Дарэчы, і ў гады ўжо поўнага поспеху Манюшка, які пастаянна жыў у Варшаве, не раз прыязджаў у Мінск – у 1860, 1861, 1863 гадах, і апошні раз – у 1864-ым.

У сваіх творах кампазітар змог перадаць нацыянальны дух польскага народа, і яшчэ пры жыцці быў прызнаны нацыянальным польскім кампазітарам, заснавальнікам польскай оперы. Меладычнасць, задушэўнасць, дэмакратызм яго песень, арый з опер, асабліва „Галькі", безумоўна, бачацца ў тым, што ў іх аснове ляжаць матывы беларускага і польскага фальклору, якія Манюшка чэрпаў з жыватворнай крыніцы народных песень і танцаў і вяртаў успрынятае ўжо ў выглядзе сваіх таленавітых твораў, што сталі здабыткам сусветнай музычнай культуры. Творчая спадчына народжанага і выхаванага на беларускай зямлі класіка польскай музыкі, аўтара музыкі да першай беларускай оперы, кампазітара Станіслава Манюшкі належыць і беларусам, з'яўляецца і нашай нацыянальнай гордасцю.

5 Зак. 3792.

# Бядулеў Пасадзец

Упершыню я трапіў у Пасадзец пятнаццаць гадоў назад, калі рабіў свой першы пераход з Мінска ў Даўгінава па вядомым гасцінцы...

Даўгінаўскі тракт – так яшчэ называлі гэтую ў свой час бойкую дарогу – ідучы строга на поўнач, не толькі злучаў губернскі горад Мінск са старадаўнім гандлёвым мястэчкам Даўгінавам, але, як можна цяпер адзначыць, праходзіў і праз асаблівы беларускі Парнас. Амаль у адзін час пры шляху жылі пачынальнікі, класікі беларускай літаратуры – Ядвігін Ш., Янка Купала, Змітрок Бядуля, будучае творчае ядро „Нашай нівы". Тут знаходзіўся хутар Кур'янаўшчына, радзіма вядомага дзеяча Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, паэта, драматурга, аўтара папулярнага вадэвіля „Збянтэжаны Саўка" Леапольда Іванавіча Родзевіча (загінуў падчас рэпрэсій 1937 года).

Ці выпадкова, ці ёсць таму пэўныя прычыны, што менавіта пры адным гасцінцы, па-суседску раслі, мужалі, у многім складваліся як творчыя асобы выдатныя пісьменнікі, сказаць цяжка. Але блізкасць бойкай дарогі, якая давала магчымасць жыхарам невялікіх вёсак, фальваркаў больш шырокіх, рознабаковых зносін ці дазваляла ўсяго за які-небудзь дзень апынуцца ў Мінску, відаць, адыграла сваю ролю ў лёсе, у развіцці будучых літаратараў.

Знаёмы гэты мне шлях родны, –  
Даўгінаўскі вядомы шлях!  
Які нёс годных і нягодных  
На векавых сваіх плячах.  
З Даўгінава ў Мінск балаголы  
Па ім, бывала, дзень у дзень...  
Ад дзёгцю пах, скрыпня ад колаў,  
Шум ад людзей...  
І ўсё як цень!..

*Я. Купала.*  
*„Па Даўгінаўскім гасцінцы"*

Недзе да 20–30-ых гадоў нашага стагоддзя амаль адзіным транспартным сродкам на Даўгінаўскім, як і на іншых бела-

рускіх шляхах, быў конь. Да рэвалюцыі на кірмаш у мястэчка, а калі і ў Мінск сяляне ездзілі на сваіх конях, запрэжаных у простыя вазы, сані. Мясцовыя паны, багацейшая шляхта мелі ўласны выезд, а, кажучы сучаснай мовай, грамадскім транспартам на гасцінцы лічыліся балаголы. У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя на Беларусі яны ўяўлялі сабой асобны тып прафесіянальных ламавікоў, фурманкі якіх наймалі для перавозу людзей, грузу, з імі ж можна было пад'ехаць і спадарожна. Менавіта балаголы многія дзесяцігоддзі заставаліся прызнанымі гаспадарамі амаль усіх беларускіх шляхоў, гасцінцаў і толькі дзякуючы ім на дарогах існавалі падобныя на Пасадзец маленькія, абавязкова з корчмамі мястэчкі.

„Трухкоча брычка па дарозе, – сам Разымблюм за фурмана", – з падкрэсленай пашанай прыгадвае Купала ва ўжо ўспомненым вершы балагола, што не раз браў яго ў свае седакі. Змітрок Бядуля, які таксама сябраваў не з адным з тых „капітанаў", амаль цалкам прысвяціў ім у аўтабіяграфічнай аповесці „У дрымучых лясах" раздзел „Караваны". Варта прывесці ўрывак:

„...Перавозкай тавараў займаліся патомныя ад дзядоў і прадзедаў балаголы. Яны называліся камісіянерамі. Гэта былі людзі-асілкі, абветраныя сцюжай і абпаленыя спёкай. Усе нібы на падбор, высакарослыя, барадатыя, у доўгіх бобрыкавых балахонах з капюшонамі, падпярэзаныя шырокімі рамнёвымі паясамі. Ад камісіянераў пахла дзёгцем, гарэлкай, конскім потам і лесам.

...Па начах ездзіць з дарагімі таварамі ды з кайстрамі, напакаванымі „кацярынкамі" (сторублёвымі асігнацыямі) было небяспечна. Рэдка калі ездзілі ўначы... На камісіянераў адбываліся часам напады і сярод белага дня. Таму яны ездзілі караванамі. Камісіянеры мелі пры сабе сякеры, чачоткавыя даўбежкі, пісталеты, таму на іх нападалі рэдка...".

...Балагол ўжо не было і толькі невялікую – пад Мінскам – частку Даўгінаўскага гасцінца „ахоплівалі" маршрутныя аўтобусы, таму я вырашыў ісці пешшу. Вядома ж, хацелася нетаропка разгледзець стары тракт, яго наваколле, больш адчуць сябе ў тым часе. (Дарэчы, некалі і фурманы-балаголы і іх седакі, асабліва папутныя, значную частку гарыстай дарогі, якой з'яўляўся гэты шлях, праходзілі побач з гружонай фурай таксама пешшу – шкадавалі коней.) Тракт тады мяне сапраўды ўразіў: асфальт ляжаў толькі на першых ад Мінска дваццаці кіламетрах – да Лускава, астатнія восемдзесят, за Даўгінавам, цягнуўся той жа спрадвечны балаголаўскі пясчаны і гліністы, прарэзаны каляінамі, у калдобінах і лужынах гасцінец. Абапал яго – рэдкія, глухія вёсачкі, там-сям палі, затое скрозь – зараснікі алешніку, месцамі лясы, часцей хваёвыя.



З. Бядуля ў маладосці

Запусценне, адзічанне старога шляху мела пэўныя прычыны. У 1921 годзе яго перарэзала за Віліяй, перад Каменам, дзяржаўная граніца з Польшчай, потым пачалося знішчэнне хутароў, на якіх у гэтых гарыстых, лясных мясцінах з невялікімі латкамі палёў жыла значная частка насельніцтва. У Вялікую Айчынную вайну амаль уся Лагойшчына стала партызанскай зонай. Падчас блакады фашысты спалілі частку вёсак і, між іншым, разбурылі на Даўгінаўскім гасцінцы ўсе масты.

Значныя тэрыторыі ў Лагойскім і колішнім Плешчаніцкім раёнах проста ператварыліся ў абязлюдзеўшую, параслую кустоўем пустыню.

І вось я зноў трапіў у прыдарожную вёску Пасадзец. Сюды з Мінска цяпер штодзённа ідзе прамы аўтобус. Мясцовыя жыхары нават жартуюць: аўтобусаў у нас зараз як у Мінску. Сапраўды, яшчэ не так даўно ўсё было інакш, цяпер жа ў паселішча можна дабрацца не толькі „мінскім", але і асобнымі аўтобусамі з Лагойска, а таксама з Плешчаніц. Прычыны такіх відавочных змен, ажыўлення краю розныя. З боку сталіцы каля тракта паўсталі і працягваюць будавацца дачныя пасёлкі. Тут Даўгінаўскі шлях даўно заасфальтаваны і па ім, асабліва ў суботу і нядзелю, штогадзіны бяжыць аўтобус. Далей раскінуліся вялікія „перспектыўныя" вёскі – Дзяніскі, Крэмянец, за імі, на поўнач, ляжаць лясныя абшары, пушча.

У Пасадзец мяне прывяло нясцерпнае жаданне наведаць на радзіме славутага майстра слова, класіка беларускай літаратуры, паплечніка і сябра Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Ядвігіна Ш. – Змітрака Бядулі яго літаратурна-мемарыяльны музей.

Падчас вайны вёску напаткаў лёс многіх лясных, „партызанскіх" паселішчаў – амаль усю яе спляжыў агонь. Не стала хаткі, у якой нарадзіўся Самуіл Плаўнік (сапраўднае імя пісьменніка), згарэў дом, дзе пазней жылі яго бацькі. Таму музей Змітрака Бядулі знаходзіцца ў мясцовай школе. Будынак узведзены адразу пасля вайны – драўляны, амаль квадратны, стаіць на ўзгорку, у глыбіні двара, на якім відаць некалькі ўжо немаладых яблынь. На пярэдняй сцяне, каля вугла замацавана мемарыяльная дошка з надпісам: „У вёсцы Пасадзец 6 мая 1886 года (23 красавіка па старому стылю) нарадзіўся выдатны беларускі пісьменнік Змітрок Бядуля. Тут ён правёў дзіцячыя і юнацкія гады і пачаў сваю літаратурную дзейнасць". А на звычайнай шыльдзе – „Пасадзецкая няпоўная сярэдняя школа" ёсць ганаровы дадатак: імя Змітрака Бядулі.

У самой школе чыста і цёпла (быў зімой, у студзені). Але адразу непрыемна ўразіла „ўпрыгожанне" столі і часткова сцен – яны выкладзены белай з рознымі ўзорамі гіпсавай пліткай. Даніна зараз пагалоўнаму захапленню дырэктароў сельскіх школ – чым мы горш за іншых! – гіпсоўкай. З часам, безумоўна, зразумеюць, што такая шалёўка столі, сцен негігіенічная, і потым – дзе ж густ? Можна апраўдаць такое аздабленне падземнага пераходу ці вакзальных памяшканняў, але толькі не школы, дзе ўмовы павінны быць набліжаны да звычайных, хатніх. Чаму б, калі ёсць сродкі ды жаданне, не абабіць панелі, столь звычайнай дошчачкай, дрэва ж лічыцца на Беларусі традыцыйным будаўнічым матэрыялам. Яго прырод-

ная фактура прыгожая, цёплая, да таго ж зверху можна пацягнуць лакам. Але шыкоўнасці ў Пасадзецкай школе, відаць, прыдаюць значную ўвагу – вокны ў класах упрыгожаны доўгімі, да самай падлогі цюлевымі фіранкамі...

А вось музей пісьменніка на радзіме – такая магчымасць выкарыстаць яго з мэтай выхавання вучняў, у літаратурна-эстэтычных мэтах, чым здавалася б, перш за ўсё і павінна вылучацца невялікая вясковая школа – вельмі ўбогі. На сценах класа літаратуры вывешаны тры сціплыя, адразу відаць, самаробныя стэнды з вядомымі, галоўным чынам з падручнікаў, фотаздымкамі самога Змітрака Бядулі і пісьменнікаў, яго сучаснікаў, сяброў, з цытатамі з твораў, ілюстрацыямі да абразка „Пяць лыжак заціркі”. Прытым здаецца, гэта ўсё тыя ж самыя стэнды, што віселі тут і пятнаццаць гадоў назад. А нядаўна ж адзначалася стагоддзе з дня нараджэння празаіка! У шафе ляжаць кнігі з аўтографамі літаратараў, якія бывалі ў Пасадцы, у школе, а таксама выданні Змітрака Бядулі з надпісамі яго брата Мацвея, жонкі апошняга і сына. У дзвюх старых папках захоўваюцца астатнія экспанаты музея і архіў, у тым ліку дакумент, які варта было б паказаць. Змест яго наступны: „Савет Міністраў БССР, пастанова № 2147, 4 снежня 1946 года, горад Мінск. Аб мерапрыемствах у сувязі з 50-годдзем з дня смерці вядомага беларускага празаіка Змітрака Бядулі. Савет Міністраў пастанавіў: прысвоіць імя Змітрака Бядулі сярэдняй школе мястэчка Пасадзец Плешчаніцкага раёна, дзе доўгі час жыў пісьменнік.

Старшыня Савета Міністраў БССР П. Панамарэнка”.

Гэта ўжо гісторыя. Безумоўна, можна адшукаць для экспазіцыі здымкі вяскоўцаў – знаёмых, сяброў Бядулі, цікавыя рэчы таго часу. Дзед пісьменніка, напрыклад, працаваў меднікам і кавалём, а маці яго шыла жаночыя каптуры (ёсць у Бядулі і абразчык „Каптурніца”). Так што медная конаўка, коўшык, дый адшуканы недзе ў старым куфры каптурык толькі б абагацілі калекцыю, так сказаць, матэрыялізавалі яе. Варта б знайсці фотаздымкі даваеннага ці нават дарэвалюцыйнага Даўгінава, дзе ў хедары – пачатковай яўрэйскай школе, а потым пэўны час у ешыбоце – школе рабінаў, вучыўся Самуіл Плаўнік. Між іншым, у паселішчы захавалася масіўная пабудова з чырвонай цэглы – каркас адной з тых школ.

Адзіны, можна лічыць, прыстойны экспанат і ўпрыгожанне музея – выкананы скульптарам Заірам Азгурам бюст маладога Змітрака Бядулі, які, здаецца, добра, шчыра ўсміхаецца дзецям. Не аказалася на гэты раз (а раней былі) запісаных у свой час вучнямі каштоўных успамінаў пра яго сяброў юнацтва, таварышаў па рабоце на лесанарыхтоўках, на сплаве – Пятра Трафімавіча Анкуды, жыхара суседняй вёскі Рэпішча, і адна-

годка пісьменніка, ураджэнца Пасадца Станіслава Іосіфавіча Гярко. Меліся тут і даволі арыгінальныя ілюстрацыі да твораў Бядулі, яго біяграфіі, створаныя па ініцыятыве колішняга дырэктара школы К. С. Зянькевіча (сцэны па бядулеўскіх сюжэтах спецыяльна для фотаздымкаў разыгрывалі вучні). Напрыклад, такая: паблізу цёмнага лесу пасуцца коні, дагарае вогнішча, а каля яго бачны постаці задрамаўшых пастухоў – сюжэт з вядомага абразка „Пяюць начлежнікі". Памятаюцца фатаграфіі знакамітай Паненскай горкі – месца традыцыйных збораў і гульняў моладзі ў часы, калі тут жыў пісьменнік, і старога Даўгінаўскага тракту.

Як зараз выглядае Пасадзец, што засталося тут з даваеннай пары? Вёска, якая павялічылася, прыблізна ў тры разы, па-ранейшаму цягнецца ўздоўж Даўгінаўскага гасцінца. Хаты – звычайныя для сучаснай сельскай Міншчыны. Свае, уласныя, маюць неблагі выгляд, ашалёваныя, пафарбаваныя. У дварах – хлявы, і хлявушкі (гаспадары трымаюць жывёлу), ёсць сады. Трапляюцца і фінскія домікі, абкладзеныя цэглай, відаць, калгасныя кватэры. А з даваенных пабудоў зберагліся толькі тры ці чатыры хаты з пачарнелых бярвенняў. Над ўсёй вёскай пануе круглая, парослая некалькімі старымі, скрыўленымі хвойкамі Паненская гара.

„...Калі над зубчатымі грэбнямі лясоў разгульвалі вятры, хаты маленькага мястэчка Пасадзец былі аглушаны гулам лясоў, нібы шумам своеасаблівых вадападаў", – піша Бядуля ў аповесці „У дрымучых лясах". Да знакамітых плешчаніцкіх лясоў, адкуль гонкія хвойкі і яліны тралявалі, звозілі на берагі Дзвінасы і сплаўлялі па ёй у Вілію, пэўны час меў самыя прамыя адносіны і малады канторшчык лесараспрацоўкі Самуіл Плаўнік. Цяпер той лес значна парадзеў дый адступіў ад паселішча. Але на поўдзень ад вёскі, абапал Даўгінаўскага гасцінца, чысты хвойнік так і цягнецца кіламетрамі. Суцэльная сінь яго стаіць і на ўсходнім гарызонце. „Сталых" дрэў тут нямнога – усё яшчэ адчуваецца значны звод лясоў на будоўлі ў пасляваенны час: давалі ўсім, хто пагарэў, пацярпеў, адпраўлялі на Мінск. Аднак мясціна гэтая як была, так і застаецца лясной, хоць мала ўжо гаманлівых бядулеўскіх хвойнікаў, а ў большасці маладняк, які сёння займае ў краі, відаць, больш за палову тэрыторыі.

Цікавы факт: зараз ні самі пасадцы, ні суседзі не называюць паселішча, як у былыя часы, мястэчкам. Хоць у пачатку нашага стагоддзя тут і стаяла хат дваццаць (праўда, меліся два млыны, карчма і кузня, дзе працаваў меднікам і кавалём дзед пісьменніка), Пасадзец лічыўся мястэчкам. Відаць, пры старадаўнім бойкім гасцінцы яно і склалася як паселішча рамеснікаў і гандляроў, аб чым сведчыць яго назва. (Пасад – так у

феадальных гарадках звычайна менавалася месца, дзе жыў рамесніцкі, гандлярскі люд.)

Але ўявіць гэтую ў нечым тыповую, у нечым непаўторную мясціну ў лясной глушы лепш за ўсё дазваляе сваім мастацкім словам сам Змітрок Бядуля. Мала хто з беларускіх пісьменнікаў пакінуў больш праўдзівае, больш пранікнёна-лірычнае апісанне роднага кутка. Высокамастацкія, вобразныя малюнкі дае Бядуля ў „У дрымучых лясах”.

„Праз Пасадзец праходзіў стары тракт на Мінск. Гэта надавала маленькаму мястэчку вялікае ажыўленне. Дзень у дзень праязджалі і спыняліся ў пасадзецкіх корчмах дзесяткі фурманак. З самых аддаленых вёсак Віленшчыны ездзілі ў Мінск караваны з ільном, збожжам, скурай, мясам, маслам, шчэццю, мёдам, пянькой, пушнінай, птушкай, яйкамі ды іншымі сельскагаспадарчымі прадуктамі. З Мінска везлі для крамнікаў дзесяткаў мястэчак мануфактуру, галантарэю, бакалею, скабяныя ды іншыя тавары... Па дарозе ў Мінск камісіянеры бралі пасажыраў, або, як яны самі называлі, – седакоў, іншых шляхоў зносін з Мінскам не было”.

А вось і прафесійны, сацыяльны склад седакоў, дарэчы, пэўная карцінка грамадства канца XIX – пачатку XX стагоддзя.

„...Пасажыры былі разнастайныя: крамнікі і крамнічыхі, прапаведнікі, настаўнікі, студэнты, гімназісты, музыкі, дробныя чыноўнікі, рабіны, прадаўшчыкі ікон і крыжыкаў, прадаўшчыкі біблії і яўрэйскіх багамолляў, папы, ксяндзы, агенты па страхаванню жыцця, па страхаванню ад пажараў, рамеснікі, ювеліры, фокуснікі і шмат, шмат іншых...”.

А як трапна малюе аўтар ужо адышоўшыя ў нябыт, а некалі такія звычайныя на беларускіх гасцінцах корчмы:

„...У Пасадцы былі дзве карчмы. Адна з іх вялікая – са стадолай на дваццаць падарожніцкіх фур. Пры карчме была крама і шынок, у які гарэлку прывозілі бочкамі з недалёкага панскага бровара. Часта прыязджалі акцызнікі, правяралі градусы гарэлкі і бралі ў карчмара хабар. У карчму хадзілі мястачковыя даведацца ў камісіянераў і пасажыраў аб тым, што дзеецца на свеце. Газет ніхто не чытаў...”.

„...Такія карчмы-станцыі мінскі тракт (Даўгінаўскі. – *Л. П.*) меў, бадай, праз кожныя дзесяць кіламетраў. Па гэтых карчмах камісіянерскія караваны спыняліся нанач. Тут п’янствала навакольнае сялянства. Тут аддавалі за гарэлку апошні пуд збожжа, апошні кажух. Тут ачумелыя п’яніцы біліся каламі, абдымаліся, цалаваліся ды зноў пілі ды зноў біліся... Ля карчмы заўсёды бывала „весела” – галоўны тэатр, галоўнае відовішча аколіцы...”.

Максім Багдановіч сказаў пра Бядулю: „Гэта пісьменнік з



„Я. Купала і З. Бядуля ў рэдакцыі „Нашай нівы".
*Фотарэпрадукцыя з карціны Я. Ціхановіча і І. Давідовіча*

душой чулай і паэтычнай". Уладзіслава Францаўна Луцэвіч, жонка Купалы, успамінаючы першыя сустрэчы з пісьменнікам у Вільні, у рэдакцыі „Нашай нівы", дзе ён з 1912 года працаваў разам з Купалам, аб яго творчасці, стылі пісала: „Мова Змітрака Бядулі чаравала сваёй мяккасцю і сакавітасцю, вельмі блізкая да народнай, яна адначасова была высокакультурнай мовай, здольнай выказваць самыя тонкія адчуванні... Усе мы з цікавасцю слухалі Бядулю. Асабліва цікавіліся ім Цётка і Ядвігін Ш., якія прысутнічалі пры сустрэчы...".

Аб сваёй літаратурнай спадчыне, аб яе вытоках сам Змітрок Бядуля сказаў: „Кожнае слова маё – шчыры ўспамін убогай вёскі. Кожны радок маёй песні – малюнак перажыванняў гаротнага, простага беларуса". Той „убогай вёскай", дзе пісьменнік чэрпаў сваю непаўторна мяккую, сакавітую народную мову, жыццёвыя ўражанні, дзе адбываліся галоўныя падзеі большасці яго твораў, быў перш за ўсё – Пасадзец – радзіма пісьменніка.

5а Зак. 3792

# Вяртанне ў Багданава

Бадай, любы мастак – ці майстар слова, ці музыкант, ці жывапісец – можа назваць мясціны, дзе збіраліся, праламляліся яго першыя ўяўленні, успрыйманні свету, складваўся, выспяваў талент. Часцей за ўсё гэта „родны кут" – краіна дзяцінства, юнацтва. Скарб тых уражанняў бясцэнны для творчай асобы, ён – яе вызначальны фундамент.

Фердынанду Рушчыцу (1870–1936), выдатнаму жывапісцу свайго часу, якога не без падстаў лічаць сваім і беларусы, і палякі, і літоўцы, у гэтых адносінах пашанцавала. Ён нарадзіўся ў сям'і дробнапамеснага шляхціца, лад жыцця якой быў цесна звязаны з беларускімі вёскамі палявой і лясной Ашмяншчыны з яе працавітым і кемлівым сельскім жыхарствам – сейбітамі, леснікамі, местачковымі рамеснікамі. Разам з тым бацька мастака быў высокаадукаваным чалавекам, сапраўдным інтэлігентам, ён мала чым нагадваў тыповага для таго часу панка-гаспадара. Валодаючы дзвюма сотнямі гектараў зямлі і лесу, млынам, сыраварняй, Рушчыц-старэйшы, як пазней і яго сын, гаспадаркай амаль не займаўся, даверыўшы яе сваякам, эканомам, а доўгія гады служыў чыноўнікам-казначэем у Лібаве, Маскве, Мінску. Захапляўся тэатрам, сабраў у Багданаве багатую бібліятэку, якую Рушчыц-малодшы павялічыў да некалькіх тысяч тамоў, набываючы рэдкія і дарагія выданні – па гісторыі і этнаграфіі, кнігі рускіх, польскіх, французскіх класікаў, а таксама альбомы рэпрадукцый з любімых ім твораў жывапісу, графікі.

Маёнтак Багданава, які перайшоў да Фердынанда ад бацькі, быў родавым, вотчынным, што пацвярджаюць старадаўнія помнікі на сямейных могілках, дзе даты нараджэння Рушчыцаў, продкаў мастака, пазначаны нават пачаткам ХУІІІ стагоддзя. Хоць дома Рушчыцы звычайна карысталіся польскай мовай, але Фердынанд адзначаў сваё паходжанне менавіта ад беларускай шляхты і ведаў, што толькі недзе ў канцы ХУІІ стагоддзя яго продкі прынялі каталіцтва, з якім паступова прыйшла польская мова, польская культура.

Галоўная сядзіба размяшчалася каля старой дарогі, што

агінала сінія адгор'і Налібоцкай пушчы і лугавую даліну ракі Альшанкі, перагароджанай у некалькіх месцах плацінамі пад млыны. Мінскі тракт падыходзіў сюды ад Валожына і Вішнева і далей, праз Дзесятнікі, вёў у старажытныя Гальшаны, а адтуль – на Ашмяны і Вільню. Унізе па абодва бакі гасцінца туліліся хаты Багданава. Як згадваў жывапісец, вёска і старая дзедава сядзіба былі для яго не толькі кроўна роднымі, але менавіта гэты куток беларускай зямлі стаў тым адзіным, дзе склаліся першыя адчуванні радзімы. Тут ён усвядоміў сябе мастаком, тут адчуў творчую сілу, тут стварыў свае лепшыя палотны. І куды б не кідаў яго лёс, а Рушчыц жыў у Пецярбургу, Варшаве, Кракаве і Вільні, ездзіў у Італію, Берлін, Парыж, на Балтыку, заўсёды цягнула дамоў, у Багданава.

Першымі гарадамі, куды Фердынанд прыязджаў з бацькам, былі Вільня, Мінск. Кемлівы, старанны юнак пастУпіў у Мінскую гімназію і закончыў яе з залатым медалём. Тут пад кіраўніцтвам вопытнага настаўніка, выхаванца Пецярбургскай акадэміі мастацтва К. Я. Ермакова, якога з удзячнасцю ўспамінаў усё жыццё, Рушчыц упершыню захапіўся жывапісам, адчуў радасць творчасці. Але яшчэ, мабыць, не быў упэўнены, ці яго прызначэнне – мастацтва, і таму пайшоў спачатку на юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Аднак праз два гады перавёўся вольным слухачом у Акадэмію мастацтва, а праз год зрабіў канчатковы выбар – стаў акадэмістам.

Здольнага навучэнца заўважылі, яго настаўнікамі сталі майстры рускага рэалістычнага жывапісу І. Шышкін і А. Куінджы. Мастак усё жыццё вёў дзённік, які зберагла яго старэйшая дачка – Яніна Рушчыц, вядомы польскі мастацтвазнавец, аўтар амаль усіх, што выходзяць у Польшчы, каталогаў, артыкулаў, прысвечаных творчасці, педагагічнай і асветніцкай дзейнасці свайго бацькі. Аб значэнні, якое Рушчыц прыдаваў сваім педагогам у Акадэміі мастацтва, гавораць хоць бы вось гэтыя ўрыўкі з таго дзённіка:

„27.X.1894 года. Мяркую, што Шышкін спецыяльна заехаў параіцца з Куінджы наконт каляровай танальнасці ў маіх карцінах. Я быў задаволены гэтым паведамленнем. Што б яны не сказалі, ці добра ці дрэнна, але нарэшце ёсць нехта з гэтых недасягальных прафесараў, хто цікавіцца маім талентам...

Шышкін быў у мяне даволі доўга... Ведаю, што ён гаворыць – праўда. Але мучыць мяне іншае – не магу выказаць усяго, што ў сабе адчуваю. Мяне яшчэ не пазналі настолькі, каб не баяцца памыліцца адносна майго таленту. Ведаю, Шышкін мяне паважае, але таксама ведаю – яшчэ не ацаніў у жывапісе. Няўжо ніколі не зразумеюць, што магу даць нешта новае ў мастацтве! Няўжо гэтага не відаць у маіх творах. Адчуваю, што маю дараванне..."



„Ля касцёла". *Фотарэпрадукцыя з карціны Ф. Рушчыца*

Дыплом Пецярбургскай Акадэміі мастацтва Фердынанд Рушчыц атрымаў у 1897 годзе за карціны „Вячэрняя зорка" і „Вясна". Апошнюю адразу набыў для сваёй галерэі Пётр Траццякоў. А праз два гады жывапісец перавёз у Пецярбург палотны „Балада", „Зямля" і прыняў удзел у выстаўцы „Свет мастацтва", а таксама ў „Веснавой выстаўцы" ў Акадэміі.

Поўны сіл, смелых парыванняў, малады мастак за пяць гадоў (з 1898 па 1902) напісаў каля двух дзесяткаў сваіх лепшых твораў (праўда, да многіх з іх ён пачаў цэліцца – рабіў эцюды – яшчэ ў акадэміі). У іх ліку – эпічная „Зямля", „Балада", „Млын ноччу", „Мінск зімой", „Стары млын", „Каля касцёла", „У людзі", „Мост зімой", „Эмігранты". Амаль ва ўсіх карцінах – матывы роднага кута, багацейшы ўсплёск устойлівых, назапашаных з дзяцінства ўражанняў. „Багданаўскія" палотны прынеслі Рушчыцу вядомасць, іх адзначаў нават І. Рэпін.

У тыя гады мастак з Беларусі завязвае сяброўства з В. Пурвітам, А. Рылавым, М. Рэрыхам, М. Чурлёнісам – яны таксама займаліся ў майстэрні А. Куінджы. Усе мелі агульныя погляды на жывапіс, мастацтва, у нечым і агульную манеру пісьма. Гэта былі прадстаўнікі новага напрамку. Застаючыся вернымі сваім настаўнікам-рэалістам, яны даволі моцна адчувалі на сабе ўплыў імпрэсіянізму (палітра твораў эмацыянальна-каларытная, багатая, яркія фарбы). У той жа час кожны з плеяды гэтых выдатных майстроў вылучаўся сваёй непаўторнай індывідуальнасцю. Так, у творчасці Рушчыца на працягу ўсяго жыцця будуць прыкметны ўздзеянні віленскай, беларускай народнай школ, польскага мастацтва.

Жывапісец доўга, упарта вучыўся ў выдатных, паважаных ім майстроў пэндзля. І, відаць, адчуўшы, што і сам можа нешта перадаць маладым, хутка пасля заканчэння акадэміі заняўся выкладчыцкай дзейнасцю. Спачатку працаваў у школе прыгожых мастацтваў у Варшаве, потым яго запрасілі на пасаду прафесара ў Кракаўскую мастацкую акадэмію, затым на працягу трыццаці гадоў (да канчатковага пераезду ў 1932 годзе ў Багданава) – узначальваў кафедру прыгожых мастацтваў у Віленскім універсітэце. Яго навучэнцамі сталі такія самабытныя беларускія мастакі, як Язэп Драздовіч, Пятро Сергіевіч, Язэп Горыд.

...Маёй правадніцай па колішняй сядзібе Рушчыцаў была старэнькая, але яшчэ з лёгкай паходкай, спрытная мясцовая жанчына Марыя Іосіфаўна Есянчак. Як высветлілася, недзе яшчэ ў 1920 годзе жонка Фердынанда „пані Ганна", пачуўшы аб нялёгкім жыцці дзяўчынкі-сіраты з Багданава, узяла яе да сябе на службу. Марыя Іосіфаўна прарабіла ў маёнтку трыццаць гадоў, вяла па дому, куды летам збіралася немалая сям'я (Рушчыцы мелі шасцёра дзяцей), ды амаль заўжды хто-небудзь гасцяваў, усю гаспадарку, была, як у той час называлі, ахмістрыняй.

Прыблізна з сярэдзіны Багданава брукаваная дарога-алея, абсаджаная бярозамі, вядзе ўгару, да сядзібы Рушчыцаў. Вакол прастора пагоркавых палёў. Лес адсюль далекавата, таму

месца былога котлішча перш за ўсё выдзяляюць адзінокія, разрозненыя, здаецца, выпадкова сюды трапіўшыя дрэвы. Іх – стогадовых, таўшчынёй у абхват і больш – засталося дзесяткі тры-чатыры. Гэта магутныя каранiстыя дубы і ўсё яшчэ стромкія клёны. А над ручаём, які перасякае сядзібу, стаіць некалькі закаваных у чорную кару высокіх гладкаствольных вольхаў. На адной з іх відаць старое, шматслойнае, падобнае на стажок сена, буслінае гняздо.

Па ўскраінных дрэвах – добра працярэбленых прысадах, што ўзняліся на схілы, можна і зараз вызначыць контуры, межы колішняга парку. Быў ён амаль квадратны і займаў плошчу з гектараў пяць. Са старых рушчыцкіх пабудоў захаваліся ў ніжняй, гаспадарчай частцы сядзібы свіран з грубых часаных бярвенняў, з шырокай лабастай страхой (Марыя Іосіфаўна ўдакладніла, што ўнутры яго падлога і столь, зробленыя яшчэ пры дзядулі Фердынанда, між іншым, без адзінага цвіка) і побач з ім – напалову ўкапаны ў зямлю падмурак былой цаглянай сыраварні. У верхнім кутку парку захавалася рэдкае дэкаратыўнае ўпрыгожанне – выкладзены з шэрых камянёў гарбаты масток, што нагадвае віадук пад горным патокам. Пад мастком застаўка плаціны, за якой і па сённяшні дзень трымаецца невялікае азярцо. Як не прыкра, старадаўняя сядзіба аддадзена пад ферму мясцовай гаспадаркі...

Марыя Іосіфаўна добра памятае і паказвае мясціны, з якіх Эрні (такое ласкавае імя Фердынанда прыжылося з лёгкай рукі ягоных цётухнаў, чый маёнтак знаходзіўся недалёка ад Багданава, у Вайганах) „маляваў прыроду". Вось уцалелая з тых часоў бярозавая алея, што ад могілак спускаецца да тракта, да багданаўскіх хат. На пагорку, пад ніцымі, тады яшчэ не старымі дрэвамі, і быў адзін з любімых куточкаў мастака. Адсюль ён добра бачыў абодва свае дамы. Двухпавярховы мураваны і драўляны выцягнуты флігель, абсаджаны кустамі бэзу і ружаў. Ад „камяніцы", спаленай у час вайны, а потым разабранай на цэглу для падмуркаў і печаў, засталася толькі высокая горка шчэбеню. Дарэчы, менавіта гэты будынак паслужыў прататыпам для вядомай карціны Рушчыца „Пустка", створанай у 1901 годзе ў Вільні.

Мая правадніца згадвала, што ў двухпавярховым муры Рушчыцы фактычна не жылі, і зімой толькі зрэдку, каб не было сырасці, палілі старыя печы-галандкі. Але менавіта тут размяшчалася бібліятэка і ў найбольш асветленым пакоі другога паверха знаходзілася „працоўная" – майстэрня Фердынанда. Пісьменнік Пятро Бітэль бываў на сядзібе Рушчыцаў яшчэ да 1939 года. Дочкі мастака тады ўжо жылі ў Вільні і ў фальварак наязджалі зрэдку. Дзедаўская камяніца – яе, дарэчы, замаляваў і Пятро Іванавіч, выглядала нейкай аголенай, няўтульнай,

стаяла на ўсіх вятрах. Вельмі дасканала яна перададзена на палотнах самога мастака. Багатая бібліятэка Рушчыцаў загінула разам з домам. Але часткова парасцяганыя кнігі яшчэ траплялiся Бітэлю і ў пасляваенны час у багданаўскіх крамах, дзе выкарыстоўваліся звычайна для ўкручвання тавару.

Затое драўляны, акуратна складзены з бярвенняў, на дзве палавіны дом быў утульны, цёплы, прасторны. Тут жыла ўся вялікая сям'я і яшчэ хапала месца шматлікім гасцям – сваякам, сябрам і вучням самога Рушчыца (не аднойчы наведваўся сюды Язэп Драздовіч), сябрам яго дзяцей, ужо гімназістаў, студэнтаў, што з'язджаліся ў Багданава, асабліва ў летнія канікулы, з Вільні, Мінска, Варшавы. Толькі калі станавілася цесна і ў спальнях і ў гасцінай, моладзь „высялялі" начаваць у „пустку". Марыя Іосіфаўна расказвала, што Рушчыцы, і гаспадар, і гаспадыня, былі на дзіва прыветнымі, чулымі людзьмі, вялікімі хлебасоламі. Летам на абед амаль кожны дзень каго-небудзь запрашалі. Па мерках таго часу заможнымі Рушчыцы не лічыліся, але у сям'і ўсе вучыліся, усе працавалі. А сродкі, даходы ішлі на вучобу дзяцей, на шматлікія паездкі па Расіі і за мяжу. Між іншым, вядома, што Фердынанд, нягледзячы ні на якія недахопы ў грашах, штогод адлічваў пэўную суму на ўтрыманне сіроцкага дома ў Вільні. Абсталяванне, убранне пакояў у Рушчыцаў былі вельмі сціплымі, што нават выклікала некаторае неразуменне панкоў-суседзяў. Фердынанд любіў старадаўнія рэчы, мэблю. У доме стаялі розныя пафарбаваныя куфры, раскладныя драўляныя крэслы, шафы і сталы з пачарнелага ад часу дрэва і, вядома, віселі карціны, шматлікія малюнкі самога гаспадара, яго вучняў і сяброўмастакоў.

Захавалася яшчэ адно месца, дзе Рушчыц любіў расстаўляць мальберт, – астравок пасярод сажалкі, на якім расце лазовы куст. Сюды некалі вяла кладка. Мастак рабіў малюнкі і гэтага дзівоснага куточка. Пышная зеляніна вакол сажалкі, ручая з яркімі, сакавітымі зараснікамі аеру, рагозу з эцюдаў і замалёвак жывапісца перайшлі на многія яго лірычныя пейзажы. Паказвала Марыя Іосіфаўна і тую мясцінку, дзе перад фасадам драўлянага дома расла старая скрыўленая яблынька, якую Рушчыц, ужо маларухомы, левай рукой (правая была паралізавана) не раз маляваў.

З ахвотай мастак працаваў і пад старымі клёнамі на процілеглым канцы парку. Адсюль адкрывалася прастора багданаўскіх палёў. І недахопу ў матывах для напісання карцін жывапісец не адчуваў.

Не ўцалелі рушчыцкія пабудовы ў Багданаве, але збярогся, хоць крыху і перароблены, стары фальваркавы дом (яму каля ста пяцідзесяці гадоў), які належаў яшчэ дзеду Фердынанда

нанда, у недалёкай ад Багданава вёсцы Вайганы. Часткова там захаваліся прысады, парк. Дом вялікі, прамавугольны, з мезанінам пад высокім дахам. Фасад, відаць, упрыгожваў традыцыйны, з драўлянымі калонамі порцік. Да нядаўняга часу будынак быў жылым, зараз яго перарабляюць пад клуб.

...У сярэдзіне вёскі Багданава за мураванай агароджай стаяў невялічкі ашаляваны дошкамі, што ўжо „пасівелі" ад часу і дажджоў, касцёл. Узводзіўся ён на месцы згарэўшага і, як сведчаць мясцовыя старажылы, дасканала паўтараў колішні. Яго небеспадстаўна называлі рушчыцкім, бо менавіта гэтаму вясковаму касцёлу і рубленай вежы-званіцы ў кутку двара лёс наканаваў трапіць на славутыя палотны мастака. Адна з першых карцін – „Каля касцёла" (напісана ў 1899 годзе) зараз уваходзіць у пастаянную экспазіцыю Дзяржаўнага мастацкага музея БССР. Яе можна лічыць характэрным прыкладам мастацкага стылю Рушчыца. Тут злучаюцца і пейзаж, і жанравая карціна, дзе настрой, эмацыянальную напружанасць ствараюць, падкрэсліваюць не толькі цьмяныя фігуркі багданаўскіх жанчын, якія прыйшлі ў ясны вясенні дзень да касцёла і моляцца ў двары, але і на яркім небе аблокі, і рухомыя блакітныя цені ад маладых (толькі яшчэ параспускаліся) дрэўцаў.

Набрыў я і на той куточак, адкуль мастак так нечакана – зверху ўбачыў і адлюстраваў на палатне „Млын" надзіва сакавітымі, мяккімі фарбамі маляўнічую патаемную мясцінку. Гэта рушчыцкі вадзяны млынок, які знаходзіўся ў суседніх Далькавічах. Прыкмеціў яго малады Рушчыц з высокага насыпу чыгуначнага палатна, што дугой выгінаецца ў ваколіцах Багданава. Адсюль, збоку моста цераз Альшанку, з вышыні пэўна васьмі-дзесяці метраў і зараз відны ў карычневатай вадзе зялёныя, абымшэлыя палі былых млынарскіх стаўкоў, запасная пратока, па якой адводзілася лішняя вада, кусты лазняку і альхоўніку ўздоўж колішняй дарогі. І вядома, напоўненыя чароўным святлом лірычныя пейзажы мастака – „Ляснoе возера", „Зімовая казка", „Берагі Альшанкі", ствараліся па лёгка пазнаваемых багданаўскіх сюжэтах.

Так што межы пленэра жывапісца лёгка акрэсліць – гэта перш за ўсё роднае Багданава: сядзіба, вёска, палі, лес у ваколіцах, даліна неглыбокай Альшанкі, на якія без малога сорак гадоў Рушчыц глядзеў вачыма таленавітага мастака, чалавека, моцна ўлюбёнага ў свае родныя мясціны. Так, менавіта на мясцовых матывах ім былі задуманы, створаны напружанай творчай працай (захаваліся літаральна сотні багданаўскіх эцюдаў, малюнкаў алоўкам, накідаў) і адразу ж прызнаныя палотны, што экспанаваліся на самых буйных выставах у Пецярбургу, Маскве, Вільні, Кракаве і Варшаве (пры жыцці Рушчыц выстаў-

ляўся каля шасцідзесяці разоў) і прынеслі яму ўсееўрапейскую вядомасць.

Зноў-такі зазначым, што, вярнуўшыся пасля доўгіх вандровак за мяжой на радзіму, мастак не замыкаўся ў адным толькі Багданаве. Ён любіў наведвацца ў дзедаўскі фальварак у Вайганы, хадзіў пешшу ў Вішнева – мястэчка са старажытным касцёлам (закладзены ў ХУ стагоддзі), які месціцца на язычніцкім капішчы, ездзіў на ровары (веласіпедзе) у Крэва, Гальшаны.

Некалькі адасоблена ў творчай спадчыне жывапісца стаяць яго гістарычныя пейзажы. Сярод іх найбольш выразна абагульняе мінулае краю карціна „Крэва" (захоўваецца ў Бібліятэцы Акадэміі навук Літвы). На ёй адлюстравана знакамітая сваёй змрочнай „біяграфіяй" Княжацкая вежа Крэўскага замка, дзе быў загублены вялікі князь Кейстут, адкуль ледзь вырваўся Вітаўт...

Захапленне гістарычным мінулым сваёй зямлі пачалося ў Фердынанда Рушчыца яшчэ з юнацкіх гадоў, з першых наведванняў Вільні, дзе на старых вуліцах былой сталіцы Вялікага княства Літоўскага амаль на кожным кроку ён сустракаўся са старадаўнімі будынкамі – касцёламі, манастырамі, замкамі, раскошнымі палацамі магнатаў. Пазней рабіў аб'езды гістарычных помнікаў, у тым ліку і ў бліжэйшых мясцінах – Лідзе, Міры, Навагрудку, ужо ў якасці старшыні Камісіі па ахове помнікаў старажытнасці, калі быў прафесарам Віленскага універсітэта. Але ён заўсёды заставаўся мастаком, і тыя быццам бы службовыя паездкі-камандзіроўкі зноў жа давалі новыя звесткі, уражанні, якія ўвасабляліся ў цікавых карцінах, гравюрах, дэкарацыях да спектакляў на гістарычныя тэмы. Напрыклад, вядома цэлая серыя каштоўных і па мастацкім выкананні і па дакументальнасці малюнкаў, створаных Рушчыцам у 1930 годзе пад сценамі віленскай катэдры – касцёла святога Станіслава. Выйшаўшая з берагоў рака вымыла з патаемнага, нікому дагэтуль невядомага касцёльнага склепа дамавіны славутых князёў. З тых археалагічных знаходак, што з'явіліся так нечакана, старшыня камісіі па ахове помнікаў старажытнасці ў першыя ж часы зрабіў дзесяткі замалёвак...

Марыя Іосіфаўна ўспамінала, што мастак большую частку года жыў у Вільні, але заўжды наведваўся ў родны дом на Вялікдзень, увосень на дажынкі. (Дарэчы, калі яму адзявалі традыцыйны вянок, шчодра адорваў жней.) І зімой на каляды таксама прыязджаў. Ужо хворы Рушчыц вярнуўся ў Багданава напрыканцы свайго веку. Правёў на радзіме апошнія чатыры гады жыцця, тут і памёр. Пахаваны на сямейных могілках побач са сваімі бацькамі і дзядамі...

Магілу мастака знайшоў адразу – шырокая, у абрамленні дзірвану, што ажывае кожную вясну маладой травой і палявымі кветкамі, прысыпаная па мясцоваму звычаю жоўтым пяском. На пліце помніка з шэрага граніту выбіты крыж, унізе словы: „Фердынанд Рушчыц. 1870–1936. Мастак, прафесар Віленскага універсітэта”.

Ад пагоста ва ўсе бакі расцякаецца поле. Яно даходзіць да клёнаў і ліп на старой сядзібе, да цеснага строю вясковых хат ля тракта і, перакінуўшыся цераз яго, амаль дабягае да хуткай Альшанкі. Багданаўскае поле паліта потам многіх пакаленняў...

...У дваццацідзевяцігадовым узросце, у самы росквіт свайго таленту, ужо заўважаны мастацкай грамадскасцю, Фердынанд Рушчыц, звяртаючыся да ўласнага дзённіка, як да лепшага сябра, пісаў: „...Дзённік ты мой! Каб ты толькі ведаў, як жадаю быць толькі добрым сынам сваёй Айчыны, для яе працаваць, араць, а калі што вырасце – ёй аддаць, бо люблю яе ўсім сэрцам сваім і ёй толькі належу і целам і душой”. Гэтаму запавету мастак служыў, заставаўся верным да канца жыцця.

# Доктар Нарбут

Яшчэ да вайны невялікі павятовы гарадок Браслаў толькі і займаў вузкі перашыек сушы паміж азёрамі Дрывяты і Навята. Месца, так і хочацца сказаць, класічна прыгожае, быццам з ідылічнай паштоўкі: з любога боку блакітнае люстэрка вады, на берагах пясчаныя, сухія ўзгоркі (па-мясцоваму – камы), і куды ні глянь – на гарызонце, ці зусім блізка, ці ў далечы за возерам сінеюць лясы.

Вуліцы Браслава, як і галоўная дарога Даўгаўпілс – Полацк, праходзяць уздоўж перашыйка, агінаючы наколькі тое магчыма круглую, узнятую над узроўнем азёр на 30–40 метраў Замкавую гару – Браслаўскі замак. Тут нават і з падножжа яе відаць: гэта гарадзішча са штучнымі, крутымі ўмацаванымі схіламі. Археалагічныя раскопкі паказалі, што Браслаў узнік у IX–X стагоддзях на месцы спаленага латгальскага паселішча. Пазней, у XI–XIII стагоддзях ён ужо з'яўляўся пагранічным, умацаваным горадам Полацкага княства, які атрымаў сваю назву па імені полацкага князя Брачыслава Ізяславіча – Брачыслаўль. Так што сённяшнія водныя далячыні ў даўніну выкарыстоўваліся перш за ўсё як надзейныя абарончыя рубяжы, дзякуючы чаму на маленькім кавалку сушы і вырасла старажытнае паселішча, затым – замак-крэпасць і нарэшце горад.

Вяршыня пануючай над наваколлем Замкавай гары зараз апранута ў купкі маладых дрэў. На заходнім краі яе ўзвышаецца бетонная стэла, якую добра відаць з большай часткі горада, з новых і старых дарог, што сыходзяцца ў Браславе, з возера Дрывяты. Хоць калі, але на вежы запальваецца ліхтар. Дык можа гэта які-небудзь незвычайны, рэдкі геадэзічны знак ці маяк для рыбакоў і турысцкіх лодак? А можа нешта з мінуўшчыны, ад часоў Брачыслава? З такімі меркаваннямі ўпершыню падымаешся на Замак. Але вось ён, вал, які абкружае вялікую паніжаную пляцоўку – былы дзядзінец. Тут, што натуральна для замкаў-крэпасцей ранняга беларускага сярэднявечча, стаяў тын з магутных ялін альбо дубовых паляў, па вуглах уздымаліся вежы. Аднак стэла ніякага дачынення да

гэтага археалагічнага запаведніка, відаць, не мае: каменна-цагляныя прыступкі, на іх – квадратны пастамент, з якога імкнецца ўвысь сапраўдны бетонны слуп. На пастаменце ў нішы памятная дошка... Яшчэ зусім нядаўна ніякага подпісу, акрамя наскрэбаных літар-ініцыялаў аматараў насценнага пісьма тут не было: больш за тры дзесяцігоддзі славуты браслаўскі помнік, цяпер гэта разумеюць усе, прастаяў „нямым”, прытым здзек над ім рабіўся наўмысна.

Ну, а калі спусціцца з гары і на вуліцы ў каго-небудзь з мясцовых жыхароў спытаць, што за слуп стаіць там, то ў лепшым выпадку чалавек у гадах адкажа: што помнік пастаўлены доктару, можа дадаць – браслаўскаму, а вось прозвішча ўжо наўрад ці хто назаве. Між іншым доктар той меў адно са старадаўніх, некалі добра знаных на Беларусі прозвішчаў – Нарбут. Прадстаўнікі гэтага славутага роду, вядомага ў краі з ХУІІІ стагоддзя, былі не толькі дзяржаўнымі дзеячамі, але і філосафамі, асветнікамі, вайскоўцамі. У Беларускай савецкай энцыклапедыі названы тры Нарбуты: Казімір (1738–1807) – ураджэнец Лідскага павета, палітык, асветнік, філосаф, які ўваходзіў у вядомую сваёй прагрэсіўнай дзейнасцю Эдукацыйную камісію і выдаў у Вільні першы падручнік па логіцы на польскай мове; Тэадор (1784–1864) родам з маёнтка Шаўры Лідскага павета, гісторык, археолаг, ваенны інжынер рускай арміі (дарэчы, аўтар праекта Бабруйскай крэпасці), удзельнік руска-шведскай і напалеонаўскай войнаў, узнагароджаны ордэнам Святога Уладзіміра і двума ордэнамі Ганны. Пасля кантузіі пасяліўся ў сваім маёнтку, заняўся навукай – сур'ёзнай, сапраўднай працай на ніве гісторыі, археалогіі. Адным з першых пачаў весці на Беларусі археалагічныя раскопкі, ён жа аўтар шырока вядомай дзевяцітомнай „Гісторыі літоўскага народа” і іншых даследаванняў. Акрамя таго, расшукваў і публікаваў каштоўныя гістарычныя крыніцы, дзякуючы менавіта яму пабачыў свет старажытны летапіс Хроніка Быхаўца; Людвіг (1832–1863) – сын Тэадора, дэмакрат, рэвалюцыянер. Падчас паўстання 1863–1864 гадоў узначальваў інсургентаў Лідскага павета. Тры месяцы яго атрад вёў няспынную барацьбу з царскімі карнікамі. Паўстанцкае кіраўніцтва прысвоіла Людвігу Нарбуту званне палкоўніка. Загінуў ён у баі, у Дубічанскіх балотах.

Акрамя Людвіга Тэадор меў яшчэ двух сыноў – Баляслава (таксама ўдзельнічаў у паўстанні, за што саслалі ў Сібір) і Станіслава, малодшага, якому было тады гадоў дзесяць-адзінаццаць. Паўстанне, смерць брата пакінулі ў душы Стася глыбокі след і, безумоўна, адыгралі сваю ролю ў фарміраванні яго патрыятычных поглядаў, пачуцця справядлівасці, мэтанакіраванасці.



С. Т. Нарбут

Тэадора Нарбута, на той час ужо вядомага вучонага-гісторыка, чалавека сталага ўзросту, з сям'і якога выйшлі два вядомыя бунтаўшчыкі, таксама пакаралі: прымусова выселілі з родавага фальварка Шаўры („гнязда інсургентаў") у Вільню. Там Станіслаў паспяхова скончыў гімназію. Паўстала пытанне: дзе працягваць вучобу. Віленскі універсітэт, які ў свой час закончыў яго бацька, быў абвешчаны расаднікам рэвалюцыйных ідэй у Заходнім краі і закрыты. У 1864 годзе Нарбут-старэйшы памёр, таму ўжо пры дапамозе яго сяброў у 1872 годзе Стасю ўдалося ўладкавацца ў Мюнхенскі універсітэт. Праз сем гадоў вучобы ён вытрымаў экзамен на ступень доктара медыцыны і вырашыў вярнуцца на сваю радзіму. Так у 1879 годзе доктар Нарбут пасяляецца ў невялікім мястэчку Браславе, цэнтры акругі, які ўваходзіў тады ў Нова-Аляксандраўскі павет Ковенскай губерні.

Пятнаццаць гадоў Станіслаў працаваў як прыватны ўрач, бо, згодна з тагачаснымі правіламі, з замежным дыпломам ён мог мець толькі прыватную практыку. Інтэлігентны, усебакова адукаваны, ды з немалым працоўным вопытам, Нарбут, які заўсёды з задавальненнем вучыўся, ужо ў саракагадовым узросце закончыў яшчэ і медыцынскі факультэт Дэрпскага (зараз Тартускі) універсітэта і атрымаў неабходны яму „расійскі" дыплом. У 1904 годзе яго прызначылі на вакантную пасаду ўрача другога ўчастка ў Браславе, дзе ён жыў, дзе яго добра ведалі і як спецыяліста, і як чалавека. Можна пагадзіцца, што і сам Станіслаў Тэадоравіч ужо прывязаўся да Браслаўшчыны і, відаць, чакаў гэту пасаду, бо мог (а ўрачоў тады бракавала) знайсці месца недзе ў другім, суседнім павеце.

Знамянальным у жыцці доктара стаў 1907 год: перш за ўсё ягонымі намаганнямі ў Браславе была пабудавана і адкрыта земская бальніца. І зараз ля падножжа Замкавай гары, на адыходзячай у бок вуліцы не цяжка пазнаць, адрозніць ад сучасных пабудоў масіўны, з моцнай, чырвонай цэглы яе аднапавярховы будынак. А ў мясцовым краязнаўчым музеі захоўваецца унікальны групавы здымак, зроблены на фоне Нарбутавай бальніцы на ўрачыстасцях пры яе адкрыцці, – у першым радзе прысутных стаіць сам доктар.

Пачалася першая сусветная вайна. Прызваны на службу ўрач узначаліў воінскі лазарэт у Латвіі. Падчас абстрэлу атрымаў цяжкае раненне і яму ампуціравалі нагу. Дарэчы, варта прыгадаць, што і бацька яго быў двойчы паранены. Толькі ў 1919 годзе Нарбут вярнуўся ў Браслаў, зноў стаў павятовым урачом, узначаліў ахову здароўя людзей у павеце. Ён праводзіў процізпідэмічныя мерапрыемствы, шмат сіл траціў для паляпшэння санітарнай службы і, нягледзячы на калецтва, амаль да апошніх дзён працягваў лячэбную практы-

ку. Памёр доктар Станіслаў Тэадоравіч Нарбут у сакавіку 1926 года, на семдзесят чацвёртым годзе жыцця. Дзіўнаму азёрнаму куточку Беларусі ён аддаў амаль трыццаць сем гадоў працы.

Але не ўсімі забыты Нарбут: біяграфію, жыццёвы шлях чалавека, які атрымаў ад землякоў, несумненна, самае ганаровае для ўрача імя – народны доктар – аднаўляе зараз Андрэй Майсяёнак, краязнавец з Гродна.

І сёння ў гарадку і яго наваколлі жывуць людзі, якія ведалі доктара Нарбута. Былыя пацыенты, вядома, ужо ва ўзросце, з удзячнасцю і пашанай успамінаюць свайго ўрача, падкрэсліваючы яго чалавечнасць, справядлівасць і самаадданасць справе. Навуковы супрацоўнік Браслаўскага краязнаўчага музея Кастусь Шыдлоўскі запісаў некалькі падобных успамінаў. Акрамя таго, у бальнічным архіве яму ўдалося адшукаць рэцэпты, выпісаныя рукой Нарбута, фотаздымкі таго часу, лісты да афіцыйных асоб і іншыя дакументы, што высвятляюць вобраз браслаўскага народнага доктара, якасці яго моцнай, непахіснай натуры.

Так, ні цяжкая рана, ні перашкаджаючы руху пратэз не пазбавілі аптымізму доктара, яго добразычлівасці да людзей і перш за ўсё да сваіх пацыентаў. Напрыклад, пры цяжкім стане хворага Станіслаў Тэадаровіч, як звычайна, сам ехаў да яго, і не толькі на якую-небудзь браслаўскую вуліцу, але і ў вёску. Бывала, асабліва зімой, хворае дзіця ці стары чалавек занядужае, не можа ўстаць, доктар, хоць і на пратэзе, нават падымаўся да яго на печ, каб агледзець, паслухаць. Вядомы выпадкі, калі Нарбут за свой кошт клаў хворага, які не меў сродкаў, у бальніцу, даваў грошы на дарагія лякарствы. Між іншым, успамінаюць: ён, дасканала валодаючы некалькі еўрапейскімі мовамі, з задавальненнем гаварыў са сваімі пацыентамі, асабліва з вёсак, па-беларуску. Памятаюць у Браславе і яго „бітву" з польскімі ўладамі за вызваленне памяшкання бальніцы ад староства, што размясцілася тут у 1921 годзе. У Вільню, Варшаву, у самы сейм пайшлі ад доктара лісты, у якіх ён патрабаваў ад высокіх чыноўнікаў умяшацца ў гэту беззаконную, з замахам на здароўе людзей усяго павета справу. Будынак усё ж такі вярнулі бальніцы. Тым часам Станіслаў Тэадаровіч прымаў хворых у сваім доме, а тры пакоі наогул аддаў пад палаты.

Дарэчы, дом Нарбута ўцалеў, стаіць каля возера ў маляўнічым месцы, зацэнены некалькімі старымі таполямі. Ён драўляны, даволі вялікі, ашалёваны, пафарбаваны ў зялёны колер. Зараз тут размяшчаецца гарадская амбулаторыя. І было б вельмі прыемна бачыць на будынку хаця б сціплую мема-

рыяльную дошку, дзе б адзначалася, што пабудаваны ў пачатку XX стагоддзя дом належаў браслаўскаму доктару Станіславу Нарбуту.

Але самым красамоўным сведчаннем павагі і ўдзячнасці гэтаму цудоўнаму чалавеку, вядома ж, з'яўляецца магіла і ўжо ўспомнены незвычайны, унікальны помнік на ёй, спраектаваны і ўзведзены на сабраныя людзьмі грошы. Між іншым, сярод матэрыялаў мясцовага музея захоўваецца дакумент, які сведчыць, што месца пад магілу і помнік Нарбуту ахвяраў на сваёй зямлі, на замку, жыхар Браслава Томаш Жарык. Як ужо згадвалася, завяршае помнік ліхтар, некалі газавы, цяпер электрычны. Стэла-паходня сімвалізуе дэвіз: „Свецячы іншым, згараю...".

Здавалася б, у любы гістарычны час памяць пра ўрача, што сваёй дзейнасцю яшчэ пры жыцці заслужыў ганаровае, прытым дадзенае не афіцыйнымі ўладамі, а самімі людзьмі, званне народнага доктара, трэба толькі ўшаноўваць, тым больш берагчы унікальны, таксама народны помнік на яго магіле. Але, відаць, бескультур'е, дзікунства не мае межаў: больш як трыццаць пяць гадоў (амаль столькі Нарбут самааддана працаваў у Браславе!) гэты помнік стаяў „скалечаным" – з выбітай мармуровай дошкай, пашкоджаным, замаляваным пастаментам. А ў пачатку пяцідзесятых гадоў у заўзятых ахоўнікаў раённай савецкай улады ўвогуле быў намер знесці яго як „панскі", „польскі". Асабліва раздражняў новых начальнікаў надпіс на польскай мове. Да таго ж помнік узведзены не толькі на сродкі, сабраныя народам, але і на грошы, ахвяраваныя графіняй Плятар (яе маёнтак знаходзіўся непадалёку, у Ахрэмаўцах). Не знеслі – паленаваліся ці да часу забыліся, усё ж не на вачах стаіць, а недзе там, воддаль. Але ўсё роўна быў зроблены ўчынак (гэта таксама наша гісторыя!), кашчунства якога цяжка перабольшыць: у нішы стэлы ўмацавалі новую дошку, дзе значылася, што помнік пастаўлены ахвярам Айчыннай вайны... Праўда, пратрымалася яна нядоўга, відаць, нехта з кіраўнікоў нарэшце ўцяміў усю ганебнасць падобнага аднаўлення помніка. Райвыканкам жа па-свойму адзначыў свяшчэннае для браслаўцаў месца пахавання Станіслава Нарбута, а адначасова і гісторыка-археалагічны помнік горада – замак: амаль побач некалькі гадоў раней адбудавалі платную танцпляцоўку...

Аднак пэўны зрух усё ж такі ёсць. Зусім нядаўна супрацоўнікі Браслаўскага краязнаўчага музея дабіліся таго, што помнік Станіславу Нарбуту быў адноўлены і ў нішы на драўлянай, адпаліраванай дошцы з'явіўся надпіс: „Нарбут С. Т. 1853–1926. Таленавітаму ўрачу, гуманісту ад удзячных жыхароў Браслаўшчыны".

Існуе, вядома, і іншая памяць пра выдатную сям'ю Нарбутаў. Не мінуў у сямідзесятых гадах XIX стагоддзя іх фальварак Шаўры знакаміты майстар гісторыка-архітэктурных пейзажаў Напалеон Орда. Подпіс пад яго малюнкам кароткі: „Шаўры, маёмасць Нарбутаў".

Мастак адлюстраваў звычайны для XIX стагоддзя фальварковы дом небагатага беларускага шляхціца, маёнткам, палацам які ніяк не назавеш. Ён аднапавярховы, драўляны, з высокім, крытым гонтай, дахам. Побач яшчэ адзін невялікі, магчыма, таксама жылы будынак. Па другі бок за шчыльнай агароджай стаяць хлявы, свірны. За пабудовамі кусты, лес, двор сыходзіць да ракі. Месца маляўнічае, утульнае. На пярэднім плане – дробныя фігуркі людзей каля пераправы. Жывапісец стварыў мастацка-гістарычны вобраз (у многім дакументальны) Шаўраў часоў Нарбутаў.

Фальварак не захаваўся, нават ніякіх прыкмет, дзе быў двор, дзе стаялі будынкі, не засталося – скрозь чыстае поле. Адзінае, што існуе – недалёка ад колішняй сядзібы вёска Шаўры. У суседнім паселішчы Нача ў касцёле пахаваны (маецца надмагільная пліта) Тэадор Нарбут, на могілках у Шаўрах – яго жонка Хрысціна і сын Баляслаў.

Да стадваццаціпяцігоддзя з дня смерці Тэадора Нарбута, а таксама да юбілею паўстання 1863 – 1864 гадоў паблізу шаўраўскага пагоста быў пастаўлены памятны знак – у шэры граніт умацавана бронзавая дошка з кароткім надпісам: „1864–1989 гг. Сям'і Нарбутаў. Нашчадкі". Вядома яна датычыцца і Станіслава Тэадоравіча Нарбута – славутага браслаўскага ўрача.

# Паэтычная калыска Купалы

Я не сокал зоркавокі
Не арол адважны,
Што так думна за аблокі
Узносіцца з іх кажны.

Нават я не салавейка,
Што пяе так слаўна,
А я толькі верабейка,
Узрошчаны пад Гайнай...

*„Я не сокал"*

„Узрошчаны пад Гайнай...". Так сам Купала абазначыў, якому кутку беларускай зямлі ён абавязаны сваім нараджэннем як паэт, як пясняр.

Гайна – калісьці невялікае, ля вытокаў ракі Гайны і паблізу Лагойска, мястэчка. Вуліцы выцягнуты ўздоўж лугавой, з купамі лазняку і алешніку, рачной даліны. Доўгі час – тры стагоддзі – паселішча вылучалася змрачнаватымі мурамі парафіяльнага касцёла, пры якім ужо ў ХУІ стагоддзі была заснавана каталіцкая духоўная школа. І яшчэ адна асаблівасць Гайны: да нядаўняй пары яна славілася сваімі пладаноснымі вішнёвымі садамі.

Хоць Сямёнаў-Цяньшанскі і назваў Лагойшчыну краем дрымучых лясоў, але зямля гэтая была заселена, абжыта здаўна. Яе мінулае бярэ пачатак з вытокаў гісторыі Беларусі. Менавіта Лагойск, згодна летапісу – Лагожск, Лагожаск, уваходзіў у трохкутнік старажытных гарадоў-княстваў Ізяслаў–Менск–Лагожск, што ўзніклі ў цэнтры тэрыторыі сучаснай Беларусі яшчэ ў Х–ХІ стагоддзях. З ХІІ стагоддзя – сталіца Лагожскага ўдзельнага княства Полацкай зямлі, з ХІУ – у складзе Вялікага княства Літоўскага, як важны апорны цэнтр, папераменна ім валодалі Ягайла, яго брат Скіргайла і вялікі князь Вітаўт. Пазней Лагойск з'яўляўся ўласнасцю князёў Чартарыйскіх, а з пачатку ХУІ стагоддзя – Тышкевічаў.

Пад Лагойскам у маёнтку князя Саламарэцкага жыў, працаваў адзін з самых адукаваных людзей свайго часу –

вучоны-палеміст, пісьменнік, педагог, аўтар „Грамматики славенския правильная синтагма" Мялецій Сматрыцкі. На Лагойшчыне нарадзіліся заснавальнікі беларускай навуковай археалогіі, стваральнікі першага на Беларусі, прытым у самім Лагойску, музея гісторыі, археалогіі, этнаграфіі вучоныя браты Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы. І сярод вядомых беларускіх вучоных – этнографаў, гісторыкаў, літаратараў – нямала менавіта „гайнаўцаў". Гэта славянафіл, фальклярыст, этнограф, дыялектолаг, а таксама адзін з заснавальнікаў польскай і беларускай археалогіі Зарыян Даленга-Хадакоўскі; ураджэнец мястэчка пісьменнік і перакладчык на польскую мову Гарацыя, Русо, Байрана, выдавец-рэдактар часопіса „Віленскі штотыднёвік" Ігнат Шыдлоўскі. Тут, пад Гайнай, у засценку Альховец, у 1868 годзе нарадзіўся Яўген Ляцкі – гісторык рускай літаратуры, этнограф, прафесар Пражскага універсітэта, які сабраў і апублікаваў яшчэ ў 1904 годзе каля двухсот беларускіх песень, запісаных ім на радзіме ў Гайна-Слабодскай воласці...

Так што дар Купалы, яго магутны талент узраслі, праявілі сябе не на голым месцы.

Але акрамя паэтычнага вызначэння – „я толькі верабейка, узрошчаны пад Гайнай" – ёсць яшчэ кароткая заўвага і ў аўтабіяграфіі паэта: „...свае дзіцячыя гады я правёў у розных кутках Барысаўскага і Мінскага паветаў, вандруючы ад арэнды да арэнды".

Большасць мясцін, па якіх амаль трыццаць гадоў вандравала сям'я беззямельнага арандатара Дамініка Ануфрыевіча Луцэвіча – Юзэфава, Касціна, Прудзішча, Аўгустова, Слабодка, Гаяны, Селішча, Мачаны, Казіміраўка, Бяларучы, Малыя Бясяды, Карпілаўка, Акопы, – усё гэта лагойскія вёскі, вёсачкі...

Бяжыць пад коламі гасцінец,
Бягуць прысадзіны назад.
Вакол бясконца свет-дзядзінец,
Палеткі, вёскі, лес, як сад.
Знаёмы гэты мне шлях родны, –
Даўгінаўскі вядомы шлях!

*„Па Даўгінаўскім гасцінцы"*

Хоць і раз'езджаны, разбіты („...з гары на горку кульдык-кульдык то ўвысь, то ўдол...") гасцінец быў тут адзінай больш-менш надзейнай транспартнай артэрыяй – дарогай у губернскі Мінск, а ў другі бок, праз Даўгінава на Вілейку і Полацк, шляхам, якім Купала, куды б яго лёс ні кідаў – у Вільню, Пецярбург, Смаленск, Маскву, Мінск, – заўсёды вяртаўся,

прыязджаў дадому, да маці... Так што не дзеля адной рыфмы назваў паэт яго „знаёмым", „родным"...

## *ЮЗЭФАВА – КОСІНА*

У вядомых аўтабіяграфічных пісьмах да свайго першага біёграфа, крытыка і публіцыста Льва Максімавіча Клейнбарта Купала скрупулёзна пералічыў усе фальваркі і вёскі, маёнткі і бровары, дзе яму ў дзяцінстве, у юнацтве давялося жыць, бываць, працаваць.

Юзэфа і Косіна – невялікія маёнткі на захадзе былога Барысаўскага павета. Ці захаваліся тут якія-небудзь прыкметы таго даўняга часу?

Рэвалюцыя, грамадзянская вайна, Вялікая Айчынная – гэтыя падзеі нашага стагоддзя прынеслі з сабой, як вядома, шмат разбурэнняў, ахвяр. Не зліталіся войны дый сам час над тымі мясцінамі, дзе прайшло дзяцінства Купалы.

Знайсці Юзэфава, куды на службу з фальварка Вязынка пераехалі Луцэвічы і прывезлі гадавалага сына Яся, могуць памагчы ў суседнім Косіне, бо ад самога Юзэфава толькі і засталася сярод поля купка старых дрэў, а пад імі – зараснікі шыпшыны, бэзу. Ніводнай пабудовы, нават падмуркаў не відаць, хоць, безумоўна, калі побач і не было вёскі, дык каля маёнтка ў асобным, як звычайна, доме жылі парабкі, служачыя, і недзе паблізу знаходзіліся гаспадарчыя пабудовы – кароўнік, канюшня...

Лёс Косіна крыху інакшы. Сёння гэта вялікі населены пункт, цэнтральная сядзіба саўгаса „Косінскі". Знаходзіцца паселішча за дванаццаць кіламетраў ад Лагойска, на памежжы са Смалявіцкім раёнам і непадалёк ад старога гасцінца Дзяніскі – Барысаў. Але сучаснае Косіна – цалкам новая, пасляваенная вёска. Старая была спалена, знішчана ў 1944 годзе падчас баёў. Праўда, адна старая пабудова захавалася – колішні бровар маёнтка – спіртзавод.

Супрацоўнікі музея Янкі Купалы ў Мінску, настаўнікі і вучні Косінскай школы некалькі гадоў назад, апытваючы старажылаў, паспрабавалі вызначыць, дзе ўсё ж у Юзэфаве і Косіне мог жыць з сям'ёй служачы маёнтка Дамінік Луцэвіч, як выглядалі гэтыя месцы хоць бы і пасля рэвалюцыі. Але ніякіх звестак атрымаць не ўдалося, як не ўдалося пакуль знайсці і ніводнай старой фотакарткі маёнтка або навакольных мясцін.

Косінцы ганарацца, што свядомае дзяцінства Купалы пачыналася менавіта тут, на іхняй зямлі. Да стогадовага юбілею песняра ў мясцовай школе ў класе беларускай мовы і літаратуры адкрыўся пастаянны музей, экспазіцыя якога

прысвечана дзяцінству і юнацтву паэта. Музей яшчэ малады, і ў ліку яго экспанатаў толькі фотакопіі дома-музея на радзіме паэта, у Вязынцы, гравюры-партрэты (дарэчы, выкананыя пляменнікам Купалы, мастаком Іванам Раманоўскім) бацькоў– Даменіка Ануфрыевіча і Бянігны Іванаўны. Ёсць і самая ранняя з вядомых фатаграфій Купалы – шасцігадовы Ясь, якраз таго часу, калі Луцэвічы жылі ў Косіне...

## ПРУДЗІШЧА

Горы ды каменне,
Вузкія палоскі:
Гэта наша поле,
Поле нашай вёскі.
Курныя аконцы –
Каб святла хоць трошкі:
Гэта нашы хаты,
Хаты нашай вёскі...

*„Вёска"*

Паведамляючы ў аўтабіяграфічных пісьмах, у якім годзе і куды бацька пераязджаў з сям'ёй, Купала адзначаў: „У 1891 годзе кідае горад і бярэ ў арэнду фальварак Прудзішча памешчыка Жаброўскага Мінскай губерні і павета Бяларуцкай воласці". Праўда, не адразу з Косіна Луцэвічы перабраліся ў Прудзішча, а яшчэ двойчы мянялі месца жыхарства. Паўтара года Дамінік Ануфрыевіч служыў у маёнтку Сенніца пад Мінскам, і Ясь тады адну зіму вучыўся ў Сенніцкім народным вучылішчы. Потым Луцэвіч-старэйшы пераехаў у Мінск, дзе некаторы час працаваў рамізнікам. Аднак у горадзе сям'я пражыла нядоўга. Відаць, асаблівага дастатку новы занятак Даменіку Ануфрыевічу не прынёс, дый цягнула арандатара-запашніка (яго бацька і старэйшыя браты таксама сядзелі на арэндзе) да зямлі, хоць і чужой.

Трэба сказаць, што аж да Кастрычніцкай рэвалюцыі беззямельныя арандатары складалі пэўную праслойку сярод сельскага насельніцтва Беларусі. Мелася нават катэгорыя панскіх фальваркаў, якія пастаянна здаваліся часовым запашнікам. Сярод лясоў, на неўрадлівых землях Лагойшчыны гэта часцей за ўсё быў хутар дзе-небудзь на ўскрайку вёскі, назву якой ён і насіў. Цаніўся фальварак па колькасці і якасці зямлі, што лічылася за ім. Але, як правіла, такой сядзібе яшчэ належалі клінок сенажаці і выпас, зрэдку – сад, а таксама жылы дом, які часта мала чым адрозніваўся ад звычайнай сялянскай хаты і, вядома, гаспадарчыя пабудовы – хлеў, ток, гумно. Плата за арэнду трымалася высокая. Купала, успамінаючы

гады юнацтва, калі ўжо і сам працаваў, дапамагаў бацьку, зазначаў: „Жыць на арэндаванай зямлі было, безумоўна, вельмі цяжка, усе даходы сельскай гаспадаркі ішлі на выплату арэнды, работы ж было па горла". Не выплаціў запашнік у дамоўлены тэрмін арэнднай платы – і пан мог заўтра ж падаць на яго ў суд і выгнаць з фальварка. Што тут зробіш – няма сваёй зямлі, свайго прытулку, і мусіў бедалага-запашнік альбо, залазячы ў новыя даўгі, аплаціць арэнду, альбо шукаць новае месца, нярэдка трапляючы яшчэ ў большую кабалу. Уласна, па гэтых прычынах – то канчаўся тэрмін арэнды, то вельмі ўжо непасільнай была ўстаноўленая панам плата – беззямельны арандатар Луцэвіч усё жыццё і вандраваў па маёнтках, панскіх фальварках.

...Бацька пабываў з рэкамендацыяй у пана Жаброўскага, дагаварыліся, падпісалі паперы. Паглядзеў і само Прудзішча. Размоў аб пераездзе шмат, і збіраюцца ўжо некалькі дзён: усё трэба забраць, у пустую хату ж едуць, ды і сям'я – шэсць душ, вось і напаўняецца пакой клункамі. Ясь задаволены. Па-першае, ехаць ім, бацька казаў, ледзь не пяцьдзесят вёрст, і – у вёску, на раздолле, гэта не тое што цесната гарадскіх двароў. Памятае Ясь парк у Юзэфаве – вялікі, як лес, там можна было і заблудзіцца. А Сенніца? Жылі ля самай Свіслачы, сапраўднай, глыбокай рэчкі, па ёй і ў лодках плавалі. Уздоўж берага квяцісты луг, а вышэй засеянае поле...

Бацькі дый сам Ясь у тую ноч, можна сказаць, не спалі, толькі малых паклалі. Прыцемкам, скрыгочучы і бразгаючы коламі, у двор заехала запрэжаная парай коней доўгая, з высокімі застаўкамі фура, і пачалі грузіцца. Везці іх узяўся знаёмы бацьку балагол, з якім таксама ўсё было загадзя дамоўлена.

Пяцігадовая Гэля і малодшая за яе на год Марыя (апраналі іх паўсоннымі) плакалі. Пасадзілі абедзвюх у сярэдзіну воза на мяккі клунак, пад ягоны, старэйшага, нагляд, а паўтарагадовую Леакадзію маці трымала на руках. Праехалі крыху па гарадскіх вуліцах, і ад Старажоўкі паўз агароды і поле пацягнуўся небрукаваны, перарэзаны глыбокімі, то ў чорнай гразі, то ў раскіслай гліне, гасцінец. Вось тады Ясь упершыню і пачуў, даведаўся, што ёсць у гэтай дарогі назва – Даўгінаўскі тракт. Пытаўся ў бацькі назовы вёсак, якія праязджалі. Той тлумачыў: Цна, Дубаўляны, Паперня, Лускова, Жукаўка. Гэтыя назвы спачатку здаваліся цяжкімі – не вымавіць, не запомніць. І з цікавасцю пазіраючы на палоскі палёў, на хаты ўздоўж самага гасцінца, на астраўкі лесу, Ясь, канешне, і не гадаў, што з цягам часу гэты шлях стане для яго самым звыклым, і не толькі назвы вёсак, але і ўсіх навакольных хутароў і фальваркаў ён будзе ведаць на памяць...

Пасля Шэпеляў, ужо вечарэла, заехалі ў Жукаўку, і за драўлянай царквой павярнулі направа. Пачаліся, Ясь яшчэ такіх нават не бачыў, горы. Хутары, як згубленыя гнёзды, і маленькія – усяго пяць-шэсць двароў, шэрыя вёсачкі стаялі ўнізе, у далінах. Вакол іх – палі. А на вяршынях пагоркаў цямнелі грабяні лесу – елкі, сасняк ці зрэдку чорны кашлаты дуб. Коні стаміліся, ледзьве перастаўляюць ногі, ды яшчэ дарога ўсё на гару, хоць злазь ды папіхай цяжкую фуру. Мясцовасці адпавядалі і назвы вёсак – Буды, Лысая Гара, Сухая Гара. Яшчэ на гасцінцы праязджалі каля шынкоў, але ні ў адзін не заходзілі, ежы набралі з сабой, перакусвалі на хаду, каб хоць да цямна паспець дабрацца. І вось нарэшце бацька абвясціў:

– Прыехалі, Прудзішча!..

... Цяпер тыя дзесяць кіламетраў, якія Луцэвічы ехалі ад Даўгінаўскага гасцінца – ад Жукаўкі да Прудзішчаў – дарога ідзе лясамі. Вёсачкі засталіся, а вось колішніх хутароў, фальваркаў, што густа былі рассеяны па наваколлі, ужо даўно няма. Многія з іх яшчэ перад вайной пазвозілі ў вёскі, а некаторыя, апусцеўшы, прыйшлі ў заняпад, разбурыліся. Астраўкі зямлі тут паступова зарасталі, бо пакінулі іх араць-засяваць, быццам нявыгадна было на кожны загублены шматок зямлі ганяць тэхніку. Зрабіла сваё і вайна – блакады, якія немцы адну за адной арганізоўвалі ў партызанскай Лагойшчыне. Вось і параслі кустамі ды лесам дзесяцінкі – былая мерка багацця і беднасці нашых дзядоў...

Прудзішча, перажыўшы тыповую для краю гісторыю, сёння якраз такая лясная, аддаленая ад магістраляў і, як цяпер кажуць, неперспектыўная, хоць і налічвае дваццаць пяць двароў, вёска. Вакол пагоркі, горы – і немалыя: асобныя ўзнімаюцца да трохсот метраў над узроўнем мора. Гэта адгор'і Мінскага ўзвышша, іх яшчэ называюць Лагойскімі вышынямі. Так што прудзішчанскія лясы разыходзяцца ад саўгаснага поля (Прудзішча адносіцца да адной з брыгад саўгаса „Сёмкава"), ад палос-сотак, ад рэчкі і азярца ўгору амфітэатрам. Лясы тут разнастайныя. Сустракаюцца чыстыя, гонкія сасмякі і суцэльныя ельнікі. Але больш – змешанае чарналессе. Вольхі і асіны суседнічаюць з густым маліннікам і падлескам лазы. У месцах вышэйшых часта пераважаюць, падсвятляючы лес, бярозкі. І паўсюдна – рабіна, клянок, дзікая яблыня, ліпа і нават ясень. Вылучаюцца дубы. Суцэльных дуброў няма, але па адным і невялікімі сем'ямі яны нярэдка стаяць тут на лужках, на ўскрайку поля, і ў лесе, адцясніўшы суседзяў-дрэў, выслабаніўшы сабе паляну.

Прамую вясковую вуліцу зараз вызначаюць, апынуўшыся на яе сярэдзіне, два рады старых прысад – уперамешку ясені,

елкі, клёны. Гэта былая дарога-алея да колішняга двара, паабапал якой пачалі будавацца яшчэ ў трыццатыя гады. Назву Прудзішча (ад старой сажалкі) мелі і панская сядзіба, і тады невялікая – двароў на пяць-сем – вёсачка, і бліжэйшы панскі хутар-фальварак, у якім чатыры гады жылі Луцэвічы.

Фальваркавы дом стаяў на беразе невялікай рачулкі ў тым месцы, дзе ад вёскі дарога ішла да дамбы і вадзянога млынка. За дамбай, з плацінай і мостам на ёй, разлівалася возера, што знікала недзе ў лесе. Да вады спускаўся абсаджаны елкамі панскі сад. Памешчыцкі дом, драўляны, але вялікі, квадратны, на высокім каменным падмурку, узвышаўся на гары, у парку.

Не ўцалелі фальваркавыя пабудовы. Але вядома, дзе стаяў дом – прыблізна метраў за сто ад моста ніжэй па цячэнні ракі на выраўненым пагорку. Нядаўна зручнае месца занялі – пабудавалі тут невялікі драўляны магазінчык. Але ён займае не ўсю пляцоўку на пагорку, і па ўцалелых вуглавых камянях падмурка можна меркаваць аб памерах колішняга будынка: невялікі, вузкі, на дзве палавіны і з адным уваходам. Адсюль былі відны мост, млын. Унізе, метраў за дваццаць, тут яшчэ плыткая, але хуткая і на камянях бурлівая працякала Вяча. Ад выгану і лугу фальваркавы двор загароджвалі хлявы і вялікае гумно – у дзірване бачны белыя валуны, таксама рэшткі падмуркаў. А за гумном стаяў – узвышаецца ён і цяпер – векавы дуб. Магутны, у тры абхваты ствол роўна, гонка ідзе ўгору і толькі на вышыні прыкладна метраў дзесяць пачынае разгаліноўвацца на магутныя сукі, што нясуць густую, прыгожую крону. Ясь бываў пад ім, гуляў там з малодшымі сёстрамі, з аднагодкамі з Прудзішчаў, неаднойчы сядзеў у засені, чытаў...

У Прудзішчах Ясь становіцца заўзятым чытачом. Пра сваё ранняе захапленне кнігамі ён пазней напіша: „Чытаць пачаў рана. Памятаю, яшчэ ў Прудзішчах, калі бацька адпраўляў мяне з сястрой у начное (начлег) пасвіць коней, я браў з сабой кнігі і пры святле кастра або месяца чытаў. Вядома, бацька за гэта мяне дакараў і часта не даваў мне браць з сабой кнігі. Безумоўна, чытаў я без разбору ўсё, што магло трапіць пад руку ў глухой правінцыі, ад „Северо-Западного календаря” да „Философии польской истории”.

Менавіта з Прудзішчамі ў Купалы звязана яшчэ некалькі яркіх успамінаў, якія паказваюць, пад чыім уплывам фарміраваўся ягоны характар, вызначаліся погляды, зараджалася пранесеная праз усё жыццё любоў да беларускіх народных казак, песень.

„Калі мы жылі ў Прудзішчах (тады я быў яшчэ малы зусім), у нас служыў рабочы (парабак) нехта Пясляк (нават прозвішча памятаю!). І вось ён быў, як мне тады здавалася,

незвычайны майстар расказваць казкі, ды яно так і было. Памятаю, што я не даваў яму праходу. Пойдзе ён у поле араць ці едзе ў начное, я заўсёды з ім і заўсёды вымольваю ў яго казкі. Можаце сабе ўявіць: чалавек ходзіць за сахой, а следам за ім, як варона тая, хаджу я і слухаю. Другі такі расказчык (парабак) быў ужо ў Селішчы. Таксама я яму не даваў спакою ні ўдзень, ні ўначы. Дык вось хто, бадай, быў маім першым настаўнікам, хутчэй натхніцелем маёй далейшай паэтычнай творчасці".

Ад самай красы маіх дзён невясёлых
Настаўнікам быў беларускі абшар;
Усходы палеткаў і гоманы ў сёлах
Навуку сваю мне прыносілі ў дар.

Душу акрылялі прыгожасці свету,
Па гонях пад небам лунала яна,
Купалася ў сонцы вясёлкай распетай,
Сама як вясёлка, як казка-вясна.

...Бурлівая рэчка і млын гутарлівы
Адмерным, раскацістым плюскатам вод
Складалі мне рытму мастацкія звівы,
Парадквалі складаў раскоцісты ход.

*„Мая навука"*

„Бурлівую" Вячу можна лічыць рэчкай дзяцінства і юнацтва Купалы. Упершыню Ясь Луцэвіч апынуўся на беразе Вячы ля самага яе вытока – у Прудзішчах. Цікава, што пакуль рачулка, пачаўшыся з балотца ў суседнім ельніку, пятляе, абыходзіць асаковыя купіны і замшэлыя валуны па зарасніках, тубыльцы называюць яе крыніцай, і толькі ад плаціны, дзе рэчка ўжо цячэ па лузе, у рукаве вольхаў і лозаў, імянуюць Вячай. Вада ў ёй, асабліва ў вярхоўі, быстрая, празрыстая, чыстая, і толькі на выгінах-паваротах, дзе віры, рака прыпыняецца і сінее, цямнее.

Зноў Ясь сустрэўся з Вячай, якая стала шырэйшай і трапіла пад ахову старых раскідзістых вербаў, у Гаянах, куды бацька аддаў яго "ў навуку". Падыходзіць рака і да вёскі Мачаны, дзе хлопец некаторы час жыў на хутары Радзькаўшчына ў цёткі і хадзіў да рэпетытара – студэнта Уладзіміра Самойлы, які рыхтаваў яго ў рэальнае вучылішча. Нарэшце, Вяча працякае і праз мястэчка Бяларучы. Тут Ясь таксама вучыўся, але ўжо ў народным вучылішчы. Рэчка ўжо невялікая, працягласць яе да ўпадзення ў Свіслач сорак вёрст, але бегла яна, асабліва ў нізоўі, па даўно асвоеных, густанаселеных мясцінах. Апрача таго, падтрымлівалі Вячу ў добрым стане, так што і лес па ёй сплаўлялі, і на чаўнах невадам рыбу лавілі. Плаціны стаялі

амаль каля кожнай, пачынаючы з Прудзішчаў, берагавой вёскі – у Гаянах, Бяларучах, Вячы, Мачанах, Пільніцы, Паперні, дзейнічалі млынкі, крупарушні, вадзяныя пільні, а ў Паперні яшчэ – папяровы млын, паўсаматужная папяровая фабрыка.

Якраз у тыя чатыры гады, што Луцэвічы жылі ў Прудзішчах, „бацька... насіўся з думкай падрыхтаваць” Яся ў якую-небудзь „сярэднюю школу”. Найбольш даступным у раскіданых фальварках-хутарах і ў маленькіх вёсачках з'яўлялася навучанне дзяцей – звычайна толькі ўзімку, два-тры месяцы, у так званых „дарэктараў”, пра якіх Купала пазней пісаў: „Тып гэтых перадзвіжнікаў-настаўнікаў быў у той час даволі распаўсюджаным у Беларусі, бо афіцыйных школ было вельмі мала. „Дарэктарам”, які спыняўся ў якім-небудзь фальварку або вёсачцы на сезон, на зіму і набіраў некалькі вучняў, часта бываў які-небудзь гімназіст, семінарыст або настаўнік, пазбаўлены за што-небудзь права выкладаць у школе, у гімназіі”.

І вось Ясь Луцэвіч ходзіць па вёсках, хутарах Лагойшчыны ад „дарэктара” да „дарэктара”. Так што да пастаянных пераездаў сям'і дабаўляліся яшчэ і яго навучэнцкія вандраванні па хутарах, вёсках, дзе хлопец, пазнаючы жыццё, побыт беларускага селяніна, больш бачыў яго паднявольную працу, беспрасветную галечу і забітасць. Праўда, побач заўсёды была чароўная прыгажосць родных мясцін: крутыя і спадзістыя пагоркі, паміж імі – зацішная даліна Вячы, лясы бязмежныя, дрымучыя і светлыя, беларускае поле, жыта, а ў тым жыце, нібыта помнікі пакаленням аратых, стаялі яго любімыя дубы-асілкі...

## *КАЗІМІРАЎКА*

...І ў аўтабіяграфіі, і ў пісьмах Янка Купала не раз прыгадваў, што ў дзяцінстве і асабліва ў раннім юнацтве шмат чытаў, хаця бацька і лічыў чытанне „залішняй раскошай для селяніна-работніка і бескарысным знішчэннем газы...”.

Хто ж у глухім сельскім кутку, дзе кнігу не тое што купіш, але і не заўсёды знойдзеш, пасеяў у дзіцячай душы палымяную, нязгасную на ўсё жыццё любоў да чытання? Бацька – не. Настаўнікі-перадзвіжнікі? Аднак і пра большасць іх Купала меў невысокую думку: „...яшчэ два-тры „дарэктары” адзін за адным абагачалі мой розум сваімі небагатымі ведамі”. „Другі такі ж настаўнік, былі фельдфебель, аднаму толькі і вучыў, што прымушаў мяне вывучваць на памяць трапары і больш нічога, за што бацька цягаў яму курэй...” Наўрад ці такія настаўнікі самі чыталі, а тым больш маглі выхаваць цікавасць да кніг у сваіх вучняў.

І ў той жа час стрыманы, сціплы па натуры Купала мала каму ў аўтабіяграфічных матэрыялах больш удзяляе ўвагі,

чым свайму настаўніку-рэпетытару з Казіміраўкі Уладзіміру Іванавічу Самойлу. Перш за ўсё гэта прызнанне высокай культуры і адукаванасці Самойлы, а таксама праяўленне ўдзячнасці за зробленае гэтым чалавекам для яго яшчэ і ў раннім юнацтве і пасля, у пачатку творчага шляху.

„Пасля фельдфебеля (здаецца) з таго ж Прудзішча бацька аддаў мяне да сваіх сваякоў на хутар Мачаны, які межаваў з фальваркам Самойлы (дырэктара Мінскага рэальнага вучылішча). Сын Самойлы Уладзімір Іванавіч падрыхтаваў мяне ў рэальнае вучылішча, але нічога з гэтага не выйшла. Прычына тая, што слаба быў падрыхтаваны, і дырэктар прадказваў, што праседжу два гады ў адным класе, гэта адно, а другое, у бацькі адпала жаданне вучыць мяне далей, бо яму патрэбен быў памочнік па гаспадарцы...", – згадваў Купала.

Казіміраўка – гэта не маёнтак і не фальварак у звычайным значэнні слоў, а дача. Асноўная кватэра Самойлаў знаходзілася ў Мінску на Юр'еўскай вуліцы. Галава сям'і Іван Іванавіч працаваў яшчэ і дырэктарам прыватнага жаночага камерцыйнага вучылішча. Ва Уладзіміра Іванавіча было яшчэ трое братоў і сястра, усе закончылі гімназію, браты – універсітэт. Моладзь чытала, любіла, цаніла і... мела кнігі. Самойлы, не гаворачы пра будучы актыўны ўдзел Уладзіміра Іванавіча ў беларускім нацыянальна-вызваленчым руху і рэвалюцыйных падзеях 1905–1907 гадоў, заўсёды прытрымліваліся дэмакратычных поглядаў. Апрача Яся Луцэвіча тут пастаянна апякалі, рыхтавалі да паступлення ў навучальныя ўстановы Мінска адначасова двух-трох сельскіх хлопчыкаў, і некаторыя з іх выбіліся пасля ў людзі. Бібліятэка гаспадароў мелася ў Казіміраўцы і займала ў доме цалкам пакой – была, вядома, даступнай выхаванцам. Таму можна меркаваць, што менавіта Уладзімір Самойла выхаваў у Яся любоў да кніг. Першую сапраўдную бібліятэку, без сумнення, юнак убачыў у Казіміраўцы.

...Вакол Мачанаў і хутара, на якім у цёткі жыў Ясь, пагоркі ніжэйшыя, чым у Прудзішчах, а на іх схілах палі шырэйшыя і раўнейшыя. І Вяча тут рабілася іншай – спакайнейшай, больш паўнаводнай і цякла, агінаючы лясісты Казіміраўскі пагорак, па ўлонні заліўных лугоў-сенажацяў.

Дом Самойлаў стаяў на процілеглым ад Мачанаў беразе. Вялікі, можа, з дзесяціну, квадратны двор, ляжаў сярод сасновага лесу і закрываў абсаджаны у два рады елкамі будынак. З Мачанаў на казіміраўскі бераг, хоць і меўся каля могілак мост, Ясь звычайна пераходзіў па бліжэйшых ад дома кладках. А наогул галоўны пад'езд да сядзібы знаходзіўся з боку Мінска, з Бараўскога тракту. Тут таксама ішоў спуск да Вячы, мост, а побач і брод. Адсюль рака цякла па шырокім лузе, то

разліваючыся ў глыбокія і чорныя ад тарфянога дна віры-азёры, то бегла ледзь прыкметная па вузкіх, зарослых сітнягом і аерам рукавах.

Ад кладкі на тым беразе сцежка, праз зараснікі чаромхі і арэшніку крута ўзнімаючыся ўгору, вяла да двара-парку, на алею. Свой парк Самойлы называлі дэндралагічным. Тут раслі лістоўніцы, ліпы з вялікімі, лапушыстымі лістамі, блакітныя елкі, чырваналісты клён, каштаны, ясені, дубы. Дом Самойлаў, драўляны і на выгляд няўклюдны, з прыбудаванымі збоку кухняй і верандай, але прасторны, зручны, таксама абкружала шмат розных рэдкіх, незвычайных кустоў і кветак, аздаблялі яны і цэментаваны фантан-басейн.

...Ясь ішоў па алеі сярод цяністых елак і глядзеў на вокны дома, разважаючы, дзе цяпер Уладзімір Іванавіч – ужо ў бібліятэцы чакае ці на двары. Спазняцца было нядобра, і ён заходзіў у дом. Сустракала і праводзіла яго ў бібліятэку Марына, сястра Самойлы. Хлопец некалькі хвілін знаходзіўся адзін у гэтым запаветным для яго пакоі на тры вялікія акны. Тут шмат кніг. Яны стаялі на паліцах у прыгожых, з закшлёнымі дзверцамі шафах, ляжалі стосамі на падаконніках, на пісьмовым стале. Ясь, хоць і не першы раз у бібліятэцы, усё яшчэ, стаіўшы дыханне, азіраўся, спрабаваў прачытаць надпісы на вокладках кніг.

Але вось увайшоў настаўнік, цёмнавалосы, хударлявы, у пацёртай студэнцкай курткы. Луцэвіч устаў, ціха павітаўся і адчуў, што чырванее, але нічога не можа з сабой зрабіць.

Дарэчы, колькі не прасіў Уладзімір Іванавіч называць яго Валодзем – розніца ж ва ўзросце не складала і пяці гадоў – Ясь не мог дазволіць сабе гэтага нават у думках: студэнт жа, вучыцца ў Пецярбургу!

А праз дзевяць гадоў яны нечакана сталі суседзямі: у 1904 годзе маці Купалы пераехала на арэнду ў фальварак Бараўцы-ад Казіміраўкі не будзе і двух кіламетраў. І зноў Луцэвіч сустрэўся з Самойлам, і паміж імі завязалася дружба.

Іван Дамінікавіч ужо смела заходзіў у дом, тут яму заўсёды былі рады, і толькі, бадай, у бібліятэцы ён усё яшчэ адчуваў пачцівую нясмеласць, хоць тут ужо гучалі яго вершы – чытаў сам нягучным, павольным голасам, і іх жа паўтараў артыстычна, з натхненнем Уладзімір Іванавіч. Нярэдка збіраліся слухачы – сястра Марына, малодшыя браты Самойлы і хто-небудзь з нанятых на сезон мачанскіх, маркаўскіх хлопцаў.

... 15 мая 1905 года. Пры непасрэдным садзейнічанні „Владака з Казіміраўкі" (адзін з псеўданімаў публіцыста і крытыка Уладзіміра Самойлы) газета „Северо-Западный край" апублікавала першы верш Янкі Купалы „Мужык". Яшчэ праз тры гады Самойла пераслаў у Пецярбург аднаму з арганізатараў

першага легальнага беларускага выдання „Загляне сонца і ў наша аконца" прафесару Эпімах-Шыпілу вершы паэта, у тым ліку і тыя, што ён прыносіў у Казіміраўку, а праз некалькі месяцаў яны выйшлі першай кніжкай паэта – „Жалейка". Гэты сціплы зборнік заняў адно з пачэсных месцаў у казіміраўскай бібліятэцы.

„Вялікае свята" – назваў Уладзімір Самойла сваю рэцэнзію на „Жалейку", дзе вітаў выданне такімі словамі: „На вуліцы маладой Беларусі вялікае свята! Сонца жывой, сапраўднай паэзіі заглянула ў аконца цёмнай, беднай, але вялікай хаты беларускага народа... Гукі „Жалейкі" прасякнуты сапраўднай чалавечай любоўю і жалем да роднага беларускага свету, яны вырваліся з вуснаў нацыянальнага паэта, адгэтуль сталі нацыянальным скарбам для беларуса, сталі магутным рычагом для яго разумовага і маральнага развіцця..."

Дорачы ў снежні 1908 года свой фотаздымак Уладзіміру Самойлу, Купала надпісаў: „На довад шчырага шацунку і сардэчнай прыязні найлепшаму і найсправядлівейшаму свайму ўчыцелю – дабрадзею Ул. Ів. Самойлу ад Янука Купалы. Шчасліў будзь, заступнік бедных людзей...".

## *СЕЛІШЧА*

*Ці помніш ты, нядбалы друже,*
*Усё тое, дзе радзіўся, узрос?*
*Дзе напявае зімка стужай,*
*Ірдзіцца лета бліскам рос?*

*Ці помніш ты пагляд нясмелы*
*Свайго радзімага сяла,*
*Адкуль паплёўся ў свет той белы,*
*Твая дзе маладасць сплыла?*

*„Брату ў чужыне"*

У 1895 годзе Луцэвічы зноў пераязджаюць, цяпер у фальварак Селішча – недалёка ад Прудзішчаў, за восем вёрст, але гэта ўжо Барысаўскі павет, Гайна-Слабодская воласць. Перавозіў іх на сваёй кабылцы таварыш Дамініка Ануфрэвіча прудзішчанец Іосіф Антонавіч Рынковіч, які пасля расказваў, што Луцэвічы не хацелі перабірацца з абжытага, наседжанага месца – прымусілі абставіны. Сумна выглядаў іх „абоз". Пагрузілі небагаты скарб, пасадзілі малодшых дзетак. Ясь (меў тады трынаццаць гадоў) усю дарогу прайшоў пехатой.

На гэты раз не выбіраліся на Даўгінаўскі гасцінец, трымаліся накірунку на Дзяніскі. Тры кіламетры ехалі прасёлкам, міма хутароў, потым праз пахмурны ельнік, што сцяной прыкрываў у гэтых мясцінах шлях на Барысаў. Пачатак яго – развілка каля вёскі Дзяніскі (таму гасцінец і называлі тут Дзяніскаўскім). Там пры самай дарозе і стаяў фальварак Селішча.

Сёння ўсе дваццаць тры кіламетры – ад перакрыжавання Мінск–Лагойск (Чудзеніцкага) да Даўгінаўскага тракта – брукаваная паласа дзяніскаўскага шляху бяжыць амаль лесам. Вольхі і лозы перабраліся на самыя абочыны і так узняліся, выцягнуліся, што месцамі пераплятаюцца ў вышыні, ствараючы цяністы калідор. Пры самай дарозе цяпер усяго адна больш-менш значная вёска – Вялікія Бясяды. Аўтобусныя маршруты скарочаны да мінімуму. „Сёмкаўскі" праходзіць трэць бальшака і заварочвае направа, на Сёмкава. Толькі раз у суткі, апоўдні, да Дзянісак ідзе „дзяніскаўскі"...

На жаль, ад хутара Селішча амаль нічога не ўцалела. Але месца колішняга жытла ўсё ж можна распазнаць.

Фальварак знаходзіўся на роўнай адлегласці – за тры кіламетры – ад Вялікіх Бясяд і Дзянісак, метраў за сорак ад дарог. Зараз, калі ехаць з Бясяд, трэба не прапусціць прарыў у лесе – квадрат поля і старэнькі масток. Гэты, гектараў дзесяць участак зямлі дзяніскаўскай брыгады мясцовай гаспадаркі (тут садзяць бульбу, сеюць ячмень) некалі і адносіўся да фальварка Селішча. Быў яшчэ сад, у лагчыне каля лесу – луг. Паводле ўспамінаў дзяніскаўцаў, у 1928–1929 гадах сюды, у Селішча яшчэ хадзілі касіць лужкі. У фальварку тады стаяў дом, які перавезлі ў Бясяды. Пасля Луцэвічаў у сядзібе доўгія гады жылі іншыя людзі.

Сёння ў Селішчы цяжка нават акрэсліць межы падмуркаў: ачышчаючы двор, далучаючы яго да поля, старанна папрацаваў бульдозер. На пагорку, у кустах шыпшыны і бузіны цяпер камяніца, па-за якой чарнее ствол засохлай яблыні. Адзінае, што ажыўляе гэта месца, адгароджанае ад дарогі маладым асіннікам, у акружэнні лазняку і нечаканага на ўзвышшы аеру – блакітнае вочка чыстай вады, колішняй селішчанскай сажалкі.

... Вясной 1902 года ў Селішчы памёр бацька. Дзевятнаццацігадовы Ясь, старэйшы з семярых дзяцей, застаўся за гаспадара. Але жудасны для сям'і год прынёс яшчэ смерці: восенню на адным тыдні памерлі ад шкарлятыны брат Казік і дзве малодшыя сястры – Сабіна і Гэля. Пахавалі на каталіцкіх могілках за семнаццаць кіламетраў ад Селішча, у мястэчку Корань...

Селішчанскі перыяд у жыцці Яна Луцэвіча знамянальны яшчэ і тым, што менавіта тут ён вырашыў парваць з дараваным яму бацькам і дзедам нялёгкім лёсам „гаспадара" на чужой зямлі, вечнага вандроўніка і ўпершыню паехаў з дому – служыць, працаваць. Праўда, атрымаўшы тэлеграму аб хваробе маці, зноў на некаторы час вярнуўся ў Селішча і заняўся гаспадаркай. Але ненадоўга. Ужо восенню 1905 года ён уладкаваўся на вінакурны завод у Сёмкаве і з тае пары за зямлю амаль не браўся.

Што ж усё-такі змяніла лёс Яся Луцэвіча, якому, здавалася, ужо было наканавана ўсё жыццё заставацца запашнікам на глухіх фальварках? Бадай, і настойлівае жаданне бацькі даць свайму першынцу сярэднюю адукацыю – адсюль і шматлікі перабор „настаўнікаў-перадзвіжнікаў”, і першая сустрэча з Уладзімірам Самойлам, і вучоба ў Бяларуцкім народным вучылішчы, і ўсё большая цяга юнака да чытання, і селішчанскія сустрэчы з адукаванымі, „кніжнымі” людзьмі. Пэўную ролю, відаць, пачынаў адыгрываць і агеньчык уласнай творчасці, што успыхнуў таксама ў Селішчы.

Наконт гэтага Купала зазначаў: „... Першы верш напісаў у Селішчы, прысвечаны сястры ў дзень яе імянін. Верш гэты крыху, наколькі помню, сястру злаваў, бо ў ім была пэўная доля насмешкі з нагоды яе падрыхтоўкі да імянін. Пазней я пачаў больш пісаць на розныя тэмы. Але ўсё гэта выйшла ў мяне выпадкова. Я сам не верыў, што звычайныя людзі могуць пісаць вершы. Тэорыі ніякай тады я не сустракаў і паняцця аб ёй не меў. У якім годзе пачаў? Здаецца, у 1903 або 1904. Пісаў спачатку па-польску, але неўзабаве пачаў і па-беларуску”.

Месца нараджэння першых вершаў Купалы, месца нараджэння яго як паэта – сціплы фальварак на Лагойшчыне, пад Дзяніскамі – Селішча. Відавочцы, а яны яшчэ жывыя, вельмі схематычна абмалёўваюць колішнюю сядзібу. Дом быў драўляны, праўда, параўнаўча вялікі. У двары – мураваны склеп. Хлеў, гумно, сад. І яшчэ... свая сажалка з карасямі...

## *БЯЛАРУЧЫ*

„...Нарэшце, калі жылі ў Селішчы, я настаяў, каб бацька даў мне магчымасць закончыць народнае вучылішча. Праўда,у гэты час я больш ведаў, чым патрабавалася па праграме народнага вучылішча, але мне патрэбна была хоць якая-небудзь казённая паперка аб маёй адукацыі. І такім чынам правучыўся адну зіму ў Бяларучах (Мінскай губерні і павета) у настаўніка Турчыновіча. Здаў экзамен, атрымаў атэстат, які, дарэчы, недзе згубіўся і ўсё”. (З аўтабіяграфічных пісьмаў Я. Купалы).

Бяларучы, хоць і знаходзіліся ў Мінскім павеце, але заставаліся малым, глухім і бедным паселішчам. Драўляная царква, шынок, млын і некалькі крам, тры дзесяткі хат, невялікі, таксама драўляны будынак вучылішча, які стаяў каля рэчкі,– вось і ўсё мястэчка. Але затое з мясцовай уладай – валасным старостам, пісарам, ураднікам і папом.

Царква стаяла высока на пагорку, і зайсці ў храм, асабліва зімой, або занесці на адпяванне нябожчыка было няпроста. І

гэтак жа з пагоркаў да невялікай плошчы, дзе стаяў помнік „цару-вызваліцелю" Аляксандру II, спускалася адзіная, цесная, брудная бяларуцкая вуліца.

Сваю назву Бяларучы атрымалі нібыта ад моцнай, а таму заўсёды пеністай белай крыніцы – Белага ручая – якая і цяпер выбіваецца з-пад Салаўінай гары, што зарасла лазняком і чаромхай, і паступова збягае па намытым пясчаным рэчышчы ў Вячу. Сярод пагоркаў вакол мястэчка адну гару – у адрозненне ад суседніх бязлесную, аголеную – называюць Замкавай. І сапраўды, на яе схілах і цяпер яшчэ можна распазнаць колішнюю заездуюю дарогу і земляны вал з аселымі ў векавым дзірване валунамі.

Бяларучы, безумоўна, адно са старажытных паселішчаў у гэтай акаймаванай пагоркамі, зручнай для жытла – пры вадзе, лугах і лесе – а таксама для схову і абароны мясцовасці. Свой пачатак яно, можна меркаваць, вядзе ад вартавога, яшчэ на межах Лагойска-Заслаўскага і Мінскага княстваў, паста-ўмацавання або ад узнесенага на непрыступны пагорак магнацкага „гнязда".

Трапіўшы ў Бяларучы, Ясь Луцэвіч, канешне, пачуў пра Замкавую гару, а магчыма, і даведаўся аб якой-небудзь легендзе далёкай даўніны мястэчка і старога замка. Ва ўсякім разе юнак не мог не звярнуць увагі на пануючы над сялом высокі аголены пагорак. Ён запомніўся яму добра і, магчыма, стаў потым геаграфічным прататыпам „удзірванелага кургана" ў вядомай паэме.

Паміж пустак, балот беларускай зямлі,
На ўзбярэжжы ракі шумнацечнай
Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі, –
Удзірванелы курган векавечны...

Між іншым, і другі раздзел твора Купала пачынае з апісання кургана і яго ваколіц, дапаўняючы, расшыраючы пейзаж дэталямі, што вельмі нагадваюць мясцовасць пад Бяларучамі:

На гары на крутой, на абвітай ракой,
Лет назад таму сотня ці болей.
Белы хорам стаяў недаступнай сцяной,
Грозна, думна глядзеў на прыволле.

У нагах у яго рассцілаўся абшар
Хвоек гонкіх і пахані чорнай,
Сонных вёсак шары, хат амшалых, як мар,
Хат з сям'ей душ падданых, пакорных...

*„Курган"*

Чаму бацька аддаў Яся менавіта ў Бяларуцкае народнае вучылішча, хоць ад Селішча да Бяларуч не так ужо й блізка –

кіламетраў пятнаццаць, і няма прамой дарогі? Пэўна, нейкую ролю адыграла тое, што Луцэвічаў тут ведалі яшчэ па тым часе, калі яны жылі ў недалёкіх Прудзішчах і, вядома, бывалі ў мястэчку. Закончыў Ясь вучылішча за адну зіму (1897 – 1898), жывучы ў інтэрнаце, звычайнай хатцы, што знаходзілася побач са школай. Але і пазней з тых жа Селішчаў, з Акопаў, куды пераехала маці, Купала, наведваючы сваіх сяброў у Карпілаўцы, Жукаўцы, Лысай Гары, нярэдка заязджаў і ў Бяларучы.

Падчас акупацыі ў Вялікую Айчынную вёска была спалена, уцалелі толькі дрэвы – старыя ліпы, клён, каштаны на бяларуцкай вуліцы. Праўда, адбудавалася яна і хутка зноў стала цэнтрам і сельскага Савета і калгаса. Адкрыліся аддзяленне сувязі, магазін, бібліятэка. Адной з першых у акрузе, ужо на свабодным, даступным месцы пачала працаваць новая школа-дзесяцігодка, якой Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР яшчэ ў 1945 годзе прысвоена імя Янкі Купалы. Ля ўваходу ў будынак устаноўлена памятная дошка з надпісам: „У 1897 – 98 гадах у Бяларучах вучыўся Янка Купала – вялікі паэт Беларусі”.

У школе ўжо гадоў дваццаць існуе музей паэта. Пачыналася ўсё з партрэта народнага песняра і некалькіх яго кніг. Цяпер пад экспазіцыю адведзены самы вялікі, лепшы клас. Сярод экспанатаў ёсць макет сціплай драўлянай пабудовы – памяшкання народнага вучылішча ў канцы мінулага стагоддзя. На стэндах фатаграфіі, вытрымкі з аўтабіяграфіі паэта, прысвечаныя яго дзіцячым і юнацкім гадам, той пары, калі Луцэвічы жылі ў Бяларуцкай і суседніх – Гайна-Слабодскай і Радашковіцкай валасцях. Выстаўлены літаграфіі з вядомых партрэтаў Купалы і яго бацькоў, карціны-акварэлі „Лясное возера”, „Бяларуцкая школа”. Сабрана ў музеі і своеасаблівая бібліятэка з кніг з аўтографамі пісьменнікаў, якія бывалі ў вёсцы...

Новы навучальны год у Бяларуцкай школе па традыцыі пачынаюць Купалаўскім урокам: аповедам пра дзіцячыя гады паэта, пра недалёкія, часта добра знаёмыя вучням вёскі і хутары, па якіх вандравала сям’я Луцэвічаў, пра мясціны, дзе бываў, вучыўся ў „перадзвіжнікаў” Ясь, пра яго вучобу ў саміх Бяларучах.

### *МАЛЫЯ БЯСЯДЫ*

Напачатку вернемся ў Селішча. Тут Луцэвічы жылі на арэндзе да 1904 года, тут Ясю споўнілася дваццаць два гады – пара сталасці. „Паступаючы ў Бяларуцкае вучылішча, я ведаў значна больш, чым патрабавалася па праграме,” – зазначаў

потым Купала. Адкуль жа веды? Вядома, не дарэмна прайшла вучоба ў заезджых настаўнікаў – „дарэктараў".

Да селішчанскага перыяду жыцця паэта адносяцца такія звесткі з яго аўтабіяграфічных пісьмаў: „...мне ўдалося пайсці з бацькам на кампраміс і выпісаць часопіс „Родина". Што датычыць маёй самаадукацыі, то я думаю, больш за ўсё мне дапамагло чытанне кніг, якіх я праглынуў вельмі шмат..."

Прага чытання, пошукі кніг і прывялі ўрэшце маладога Луцэвіча ў Малыя Бясяды, да Сігізмунда Чаховіча, чалавека, які адыграў пэўную ролю ў жыцці Купалы, у фарміраванні яго інтарэсаў і поглядаў. Пра Чаховіча паэт згадваў: „Дарэчы, я ўспомню тут адну акалічнасць: калі мы жылі ў Селішчы, я пазнаёміўся з адным польскім памешчыкам Сігізмундам Чаховічам у маёнтку Малыя Бясяды Вілейскага павета. Памешчык гэты быў у свой час сасланы Мураўёвым у Сібір, але з цягам часу вярнуўся і жыў бязвыезна ў сваім маёнтку Бясяды. У яго была велізарная бібліятэка, большасцю з польскіх кніг. Вось тут мне і адкрыўся,што называецца, скарб... Яго бібліятэка адкрыла мне вочы на многае, што дагэтуль было невядома. Бываючы ў яго часта, прыносячы яму ў падзяку за кнігі то масла, то сыр, бо таго, што даставалася яму ад жонкі, на пражытак не хапала, гутарылі з ім шмат аб чым, аб чым – цяжка нават успомніць, але больш за ўсё, здаецца, аб польскім паўстанні 1863 года. Часта ён мне выбіраў кнігі для чытання, а іншы раз я сам прасіў такіх або іншых аўтараў. Апрача ўсякага роду паэзіі, якой я больш за ўсё захапляўся, белетрыстыкі, гісторыі і да т. п., у яго першага я пазнаёміўся з нелегальнай літаратурай, больш за ўсё наконт польскага паўстання. Былі гэта выданні кракаўскія, лонданскія, парыжскія і г. д.".

Сігізмунд Бярнардавіч Чаховіч-Ляхавіцкі (1831-1907), біяграфію якога даследчыкі ўдакладнілі толькі ў наш час, закончыў Пецярбургскі універсітэт. У 1863–1864 гадах стаў адным з арганізатараў паўстанцкага руху на тэрыторыі Беларусі і Літвы, яго абралі членам Літоўскага правінцыяльнага камітэта. Чаховіч з'яўляўся блізкім таварышам Кастуся Каліноўскага. Пасля падаўлення паўстання адбываў дваццаць гадоў катаргі ў Нерчынскіх рудніках. Маёнтак Малыя Бясяды – яго апошні прытулак. Тут Чаховіч жыў, зусім не займаючыся гаспадаркай, толькі сваімі кнігамі. Купала так і характарызаваў гэтага чалавека: „...Памешчык быў ідэаліст, летуценнік... Жыў асобна, куды яму пасылалася ежа, ні з кім не сустракаўся, заўсёды заняты кнігамі". Пра сябе ў той час паэт напісаў: "...У бібліятэцы Чаховіча было шмат прагрэсіўных кніг, якія дапамаглі мне асэнсаваць палітычны лад тагачаснай царскай Расіі і абуджалі незадаволенне гэтым ладам. Такім чынам я жыў да 1902 года, араў, сеяў, сек дровы і чытаў кнігі..."

У Малых Бясядах Луцэвіч бываў часта. Ад Селішча сюды, як ісці па дзяніскаўскай дарозе, а потым павярнуць налева і па Даўгінаўскім гасцінцы, набіраецца толькі ў адзін канец сем кіламетраў. Але калі нават Ясь хадзіў нацянькі, якой-небудзь мясцовай, палявой ці лясной дарогай, то ўсё роўна скарачаў шлях на кіламетр-два, не больш. Безумоўна, рухаваму, лёгкаму на хаду хлопцу не такімі ўжо і цяжкімі здаваліся тыя вандроўкі, асабліва калі ўлічыць, што ў Бясядах яго чакала, стаўшая ўжо неабходнай, сустрэча з начытаным, інтэлігентным чалавекам, чыё мінулае авеяна рамантыкай паўстання. І галоўнае – новыя кнігі.

Але ад Селішча да перакрыжавання на Даўгінаўскім гасцінцы тры кіламетры. Адсюль Луцэвічы ехалі на Мінск, да якога прыблізна пяцьдзесят кіламетраў, або – направа, праз Дзяніскі, Калачы, Пасадзец, Крайск (такі ж кавалак шляху).

Цяпер да перакрыжавання Даўгінаўскі тракт яшчэ свежым жоўтым насыпам уваходзіць у лясныя ўскрайкі. І зноў, як на дзяніскаўскай дарозе, няма тут палёў, а скрозь цягнуцца сасьнякі, ельнікі. Праз кіламетры два наезджаная машынамі дарога вядзе ад гасцінца на Дашкі. І хоць да вёскі ўсяго метраў трыста, яе не відаць – закрывае лес. А яшчэ праз два-тры кіламетры, толькі цяпер па левы бок, можна ўбачыць Малыя Бясяды: над альхоўнікам узнімаюцца з прысад цёмна-сінія елкі. Сёння ў вёсцы двароў пятнаццаць. Праўда, вуліцы, звыклай для нас, няма: будаваліся некалі па ўскраінах вялікага, абсаджанага елкамі і ліпамі панскага двара.

Нямногае захавалася ў паселішчы ад багатага калісьці маёнтка. У колішнім парку стаяць некалькі дрэў – ясені, ліпы, у тым ліку „экзоты" – кедр, блакітная елка, встралісты клён. Ну, а там, дзе знаходзіўся панскі палац, – цяпер узвышаецца земляны пагорак. У двух невялікіх флігелях доўгі час размяшчалася Малабясядская васьмігодка, потым бальніца. Зараз уся тэрыторыя парку – а тут пабудавана яшчэ некалькі катэджаў – з'яўляецца зонай адпачынку Мінскага трактарнага завода.

Дом Чаховіча ў пачатку 30-ых гадоў аддалі пад школу. У палацы хапіла месца і для клуба, дзе, дарэчы, сіламі настаўнікаў у 1926 годзе ставілася „Паўлінка" і на адным са спектакляў пабываў, калі гасціў у Акопах, сам Купала. Але прыблізна ў 1936 годзе мясцовы калгас прадаў „палац" і яго перавезлі для будаўніцтва дома адпачынку.

У Бясядах той-сёй яшчэ памятае, як выглядаў дом Чаховіча. Першы мураваны паверх уяўляў сабой нешта накшталт аранжарэі або хола з зімовым садам. Перад зашклёнымі праёмамі ў вазонах і кадках стаялі фікусы, пальмы. Шырокая лесвіца вяла на другі паверх, у пакоі – залу, сталовую, спаль-

ні. Бібліятэка, адкуль амаль не выходзіў гаспадар, знаходзілася на трэцім паверсе. Дарэчы, Купала наведваўся сюды яшчэ ў гады рэвалюцыі, калі ўжо з'ехалі дочкі памешчыка. Ён запомніў груды кніг і часопісаў на падлозе, на сценах – геаграфічныя карты, карціны ў залатых рамах, скульптуры па кутах.

Завяршала палац васьмівугольная драўляная вежа, з якой былі бачны палі, возера з млынам, за паркам гаспадарчыя пабудовы – доўгі цагляны кароўнік (цэлы ён і цяпер), канюшня, птушнік...

І яшчэ адна прыкмета Малых Бясяд – алея, якая пачынаецца адразу з парку. І гэта не пяць-шэсць выпадкова ўцалелых дрэў, а цэлы кіламетр дарогі на Радашковічы, абсаджанай еўрапейскімі лістоўніцамі. Вядзе яна яшчэ да цікавага ляснога возера, што мае ласкава-памяншальнае імя – Круглік. Не чакаеш яго тут, на гары, але вось адгалінаваная ад алеі сцежка, прайшоўшы краем змешанага лесу, упіраецца ў зараснікі чароту і аеру, за якімі праглядваецца цёмная роўнядзь вады. Асіны, бярозы, нават елкі стаяць тут на самым узбярэжжы, амаль у чаротавых затонах. Як расказваюць, гэты лясны вадаём яшчэ ў даўнія часы быў прыстасаваны пад купальню, і таму дно ў азярцы нібыта выкладзена дробнымі каменьчыкамі, а ад адной з прыбярэжных соснаў, вось толькі невядома ад якой, углыб вядуць пакатыя цэментавыя прыступкі.

Прыходзячы ў Бясяды, Купала, безумоўна, бываў каля таямнічага ляснога азярца, што праз гады, як лічаць, і адлюстраваў у пранікнёнай, адухоўленай элегіі родным мясцінам.

Дрэмле абсаджана лесам адвечным,
Цінай засланае возера ў лесе;
Шастае сціха асока і аер,
Нудныя казкі куст з кустам шапоча.

Сосны і вязы, дубы і асіны
Вокала возера вартай пасталі,
Долу ківаюць паклоны нямыя,
Небу малітву таемную твораць.

Возера! Возера! Йду к табе смутны
Соннаю пушчай, амшалаю сцежкай, –
Жоўтае лісце шасціць пад нагамі,
Шчокі калючка сасновая шчыпле.

*„Лясное возера"*

## КАРПІЛАЎКА

Крыху пазней, але ўсё яшчэ калі жылі ў Селішчы, адбылося немалаважнае для Яся знаёмства з пісьменнікам Ядвігіным Ш. (сапраўднае імя Антон Лявіцкі). Пасля Чаховіча такое збліжэнне было ўжо нібы наступнай прыступкай у духоўным развіцці, у станаўленні маладога літаратара.

У Карпілаўку да Ядвігіна Ш. яго прывялі ўжо не толькі пошукі кніг, але і жаданне сустрэцца, пазнаёміцца з пісьменнікам. У будучым Купала высока ацэніць уплыў публіцыста на свой лёс, на творчасць: „Абодва яны (Ядвігін Ш. і У. І. Самойла. – *Л. П.*) людзі сур'ёзныя, культурныя і самі літаратары супрацоўнічалі ў газетах і, вядома, усяляк заахвочвалі мяне ў маім пісанні...". „...Апрача Чаховіча, які быў высакакультурным чалавекам, але паляк, я ў гэты час пазнаёміўся з Ядвігіным Ш. (А. Лявіцкім). Гэта таксама быў чалавек культурны, выключаны з універсітэта (здаецца, маскоўскага) за рэвалюцыйную дзейнасць: у дадатак ён аказаўся беларусам, пісаў па-беларуску... З ім вось мы доўгія гадзіны гутарылі пра беларускую літаратуру, у прыватнасці, і пра беларускае пытанне наогул".

Сказанае вышэй пацвярджала дачка Ядвігіна Ш., пісьменніца Ванда Лявіцкая: „Калі, у якім годзе стаў у нас бываць Купала – не памятаю. Перш ён прыходзіў да нас браць кнігі – у нас была невялікая бібліятэка, галоўным чынам польскіх пісьменнікаў: Крашэўскага, Ажэшкі, Міцкевіча, Сянкевіча і іншых. Гэтай бібліятэкай карысталіся ўсе суседзі. Купала чытаў тату свае вершы і ўскорасці стаў друкаваць іх у „Н. н." („Наша ніва". – *Л. П.*). Купала проста і часта прыходзіў да нас. З татам яны вялі доўгія гутаркі, спрачаліся, чыталі".

Сустрэў будучы паэт аднаго з нямногіх у тыя часы беларускіх пісьменнікаў не дзесьці за блізкі свет, а ўсё на той жа Лагойшчыне, ля роднага гасцінца, у фальварку Карпілаўка. Ад Малых Бясяд па Даўгінаўскім тракце ў бок Мінска – шэсць кіламетраў. Значыць, ад Селішча да Лявіцкіх было кіламетраў дванаццаць-трынаццаць, і ўжо тут Луцэвіч, трэба думаць, часцей падсаджваўся да камісіянераў. Толькі з 1909 года, калі маці паэта перабралася на арэнду ў Акопы, Луцэвічы і Лявіцкія сталі блізкімі суседзямі.

... Не канчаецца лес ля Даўгінаўскага гасцінца і за Малымі Бясядамі. Мясцовасць па-ранейшаму гарыстая, але пагоркі ніжэйшыя і больш адасобіліся адзін ад аднаго, нагадваючы сопкі, конусападобныя вяршыні якіх вянчаюць то бярозаваасінавыя гайкі, то цёмныя, у сіне-шызых шапках сасняки. Лес стаіць за пагоркамі. Вось дзе сапраўды (за сорак вёрст ад Мінска) абнавілася старажытная беларуская пушча. Цяжка

нават уявіць, што яшчэ ў 30-ыя гады тут былі рассеяны хутары і фальваркі, і вакол узорваліся палеткі...

Але ўсё ж лес скончыўся. Па левы бок – поле, яно бяжыць за пагорак. Каля лесу бруіцца рачулка, і побач на палявой і лугавой прагаліне, але зноў з астраўком дрэў, віднеецца Карпілаўка...

Антон Лявіцкі нарадзіўся ў 1868 годзе ў маёнтку Дубасня Рагачоўскага павета, дзе яго бацька працаваў ляснічым. Было Антосю ўсяго гады тры-чатыры, калі пераехалі на Міншчыну. Некаторы час Лявіцкія жылі пад Пяршаямі (бацька працаваў лоўчым у графа Тышкевіча); і сямігадовы хлапчук наведваў у Люцінцы Марцінкевіча „прыватную" школу. А прыблізна ў 1876–1878 гадах сям'я набыла невялікі фальварак Карпілаўка ў Радашковіцкай воласці, з якім у далейшым будзе звязана ўсё жыццё і мінскага гімназіста, і маскоўскага студэнта, і аптэкара ў Радашковічах, журналіста, пісьменніка Антона Лявіцкага – Ядвігіна Ш.

Што засталося ў Карпілаўцы ад той сядзібы, ад дома, куды прыходзіў Купала, дзе чытаў, апрабоўваў перад сябрам свае вершы і, дарэчы, упершыню, завершаную ў чэрвені 1913 года ў Акопах „Паўлінку"? Зноў жа помнікам месцу і людзям, што жылі тут, ці наведваліся сюды, аказваюцца дрэвы. Адбудаваны з вялікімі цяжкасцямі новы дом Лявіцкіх – стары згарэў у год смерці бацькі Антона Іванавіча – стаяў у цэнтры невялікага сядзібнага парку. Месца колішняга будынка яшчэ можна было вызначыць па выцягнутым прамавугольным насыпе і каменных прыступках. Парк зарос маладняком, але некалькі дрэў зберагдося. Яны вылучаюцца і вышынёй, і таўшчынёй – пяць-шэсць абхватаў, а таксама кідаецца ў вочы незвычайнае шэра-срабрыстае лісце „завозных" таполяў. За паркам, на Пацяробе (мясцовая назва сенажаці) ля крынічкі – цяпер у яе напалавіну ўкапаны цэментавы калодзежны круг – якой нязменна карысталіся Лявіцкія, стаіць каржакаваты, са шчыльнай круглай кронай дуб. Часткова захавалася ліпавая алея, што ахінала вялікі, каля чатырох гектараў, сад.

Пра колішні фальварак дачка пісьменніка згадвала: „Зямля ў Карпілаўцы была пясчаная, камяністая – гаспадарка ніколі не была рэнтабельнай. Бацькоўскі доўг за дом вісеў над намі цяжкай хмарай. Сям'я была шэсць чалавек – адзець, абуць трэба... але ў нас быў вялікі сад, і работа ў садзе патрабавала шмат часу. Гэта была асноўная работа і таты і наша – дзяцей, – пачыналася яна ранняй вясной і канчалася ўвосень".

Дом Лявіцкіх апусцеў у 1936 годзе. Ванда, выйшаўшы замуж, пераехала ў Мінск. Апошнім тут жыў і вёў гаспадарку старэйшы сын Антона Іванавіча – Вячаслаў.

Восенню трыццаць шостага года ў дом пасялілі маладую пару Васілевічаў. Два гады пражыла тут з сям'ёй работніца сельскага Савета (потым – настаўніца Малабясядскай школы, а ў гады вайны – партызанка) Марыя Аляксандраўна Васілевіч. Пранесшы праз жыццё любоў да паэзіі Купалы і творчасці Ядвігіна Ш., яна да апошніх дзён заставалася ў Карпілаўцы незаменным гідам, сведкам тых часоў. Тым, хто хацеў пазнаёміцца з колішняй сядзібай Лявіцкіх, Марыя Аляксандраўна звыкла чарціла план вёскі, наносіла дарогі, што сыходзіліся да фальварка, і не менш упэўнена – план самога дома. Па яе ўспамінах, ён быў аднапавярховы, драўляны, але з мансардай у адзін „халодны" пакой, акно з якога выходзіла ў парк. З прыхожай – „салона" дзверы вялі направа, у спальню, прама – у бібліятэку, дзе стаяў невялікі цагляны камін, а верхнія шыбіны ў вокнах упрыгожвалі вітражы. У правым кутку знаходзілася гасціная, куды можна было трапіць з кабінета і са спальні. Доўгі калідор ішоў у сталовую і кухню, добрую чвэрць якой займала руская печ...

... Неяк у 1910 годзе дамоў, у Карпілаўку, Ядвігін Ш. прыйшоў з Вільні пешшу і, не прамой дарогай, а пабываўшы за Нёманам – у Любчы і ў Налібоцкай пушчы. Уражанні ад свайго унікальнага, амаль чатырохсоткіламетровага пераходу ён занатаваў у вядомых „Лістах з дарогі". У 13-ым пісьме апошнія, усхваляваныя, глыбока шчырыя радкі ён прысвяціў Карпілаўцы:

„... Ну, але годзе гэтай гутаркі на сягоння, а цыганіны на сёлета. Вось бо ўзгорак, а там – удалі векавыя дубы, ліпы стаяць – мае дубы, мае ліпы! Сад відаць – мой сад! Апісаць вам яго? Як жа я апішу, калі ён мой?! Бягу, ляту да яго! Бывайце здаровы!"

Сюды, у гэты непаўторна маляўнічы куток Лагойшчыны, да свайго блізкага сябра, з якім сустрэчы, дружба працягваліся і падчас працы ў рэдакцыі „Нашай нівы" ў Вільні, Купала наведваўся „проста і часта".

## *АКОПЫ*

Свой паэтычны праезд па „родным" Даўгінаўскім гасцінцы Янка Купала заканчвае на высокай, радаснай ноце – амаль у кожным радку яго верша клічнік:

...А ну, мой косю!
Што там?
Пустка...
Вярні з гасцінца ўбок гужом!
Бо далей – „пропуск" і...

„пшепустка".

Стань, Разымблюм!

Акопы ўжо!

*„Акопы"*

Вокліч паэта зразумелы: нарэшце ён у любімых, доўгачаканых Акопах, у маці!

Дзе ж, едучы з Мінска, Купала збочваў з гасцінца на Акопы? Адразу за Жукаўкай, мінуўшы мост цераз невялікую – зараз пушчана пад насыпам у жалезабетонную трубу – рачулку. Тут побач, у Здарэнні, стаяў шынок і пры ім дзве-тры хаткі (дарэчы, адзін з ранніх псеўданімаў Купалы – Здарэнец). За шынком ад тракта адгаліноўвалася дарога да Лявіцкіх у Карпілаўку і далей – на Акопы. Менавіта ў тым месцы вядомы на шляху балагол Разымблюм, стары знаёмы Купалы – і паварочваў „з гасцінца ўбок гужом".

Дарога на акопы, хоць і малаезджаная, захавалася. Месца, дзе некалі стаяў жукаўскі шынок (у маладыя гады Купала бываў тут, слухаў, іншы раз запісваў аповяды, песні вандроўнікаў), вызначыць не цяжка: метраў за дваццаць ад раўчука прыкметны насып і непадалёк „крушня" шэрых валуноў, пэўна, з колішніх падмуркаў. Мелася пры шынку яшчэ і стадола, дзе пакідалі нанач коней.

У Ядвігіна Ш., які таксама толькі Даўгінаўскім шляхам мог выбрацца з Карпілаўкі і ў Мінск, і ў Вільню, ёсць гумарыстычны нарыс „Пуцявыя нататкі сябра майго", дзе публіцыст, безумоўна, апісваючы свае ўласныя паездкі з Карпілаўкі, не ўпусціў назваць і Здарэнне „...Ехаць давялося па Даўгінаўскім гасцінцы. Першы з выдатных пунктаў на ім – пасёлак Здарэнне: тут працякае ручай (з фарэлькай!), які з'яўляецца граніцай Мінскай і Віленскай губерняў" (зараз мяжа Лагойскага і Мінскага раёнаў. – *Л. П.*).

„...Вярні! Бо далей – „пропуск" і ...„пшепустка". І гэты вокліч „седака" Купалы не выпадковы. Да 1939 года за нейкіх пяць-шэсць кіламетраў ад Карпілаўкі і Акопаў праходзіла дзяржаўная граніца з панскай Польшчай, так што зона тут была прыгранічнай, прапускной.

У аўтабіяграфічных пісьмах Купала адзначыў, што з фальварка Бараўцы, куды маці перабралася з Селішча, яна пераехала ў 1909 годзе на арэнду ў фальварак Акопы, колішні маёнтак Жэлігоўскіх, з дочкамі і пражыла там семнаццаць гадоў. А з 1903 года пачаліся вандраванні самога Купалы. Працаваў хатнім настаўнікам, пісарам у судовага следчага ў Радашковічах, потым у розных месцах на панскіх бровараx, пакуль не паехаў у Вільню, дзе стаў супрацоўнічаць з „Нашай



„Віленскія сустрэчы". *Фотарэпрадукцыя з карціны М. Савіцкага*

нівай". Затым займаўся на агульнаадукацыйных курсах Чарняева ў Пецярбургу, пасля зноў апынуўся ў Вільні, але ўжо на пасадзе рэдактара „Нашай нівы".

Аднак домам паэта ўсе тыя гады заставаліся Акопы, куды паэт прыязджаў пры першай магчымасці. Так, менавіта гэты згублены ў лясах хутарок мы цяпер з поўным правам можам назваць купалаўскім Болдзінам. Амаль кожны тыдзень, месяц яго знаходжання ў Акопах незвычайна плённыя, Янка Купала напісаў тут каля сямідзесяці сваіх лепшых твораў. Толькі за 1912 год і лета 1913 года ён закончыў „Паўлінку", завяршыў паэмы „Бандароўна", „Магіла льва", „Яна і я", драму „Раскіданае гняздо", вадэвіль „Прымакі", склаў некалькі вершаў...

Вернемся на дарогу, што вядзе ад Пусткі на Карпілаўку і Акопы. Вакол лес, пад нагамі шэры падзол. Сасновы бор адступіў, пацягнулася сумная вырубка-пасека – тырчаць счарнелыя пні, жаўцее сухая асака. Але лес не здаўся, і неўзабаве зноў змыкаецца над дарогай. Вось і колішні фальварак Карпілаўка, з яго вялізнымі срабрыстымі таполямі і дубамасілкам на адкрытым пагорку. Ад старога падмурка дарога спускаецца на лясны лужок і, павярнуўшы налева, зноў вядзе ўгору – прама на сядзібу Акопы.

Лес расступіўся, у даліне адкрыўся луг з купалаўскай „грамадой" дубоў, старадаўняя дарога, паабапал якой спілавана прысада, старыя елкі. На памяць прыходзяць купалаўскія



„Купала прыехаў з Вільні да маці". *Фотарэпрадукцыя з карціны М. Савіцкага*

радкі: „Было іх больш, дый далі рады: пацерабіў іх свой народ"... Вядзе дарога на вялікае падвор'е і ў поле.

Дом у Акопах, што месціўся некалі на краі лагчыны, быў даволі вялікі, на два канцы, памеры яго дапамагаюць уявіць насып і падмурак. Схілы лагчыны парaслі кустамі, а на дне яе сажалка – трохі вады затрымлівае плаціна з драўляных калод. Калісьці тут стаяла тры азярцы – адно за адным. На пагорках з

вадой цяжка, яе для розных гаспадарчых патрэб клапатліва берaглі. Уцалелая ў насыпе цагляна-каменная лядоўня знаходзілася, пэўна, пад падлогай, у кухні.

І ўсё ж як выглядаў дом у Акопах, на хутары, дзе больш за ўсё пражылі маці і сёстры Купалы, дзе падоўгу жыў і ён сам, дзе стварыў свае найбольш значныя творы? Фотаздымак пабудовы не знойдзены. Але ў чымсьці можа дапамагчы зноў жа Марыя Аляксандраўна Васілевіч. Восенню 1925 ці 1926 года па даручэнні сельскага Савета яна праводзіла перапіс насельніцтва па вёсках і хутарах. Вяртаючыся неяк з Харужанцаў дамоў у Карпілаўку, вырашыла зазірнуць і ў Акопы – гэта амаль па дарозе – каб узяць там неабходныя звесткі. Было позна, але адчынілі адразу, запрасілі ў дом. І хоць жанчына растлумачыла, што жыве недалёка і хуценька дабяжыць дамоў, яе не пусцілі – пачаўся дождж.

Запомнілася Марыі Аляксандраўне паўцёмная пярэдняя і чыста выбеленая невялікая кухня, дзе вячэралі. І яшчэ – пакой Івана Дамінікавіча. Там стаяў пісьмовы стол, этажэрка з кнігамі, некалькі крэслаў і даволі нечаканае ў небагатым фальварку піяніна. Тое-сёе з мэблі і піяніна засталіся Бянігне Іванаўне ад былой гаспадыні дома. Купала ніколі не вучыўся іграць, але, як успамінае Ядвіга Юльянаўна Раманоўская, пляменніца паэта, прыязджаючы ў Акопы, даволі лёгка падбіраў мелодыі, імправізіраваў...

Як я полем іду, гнецца колас ка мне,
З ім маркотнай душой ціха шэпты вяду,
Колас чуе усё ў зачарованым сне, –
Колас гнецца ка мне, як я полем іду...

Як я лесам іду, зважна думкі сную,
Аглядаю святую дубоў грамаду,
Там, як дома, сабе з пушчай песню пяю.
Зважна думкі сную, як я лесам іду...

*„Як я полем іду..."*

Яго „грамада" – дрэвы ў Акопах. Зараз вакол падмурка – зараснікі здзічэлых ружаў і бэзу, падступілі, узняліся асіны і бярозы. Але сам падворак не зарос лесам, на ім травяны дзірван, па якім рассеяўся шматгадовы лубін – цягнуцца, тапырацца яго крохкія з султанамі блакітных кветак цыбы. Зараз падворак і невялікія лужкі вакол сядзібы – пастаянны выпас для харужанцкай жывёлы, а два лапікі гектараў па дзесяць-пятнаццаць яшчэ не зарослага лесам поля – пачатак саўгаса „Янушкавічы", брыгады Харужанцы.

На схілах лагчыны стаяць ясені, дубы – стогадовыя асілкі ў маладых беразняках, а сярод поля – моцныя дубкі-падлеткі.

Ляжыць за лагчынай у папараці ружова-жоўты (рэдкі колер) добрыя тры метры даўжынёй гранітны валун, да якога прыходзіў паэт. Чароўны, аблашчаны прыродай і гэты лясны некалі так любімы Янкам Купалам куток Лагойшчыны.

Натхнёныя радкі прысвяціў мясціне паэт Вячаслаў Дашкевіч.

Ёсць Вязынка і ёсць Акопы, —
Выток і плынь.
У Вязынцы пятраркі і эзопы, —
У Акопах — лесу засяроджаная сінь.
У Вязынку з сябрамі еду,
Вязу сюды знаёмых і гасцей,
А сам — даруйце —
на маўклівую бяседу
Прастую на Акопы ўсё часцей.
Там стынуць адзічэлыя падмуркі,
Сляды ласіныя вядуць з двара,
Там з вечнасцю гуляе ў жмуркі
Паэта слыннага шчаслівая пара.

*„Акопы"*

Нарадзіўся Янка Купала, як вядома, у Вязынцы, пад Радашковічамі. Але і Лагойшчыну ў сучасных межах, па якой каля трыццаці гадоў „вандравала" сям'я арандатара Луцэвіча, фальваркі і вёскі, дзе рос, вучыўся, пазнаваў жыццё, дзе пачынаў пісаць Ян Луцэвіч і стварыў многія са сваіх лепшых твораў, мы маем права назваць таксама радзімай, паэтычнай калыскай народнага песняра Янкі Купалы.

І пэўная доля нашай павагі да славутага паэта складаецца з таго, што мы ведаем мясціны, дзе ён жыў, дзе вызначыўся яго творчы лёс, дзе нарадзіліся яго лепшыя творы. Мы павінны, мы будзем берагчы тут прыкметы часу, сляды яго прысутнасці...

# Лысагорскія сябры

З дзіцячых гадоў мы ў доме прывыклі чуць, што паэт Янка Купала сябраваў з матчынымі дзядзькамі Бычкоўскімі – Антонам, Янам і Ясем. Жылі яны ў Лысай Гары – невялікай, размешчанай на вяршыні гары вёсачцы. Там жа недзе жыў Купала. Дзядзькі часта бывалі ў сваёй сястры Алены – нашай бабулі ў Новым Двары, што кіламетраў пятнаццаць ад Лысай Гары па дарозе на Радашковічы, дзе наш дзед Рыгор Сафронавіч Грычын працаваў кавалём на панскім бровары. Да „каваля Гжэгуша" (дарэчы, лічыўся нядрэнным музыкам) заязджаў таксама Купала.

Мама і цётка Соня, яе старэйшая сястра, памяталі і нямала цікавых падрабязнасцей аб сустрэчах паэта з дзядзькамі і іх бацькам. Але якімі б праўдзівымі ні былі тыя ўспаміны, сапраўды каштоўнымі яны сталі пасля таго, як выявіліся дакументальныя сведчанні старой, амаль пятнаццацігадовай дружбы Купалы з Бычкоўскімі.

У пачатку 1916 года Антон з сям'ёй выехаў з Лысай Гары. Некаторы час яны жылі ў Маскве, потым перабраліся на Данбас. Яшчэ перад вайной сувязь маці і цёткі Соні з іх стрыечнымі братамі і сёстрамі – дзецьмі Антона Мікалаевіча – была перарвана, адрасы згубіліся. І толькі ў сямідзесятым годзе ў Музей Янкі Купалы нечакана паступіў фотаздымак паэта віленскага перыяду і кніга „Шляхам жыцця" з даравальнымі подпісамі Антону і яго сыну Пятру. Нягледзячы на многія перыпетыі, гора, перанесеныя Пятром Антонавічам Бычкоўскім у грамадзянскую і Вялікую Айчынную войны, падарункі з аўтографамі Купалы – гэтыя дарагія ўсёй сям'і рэліквіі, ён пастаянна вазіў з сабой і змог захаваць. На выдатна выкананай фатаграфіі Купалы надпіс: „На добрую память уважаемому другу Антону Николаевичу Бычковскому посвящает И. Д. Луцевич. Вильно, 20/XII – 1908". Кніжка просценькага выдання, на мяккай пажоўклай вокладцы ўверсе напісана: „На добрую память Петрусю Бычковскому. Янка Купала. 29/УІ– 13 года, Акопы"...



Фотаздымак Я. Купалы (1908), падараваны А. Бычкоўскаму

Калі выйшаў першы зборнік вершаў паэта ўсяго з некалькіх асобнікаў, якія меліся ў Купалы (як вядома, „Жалейка" „арыштоўвалася"), адзін ён падарыў Антону Бычкоўскаму. На жаль, гэта кніга не захавалася, але яе добра памяталі сыны Антона Мікалаевіча і мая маці.

„...Паважанаму сябру...". Калі ўлічыць стрыманасць,




Дароўны надпіс Купалы на фотаздымку



П. Бычкоўскі

прыродную сціпласць Купалы, трэба меркаваць, што змест подпісу склаўся не выпадкова і паэт выказвае ім свае шчырыя адносіны, аб чым сведчыць другі падарунак і аўтограф, зроблены ім праз пяць гадоў Петрусю.

Праўда, блізкая дружба Купалы з Бычкоўскімі бярэ пачатак з яшчэ больш ранняга часу. Аказваецца, менавіта Ян Луцэвіч у 1903 годзе хрысціў Марыю, першую дачку Антона, у

якога ўжо меліся два сыны – Пётр і Аляксандр. У Бычкоўскіх паэта так і называлі: „кум", „наш куме". І была на тое пэўная падстава: у 1906 годзе Купала стаў хрышчоным бацькам дачцы Антона Соф'і, а ў 1912 годзе – сыну Мікалаю. Дарэчы, Марыя Антонаўна, у замужжы Маліноўская, доўга берагла яго падарунак – мініяцюрны залаты крыжык.

Аднак вернемся ў 1903 год. Ян Луцэвіч яшчэ невядомы як паэт, яшчэ не апублікаваны яго славуты „Мужык". Жывуць Луцэвічы на арэндзе ў фальварку Селішча.

Сядзіба знаходзілася пры дзяніскаўскай дарозе, за тры кіламетры ад яе скрыжавання з Даўгінаўскім трактам – ад Лысай Гары, калі браць напрасткі праз Харужанцы, кіламетраў шэсць-сем. Радашковічы – яшчэ далей. У Селішчы Луцэвічы жылі з 1895 года. Да гэтага яны сядзелі на арэндзе ў Прудзішчах, таксама за сем кіламетраў ад Лысай Гары. Як відаць, блізкімі суседзямі Луцэвічы і Бычкоўскія не былі і, значыць,не проста жыхарства побач, у адной вёсцы, або сумесная работа, як гэта часта здараецца, звялі Яна з Бычкоўскімі. Дык, можа, Луцэвіч вучыўся з кім-небудзь з братоў Бычкоўскіх у Бяларучах? Не. Антон быў на пятнаццаць гадоў старэйшы за Купалу, Ян і Ясь таксама – адзін на пяць, другі на адзінаццаць гадоў.

Хто ж такія лысагорскія Бычкоўскія, дружбе з якімі Купала заставаўся верны з юнацкіх гадоў і да іх выезду з Беларусі? Галава сям'і Мікалай Бычкоўскі, выхадзец з-пад Міра (хутар Воўчае Балота), неўзабаве пасля адмены прыгону купіў зямлю, як у іх гаварылі, па той бок ад Мінска. Пераязджаў на новае месца – у Лысую Гару яшчэ пад прозвішчам Бычко, але, лічачы сябе шляхціцам ды яшчэ валодаючы амаль трыццаццю дзесяцінамі зямлі, без ніякіх згрызот сумлення, дадаў да свайго прозвішча „шляхецкі" канчатак. Мікалай меў васьмёра дзяцей. Дзе ён вучыўся грамаце, цяжка сказаць, але тут аказаўся на некалькі вёсак амаль адзіным, хто мог чытаць і пісаць па-руску і па-польску. Навучыў грамаце, відавочна, у „дарэктараў-перадзвіжнікаў" і сваіх сыноў, бо двухкласнае народнае вучылішча ў Бяларучах адкрылі некалькі пазней.

Мама расказвала, што ў доме дзядзькі Антона былі кнігі, хоць дзецям толькі зрэдку дазвалялася іх патрымаць у руках і пагартаць. Апрача таго, ён заўсёды прывозіў з Мінска газеты, календары, розныя брашуры, якія і пасля прачытання захоўваліся ў куфры. Мажліва, юнага Яна Луцэвіча Антон Бычкоўскі і яго браты зацікавілі перш за ўсё як пісьменныя людзі. Апрача таго, Антон Бычкоўскі меў адукаваную на той час жонку Соф'ю Паўлаўну Цахінскую. Ажаніўся ён з дзяўчынай, як тады гаварылі,

„іншага асяроддзя" па волі выпадку. У трохгадовым узросце Соф'я засталася круглай сіратой і выхоўвалася ў сям'і свайго апекуна – дзядзькі, губернскага архітэктара Л. В. Дабралюбава. Яны кожны год прыязджалі на дачу ў фальварак Лопатава, што знаходзіўся за паўтара кіламетра ад Лысай Гары. Тут Антон Бычкоўскі і пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай. Апякун Соф'і Паўлаўны лічыўся чалавекам ліберальным, дэмакратычных поглядаў і без ваганняў даў згоду на шлюб ды яшчэ прыкупіў у пасаг пляменніцы дваццаць пяць дзесяцін зямлі.

Соф'я выходзіла замуж у 19 гадоў, была ўсяго на год старэйшая за Купалу, так што, безумоўна, і яна, жанчына мяккага характару, чулая, актыўная, станавілася для маладога Луцэвіча цікавым, прыемным субяседнікам падчас яго заездаў да Бычкоўскіх. Калі б не сімпатызаваў ён гэтай пары, то наўрад ці стаў бы хрышчоным бацькам іх дзяцей.

Малодшыя браты Антона, Ян і Ясь, таксама былі па-свойму цікавыя людзі. Па-першае, яны аднолькава зваліся. Кажуць, што бяларуцкі бацюшка, які праз шэсць гадоў пасля нараджэння Івана (Яна) хрысціў яго брата, на тую пару меў спрэчку з іх бацькам, і таму хоць кумы і напомнілі, што ў сям'і ўжо ёсць такое імя, не паслухаў іх і ўсё роўна назваў нованароджанага Бычкоўскага Іванам. Праўда, і дома, і ў вёсцы ні аднаго з братоў не клікалі Іванам, а мясцовымі, беларускімі варыянтамі гэтага распаўсюджанага імя: старэйшага – Янам, малодшага – Ясем.

Апрача таго, абодва Бычкоўскія, асабліва Ян, мелі рэдкую фізічную сілу. Напрыклад, у акрузе доўга памяталі выпадак, калі Ян вызваліў брата з-пад арышту. Неяк на вечарынцы ў Бяларучах пашумеў Ясь з сябрукамі і трапіў у рукі прыстава, які да разбору справы пасадзіў яго ў прыстасаваную для такіх выпадкаў лазню-каталажку. Раніцой Ян даведаўся пра здарэнне і прыйшоў з Лысай Гары выручаць брата. Прыстава паблізу не аказалася. Хлопец паспрабаваў замок – моцны, не сарваць, дзверы таксама не зняць, тады ён упёрся ў рог, прыўзняў зруб і скамандаваў малодшаму: „А ну, вылазь хутчэй, а то лазня плячо рэжа".

З 1906 года за яўнае, дэманстратыўнае спачуванне рэвалюцыйным падзеям да малодшых Бычкоўскіх, як і да Антона, цвёрда прымацавалася далёка не бяскрыўдная ў тыя часы мянушка „сацыялісты". І яшчэ адна характэрная рыса абодвух братоў – не спяшаліся жаніцца. Антон адважыўся на гэты ўчынак у трыццаць гадоў, Ясь – у трыццаць чатыры, Ян – маючы за сорак. І калі з адносін Купалы з сям'ёй Антона вядомы такія эпізоды, як шматгадзіннае піццё чаю на свежым паветры пад магутнай старой ліпай або чытанне ўголас, то

сустрэчы паэта з Янам і Ясем мелі іншы характар. „Вечныя жаніхі” не цураліся вясёлых кампаній: хадзілі, ездзілі на розныя вечарынкі, гулянкі, не прапускалі паблізу ніводнага фэсту. У іх заўсёды быў нядрэнны конік, і як прыгадвала наша маці, на каляды ўтрох – абодва дзядзькі і Купала – усе ў ладных кажушках, ды яшчэ прыхапіўшы вялікі кажух, завальваліся ў санкі і ехалі „на госці” ў Буды, Лекараўку або Жукаўку, дзе пры Даўгінаўскім гасцінцы стаяў шынок, дасціпна празваны „Здарэнне”.

Улетку малады Луцэвіч далучаўся да розных гульняў, асабліва ў „каршука”. На свабодным месцы, часцей на выгане, усе ўдзельнікі станавіліся ў круг і смешным пералікам: „энтэль, пэнтэль, сігі, сея, лапэт, капэт, кнот” вызначалі „каршука”. „Кураня”, кранутае „драпежнікам”, лёгка не здавалася, бегла ў луг і злавіць яго трэба было толькі там, не даючы магчымасці зноў вярнуцца да сваіх, у „чараду”. Якраз у ролі „каршука” лепш за ўсё і запомніўся Купала: хударлявы, падцягнуты юнак, у акуратным, клятчастым (тады называлі „у сталетачку”) касцюме і ў белай святочнай кашулі.

А яшчэ хлопцы Бычкоўскія і Луцэвіч прыдумвалі такую забаву: пасылалі каго-небудзь у Лопатава з заданнем непрыкметна выкрасці там сабаку і прывесці на Лысую Гару. Самі ж да гэтага часу паспявалі напісаць смешнае, звычайна ў вершаванай форме пасланне прыехаўшым з горада гасцям-дачнікам, часцей знаёмым дзяўчатам. Яркім матузком пісьмо прывязвалі да ашэйніка „паштальёна” і адпускалі...

„...Пан Луцэвіч прыехаў, пан Луцэвіч!” – радасна абвяшчалі дзеці заезд Купалы ў Новы Двор (без падарункаў ён ніколі не прыязджаў), і толькі старэйшыя, вітаючыся, саромеліся, а іншы раз і наогул стараліся не трапляць на вочы Луцэвічу, таму што ведалі: Іван Дамінікавіч паэт і яны могуць „апынуцца” ў якім-небудзь яго вершы, і ўсе будуць пазнаваць, паказваць на іх пальцам. Тут жа ў Новым Двары маці і цётка Соня ўпершыню чыталі Купалу, яго „Жалейку”, якую спачатку прыносіла ў дом гувернантка панскіх дзяцей, яна іншы раз заходзіла да Алены Мікалаеўны, а пазней гэтую ж кнігу з гордасцю вазіў з сабою дзядзька Антон, бо яна была з аўтарскім надпісам.

Неяк Луцэвіч спрабаваў уладкавацца памочнікам вінакура на бровар да навадворскага пана Валатковіча. Дамаўляцца павёў яго наш дзед Рыгор. Падцягнуты, інтэлігентнага выгляду малады чалавек не даспадобы прыйшоўся пану (пасада памочніка вінакура звычайна зводзілася да простай фізічнай работы) і, адмаўляючы Луцэвічу, Валатковіч вобразна выказаўся: „Ды пан больш да полькі, чым да заціркі”.

Не ўтойвалі ў сям'і Бычкоўскіх і адзін кур'ёзны выпадак з

іх дружбы з Купалам. Летам і восенню 1912–1913 гадоў паэт падоўгу жыў у Акопах – невялікім фальварку, што арандавала яго маці. Абсаджаны ліпамі і ясенямі, прытуліўшыся за пагоркамі, хутар знаходзіўся кіламетры за два, калі ісці праз Буды, ад сядзібы Бычкоўскіх.

Дык вось. Праз паўтара месяца пасля таго, як Купала, відавочна, пабываў на Лысай Гары і падарыў сыну Антона кнігу, 15 жніўня мінскі драматычны гурток ставіў у Радашковічах „Паўлінку". Запрошаныя самім паэтам і сціпла сядзеўшыя на апошніх лаўках у перапоўненай зале браты Бычкоўскія адчувалі сябе даволі няёмка. Справа ў тым, што як толькі з'яўляўся на сцэне Адольф Быкоўскі або пад смех выходзіў за кулісы, знаёмыя азіраліся на братоў,ківалі ім, усміхаліся. Вобраз пана Быкоўскага, вядома ж, мастацкі, зборны, але прозвішчы падобныя: Бычкоўскі – Быкоўскі. Апрача таго, хто ж як не Ян і Ясь загуляліся ў хлопцах, хоць і ездзілі неаднаразова ў сваты, і хто, як не Бычкоўскія, калі жартам, а калі і ўсур'ёз, выстаўлялі сябе за шляхціцаў. Пасля заканчэння спектакля радасны, усхваляваны Купала, нічога не падазраючы (дамаўляліся ехаць разам дамоў), прабіўся праз натоўп да Бычкоўскіх, але браты сустрэлі яго суровым маўчаннем, ні адзін не падаў рукі, не павіншаваў...

Меў паэт адносіны і да такіх, можна сказаць, кульмінацыйных падзей у біяграфіі братоў, як іх удзел у рэвалюцыйных выступленнях 1906 года.

Канец мая. Перад апоўднем, недзе аб адзінаццатай гадзіне, у Лысую Гару да Бычкоўскіх прыехаў Купала. Каня паставіў пад вокнамі і, завязаўшы лейцы за плот, зайшоў у дом. Антон адразу ж паслаў некага з дзяцей па сваіх стрыечных братоў, Шпакоўскага і Казлоўскага, што якраз гасцілі ў Лысай Гары. Сабраліся шасцёра, зачыніліся ў пакоі... Гэты майскі дзень і пазнейшыя бурныя падзеі на ўсё жыццё запомніла наша цётка Соф'я, якая мела на той час 12 гадоў. Цікава, што амаль з тымі ж дэталямі аб арышце Бычкоўскіх расказваў праз шмат гадоў іхні сусед, тады таксама 13–14-гадовы падлетак Антон Маліноўскі.

...Чаму ж тады ў доме Антона сабраліся ўсе мужчыны, зачыніліся. Што за прычына? Праз дваццаць з лішнім гадоў у аўтабіяграфічных пісьмах Купала скажа: „...У 1904–1905 гг. я пазнаёміўся з беларускімі рэвалюцыйнымі дзеячамі (здаецца, членамі „Грамады") У. І. Самойлам, былым маім рэпецітарам, Бурбісам, у далейшым камісарам земляробства БССР ...Яны давалі мне нелегальную літаратуру для распаўсюджвання і г. п... Дарэчы, павінен адзначыць, што я пазнаёміўся з беларускімі рэвалюцыйнымі дзеячамі, калі жыў яшчэ ў Бараўцах". Вельмі магчыма, што знаёмства адбылося ў фальварку І. Са-

мойлы Казіміраўцы, да якой з Бараўцоў усяго кіламетра паўтара і, відавочна, у той майскі дзень 1906 года Купала якраз і прывёз сваім даўнім надзейным сябрам нейкую рэвалюцыйную літаратуру.

Сустрэча была перапынена крыкам цёткі Анэты: „Сядзіце тут, гляньце ў акно!" Па дарозе ад Пунішчаў да Лысай Гары рухаліся коннікі – цэлая калона. Былі яны апрануты ва ўсё чорнае. Вядома ж, стражнікі. Ззаду, у лёгкай брычцы, ехалі прыстаў і ўраднік. „Гэта па нас!" – прамовіў Антон. – Нам няма куды схавацца, а ты хутчэй едзь, Ян!" – загадаў дзядзька Купалу. Той выбег на вуліцу. Пугі на месцы не аказалася, вырваў з плоту штыкетнік, ускочыў на воз і паімчаў уніз да Будаў незаўважаны. Паліцыя акружыла дом Антона, на двор нікога не выпусцілі. Вобыск зацягнуўся да вечара: шукалі лістоўкі, зброю. У куфрах, у шафах усё перавярнулі, залезлі на гарышча. Там гаспадар хаваў ад дзяцей часопісы і газеты – старанна пагарталі, паглядзелі. Затым прыстаў загадаў яшчэ раз абшукаць сенцы, хлеў, пуню. Малако, што стаяла ў варыўні ў бітонах, і тое перапаролі шаблямі. Дзейнічалі паліцэйскія яўна па нечай падказцы. Але старанні іх аказваліся дарэмныя: нічога падазронага знайсці не ўдалося. І ўсё ж чатырых мужчын – Антона, Яна, Яся, а таксама Аляксандра Шпакоўскага і Канстанціна Казлоўскага – арыштавалі. Тут жа іх абвінавацілі ў арганізацыі маёўкі і ў падбухторванні сялян да бунту. На вуліцы арыштаваным надзелі наручнікі, і пятнаццаць узброеных стражнікаў пагналі лысагорцаў пешшу ў Мінск.

Амаль два месяцы прасядзелі яны там у турэмным замку. Але ўмяшаўся Л. В. Дабралюбаў: знаёмы з губернатарам, ён дабіўся, каб арыштаваных выпусцілі. Вярнуліся лысагорскія сябры Купалы з турмы барадатыя, узмужнелыя. Потым Ян і Ясь часта ўспаміналі, што, пазнаёміўшыся ў мінскім астрогу з палітычнымі зняволенымі, яны ў многім разабраліся, зразумелі, што да чаго... З таго часу іх і пачалі называць „сацыялістамі".

## ЗМЕСТ


ПРАДМОВА .. .. .. 3

КРЭЎСКІЯ ТАЯМНІЦЫ .. .. .. 5

ЛЕГЕНДЫ СТАРОГА ЛОСКА .. .. .. 19

ГАЛЬШАНСКІЯ МУРЫ .. .. .. 28

ЛЮБЧАНСКАЯ ДАЎНІНА .. .. .. 39

СХАВАНЫ ШЭДЭЎР .. .. .. 47

ШЧОРСАЎСКІ СКАРБ .. .. .. 52

ВАРШАЎКА .. .. .. 61

ТРАГЕДЫЯ АНТОНІЯ ТЫЗЕНГАЎЗА .. .. .. 66

ГЕНЕРАЛ КАСІНЕРАЎ .. .. .. 77

ФАЛЬВАРАК ЛЮЦІНКА .. .. .. 85

„ЗРЫСАВАНА З НАТУРЫ" .. .. .. 92

СТАНІСЛАЎ МАНЮШКА – НАШ ЗЯМЛЯК .. .. .. 106

БЯДУЛЕЎ ПАСАДЗЕЦ .. .. .. 114

ВЯРТАННЕ Ў БАГДАНАВА .. .. .. 122

ДОКТАР НАРБУТ .. .. .. 131

ПАЭТЫЧНАЯ КАЛЫСКА КУПАЛЫ .. .. .. 138

ЛЫСАГОРСКІЯ СЯБРЫ .. .. .. 165

*На першай старонцы вокладкі –*
Крэўскі замак. *Фотарэпрадукцыя малюнка Н. Орды. 1868 г.*
*На чацвёртай старонцы вокладкі –*
Званіца ў Вішневе, помнік архітэктуры XVIII ст.

Научно-популярное издание

*Прокопчик Леонид Тимофеевич*

**„ДРЕМЛЕТ ПАМЯТЬ ДНЕЙ...“**
**Краеведческие очерки**

Навукова-папулярнае выданне

*Пракопчык Леанід Цімафеевіч*

**„ДРЭМЛЕ ПАМЯТКА ДЗЁН...“**
**Краязнаўчыя нарысы**

Загадчыца рэдакцыі *Л. І. Круглова*
Рэдактар *В. І. Дрозд*
Фота В. І. Ждановіча, *Ю. М. Паўлава*
Мастацкі рэдактар *С. У. Стрэльскі*
Тэхнічны рэдактар *С. І. Стараверава*
Карэктар *Л. І. Жылінская*

ІБ № 905

Здадзена ў набор 17.09.90. Падпісана да друку 05.08.91. Фармат 84x108 $^1/_{32}$. Папера кн.-часопісная. Гарнітура Прэс Раман. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 9.24. Ум. фарб.-адб. 9,45. Ул.-выд. арк. 9,97. Тыраж 5300 экз. Выд. № 7157. Зак. 3792. Цана 2 р.

Выдавецтва „Полымя“ Дзяржаўнага камітэта Беларускай ССР па друку. 220600, Мінск, пр. Машэрава, 11.

Баранавіцкая ўзбуйненая друкарня. 225320, Баранавічы, Савецкая, 80.

Читателю предлагается сборник очерков об исторических личностях нашего края, писателях, художниках, творивших здесь в прошлые времена, об уникальных местах, архитектурных и исторических памятниках. Диапазон представленных личностей достаточно широк: общественно-политический деятель XVIII ст. Антоний Тизенгауз, график и композитор XIX ст. Наполеон Орда, поэт, драматург, театральный деятель Винцент Дунин-Марцинкевич, классик белорусской литературы Янка Купала, один из зачинателей национальной прозы Ядвигин Ш. В основу повествования положены летописные и документальные сведения, материалы археологических исследований.

Пракопчык Л.
П69 „Дрэмле памятка дзён...” Краязн. нарысы. – Мн.: Полымя, 1991. – 174 с.: іл.
ISBN 5-345-00381-5.
Прокопчик Л. „Дремлет память дней...”: Краевед. очерки.

Чытачу прапануецца зборнік нарысаў пра гістарычных асоб нашага краю, пісьменнікаў, мастакоў, якія працавалі тут у мінулыя часы, пра унікальныя мясціны, архітэктурныя і гістарычныя помнікі. Дыяпазон прадстаўленых асоб даволі шырокі: грамадска-палітычны дзеяч XVIII ст. Антоній Тызенгаўз, графік і кампазітар XIX ст. Напалеон Орда, паэт, драматург, тэатральны дзеяч Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, класік беларускай літаратуры Я. Купала, адзін з пачынальнікаў нацыянальнай прозы Ядвігін Ш. У аснову аповяду пакладзены летапісныя і дакументальныя звесткі, матэрыялы археалагічных даследаванняў.

Адрасуецца масаваму чытачу.

$П\frac{1805080000-048}{М306(03)-91}$ 9–91 ББК 26.891


2 p.